Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі
«Полацкі дзяржаўны універсітэт»

Т. М. ГЛАЗЫРЫНА

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ XIX СТАГОДДЗЯ

Вучэбна-метадычны комплекс
для студэнтаў спецыяльнасцей 1-21 03 01 «Гісторыя»,
1-02 01 02-04 «Гісторыя. Англійская мова»

Наваполацк
ПДУ
2009

УДК 94(476)"18"(075.8)
ББК 63.3(4Беи)5я73
Г52

Рэкамендавана да выдання метадычнай камісіяй
гісторыка-філалагічнага факультэта ў якасці вучэбна-метадычнага комплекса
(пратакол № 8 ад 11.03.2008)

РЭЦЭНЗЕНТЫ:

канд. гіст. навук, навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі
НАН Беларусі А. У. МАЦУК;
канд. гіст. навук, дацэнт кафедры айчыннай і ўсеагульнай гісторыі
УА «ПДУ» А. А. ШЫШКОЎ

**Глазырына, Т. М.**

Г52 Гісторыя Беларусі XIX стагоддзя : вучэб.-метад. комплекс для студэнтаў спец. 1-21 03 01 «Гісторыя», 1-02 01 02-04 «Гісторыя. Англійская мова» / Т. М. Глазырына. – Наваполацк : ПДУ, 2009. – 216 с.

ISBN 978-985-418-822-5.

Дае магчымасць студэнтам дзённай і завочнай форм навучання авалодаць сістэмай ведаў аб асноўных этапах гісторыі Беларусі XIX стагоддзя. У выданне ўключана базавая праграма курса, канспект лекцый, планы семінарскіх заняткаў, апісанне і методыка рэйтынгавай сістэмы, храналагічны даведнік, тэрміналагічны слоўнік.

Прызначаны для студэнтаў-гісторыкаў дзённай і завочнай форм навучання і для ўсіх, хто вывучае гісторыю Беларусі.

**УДК 94(476)"18"(075.8)**
**ББК 63.3(4Беи)5я73**

**ISBN 978-985-418-822-5**

© Глазырына Т. М., 2009
© УА «Полацкі дзяржаўны універсітэт», 2009

# УВОДЗІНЫ

Вучэбна-метадычны комплекс «Гісторыя Беларусі XIX стагоддзя» падрыхтаваны ў адпаведнасці з базавай праграмай падрыхтоўкі студэнтаў-гісторыкаў і накіраваны на фарміраванне ў студэнтаў сучаснага навуковага ўяўлення аб асноўных падзеях гістарычнага развіцця Беларусі ў XIX стагоддзі.

Структура ВМК складзена такім чынам, каб забяспечыць праектную дзейнасць выкладчыка і студэнтаў у адукацыйным працэсе ў адпаведнасці з яго мэтамі і зместам. Першым структурным элементам з’яўляецца базавая праграма дысцыпліны, у якой змяшчаюцца мэта і задачы вывучэння дысцыпліны, віды заняткаў і формы кантролю ведаў, а таксама тэматычны план лекцыйных і семінарскіх заняткаў.

Асноўнае месца ў структуры ВМК займае канспект лекцый, складзены на падставе выкарыстання і аналізу навейшых падручнікаў і дапаможнікаў па гісторыі Беларусі. У лекцыях у сціслым выглядзе раскрываюцца галоўныя пытанні гісторыі XIX стагоддзя: палітыка царызму ў Беларусі пасля ўключэння яе ў склад Расійскай імперыі, эканамічнае развіццё ў першай палове XIX ст., становішча ў вайне 1812 г., асаблівасці грамадска-палітычнага руху, адмена прыгоннага права і рэалізацыя рэформы 1861 г., паўстанне 1863 г., палітыка царызму пасля падаўлення паўстання, буржуазныя рэформы 60 – 70-х гадоў і контррэформы 80 – 90-х гадоў, развіццё капіталізму ў сельскай гаспадарцы і прамысловасці ў 60 – 90-я гады, становішча культуры і фарміраванне беларускай нацыі. Шмат увагі ўдзяляецца тлумачэнню найбольш важных метадалагічных праблем. Гэта датычыць перш за ўсё разлажэння феадальна-прыгонніцкага ладу і зацвярджэння капіталістычных адносін, таварнай вытворчасці, фарміравання рынку, ідэалогіі народніцтва і сацыял-дэмакратыі, марксісцкай, ліберальнай і манархісцка-клерыкальнай ідэалогій. Пасля кожнай лекцыі сфармуляваны пытанні для самаправеркі і заданні для самастойнай работы. Гэта дасць магчымасць выкладчыкам і студэнтам звярнуць увагу на вузлавыя праблемы курса, дапаможа ім зарыентавацца ў аб'ёме вучэбнага матэрыялу, неабходнага для засваення, выпрацаваць адпаведныя ўменні і навыкі, якімі ім неабходна авалодаць у працэсе вывучэння гісторыі Беларусі.

Раздзел, прысвечаны семінарскім заняткам, змяшчае пералік гістарычных крыніц, навуковых даследаванняў, розныя віды практычных заданняў да кожнай тэмы, а таксама методыку іх выканання. Паспяховае

засваенне студэнтамі тэм семінарскіх заняткаў магчыма пры ўмове выканання імі папярэдняй працы, сэнс якой зводзіцца да наступнага: вывучэнне тэм павінна засноўвацца не толькі на трывалых ведах, атрыманых раней на лекцыях, але і на значнай па аб'ёме практычнай працы, падчас якой павінны сфармавацца дакладныя ўяўленні аб вывучаемай гістарычнай падзеі. У сувязі з гэтым заданні скіраваны на аналіз навуковых даследаванняў, дакументаў і матэрыялаў, на праверку ведаў гістарычных дат, імёнаў, падзей, тэрмінаў і паняццяў; уменне рэферыраваць і выяўляць прычынна-выніковыя сувязі матэрыялу; уменне ацэньваць гістарычныя падзеі і абгрунтоўваць уласнае дачыненне да іх.

Методыка ўліку і ацэньвання ведаў студэнтаў змяшчаецца ў раздзеле «Рэйтынгавая сістэма пры вывучэнні гістарычных дысцыплін». Рэйтынгавая тэхналогія ацэньвання вынікаў навучання студэнтаў заснавана на ўліку назапашваемых імі адзнак у балах за выкананне бягучых або кантрольных работ. У адрозненне ад традыцыйнага спосабу ацэньвання, рэйтынгавая тэхналогія прадугледжвае сістэму назапашвання ўмоўных адзінак ведаў на працягу ўсяго атэстуемага перыяду.

Вучэбна-метадычны комплекс змяшчае таксама храналагічны даведнік, тэрміналагічны слоўнік і дадаткі.

Канспект лекцый, практычныя заданні, рэкамендаваныя для падрыхтоўкі да семінарскіх заняткаў гістарычныя крыніцы і навуковая літаратура дазволяць студэнтам праводзіць самастойны аналіз вывучаемай праблемы, вызначыць уласную пазіцыю па гістарычных пытаннях і абгрунтаваць яе.

# БАЗАВАЯ ПРАГРАМА КУРСА

## Мэта выкладання дысцыпліны

Фарміраванне гістарычнай самасвядомасці студэнтаў, вывучэнне заканамернасцей і асаблівасцей сацыяльна-эканамічнага, грамадска-палітычнага і духоўна-культурнага развіцця Беларусі на розных гістарычных этапах, садзейнічанне фарміраванню актыўнай грамадзянскай пазіцыі, патрыятызму, любові да Бацькаўшчыны.

## Задачы вывучэння дысцыпліны

1. Прааналізаваць тэндэнцыі, асаблівасці, супярэчнасці сацыяльна-эканамічнага, грамадска-палітычнага і культурна-духоўнага развіцця беларускага народа.
2. Даць параўнальную характарыстыку асноўных этапаў гістарычнага працэсу на Беларусі і ў краінах блізкага і далёкага замежжа.
3. Фарміраваць у студэнтаў уменне аналізаваць гістарычныя працэсы і падзеі, вызначаць іх прадумовы, наступствы, заканамернасці, выпадковасці, асаблівасці.
4. Сфарміраваць уменне крытычна і ўсебакова падыходзіць да разгляду праблем гісторыі і сучаснасці.
5. Абудзіць цікавасць у студэнтаў да творчага падыходу вывучэння гісторыі Радзімы праз падрыхтоўку рэфератаў, курсавых работ, удзел у даследчыцка-краязнаўчай працы, канферэнцыях, круглых сталах, дыспутах і г. д.
6. Паказаць невычарпальную выхаваўчую ролю сувязі гістарычнай спадчыны з сучаснасцю.
7. Садзейнічаць фарміраванню актыўнай грамадзянскай пазіцыі студэнтаў, іх патрыятызму, любові да Радзімы.

**Віды заняткаў і формы кантролю ведаў**

| Віды заняткаў, формы кантролю ведаў | Дзённая форма | Завочная форма |
|---|---|---|
| Курс | 2 | 2 |
| Семестр | 4 | 3 |
| Лекцыі, г | 36 | 10 |
| Экзамен, семестр | 4 | 3 |
| Семінарскія заняткі, г | 18 | 6 |
| Кантрольныя работы, г | - | 14 |
| Курсавая работа, семестр | 4 | 3 |

Лекцыйны курс

| Назва раздзелаў і тэм лекцый і іх змест | Колькасць гадзін | |
|---|---|---|
| | Д | З |
| **IV Семестр** | | |
| **БЕЛАРУСЬ У СКЛАДЗЕ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ**<br>**Тэма: Беларусь у першай палове XIX ст.**<br>Новы перыяд у гісторыі Беларусі, яго асноўныя рысы. Перыядызацыя. Айчынная і замежная гістарыяграфія. Крыніцы. Іх класіфікацыя.<br>Тэрыторыя і насельніцтва. Адміністрацыйны падзел. Прыродныя рэсурсы. Уплыў геаграфічнага і дэмаграфічнага фактараў на сацыяльнае і эканамічнае развіццё. Сацыяльная і нацыянальна-рэлігійная структура насельніцтва. Яе асаблівасці. Катэгорыі сялян. Становішча і склад гарадскога насельніцтва. | 2 | |
| **Тэма: Сацыяльна-эканамічнае развіццё на зыходзе прыгонніцтва.** Разлажэнне феадальна-прыгонніцкага ладу і фарміраванне капіталістычных адносін. Развіццё таварнай вытворчасці ў сельскай гаспадарцы. Пачатак яе спецыялізацыі. Новыя з'явы ў агратэхніцы. Прамысловая дзейнасць сялянства, узровень яго дыферэнцыяцыі.<br>Крызіс паншчыннай гаспадаркі. Спробы яе рацыяналізацыі. Узмацненне феадальнай эксплуатацыі сялянства. Хваляванні сялян дзяржаўных і прыватнаўласніцкіх маёнткаў, іх антыпрыгонніцкая накіраванасць.<br>Структура і формы арганізацыі прамысловай вытворчасці. Вотчынныя і купецкія мануфактуры. Пачатак прамысловага перавароту. Рост выкарыстання наёмнай працы. Будаўніцтва дарог і каналаў. Гандаль. Кірмашы. Узрастанне ролі гарадоў і мястэчкаў. | 2 | - |
| **Тэма: Вайна 1812 г. і Беларусь.**<br>Расійска-французскія адносіны і палітычная сітуацыя ў заходніх губернях напярэдадні вайны. Перадача Расіі Беластоцкай акругі. Праект адраджэння Вялікага княства Літоўскага. Ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі летам 1812 г. Палітыка французскіх улад. Дзейнасць Часовай камісіі ўрада Вялікага княства Літоўскага. Адносіны шляхты да Напалеона. Пазіцыі сялянства. Партызанскі рух. Удзел насельніцтва Беларусі ў баявых дзеяннях. Разгром французскіх войскаў на Бярэзіне. Вынікі вайны для Беларусі. | 2 | 2 |
| **Тэма: Урадавая палітыка.** «Польскае пытанне» і ўрадавая палітыка. Эвалюцыя саслоўнай палітыкі. Ваенныя пасяленні. Актуалізацыя сялянскага пытання ў другой чвэрці XIX ст. Люстрацыя дзяржаўных маёнткаў. Інвентарная рэформа. Канфесіянальная палітыка. Полацкі царкоўны Сабор і яго вынікі. Змяненні палітыкі ў галіне асветы. Заканадаўства. Ідэі і рэаліі. Камітэт па справах заходніх губерняў і яго дзейнасць. Русіфікацыя і яе сутнасць. | 2 | 2 |

| | | |
|---|---|---|
| **Тэма: Светапогляд рамантызму і грамадска-палітычнае жыццё.** «Вясна народаў» і ажыўленне грамадска-палітычнага руху. Характар і сацыяльна-саслоўны склад яго ўдзельнікаў. Грамадска-палітычнае жыццё і яго накірункі. Фізіякраты. Масонства. Тайныя таварыствы вучнёўскай моладзі і іх дзейнасць. Дзекабрысты. Беларусь у планах дзекабрыстаў. Бабруйскі план паўстання. «Таварыства ваенных сяброў». Выступленне дзекабрыстаў у Літоўскім корпусе і ў Бабруйскай крэпасці. Разгром тайных таварystваў.<br>Шляхецкае паўстанне 1830 – 1831 гг. Яго мэты і праграма дзеянняў. Віленскі цэнтральны паўстанцкі камітэт. Развіццё паўстання ў заходніх і паўднёвых раёнах Беларусі. Мабілізацыя сялян і мяшчан. Бітва за Вільню. Падаўленне паўстання. Вынікі падзей 1831 г. Ліцвінскі патрыятызм сярод мясцовай шляхты.<br>Уплыў рэвалюцыйных падзей у Заходняй Еўропе на грамадска-палітычны рух у Беларусі. «Экспедыцыя Валовіча». «Дэмакратычнае таварыства». Ф. Савіч. «Саюз свабодных братоў». Зараджэнне беларускага нацыянальна-культурнага руху. «Заходнерусізм» і яго прадстаўнікі: мітрапаліт літоўскі І. Сямашка, І. Грыгаровіч і інш. П. Янкоўскі і Літоўская семінарыя. | **4** | **-** |
| **Тэма: Культура. Ад асветніцтва да рамантызму.** Новае ў культуры: рацыяналізм, дэмакратызацыя і дыферэнцыяцыя. Уплыў польскай і рускай культур. Сацыяльная структура культуры: магнацкая, памесна-дваранская культура сярэдняй і дробнай шляхты. Культура мяшчан і насельніцтва гарадоў і мястэчак. Сялянская культура. Культурныя цэнтры Беларусі. Асвета. Фарміраванне сістэмы свецкай і духоўнай адукацыі. Віленская навучальная акруга. Віленскі універсітэт. Гімназіі. Павятовыя вучылішчы. Царкоўнапрыходскія школы. Змены ў сістэме адукацыі. Беларуская навучальная акруга. Горы-Горацкі земляробчы інстытут. Віцебская настаўніцкая семінарыя. Духоўная адукацыя. Полацкая езуіцкая акадэмія. Ваеннае і прафесійнае навучанне. Тыпаграфіі: казённыя, прыватныя, царкоўныя.<br>Навука. Зараджэнне і развіццё археаграфіі, крыніцазнаўства, славяназнаўства, беларусазнаўства, этнаграфіі і археалогіі. З. Даленга-Хадакоўскі, М. Баброўскі, І. Даніловіч, К. і Я. Тышкевічы і інш. Прыродазнаўчыя веды: батаніка, біялогія, фізіялогія, хімія. Станаўленне новай беларускай мовы і літаратуры. Рамантызм: А. Міцкевіч, Я. Чачот, У. Сыракомля, Я. Баршчэўскі. Пераход да рэалізму. В. Дунін-Марцінкевіч. Ананімная паэзія. Мастацтва. Тэатр. Музыка. А. Абрамовіч, М. Агінскі, Д. Стэфановіч, Ф. Міладоўскі, С. Манюшка. Архітэктура і горадабудаўніцтва. Палацава-сядзібнае будаўніцтва. Класіцызм. Неаготыка. Жывапіс. Віленская школа жывапісу. Я. Дамель, І. Аляшкевіч, В. Ваньковіч, І. Хруцкі, В. Дмахоўскі. Графіка. Скульптура. Уклад выхадцаў з Беларусі ў развіццё навукі і культуры іншых народаў. Выспяванне беларускай нацыянальнай ідэі. | **2** | **-** |

| | | |
|---|---|---|
| **Тэма: Беларусь у другой палове XIX ст.**<br>Асноўныя напрамкі і вынікі навуковых даследаванняў. Перспектывы далейшага вывучэння. Класіфікацыя крыніц і іх асноўныя віды. Масавыя статыстычныя даныя. Апублікаваныя матэрыялы перапісу насельніцтва Расійскай імперыі 1897 г. | **2** | **-** |
| **Тэма: Мадэрнізацыйныя працэсы ў Беларусі**.<br>Мадэрнізацыя, яе сутнасць, этапы, характэрныя і спецыфічныя рысы яе эвалюцыі ў Беларусі. Фарміраванне сацыяльнай структуры буржуазнага грамадства, незавершанасць гэтага працэсу ў Беларусі. Мадэрнізацыя і працэсы індустрыялізацыі, урбанізацыі, станаўлення нацыі, змены ў менталітэце беларускага грамадства. | **2** | **-** |
| **Тэма: Адмена прыгоннага права.** Наспяванне неабходнасці падрыхтоўкі сялянскай рэформы, яе прычыны. Арганізаваная ініцыятыва інвентарных камітэтаў Віленскай, Гродзенскай і Ковенскай губерняў па вызваленні сялян. Рэскрыпт У. І. Назімаву. Маніфест і «Палажэнні» 19 лютага 1861 г. Спецыфіка мясцовых «Палажэнняў» для Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай, Гродзенскай і Віленскай губерняў. Выкупная аперацыя. Устаўныя граматы і выкупныя акты. Правы сялян. Змены ў рэалізацыі рэформы, звязаныя з паўстаннем 1863 г. Рэформы аграрных адносін дзяржаўных сялян і ўпарадкаванне іншых катэгорый сельскага насельніцтва. Вынікі і значэнне аграрных рэформ. | **2** | **2** |
| **Тэма: Урадавая палітыка.** Асаблівасці эканамічнай і саслоўнай палітыкі на Беларусі. Абмежаванні ў дачыненні да палякаў, беларусаў-католікаў. Заканадаўства ў адносінах да яўрэяў. Пашырэнне рускага землеўладання. Сервітутнае пытанне. Рэформы ў сістэме падаткаў і павіннасцей.<br>Змены ва ўрадавай палітыцы ў Беларусі па нацыянальным і рэлігійным пытаннях. Умацаванне «традыцыяналісцкіх» пачаткаў ва ўрадавай палітыцы Беларусі. Русіфікацыя Беларусі. Пашырэнне ўплыву праваслаўнай царквы. | **2** | **2** |
| **Тэма: Сельская гаспадарка.** Памешчыцкае і сялянскае землеўладанне. Асаблівасці буржуазнай эвалюцыі сельскай гаспадаркі Беларусі. Аграрны крызіс 80-х гг. і яго ўплыў на рыначную спецыялізацыю сельскай гаспадаркі. Малочная і мясная жывёлагадоўля. Вытворчасць тэхнічных культур. Вінакурэнне. Скарачэнне дваранскага землеўладання і рост бессаслоўнай зямельнай уласнасці. Становішча сялян. Сацыяльныя працэсы сярод сялянства. Фарміраванне аграрнай буржуазіі. Адыходныя промыслы. Міграцыя сялянства. Сельская грамада, рэгіянальныя асаблівасці яе функцыяніравання ў Беларусі. | **2** | **-** |

| | | |
|---|---|---|
| **Тэма: Прамысловасць і гарады.** Спецыялізацыя беларускай прамысловасці, яе галіновая структура. Спецыфічныя рысы тэрытарыяльнага размяшчэння прамысловых прадпрыемстваў. Асаблівасці прамысловай рэвалюцыі ў Беларусі. Удзельная вага дробнай вытворчасці. Рост гарадоў і іх добраўпарадкаванне. Асаблівасці ўрадавай палітыкі ў дачыненні горадаўтварэння. Мястэчкі. Фарміраванне гандлёва-прамысловай буржуазіі. Колькасць, склад, становішча рабочых. | **2** | **-** |
| **Тэма: Транспарт, гандаль, крэдыт. Будаўніцтва чыгунак.** Важнейшыя чыгуначныя лініі ў Беларусі; іх уплыў на развіццё сельскай гаспадаркі, прамысловасці, гарадоў і гандлю. Рачны транспарт. Фарміраванне фінансава-крэдытнай сістэмы. Дзейнасць у Беларусі аддзяленняў Дзяржаўнага, Сялянскага, Дваранскага і іншых банкаў. Таварыствы ўзаемнага крэдыту. Скарачэнне кірмашоў і развіццё магазінна-крамнага гандлю. Фарміраванне на тэрыторыі Беларусі адзінага эканамічнага рэгіёна. | **2** | **-** |
| **Тэма: Паўстанне 1863 г.** Прычыны паўстання. Варшаўскі нацыянальны і Літоўскі правінцыяльны камітэты. «Чырвоныя» і «белыя»: З. Серакоўскі, Л. Звяждоўскі, В. Урублеўскі, Ф. Ражанскі і інш. К. Каліноўскі і яго дзейнасць. «Мужыцкая праўда». Пачатак паўстання. Маніфест Часовага правінцыяльнага ўрада Літвы і Беларусі. Арганізацыя паўстанцкіх атрадаў і іх дзейнасць на тэрыторыі Беларусі. Тактыка «белых». Аддзел кіравання правінцыямі Літвы. Я. Гейштар. Меры царскай адміністрацыі ў сувязі з паўстаннем. М. Мураўёў. Спад паўстанцкага руху. Утварэнне «Літоўска-Беларускага чырвонага жонду». Падаўленне паўстання. «Лісты з-пад шыбеніцы» К. Каліноўскага. Характар і прычыны паражэння паўстання. | **2** | **-** |
| **Тэма: Грамадска-палітычнае жыццё.** Грамадская думка: асноўныя плыні і іх эвалюцыя. Ідэалогія манархізму ў Беларусі. «Заходнерусізм» і яго плыні. М. Каяловіч. Станаўленне ліберальнай думкі. Рэвалюцыйна-дэмакратычная думка. Вытокі ідэалогіі беларускага нацыянальнага руху. Ф. Багушэвіч. К. Каліноўскі. Польскі і яўрэйскі нацыянальныя рухі і іх ідэалогія.<br>Вытокі і сутнасць народніцтва. Першыя народніцкія гурткі пачатку 70-х гг. і іх дзейнасць. Народніцкія гурткі другой паловы 70-х гг. Пераход на пазіцыі «Народнай волі». Выхадцы з Беларусі ў народніцкіх арганізацыях Расіі. І. Грынявіцкі, М. Судзілоўскі, С. Кавалік, Р. Ісаеў і інш. Народніцкія арганізацыі на Беларусі ў першай палове 80-х гг. Група «Гоман» і яе погляды на развіццё Беларусі. Ліберальныя народнікі Рэвалюцыйнага народніцтва ў канцы 90-х гг.<br>Эвалюцыя рабочага руху. Распаўсюджванне марксізму. Э. Абрамовіч, І. Гурвіч, С. Трусевіч, Я. Спонцы, В. Сяліцкі, А. Крэмер. Дзейнасць сацыял-дэмакратыі Польшчы і Літвы. Літоўская сацыял-дэмакратычная партыя (ЛСДП). Польская партыя сацыялістычная (ППС). Усеагульны яўрэйскі рабочы саюз | **2** | **-** |

| | | |
|---|---|---|
| (Бунд). «Рабочая партыя палітычнага вызвалення Расіі». I з'езд РСДРП. Стварэнне Сацыял-дэмакратыі Каралеўства Польскага і Літвы (СДКПіЛ). Асаблівасці сацыял-дэмакратычнага руху на Беларусі. | | |
| **Тэма: Фарміраванне беларускай нацыі.** Этнічная эмансіпацыя еўрапейскіх народаў у XIX ст. Умовы ўтварэння беларускай нацыі. Этнічная тэрыторыя беларусаў, нацыянальны склад насельніцтва. Сацыяльна-класавыя асаблівасці станаўлення беларускай нацыі. Фарміраванне агульных нацыянальных прыкмет. Этнічная і нацыянальная самасвядомасць. Станаўленне беларускай літаратурнай мовы. Самавызначэнне беларускага нацыянальнага руху. | **2** | **2** |
| **Тэма: Культура Беларусі ў 60 – 90-я гг.** Асноўныя стылі і накірункі ў развіцці культуры. Асвета. Палітыка ўрада ў галіне школьнай справы. Пачатковая і сярэдняя адукацыя. Тыпы і колькасць школ. Узнікненне прафесійна-тэхнічнай адукацыі. Настаўніцкія семінарыі. Развіццё прыродазнаўчых навук. А. Кіркор, П. Шэйн, І. Насовіч, Е. Раманаў, М. Каяловіч і інш. Публікацыя гістарычных крыніц і помнікаў духоўнай культуры. Развіццё мастацкай літаратуры. Творчасць Ф. Багушэвіча, А. Гурыновіча, Я. Лучыны, К. Каганца і інш. Рост легальных публікацый на беларускай мове ў 90-я гг. Быт і матэрыяльная культура, звычаі, абрады, нормы маралі народаў Беларусі. Развіццё друку. «Минский листок».<br>Тэатр і музыка. Архітэктура і горадабудаўніцтва. Эклектыка. Жывапіс. Гістарычны і бытавы жанры: К. Альхімовіч, Д. Баркоўскі. Краявід, партрэт. Н. Сілівановіч, Б. Русецкі, А. Ромер, А. Гараўскі. Графіка. Творчасць А. Андрыёлі, Ф. Дмахоўскага, Н. Орды. | **2** | **-** |
| **Усяго за семестр:** | **36** | **10** |

## Семінарскія заняткі

| **Назва тэм семінарскіх заняткаў і іх змест** | **Колькасць гадзін** | |
|---|---|---|
| | **Д** | **З** |
| <u>**IV семестр**</u><br>**Тэма: Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў першай палове XIX ст.**<br>1. Стан памешчыцкай і сялянскай гаспадаркі.<br>2. Развіццё прамысловасці. Пачатак прамысловага перавароту.<br>3. Эканамічныя рэформы 30 – 50-х гг. XIX ст.<br>4. Транспарт, гандаль, банкі. | **2** | **-** |
| **Тэма: Вайна 1812 г. на Беларусі**<br>1. Пачатак вайны і баявыя дзеянні летам 1812 г.<br>2. Палітыка Напалеона на Беларусі. Акупацыйны рэжым.<br>3. Партызанскі рух.<br>4. Баявыя дзеянні восенню 1812 г. Вынікі вайны для Беларусі | **2** | **2** |

| | | |
|---|---|---|
| **Тэма: Грамадска-палітычнае жыццё на Беларусі ў першай палове XIX ст.**<br>1. Тайныя таварыствы вучнёўскай моладзі.<br>2. Дзекабрысты і Беларусь.<br>3. Шляхецкае паўстанне 1830 – 1831 гг.<br>4. Змены і асноўныя напрамкі ва ўрадавай палітыцы ў першай палове XIX ст. | **2** | **-** |
| **Тэма: Культура Беларусі ў першай палове XIX ст.**<br>1. Развіццё адукацыі ў першай палове XIX ст.<br>2. Фарміраванне новай беларускай літаратуры.<br>3. Беларускае выяўленчае мастацтва ў першай палове XIX ст.<br>4. Архітэктура і горадабудаўніцтва. | **2** | **2** |
| **Тэма: Буржуазныя рэформы 60 – 70-х гг. XIX ст. на Беларусі.**<br>1. Асаблівасці судовай і гарадской рэформаў.<br>2. Рэформы ў галіне адукацыі і цэнзуры.<br>3. Ваенная рэформа.<br>4. Контррэформы 80 – 90-х гг. XIX ст. | **2** | **2** |
| **Тэма: Развіццё капіталізму на Беларусі ў другой палове XIX ст.**<br>1. Памешчыцкая і сялянская гаспадаркі.<br>2. Аграрны крызіс 80-х гг. і яго ўплыў на сельскую гаспадарку.<br>3. Прамысловасць і яе асноўныя галіны.<br>4. Будаўніцтва чыгунак. | **2** | **-** |
| **Тэма: Грамадска-палітычнае развіццё Беларусі ў другой палове XIX ст.**<br>1. Ідэалогія манархізму ў Беларусі. «Заходнерусізм».<br>2. Ліберальна-буржуазны рух.<br>3. Народніцкі рух.<br>4. Паўстанне 1863 – 1864 гг. | **2** | **-** |
| **Тэма: Сацыяльная барацьба ў другой палове XIX ст. Узнікненне палітычных арганізацый.**<br>1. Сялянскі рух на Беларусі ў другой палове 60 – 90-х гг.<br>2. Рабочы рух у 60-х – першай палове 90-х гг. Утварэнне рабочых саюзаў.<br>3. Распаўсюджванне марксізму, зараджэнне сацыял-дэмакратыі і іншых палітычных партый і арганізацый.<br>4. Зараджэнне беларускага нацыянальна-палітычнага руху. | **2** | **-** |
| **Тэма: Культура Беларусі ў 60 – 90-я гг. XIX ст.**<br>1. Вывучэнне этнаграфіі, гісторыі і культуры Беларусі.<br>2. Палітыка ўрада ў галіне адукацыі.<br>3. Фарміраванне беларускай літаратурнай мовы.<br>4. Жывапіс: характарыстыка асноўных жанраў. | **2** | **-** |
| **Усяго за семестр:** | **18** | **6** |

# 1. КАНСПЕКТ ЛЕКЦЫЙ

## ЛЕКЦЫЯ 1
## Беларусь у першай палове XIX ст.

1. Крыніцы і гістарыяграфія.
2. Адміністрацыйны падзел і органы ўлады.
3. Сацыяльная і нацыянальна-рэлігійная структура насельніцтва.

### 1. Крыніцы і гістарыяграфія

**Пісьмовыя крыніцы** – падмурак гістарычных даследаванняў. Яны падзяляюцца на:

– *помнікі заканадаўства* («Статут Великого Княжества Литовского» 1588 г., «Полное собрание законов Российской империи», «Полный хронологический сборник законов и положений, касающихся евреев», «Акты и грамоты об устройстве и управлении римско-католической церкви в империи Российской и Царстве Польском» і інш.);

– матэрыялы справаводства цэнтральных і мясцовых органаў дзяржаўнай улады (архівы міністэрстваў, Сінода, канцылярый губернатараў, уездных органаў улады і інш.);

– *эканамічна-геаграфічныя і гаспадарчыя апісанні канца XVIII – пачатку XX ст.* (Матэрыялы генеральнага межавання зямель канца XVIII ст., інвентары памешчыцкіх і дзяржаўных маёнткаў першай паловы XIX ст., ваенна-тапаграфічныя апісанні і інш.);

– *статыстычныя матэрыялы* (адрас-календары, агляды губерняў, «Гарадскія пасяленні ў Расійскай імперыі», «Статыстыка пазямельнай уласнасці і населеных месцаў Еўрапейскай Расіі», «Спіс фабрыкантаў і заводчыкаў Расійскай імперыі 1832 г.», «Статыстычнае апісанне гарадоў і пасадаў Расійскай імперыі па 1825 г.» і інш.);

– *эпісталярная і мемуарная літаратура* – мемуары, дзённікі, нататкі, хранографы-дыярыушы, лісты (Коркозевич, М. Воспоминания о нашествии французов на Россию в 1812 году / М. Коркозевич // Минские губернские ведомости. – 1869; Записка графа Хрептовича о событиях войны 1812 года // Военный журнал. – 1859. – № 1; Мемуары князя Сангушки // Исторический вестник. – 1898. – Т. 73. – № 8; Из воспоминаний графа Гогендорпа, бывшего генерал-губернатора Великого княжества

Литовского и генерала Рох-Годара, Виленского военного губернатора в 1812 году. – СПб., 1912);

– *перыядычны друк* (Kuryer Litewski, Tymczasowa gazeta Minska, «Губернскія ведамасці»);

– *мастацкая літаратура* (творы А. Міцкевіча, Я. Чачота, Я. Баршчэўскага, А. Рыпінскага, У. Сыракомлі, В. Дуніна-Марцінкевіча).

**Асноўныя праблемы гістарыяграфіі:**

- *палітыка царызму на Беларусі пасля далучэння яе да Расіі* (Жукович, П. Управление и суд в Западной России в царствование Екатерины II / П. Жукович // Журнал министерства народного просвещения (далей – ЖМНП). 1914. – № 2. – С. 265 – 315; № 3. – С. 88 – 120; № 4. – С. 314 – 355; № 5. – С. 1 – 43; Жукович, П. Сословный состав населения Западной России в царствование Екатерины II / П. Жукович // ЖМНП. 1915. – № 1. – С. 76 – 109; № 2. – С. 257 – 321; № 5. – С. 130 – 178; Жукович, П. Западная Россия в царствование императора Павла I / П. Жукович // ЖМНП. – 1916. – № 6. – С. 183 – 226; № 8. – С. 207 – 263; № 9. – С. 186 – 275; Анішчанка, Я.К. Беларусь у часы Кацярыны II. / Я.К. Анішчанка. Мінск, 1996; Тихомиров, Л.А. Монархическая государственность / Л.А. Тихомиров. – СПб., 1992; Туміловіч, Г.М. Палітыка царызму ў адносінах да дробнай шляхты Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. / Г.М. Туміловіч // Нацыянальная палітыка расійскага самадзяржаўя ў канцы XVIII – пачатку XIX стагоддзяў. – Мінск, 1995. – С. 114 – 128; Луговцова, С.Л. Политика российского самодержавия по отношению к дворянству Белоруссии в конце XVIII – первой половине XIX века / С.Л. Луговцова. – Минск, 1997; Пічукоў, В.П. Палітыка царызму на Беларусі ў першай палове XIX ст. / В.П. Пічукоў, В.І. Сычоў. – Гомель, 1994; Ільяшэвіч, М. Расійская палітыка на землях былога Беларуска-Літоўскага гаспадарства за панаваннем Кацярыны II і Паўла I (1772 –1801 гг.). / М. Ільяшэвіч. – Мінск, 1992.);
- *становішча Беларусі ў вайне 1812 г.* (Бутурлин, Д.П. История нашествия императора Наполеона на Россию в 1812 году / Д.П. Бутурлин. СПб., 1823 – 1824. – Ч. 1 – 2; Михайловский-Данилевский, А.И. Описание Отечественной войны в 1812 году / А.И. Михайловский-Данилевский. – СПб., 1839. – Ч. 1 – 4; Богданович, М.И. История Отечественной войны 1812 года по достоверным источникам / М.И. Богданович. СПб., 1859 – 1860. Т. 1 – 3; Кудринский, Ф.А. Вильна в 1812 году / Ф.А. Кудринский. – Вильна, 1912; Бернацкий, Н. События в Вильно в 1812 году / Н. Бер-

нацкий. – Вильно, 1912; Орловский, Е.Ф. Гродненская губерния в 1812 году / Е.Ф. Орловский. – Гродно, 1912; Краснянский, В.Г. Минский департамент Великого княжества Литовского / В.Г. Краснянский. – СПб., 1902; Ён жа. Борисов и Борисовский уезд в Отечественную войну 1812 года. – Гродно, 1913; Глыбовский, В.И. 1812 год в Витебской губернии / В.И. Глыбовский. – Витебск, 1910; Добровольский, В.К. Витебская губерния в Отечественную войну / В.К. Добровольский. – Витебск, 1912; Цехановецкий, В.П. Краткое описание военных действий в Витебской губернии во время Отечественной войны 1812 года / В.П. Цехановецкий. – Витебск, 1892; Бриллиантов, Л.И. Година тяжелого испытания и великой неувядаемой славы русского народа. Город Могилев во власти французов / Л.И. Бриллиантов. – Могилев, 1912; Лунин, А.П. 1812 год. Наполеон в пределах Могилевской губернии / А.П. Лунин. – Могилев, 1912; Чистяков, С.Д. Борисовцы в Могилеве на Днепре. Эпизод из Отечественной войны / С.Д. Чистяков. – СПб., 1897; Корнейчик, Е.И. Белоруский народ в Отечественной войне 1812 г. / Е.И. Корнейчик. – Минск, 1962; Тарле, Е.В. Нашествие Наполеона на Россию / Е.В. Тарле. – М., 1992; Французска-руская вайна 1812 г.: еўрапейскія дыскурсы і беларускі погляд. – Мінск, 2003; Мазин, Г. Березина, год 1812-й / Г. Мазин, Л. Ерусалимчик. – Минск, 1991);

- *грамадска-палітычны рух у першай палове XIX ст. і змена палітычнага курсу царызму* (Смит, Ф. История польского восстания и войны 1830 – 1831 годов. В 3 т. / Ф. Смит. – СПб., 1863 – 1864; Пузыревский, А.К. Польско-русская война 1831 г. В 2 т. / А.К. Пузыревский. – СПб., 1890; Сватиков, С.Т. Общественное движение в России (1700 – 1895) / С.Т. Сватиков. – Ростов н/Д, 1905; Wrotnowski, F. Historia powstania w 1831 roku na Wofyniu, Podolu, Zmudzi i Litwie. T. I / F. Wrotnowski. – Lipsk, 1875; Lelewel, J. Pamietnik z roku 1830 – 31 / J. Lelewel. – Warszawa, I924; Mochnacld, M. Powstanie narodu polskiego w r. 1830 – 1831. T. 1 – 2 / M. Mochnacld. – Paryz, 1833 – 1834; Dangel, S. Rok 1831 w Minszczyznie / S. Dangel. – Warszawa, 1925; Tokan, W. Wojna polsko-rosyjska 1830 i 1831 / W. Tokan. – Warszawa, 1930; Блинова, Т.Б. Иезуиты в Белоруссии / Т.Б. Блинова. – Минск, 1990; Гарбачова, В.В. Паўстанне 1830 – 1831 гг. на Беларусі / В.В. Гарбачова. – Мінск, 2001; Коялович, М.О. История воссоединения западнорусских униатов старых времён / М.О. Коялович. – Минск, 1999; Мохнач, Н.Н. Идейная борьба в Белоруссии в 30 – 40-е гг. XIX в. / Н.Н. Мохнач. – Минск, 1971; Соколова, М.А. Общественные объединения и движения в Беларуси в конце XVIII – на чале XX века: проблемы становления гражданского общества / М.А. Соколова. – Минск,

2002; Швед, В.В. Беларускія старонкі гісторыі дзекабрыстаў / В.В. Швед. – Мінск, 1998; Цвікевіч, А. «Западно-руссизм». Нарысы з гісторыі грамадскай мыслі на Беларусі ў XIX і пачатку XX ст. / А. Цвікевіч. – Мінск, 1993; Швед, В.В. Паміж Польшчай і Расіяй: грамадска-палітытнае жыццё на землях Беларусі (1772 – 1863 гг.) / В.В. Швед. – Гародня, 2001);

- *крызіс феадальна-прыгонніцкай сістэмы і эканамічныя рэформы 30 – 50-х гадоў* (Кернажыцкі, К.І. Гаспадарка прыгоннікаў на Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. / К.І. Кернажыцкі. – Мінск, 1935; Козловский, П.Г. Землевладение и землепользование в Белоруссии в конце XVIII – первой половине XIX в. / П.Г. Козловский. – Минск, 1982; Люты, А.М. Дваранства Беларусі ў перыяд разлажэння і крызісу феадалізму (канец XVIII – першая палова XIX стст.) / А.М. Люты, Г.М. Туміловіч. – Мінск, 1991; Сосна, У.А. Фарміраванне саслоўна-групавога складу сялянства Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. / У.А. Сосна. – Мінск, 2000; Чепко, В.В. Сельское хозяйство Белоруссии в первой половине XIX в. / В.В. Чепко. – Минск, 1966; Сосно, В.А. Формирование сословия государственных крестьян Белоруссии в конце XVIII – первой половине XIX вв. / В.А. Сосно. – Минск, 1983);

- *развіццё прамысловасці і гарадоў* (Доўнар-Запольскі, М.В. Гісторыя Беларусі / М.В. Доўнар-Запольскі. – Мінск,1994; Игнатовский, В. Белоруссия. Территория, население, экономика, важнейшие моменты истории / В. Игнатовский. – Минск, 1924; Болбас, М.Ф. Развитие промышленности в Белоруссии (1795 – 1861 г.) / М.Ф. Болбас. – Минск, 1966); Лютый, А.М. Генезис капитализма в промышленности Белоруссии (вторая половина XVIII – первая половина XIX вв.) / А.М. Лютый. – Минск, 1991; Лютый, А.М. Социально-экономическое развитие городов Белоруссии в конце IVIII – первой половине XIX в. / А.М. Лютый. – Минск, 1987; Романовский, Ц.Т. Развитие мануфактурной промышленности в Белоруссии (вторая половина XVIII – первая половина XIX вв.) / Ц.Т. Романовский. – Минск, 1966; Чепко, В.В. Города Белоруссии в первой половине XIX в.: экономическое развитие / В.В. Чепко. – Минск, 1981; Швед, В.В. Торговля в Белоруссии в период кризиса феодализма (1830 – 1850-е годы) / В.В. Швед. – Гродно, 1995;

- *развіццё культуры і грамадска-палітычнай* думкі (Извеков, В.Д. Исторический очерк состояния православной церкви в Литовской епархии за время с 1839 – 1889 / В.Д. Извеков. – М., 1889; Шавельский, Г. Последнее воссоединение с православной церковию униатов Белорусской

епархии (1833 – 1839 гг.) / Г. Шавельский. – СПб., 1910; Киприанович, Г.Я. Исторический очерк православия, католичества и унии в Белоруссии и Литве с древнейшего до нашего времени / Г.Я. Киприанович. – Вильна, 1895; Коялович, М. История воссоединения западнорусских униатов старых времен / М. Коялович. – Минск, 1999; Кирюшин, П.М. Антинародная роль реакционного католического духовенства / П.М. Кирюшин. – Минск, 1948; Корзун, М.С. Русская православная церковь на службе эксплуататорских классов / М.С. Корзун. – Минск, 1984; Марозава, С. Уніяцкая царква ў культурна-гістарычным развіцці Беларусі (1596 – 1839) / С. Марозава. – Гродна, 1996; Дробаў, Л.М. Беларускія мастакі XIX ст. / Л.М. Дробаў. – Мінск, 1971; Каханоўскі, Г.А. Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI – XIX стст. / Г.А. Каханоўскі. – Мінск, 1984; Кацер, М.С. Изобразительное искусство Белоруссии дооктябрьского периода / М.С. Кацер. – Минск, 1969; Киселев, Г. Разыскивается классик… Историко-литературная дилогия / Г. Киселев. – Минск, 1989; Лойка, А.А. Гісторыя беларускай літаратуры: дакастрычніцкі перыяд. У 2-х ч. Ч. 1. – Мінск, 1969; Пічэта, В.І. Пытанне аб вышэйшай школе на Беларусі ў мінулым. / В.І. Пічэта. – Мінск, 1991; Мальдзіс, А. На скрыжаванні славянскіх традыцый / А. Мальдзіс. – Мінск, 1980).

## 2. Адміністрацыйны падзел і органы ўлады

У выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай (1772, 1793 і 1795 гг.) тэрыторыя Беларусі з насельніцтвам каля 3 млн чалавек апынулася ў складзе Расійскай імперыі. Гэта падзея аказала моцны ўплыў на грамадска-палітычнае і культурнае развіццё беларускага народа.

Адразу пасля кожнага падзелу на далучаных землях уводзілася новае адміністрацыйна-тэрытарыяльнае дзяленне. Паводле загаду сената ад 23 кастрычніка 1772 г. паўночна-ўсходнія раёны Беларусі былі ўключаны ў склад Пскоўскай і Магілёўскай губерняў і злучаны ў адно генерал-губернатарства. У іх уводзіўся трохступеньчаты адміністрацыйны падзел, які існаваў у той час у Расіі, – губерня – правінцыя – уезд.

У 1776 г. з Пскоўскай губерні былі вылучаны беларускія ўезды і з іх утворана Полацкая губерня. Сенацкім указам ад 22 сакавіка 1777 г. Полацк быў зацверджаны губернскім горадам. Магілёўскую і Полацкую губерні ў 1778 г. перайменавалі ў намесніцтвы.

Пасля другога падзелу Рэчы Паспалітай указам ад 23 красавіка 1793 г. на беларускай тэрыторыі была ўтворана Мінская губерня з цэнтрам у Мінску, а пасля трэцяга падзелу – Слонімская і Віленская губерні (снежань 1795 г.).

Заходняя граніца Беларусі праходзіла па Нёмане ад вусця да Гродна, далей па прамой лініі да Брэста і затым па Заходнім Бугу.

У 1796 г. царскі ўрад правёў новую губернскую рэформу, згодна з якой уводзілася двухступеньчатае дзяленне: губерня – уезд.

У час рэформы на Беларусі былі ўтвораны наступныя губерні: Беларуская з Полацкага і Магілёўскага намесніцтваў (насельніцтва – каля 1,5 млн чалавек; цэнтр – г. Віцебск), Мінская з Мінскай губерні і далучаным да яе Рэчыцкім уездам (насельніцтва – звыш 800 тыс. чалавек; цэнтр – г. Мінск), Літоўская са Слонімскай і Віленскай губерняў (насельніцтва – каля 1,6 млн чалавек; цэнтр – г. Вільня).

Але такія буйныя адміністрацыйныя адзінкі праіснавалі нядоўга. Паводле ўказа Аляксандра I ад 9 верасня 1801 г, быў зроблены новы губернскі падзел усёй Расіі. Тэрыторыя Беларусі ўвайшла ў склад пяці губерняў: Віцебскай, Магілёўскай (абедзве склалі Беларускае генерал-губернатарства), Мінскай, Гродзенскай, Віленскай, якія ўтварылі Літоўскае генерал-губернатарства. Прычым у Віцебскую губерню былі ўключаны таксама ўезды з рускім і латышскім насельніцтвам, у Гродзенскую і Віленскую – з польскім і літоўскім.

Уся ўлада на далучаных землях перайшла да генерал-губернатараў, якія з’яўляліся даверанымі асобамі цара і таму мелі неабмежаваныя паўнамоцтвы. З 1776 па 1856 г. гэтую пасаду займаў 21 чалавек.

Генерал-губернатарам падпарадкоўваліся вайсковыя і грамадзянскія губернатары, абавязкі якіх заключаліся ў кантролі за выкананнем указаў цара і ўраду, у наглядзе за эканамічнай дзейнасцю, у камплектацыі і забеспячэнні войск рэкрутамі, у падтрымцы грамадскага парадку і інш.

Кіравалі губернатары праз канцылярыі. Іх асноўны штат складаўся прыкладна з 56 асоб, а дадатковы – з 323 чыноўнікаў і 132 чалавек вайсковай каманды для пасылак у якасці кур’ераў.

Большасць губернатараў прызначалася з рускіх саноўнікаў і, як правіла, з ваенных. Іх чыны адпавядалі 2-му класу «Табеля аб рангах» – «сапраўдны стацкі саветнік» або 3-му – «тайны саветнік».

Губернскае кіраўніцтва было падвержана карупцыі і пратэкцыянізму, а таксама барацьбе паміж мясцовым дваранствам за кіруючыя пасады.

Дзейнасць органаў мясцовага кіравання вызначалася пастановай сената ад 22 верасня 1773 г. Згодна з гэтым указам, выканаўчая ўлада ва ўездах належала ўезднаму камісару. Яго асоба прызначалася з рускіх афіцэраў і зацвярджалася ў сенаце. Адказваў уездны камісар за функцыяніраванне пашпартнай сістэмы, рэгістрацыі міграцыі насельніцтва, за нагляд за жабракамі, састарэлымі і калекамі, за раскватараванне войск на пастой, за рамонт дарог, мастоў і г. д. Яму падпарадкоўваліся войты, якія ўзначальвалі ўездныя ключы. Кожны ўезд падзяляўся на 6 ключоў. У падначаленні войтаў былі выбарныя ад сялян – асобы сотнікаў і дзесятнікаў. Сотнікі абіраліся ад 100–200 двароў, дзесятнікі – ад 1 – 25 двароў.

Прадстаўнікі царскай адміністрацыі на месцах прызначаліся ўезднай паліцыяй і камісарам і мелі асабістыя знакі ўлады. Войты насілі знак арла, які быў выбіты на меднай пласціне і замацоўваўся на правым баку грудзей. Сотнікі атрымлівалі доўгі кій з меднай круглай булавой на канцы, а дзесятнікі – такі ж, але кароткі.

Такім чынам, у канцы XVIII – пачатку XIX ст. на Беларусі былі распаўсюджаны расійскія адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел і сістэма дзяржаўнага кіравання.

## 1. Сацыяльная і нацыянальна-рэлігійная структура насельніцтва

Пасля ўключэння беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі падворная (падымная) сістэма падаткаабкладання, што існавала ў Рэчы Паспалітай, была заменена на падушную. З гэтай нагоды на Беларусі пачынаюць праводзіць перапісы (рэвізіі). Усяго ў першай палове XIX ст. было праведзена 6 рэвізій: у 1796, 1811, 1815, 1833, 1851, 1858 гг. Аднак рэвізіі ўлічвалі не ўсе катэгорыі жыхароў. У імянныя спісы (рэвізскія казкі) заносіліся толькі тыя саслоўі і групы насельніцтва, якія павінны былі плаціць падаткі, – сяляне, мяшчане, купцы і інш. Збор статыстычнай інфармацыі аб прывілеяваных саслоўях і групах (дваранах, духавенству, дзяржаўных служачых) ажыццяўляўся нерэвізскім шляхам – праз губернскія канцыляры, духоўныя ўстановы, ваеннае ведамства і звычайна прымяркоўваўся да тэрміну правядзення рэвізій. Дадатковымі крыніцамі служаць матэрыялы царкоўнага (метрычныя кнігі і спісы прыхаджан, або кліравыя ведамасці) і адміністрацыйна-паліцэйскага ўліку насельніцтва.

За 60 гадоў (з 1796 па 1858 г.) насельніцтва Беларусі павялічылася нязначна: з 2636 тыс. да 3398 тыс. чалавек, або на 28,9 %. Павелічэнне колькасці жыхароў краю адбывалася цалкам за кошт натуральнага

прыросту. Міграцыі з іншых рэгіёнаў імперыі перакрываліся большай колькасцю выбыўшых. Лік апошніх заўсёды пераважаў. Так з 1815 па 1842 г. з пяці заходніх губерняў выехала 7770, а прыехала 3470 рэвізскіх душ. Франка-расійская вайна 1812 г. вызвала ў Беларусі зацяжны дэмаграфічны крызіс. Стагнацыя народнай гаспадаркі, якая доўга не магла аправіцца ад наступстваў вайны, працягвалася і ў 20-я гг. XIX ст., асабліва ва ўсходняй частцы краю. Усяго з 1815 па 1833 г. насельніцтва скарацілася на 83 тыс. чалавек (2,8 %), у тым ліку сельскае – на 5 %.

Пасля адноснай стабілізацыі эканомікі ў 30 – 40-я гг. XIX ст. адбываецца і рост насельніцтва. З 1833 па 1851 г. яно вырасла на 23,1 %, у тым ліку сельскае – на 21, гарадское – на 60,6 %.

Тэмпы росту гарадскога і сельскага насельніцтва кардынальна адрозніваліся. Рост колькасці жыхароў вёскі забяспечваўся выключна іх натуральным прыростам. Унутраная міграцыя з гарадоў у сельскую мясцовасць фактычна адсутнічала.

Колькасць гарадскога насельніцтва павялічвалася пераважна за кошт міграцый у горад розных саслоўных катэгорый мясцовага сельскага жыхарства: вольных людзей, панцырных баяр, аднадворцаў, шляхты, дзяржаўных сялян. Важнай крыніцай папаўнення гарадскіх саслоўных груп было яўрэйскае насельніцтва. На падставе шэрагу ўказаў яўрэі высяляліся з сельскай мясцовасці. На рост ліку гараджан паўплывала таксама значнае павелічэнне адміністрацыйнага апарату.

У цэлым для дэмаграфічнай сітуацыі першай паловы XIX ст. характэрным было зніжэнне ўдзельнай вагі сельскіх жыхароў (з 96,5 да 91,6 %), павелічэнне долі гараджан (з 3,5 да 8,4 %) і апераджальныя тэмпы росту апошніх, што сведчыла аб хуткіх урбанізацыйных працэсах у Беларусі. У параўнанні з сярэднімі паказчыкамі па Еўрапейскай Расіі, дзе колькасць гарадскога насельніцтва з 1825 па 1858 г. вырасла на 62 %, беларускія гарады павялічылі колькасць свайго насельніцтва на 90 %. У пэўнай ступені такі рост быў абумоўлены нізкімі зыходнымі данымі колькасці жыхароў беларускіх гарадоў у канцы XVIII ст.

Найбольш шматлікім саслоўем Беларусі было сялянства. Па юрыдычнаму стану ў Беларусі вылучаліся тры вялікія групы сялян – прыватнаўласніцкія, дзяржаўныя (казённыя) і вольныя. Абсалютную большасць складалі прыватнаўласніцкія. Да іх адносіліся памешчыцкія (панскія), царкоўныя і тыя, што належалі асобным мяшчанам і розным ведамствам (гарадам, дабрачынным арганізацыям, Вольнаму эканамічнаму таварыству і г. д.) (табл. 1).

Табліца 1

**Колькасць і ўдзельная вага асноўных катэгорый сялян Беларусі, тыс. чал.**

| Разрады сялян | 5-я рэвізія (1796 – 1808) | | 7-я рэвізія (1815 – 1825) | | 8-я рэвізія (1833 – 1851) | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | колькасць | % | колькасць | % | колькасць | % |
| Памешчыцкія | 1950 | 87,0 | 1683 | 80,9 | 1989 | 75,7 |
| Дзяржаўныя | 167,0 | 7,5 | 244,8 | 11,8 | 542,0 | 20,6 |
| Царкоўныя і манастырскія | 77,3 | 3,5 | 112,6 | 5,4 | 10,2 | 0,4 |
| Вольныя | 45,9 | 2,0 | 18,3 | 0,9 | 64,2 | 2,5 |
| Іншыя | _ | | 20,4 | 1,0 | 21,7 | 0,8 |
| Усяго | 2240,2 | 100 | 2079,1 | 100 | 2627,1 | 100 |

Прывілеяваным саслоўем было дваранства. У канцы XVIII – пачатку XIX ст. толькі 5 – 6 % буйных і сярэдніх дваран валодалі зямлёй і прыгоннымі, абсалютная ж большасць саслоўя (95 %) уяўляла сабой дробную беззямельную шляхту, якая арандавала зямлю ў буйных землеўладальнікаў і апрацоўвала яе сваімі рукамі.

«Разбор шляхты» 30 – 40-х гг. XIX ст., які заключаўся ў пераводзе пэўнай яе часткі, што дакументальна не магла пацвердзіць свайго дваранскага паходжання, у дзве занава створаныя падатныя саслоўныя групы – аднадворцаў і грамадзян заходніх губерняў, быў прычынай скарачэння дваранства з 1816 па 1833 г. на 22,9 тыс. чалавек. Да канца 50-х гг. XIX ст. удзельная вага дваран Беларусі знізілася з 10 – 12 % да 5 – 6 %, але пры гэтым павялічыўся працэнт (з 5 – 6 да 14) сярэдніх і буйных дваран – землеўладальнікаў (табл. 2).

Табліца 2

**Дынаміка і ўдзельная вага дваранства Беларусі**

| Год | Колькасць, тыс. чалавек | % |
|---|---|---|
| 1796 | 137,5 | 5,2 |
| 1816 | 196,7 | 6,7 |
| 1833 | 173,8 | 6,2 |
| 1851 | 186,4 | 6,6 |
| 1858 | 196,7 | 5,8 |

Другім прывілеяваным саслоўем было духавенства. У апошнія гады існавання Рэчы Паспалітай яно складала прыкладна 1,0 % насельніцтва. Да скасавання уніі ў Беларусі самым шматлікім было уніяцкае духавенства, другое па колькасці месца займала каталіцкае. У канцы 50-х гг.

абсалютную большасць ужо складала праваслаўнае духавенства. У 1858 г. у пяці заходніх губернях пражывала 27 717 духоўных асоб і членаў іх сем'яў, з іх 21 721 – у сельскай мясцовасці і 5996 – у гарадах. Па канфесіях духавенства размяркоўвалася наступным чынам: праваслаўнае – 83,3 %, каталіцкае – 11,0, іудзейскае – 5,0, мусульманскае – 0,4, пратэстанцкае – 0,3 %. За паўстагоддзя ўдзельная вага духавенства ў складзе насельніцтва знізілася да 0,6 %.

Неаднародным па структуры было і саслоўе «гарадскіх абывацеляў». Колькасць мяшчан у канцы XVIII ст. складала 78,9 тыс. чалавек, ці 80 % усіх гараджан. Да 30-х гг. XIX ст. яна амаль падвоілася – 154,6 тыс., да 82,2 % узрасла іх удзельная вага. У канцы 50-х гг. XIX ст. мяшчан у беларускіх гарадах налічвалася 196,8 тыс., але іх доля знізілася да 75,2 %, што было выклікана павелічэннем удзельнай вагі іншых груп насельніцтва. У шэрагу гарадоў мяшчане перавышалі 90 %, а ў 13 гарадах (з 42) працэнт дадзенага саслоўя вагаўся ад 80 да 90.

У этнаканфесіянальных адносінах насельніцтва Беларусі было стракатым. На тэрыторыі ВКЛ у апошняй трэці XVIII ст. уніяты складалі прыблізна 39,0 % насельніцтва, каталікі – 38,0, праваслаўныя – 6,5, стараверы – 4,0, пратэстанты – 1,6 %. Амаль кожная з пералічаных канфесій уключала прадстаўнікоў розных этнічных груп: беларусаў, палякаў, украінцаў, немцаў, латышоў, рускіх. Што тычыцца іудзеяў і мусульман, то іх цалкам можна атаясамліваць адпаведна з яўрэямі і татарамі.

Пасля далучэння да Расійскай імперыі пануючай канфесіяй у краі стала праваслаўе. У 1858 – 1859 гг. 58,1 % насельніцтва пяці заходніх губерняў вызнавала праваслаўную веру, у тым ліку ў Магілёўскай – 71,9, Віцебскай – 72,8, Мінскай – 71,9, Віленскай – 21,5 %. Каталікі складалі 29,9 % і пражывалі пераважна ў Віленскай губерні, іудзеяў было 9,8, старавераў – 1,6, пратэстантаў – 0,4 і магаметан – 0,1 %.

Большасць беларусаў у канцы XVIII ст. належала да уніяцкай канфесіі, доля якой сярод вясковага насельніцтва даходзіла да 80 %. Пасля скасавання уніі сітуацыя змянілася. У 1840 г. на тэрыторыі пяці заходніх губерняў пражывала 2726,0 тыс. беларусаў, з іх 87,2 % былі праваслаўнымі і 12,8 % – каталікамі. У канцы 50-х гг. XIX ст., паводле няпоўных даных, у пяці заходніх губернях зафіксавана 2790,0 тыс. беларусаў, што складала 69,7 % усяго насельніцтва. З іх 2345,9 тыс. (84,1 %) спавядалі праваслаўную веру і 444,1 тыс. (15,9 %) каталіцкую. Па губернях удзельная вага

беларусаў была наступнай: Віленская – 46,9 %, Віцебская – 59,8, Гродзенская – 57,8, Мінская – 64,6, Магілёўская – 81,7 %.

Другой па колькасці этнічнай супольнасцю ў Беларусі ў дадзены перыяд былі яўрэі. У пяці заходніх губернях у канцы 50-х гг. іх пражывала 463,2 тыс. члавек. У гэты ж час палякаў налічвалася 442,3 тыс., рускіх – 141,6 тыс., татар – 6,2 тыс. чалавек.

## Пытанні і заданні для самакантролю

1. Вызначце асноўныя групы крыніц па гісторыі Беларусі першай паловы XIX ст.
2. Дайце характарыстыку стану навуковых даследаванняў па праблемах гісторыі Беларусі канца XVIII – пачатку XIX ст.
3. Прасачыце па карце тэрытарыяльна-адміністрацыйны падзел Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XIX ст.
4. Якія змены адбыліся ў фарміраванні і функцыяніраванні органаў улады і кіравання на далучаных землях?
5. Прааналізуйце асаблівасці сацыяльнага складу насельніцтва беларускіх губерняў у канцы XVIII – пачатку XIX ст.
6. Чым вызначалася сутнасць дэмаграфічнай сітуацыі на Беларусі ў першай палове XIX ст.?
7. Ахарактарызуйце палітыку ўрада ў адносінах да кожнай з асноўных канфесій на Беларусі.

# ЛЕКЦЫЯ 2
# Сацыяльна-эканамічнае развіццё на зыходзе прыгонніцтва

1. Развіццё сельскай гаспадаркі.
2. Прамысловая вытворчасць.
3. Формы арганізацыі гандлю.
4. Узрастанне ролі гарадоў і мястэчак.

## 1. Развіццё сельскай гаспадаркі

Асновай эканомікі Беларусі ў першай палове XIX ст. з’яўлялася сельская гаспадарка. Развіццё таварна-грашовых адносін абумовіла крызіс феадальна-прыгонніцкай сістэмы. Гэты працэс у першую чаргу закрануў памешчыцкую гаспадарку.

Памешчыцкае землеўладанне ў Беларусі ў першай палове XIX ст. было пераважна буйнапамесным. Усяго ў беларускіх губернях налічвалася каля 50 памешчыкаў, якім належала больш чым па 2 тыс. прыгонных сялян. Буйныя гаспадаркі, якія мелі 500 і больш рэвізскіх душ, у 1834 г. складалі 3,6 %, але на іх долю прыпадала каля 50 % усіх прыгонных сялян. Разам з тым у Беларусі было многа невялікіх маёнткаў, якія налічвалі менш 100 рэвізскіх душ. Яны складалі 73,2 %, але ім належала толькі 15,8 % прыгонных сялян. Сярэднія маёнткі, у якіх налічвалася ад 100 да 500 рэвізскіх душ, у 1834 г. складалі 17 % ад агульнай колькасці памешчыцкіх гаспадарак. На іх долю прыпадала 34,6 % прыгонных сялян.

У першыя два дзесяцігоддзі росту тварнасці памешчыцкіх гаспадарак спрыяў вялікі попыт на збожжа ў краінах Заходняй Еўропы. Да 40-х гадоў у многіх маёнтках гэтых губерняў пад збожжавымі культурамі ўжо было занята ад 30 да 50 % ворнай зямлі.

Уцягванне памешчыцкіх гаспадарак у таварна-грашовыя адносіны, прыстасаванне да патрэб рынку садзейнічалі спецыялізацыі сельска-гаспадарчай вытворчасці. Калі памешчыкі цэнтральных і заходніх рэгіёнаў Беларусі спецыялізавалі свае гаспадаркі на вырошчванні збожжавых культур, то ў Віцебскай, паўночных раёнах Віленскай, Мінскай і Магілёўскай губерняў шырокае распаўсюджанне атрымала ільнаводства. Паўднёвыя раёны Магілёўскай і ўсходнія раёны Мінскай губерняў спецыялізаваліся на вырошчванні канаплі. Важнае значэнне ў сельска-гаспадарчай вытворчасці мела хуткае павелічэнне пасеваў бульбы, ператварэнне яе з агароднай у палявую культуру і выкарыстанне як сыравіны для вінакурнай прамысловасці. Даход ад продажу гарэлкі і спірту складаў 50 – 60 %, а часам і больш ад усіх даходаў памешчыцкіх гаспадарак.

У параўнанні з паляводствам жывёлагадоўля, асабліва мяса-малочная, на працягу першай паловы XIX ст. у памешчыцкіх гаспадарках яшчэ не набыла таварнага характару і мела другараднае значэнне. Таварны характар у некаторых памешчыцкіх гаспадарках набыла толькі тонкарунная авечкагадоўля. Цясней за ўсё былі звязаны з рынкам буйныя і сярэднія памешчыцкія гаспадаркі.

З мэтай павышэння даходнасці сваіх маёнткаў памешчыкі наладжвалі ў іх перапрацоўку сыравіны, адкрывалі суконныя, палатняныя, смалакурныя, паташныя, шкляныя, жалезаапрцоўчыя і іншыя прадпрыемствы. Расшыралася і традыцыйная крыніца даходаў памешчыкаў – продаж лесу.

У пачатку 40-х гадоў памешчыкі паўднёвых паветаў Магілёўскай і Мінскай губерняў сталі сеяць цукровыя буракі і адкрываць цукраварныя заводы. Каб павялічыць даходнасць маёнткаў, многія памешчыкі спрабавалі выкарыстаць навейшыя рацыянальныя спосабы вядзення гаспадаркі. Яны больш шырока сталі выкарыстоўваць машыны, паляпшаць сістэму землекарыстання, прымяняць новыя агратэхнічныя прыёмы.

Развіццё вытворчых сіл у памешчыцкай гаспадарцы выклікала больш шырокае выкарыстанне наёмнай працы. Але новыя з'явы ў вядзенні гаспадаркі ў першай палове XIX ст. ахапілі толькі частку буйных і сярэдніх маёнткаў. Пераважная большасць памешчыкаў, асабліва дробных, прытрымлівалася традыцыйных спосабаў вядзення гаспадаркі, заснаваных на прымусовай працы прыгонных сялян.

У першым дзесяцігоддзі XIX ст. сялянства складала 93,5 % усяго насельніцтва Беларусі, у 30-х гадах – амаль 90 %. Пераважная маса сялянства належала памешчыкам – да 80 % у пачатку XIX ст. і каля 70 % у пачатку 40-х гадоў. Колькасць казённых (дзяржаўных) сялян, якія складалі 9,3 % насельніцтва ў пачатку стагоддзя, у 40-х гадах павялічылася да 19 % за кошт канфіскацыі маёнткаў удзельнікаў паўстання 1830 – 1831 гг. Памеры зямельных надзелаў памешчыцкіх сялян былі рознымі, ад 5 да 20 дзесяцін. У пачатку XIX ст. асноўная маса сялян карысталася надзелам у 1/4 валокі (5 дзесяцін) цяглай зямлі і столькі ж прыёмнай. За цяглы ўчастак сяляне адбывалі паншчыну, за прыёмны – плацілі чынш. На працягу першай трэці XIX ст. прыёмныя землі былі пераведзены памешчыкамі ў цяглыя і асноўнай павіннасцю памешчыцкіх сялян стала паншчына. У сярэдзіне XIX ст. яе выконвалі ўжо 97 % памешчыцкіх сялян. Перавод памешчыцкіх сялян на паншчыну суправаджаўся яе павелічэннем.

Акрамя паншчыны, цяглыя сяляне адбывалі згоны (гвалты, талокі) у час жніва і сенакосу, удзельнічалі ў будаўніцтве гаспадарчых пабудоў у панскім двары, рамонце дарог, грэбляў, мастоў, прадстаўлялі падводы для перавозкі грузаў, нарыхтоўвалі дровы, чысцілі скацінныя двары, даглядалі памешчыцкую жывёлу і птушку, неслі начную варту. Захоўваўся і натуральны аброк (даніна). Сяляне давалі памешчыку птушку, яйкі, мёд, грыбы, ягады і іншыя прадукты сваёй гаспадаркі. Цяжкім ярмом на плечы сялян лажыліся таксама шматлікія дзяржаўныя павіннасці – падушны падатак, земскі збор, перавозка ваенных грузаў, кватэрная павіннасць і г. д.

Не лепшым было становішча і аброчных сялян. Яны, акрамя аброку, які складаў у сярэднім 20 – 80 рублёў у год (карова каштавала 12 – 18 руб.),

нароўні з цяглымі сялянамі плацілі даніну, выконвалі шматлікія дадатковыя і дзяржаўныя павіннасці.

Што датычыць дзяржаўных сялян, то іх становішча таксама было незайздросным. Казённыя маёнткі, як правіла, здаваліся ў арэнду чыноўнікам і збяднелым дваранам, а арандатары імкнуліся за час арэнды выціснуць з сялян усё, што можна, і бессаромна павялічвалі павіннасці.

Не маючы магчымасці пракарміць свае сем'і з надзелаў, выплаціць у час шматлікія чыншы і падаткі, многія сяляне вымушаны былі шукаць пабочныя заробкі. Вялікая колькасць сялян ішла на адыходныя промыслы – сплаўныя работы і дарожнае будаўніцтва. У 30-х гадах XIX ст. толькі на сплаўных работах у Беларусі было занята каля 60 тыс. чалавек, у пераважнай большасці памешчыцкіх сялян. Аброчныя сяляне наймаліся на будаўнічыя работы. Многія памешчыкі самі аддавалі сваіх прыгонных сялян па кантрактах на будаўнічыя і дарожныя работы, часта ў далёкія губерні Расіі. Плату за іх працу яны забіралі сабе.

Рост паншчыны, масавае абеззямельванне сялянства, частыя неўраджаі, свавол памешчыкаў вялі да заняпаду сялянскай гаспадаркі, яшчэ большага абядненне сялянскіх мас.

## 2. Прамысловая вытворчасць

У першай чвэрці XIX ст. прамысловасць праходзіла першыя дзве стадыі – дробнатаварную вытворчасць і мануфактуру. З канца 20-х гадоў пачалі ўжо з'яўляцца і фабрыкі.

Нягледзячы на тое, што дробнатаварная вытворчасць скарачалася (памяншалася колькасць прадпрыемстваў), для яе развіцця ў Беларусі на ўсім працягу першай паловы XIX ст. яшчэ захоўваліся спрыяльныя ўмовы, асабліва ў гарадах і мястэчках. Гэта было звязана з тым, што большасць буйных прадпрыемстваў – мануфактур было сканцэнтравана ў сельскай мясцовасці, а сельскае рамяство было развіта слаба. З'яўленне мануфактурнай вытворчасці і пашырэнне гандлёвых сувязей прывялі да заняпаду цэхавай арганізацыі рамяства. У майстэрнях рамеснікаў стала шырока выкарыстоўвацца наёмная праца.

Што датычыцца мануфактурнай вытворчасці, то за першую палову XIX ст. яе ўдзельная вага ва ўсёй прамысловасці падвоілася. У 1860 г. у ёй ужо было занята 1/4 частка ўсіх рабочых. Мануфактуры ў гэты час ужо давалі 14,8 % усёй прамысловай прадукцыі. Але гэта былі ў асноўным дробныя прадпрыемствы, на кожным з якіх працавала ў сярэднім каля 30 чалавек. Як

правіла, яны належалі памешчыкам і на іх працавалі ў асноўным прыгонныя сяляне.

Фабрычна-заводская вытворчасць у Беларусі ўзнікла на 20 гадоў пазней, чым у Расіі, у канцы 20-х гадоў XIX ст. Першым прадпрыемствам фабрычна-заводскага тыпу былі суконныя фабрыкі ў мястэчках Хомск Кобрынскага і Косава Слонімскага ўездаў. Яны належалі буйнаму памешчыку і прамыслоўцу графу Пуслоўскаму. У 1860 г. колькасць прадпрыемстваў фабрычна-заводскага тыпу дасягнула 30, а колькасць рабочых на іх – 2882 чалавек. На 18 фабрыках працавалі прыгонныя сяляне, паколькі яны належалі памешчыкам. На 12 фабрыках працавалі наёмныя рабочыя, і яны належалі купцам. Характэрным паказчыкам развіцця капіталістычных адносін у прамысловасці наогул у гэты час было паступовае пашырэнне выкарыстання вольнанаёмнай працы. У 1860 г. каля 45 % усіх прадпрыемстваў (1641) дзейнічала ўжо на аснове вольнага найму. На іх было занята 6,1 тыс. чалавек з 17 тыс. рабочых, што складала 36 % ад іх агульнай колькасці.

Прамысловасць Беларусі ў першай палове XIX ст. спецыялізавалася ў асноўным на перапрацоўцы сельскагаспадарчай прадукцыі. Вядучай яе галіной першапачаткова была суконная. З пашырэннем паравых машын і будаўніцтвам чыгуначных дарог хуткімі тэмпамі пачалі развівацца металаапрацоўчая і дрэваапрацоўчая галіны вытворчасці, асабліва вытворчасць шпал. З ростам гарадоў і гарадскога насельніцтва адкрываліся і пашыралі аб’ём вытворчасці сыраварныя, маслабойныя, мылаварныя, свечныя, цагляныя і іншыя прадпрыемствы.

Найбольш развітай у прамысловых адносінах была Гродзенская губерня. Другое месца па ўзроўню прамысловай вытворчасці займала Магілёўская, трэцяе месца – Мінская губерня. Найменш развітай у прамысловых адносінах у гэты час была Віцебская губерня.

### 3. Формы арганізацыі гандлю

Ва ўнутраным гандлі першапачаткова важную ролю адыгрывалі кірмашы. Яны штотыднёва праводзіліся ва ўсіх гарадах і мястэчках. У канцы 50-х гадоў у Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай і Гродзенскай губернях дзейнічала каля 270 кірмашоў. Пераважная большасць з іх былі аднадзённымі і толькі асобныя працягваліся тыдзень і болей. Гандлёвы абарот больш за 100 тыс. рублёў мелі кірмашы: Бешанковіцкі ў Віцебскай, Зэльвенскі ў Гродзенскай, Любавіцкі ў Магілёўскай губернях, кантрактавы

ў Мінску і Троіцкі ў Гомелі. На некаторыя з іх у асобныя гады прывозілася тавараў, у тым ліку з-за межаў Беларусі, на 1,5 – 2 млн рублёў. Але па велічыні гандлёвых абаротаў беларускія кірмашы, нават самыя буйныя, у шмат разоў уступалі расійскім і ўкраінскім (Ніжнегародскаму, Харкаўскаму, Кіеўскаму і інш.). Гэта было звязана з адносна невялікімі капіталамі мясцовых купцоў.

Кірмашовы гандаль паступова стаў выцясняцца пастаянным, лавачна-магазінным. З 1825 г. па 1860 г. колькасць лавак у гарадах Беларусі павялічылася з 1,3 тыс. да 4,7 тыс. У Мінску гадавы абарот лавачнага гандлю за 1800 – 1858 г. вырас больш чым у 8 разоў. Абароты кірмашоў у 50 – 60-я гады рэзка скараціліся і многія з іх ператварыліся ў звычайныя рынкі лакальнага значэння.

Пашырэнню гандлёвай дзейнасці садзейнічалі ўказы сената аб дазволе займацца гандлем мяшчанам, удзельным і казённым сялянам, а таксама адпушчаным на волю былым прыгонным. Апошнія маглі запісвацца ў саслоўі рамеснікаў, мяшчан, купцоў. Устанаўліваліся чатыры віды пасведчанняў, якія давалі права сялянам на гандаль з аплатай ад 60 да 2600 руб. (у залежнасці ад разраду). Акрамя таго, сяляне-гандляры павінны былі плаціць гарадскі падатак (акцызы) па 10 % у год ад цаны пасведчання. За гандаль без пасведчання прызначаліся вялікія штрафы. На Беларусі колькасць сялян-гандляроў была невялікай (у 20 – 30-я гады XIX ст. было зарэгістравана толькі 15 – 20 чалавек).

Гандлёвай дзейнасцю ў асноўным займаліся купцы. Па велічыні аб'яўленых капіталаў яны дзяліліся на тры гільдыі. Самыя багатыя адносіліся да першай і другой гільдый. Але такіх было нямнога: у канцы XVIII ст. – 8, у 1839 г. – 346. Купцы набывалі на кірмашах і рынках, у памешчыцкіх маёнтках сельскагаспадарчую і прамысловую прадукцыю, перапрадавалі яе, займаліся гандлем лесу іляснымі матэрыяламі. Некаторыя з багатых купцоў засноўвалі свае ці арандавалі памешчыцкія прамысловыя прадпрыемствы, заключалі падрады на будаўніцтва дарог і каналаў, дагаворы на пастаўку войску прадуктаў, фуражу і інш. Гандлёвыя абароты пераважнай большасці купцоў Беларусі былі нязначнымі (не перавышалі 1 тыс. рублёў).

Знешні гандаль у Беларусі ажыццяўляўся ў асноўным па рачных сістэмах. З Беларусі ў Расію, Украіну, Польшчу, Прыбалтыку і краіны Заходняй Еўропы вывозіліся гарэлка, спірт, хлеб, лён, пянька, ільняное і канаплянае семя, алей, сала, лес і лесаматэрыялы, смала, дзёгаць, сукно, парусіна, канаты і інш. тавары. Беларускія тавары траплялі ў

Вялікабрытанію, Аўстрыю, Прусію, Францыю, Італію, Турцыю, Персію, Кітай і нават краіны Лацінскай Амерыкі. У Беларусь увозіліся соль, металы, цукар, тканіна, фарфоравы і фаянсавы посуд, тытунь, рыба, чай, кава, сельскагаспадарчая і прамысловая тэхніка, абсталяванне.

Аб'ёмы знешняга гандлю з года ў год узрасталі. Калі ў 1844 г. па рэках Беларусі было перавезена грузаў на 8,8 млн руб., то ў 1860 г. – на 18 млн руб. больш. Галоўнымі гандлёвымі партамі для Беларусі былі Рыга і Данцыг. Праз Беларусь ішлі таксама транзітныя грузы з Заходняй Еўропы ў Расію і наадварот. Найбольшая колькасць прадукцыі сельскай гаспадаркі за граніцу вывозілася з Гродзенскай і Віленскай губерняў, якія былі цесна звязаны воднымі шляхамі з Балтыйскім пабярэжжам.

У 30 – 40 гады XIX ст. адбылося перамяшчэнне знешнегандлёвых сувязей Беларусі з захаду на ўсход. Калі ў пачатку XIX ст. на ярмаркі ў Беларусь прыязджалі ў асноўным купцы з Варшавы, Данцыга і іншых заходніх гарадоў, то ў 40-я гады іх выцеснілі купцы з Масквы, Казані, Тулы, Смаленска і іншых гарадоў Расіі.

## 4. Узрастанне ролі гарадоў і мястэчак

З развіццём прамысловасці і гандлю быў цесна звязаны рост гарадоў Беларусі. З 1825 па 1861 г. насельніцтва 42 беларускіх гарадоў павялічылася са 150 да 316 тыс. чалавек. У сярэдзіне XIX ст. у Магілёве ўжо пражывала 31 062 чалавекі, Віцебску – 30 654, Мінску – 26 760, Брэсце – 20 943, Гродне – 20 241 чалавек. Асабліва высокімі тэмпамі расло гарадское насельніцтва ў Віцебскай губерні. Адной з асноўных прычын хуткага росту гарадскога насельніцтва ў Беларусі ў гэты перыяд было ўвядзенне тут мяжы аседласці яўрэйскага насельніцтва, згодна з якой яўрэям забаранялася пражыванне ў вёсцы і валоданне зямлёй. У сувязі з гэтым яўрэі прымусова перасяляліся з вёсак у мястэчкі і гарады. Гэта прывяло да значных перамен у нацыянальным складзе гарадскога насельніцтва. У сярэдзіне XIX ст. яўрэі складалі ўжо каля 70 % рамесна-гандлёвай часткі гараджан, а выхадцы з сялян – толькі 2,5 – 3 %. Значнай праслойкай у гарадах Беларусі было рускае чыноўніцтва, з якога царызм камплектаваў тут адміністрацыйны апарат.

Прамысловасць у гарадах Беларусі была развіта слаба. У канцы XVIII ст. у іх налічваліся толькі 73 прамысловыя прадпрыемствы, у 30-я гады XIX ст. – 170, у 50-я – 272. Большасць з іх адносілася да тыпу простай

кааперацыі, невялікая колькасць – да тыпу мануфактур. Першыя фабрыкі тут з’явіліся толькі ў сярэдзіне XIX ст.

Амаль усе прамысловыя прадпрыемствы ў 30 – 50-я гады ў гарадах Беларусі ўжо належалі мяшчанам і купцам. Але мяшчанска-купецкая прамысловасць аказалася нянздольнай да канкурэнцыі з вотчыннай прамысловасцю. Яе ў літаральным сэнсе душыла феадальна-прыгонніцкая сістэма.

Гарадское насельніцтва ў Беларусі ў першай палове XIX ст. падзялялася на характэрныя для феадальнага грамадства саслоўі (табл. 3).

Табліца 3

**Сацыяльная структура гарадскога насельніцтва беларуска-літоўскіх губерняў**

| Год | Дваране, % | Духавенства, % | Мяшчане, % | Вайскоўцы, % | Сяляне, % | Разначынцы, % | Усяго, тыс. чалавек |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1808 | 7,6(5,1) | 1,5(2,4) | 82,1 (49,6) | 1,4 (7,8) | 5,4 (27,9) | 2,0 (7,1) | 191,7 |
| 1858 | 5,9 (5,2) | 1,3(1,6) | 74,5 (54,7) | 12,3 (14,1) | 2,5 (20,2) | 3,5 (4,2) | 495,8 |

Асноўнымі з іх з’яўляліся дваране, духавенства, купцы, мяшчане і сяляне. Як асноўныя саслоўныя групы ўлічваліся чыноўнікі, ваенныя і «ганаровыя грамадзяне». Прывілеяванымі саслоўямі з’яўляліся дваране і духавенства. З іх прадстаўнікоў складалася царская бюракратыя. Дваране сярод гараджан Беларусі ў канцы XVIII ст. складалі каля 3,3 %. У канцы 30-х гадоў XIX ст. у сувязі з «разборам» шляхты іх удзельная вага панізілася да 1,1 %, але да канца 50-х гадоў зноў вырасла да 4,6 %. Духавенства ў пачатку 60-х гадоў складала каля 1 %, купцы – каля 2 %, чыноўнікі і ваенныя адпаведна – 5,2 і 8,4 % гараджан.

Самай шматлікай катэгорыяй гарадскога насельніцтва з’яўляліся мяшчане. У канцы XVIII ст. яны складалі 80 %, а ў 50-я гады XIX ст. – 75 % гараджан. Да мяшчан адносіліся рамеснікі, дробныя гандляры, чорнарабочыя, хатняя прыслуга, людзі, якія займаліся возніцтвам, агародніцтвам і г. д. Многія мяшчане жылі за кошт выпадковых заробкаў, з’яўляліся жабракамі і паўжабракамі, не мелі ўласнага жылля. Большасць дамоў мяшчан ацэньвалася невысока і адносілася да разраду «халупных».

Гарадское насельніцтва плаціла розныя дзяржаўныя і мясцовыя (земскія) падаткі і выконвала шматлікія натуральныя павіннасці. Галоўным з дзяржаўных падаткаў у горадзе, як і ў вёсцы, быў падушны збор. Але

стаўка яго ў гарадах удвая перавышала сельскую. Мяшчане-яўрэі плацілі падатак у 2 разы большы, чым хрысціяне, земскі падатак прызначаўся на ўтрыманне гарадскога магістрата, паліцыі, турмаў, паштовай службы, навучальных і медыцынскіх устаноў і іншыя мэты. З мяшчан-яўрэяў дадаткова спаганяліся зборы на карысць яўрэйскай абшчыны (кагала) і на ўтрыманне яўрэйскіх школ.

Усе будаўнічыя работы грамадскага прызначэння ў гарадах жыхары выконвалі самі або плацілі спецыяльны падатак. Купцы ў залежнасці ад гільдыі і статуса горада (губернскі або ўездны) уносілі ў казну ад 1,5 да 4 % з сумы аб'яўленага капіталу. Усе плацілі таксама дарожны падатак.

Гараджане пастаўлялі таксама ў войска рэкрутаў. Ад кожных 250, а з 1820 г. – ад 125 жыхароў мужчынскага полу яны павінны былі выдзяляць аднаго рэкрута, абмундзіраваць яго па ўстаноўленай форме і забяспечыць харчаваннем. Кожны рэкрут абыходзіўся гарадам каля 100 рублёў. Рэкруцкія зборы з гараджан узраслі з 1798 па 1835 г. з 72 кап. да 5 руб. У тых гарадах і мястэчках, дзе размяшчаліся вайсковыя гарнізоны, іх жыхары павінны былі забяспечыць вайскоўцаў кватэрамі, а салдат – харчаваннем. Ад вайсковага пастою гараджане маглі адкупіцца спецыяльнымі грашовымі зборамі.

Усяго ў 30 – 50-я гады XIX ст. гараджане Беларусі плацілі падаткі і выконвалі павіннасці да 40 розных відаў. Грашовыя зборы з гараджан вагаліся ад 15 да 25 руб. на душу і з'яўляліся непасільнымі для большасці жыхароў. У сувязі з гэтым няспынна раслі нядоімкі, а даходы гарадоў былі мізэрнымі. У 30-я гады XIX ст. у Мінску яны складалі 68 тыс. руб., Віцебску – 47 тыс., Магілёве – 33 тыс., Гродне – 30 тыс., Полацку – 19 тыс., Брэсце – 4 тыс., Бабруйску і Пінску – каля 2 тыс. Аб беднасці беларускіх гарадоў сведчыць і тое, што цагляных будынкаў у іх у пачатку XIX ст. было ўсяго 2 %, у 50-х гадах – 5,5 %.

Развіццё таварна-грашовых адносін у першай палове XIX ст. садзейнічала росту мястэчак, іх колькасць за гэты час узрасла з 290 да 400. Гэта было звязана з правам дваран-памешчыкаў устанаўліваць у сваіх уладаннях кірмашы і рынкі. Тыя пасяленні, дзе яны адкрываліся, з дазволу губернатараў пераводзіліся ў разрад мястэчак. Да іх ліку адносіліся Гомель, Горкі, Шклоў, Смаргонь, Зэльва, Свіслач і многія інш. Некторыя мястэчкі па колькасці жыхароў і ўзроўню развіцця прамысловасці і гандлю не ўступалі сярэднім гарадам, а часам пераўзыходзілі іх. У шэрагу мястэчак дзейнічалі вотчынныя прамысловыя прадпрыемствы і буйныя кірмашы. Аднак асноўная колькасць мястэчак адносілася да невялікіх

пасяленняў сельскага тыпу, большасць насельніцтва якіх складалі прыгонныя сяляне.

Што датычыць этнічнага і канфесійнага складу насельніцтва і градоў і мястэчак Беларусі ў першай палове XIX ст., то яно было шматэтнічным і шматканфесійным. Статыстычных звестак аб яго этнічным складзе ў гэты перыяд у гістарычных крыніцах няма. Сустракаюцца толькі няпоўныя даныя за асобныя гады і па асобных губернях аб колькасці гараджан пэўных канфесій – праваслаўных, уніятаў, католікаў, іудзеяў, лютэран, пратэстантаў, мусульман і інш. Па веравызнанню ў асобных выпадках можна ўстанавіць і нацыянальнасць. У канцы XVIII – пачатку XIX ст. у Мінскай губерні ў гарадах іудзеі складалі 50,5 %, праваслаўныя – 38,4 %, уніяты – 5,4 %, католікі – 4,8 %. У 20-я гады сярод гараджан той жа Мінскай губерні уніяты складалі 29,5 %, католікі – 17,1 %, іудзеі – 52,3 %. У 40 – 50-я гады сярод мяшчан і купцоў Віцебскай і Магілёўскай губерняў яўрэі складалі каля 60 %, у Мінскай губерні – амаль 70 %. Уніяты на Беларусі, як правіла, былі беларусамі, іудзеі – яўрэямі, лютэране і пратэстанты – немцамі, мусульмане – татарамі. Што датычыць праваслаўных і католікаў, то сярод іх былі беларусы, рускія і палякі.

Падводзячы вынікі вышэйсказанаму, патрэбна адзначыць, што эканамічнае развіццё Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. вызначалася ўзаемадзеяннем дзвюх з’яў: з аднаго боку, завяршаўся працэс разлажэння феадальна-прыгонніцкага ладу як у горадзе, так і ў вёсцы, з другога боку – складваліся перадумовы для зацвярджэння капіталістычнага спосабу вытворчасці ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы.

### Пытанні і заданні для самакантролю

1. Дайце характарыстыку феадальнага землеўладання ў Беларусі ў першай палове XIX ст.

2. Што спрыяла росту таварнасці памешчыцкай гаспадаркі? Прывядзіце канкрэтныя прыклады.

3. Назавіце асноўныя групы сялян і дайце характарыстыку іх становішча.

4. Які ўплыў аказвала ўзмацненне феадальна-прыгонніцкай эксплуатацыі на развіццё сялянскай гаспадаркі?

5. Растлумачце прычыны і мэты рэформы П. Кісялёва. Пакажыце яе сутнасць у дзяржаўных маёнтках.

6. Як праводзілася рэформа П. Кісялёва ў памешчыцкіх маёнтках? Ахарактарызуйце яе вынікі.

7. Раскажыце, якія змены адбыліся ў прамысловасці Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. Дайце характарыстыку дробнатаварнай вытворчасці Беларусі ў першай палове XIX ст.

8. Якія змены адбыліся ў развіцці ўнутранага і знешняга гандлю ў першай палове XIX ст.?

9. Дайце характарыстыку саслоўнага і этнаканфесійнага складу гарадскога насельніцтва ў Беларусі ў першай палове XIX ст.

10. Назавіце асноўныя віды падаткаў і павіннасцей гараджан у гэты перыяд.

## ЛЕКЦЫЯ 3
## Вайна 1812 г. і Беларусь

1. Прычыны і пачатак франка-рускай вайны 1812 г.
2. Становішча Беларусі ў час вайны.
3. Разгром напалеонаўскіх войск. Вынікі вайны для Беларусі.

### 1. Прычыны і пачатак франка-рускай вайны 1812 г.

Галоўнымі прычынамі вайны 1812 г. былі канфлікты паміж Францыяй і Расіяй з-за кантынентальнай блакады Англіі і сутыкненне прэтэнзій Напалеона на сусветнае панаванне з імкненнямі царызму да еўрапейскай гегемоніі. З прычыны разрыву традыцыйных сувязей з Англіяй знешні гандаль Расіі за 1808 – 1812 гг. скараціўся на 43 %. Блакада разладзіла фінансавую сістэму. Ужо з 1809 г. бюджэтны дэфіцыт узрос у параўнанні з 1801 г. з 12,2 млн да 157,5 млн руб., амаль у 13 разоў. Царскі ўрад нават патураў кантрабанднаму гандлю з Англіяй, а 31 снежня 1810 г. прыняў забароны на тава-ры, «увазныя па сушы», што ўдарыла галоўным чынам па французскім гандлі. Напалеон расцаніў гэта як парушэнне ўмоў Тыльзіцкага дагавора 1807 г.

Акрамя таго, згодна з гэтым дагаворам, Напалеон стварыў з польскіх зямель, якія належалі Прусіі, Вялікае герцагства Варшаўскае – у якасці свайго плацдарма на выпадак вайны з Расіяй. Ён пагражаў Аляксандру I, што гатовы аднавіць Польшчу ў межах 1772 г. Такія пагрозы абвастрылі расійска-французскія адносіны, тым больш што і царызм жадаў далучыць

да Расіі не толькі Варшаўскае герцагства, але і ўсе землі былой Рэчы Паспалітай.

Аляксандр I выказваў намеры «даць канстытуцыю і асобнае палажэнне Польскаму каралеўству, далучыўшы гэты тытул да кароны Расіі». Імператар лічыў неабходным пачаць выкананне гэтага праекта з правінцый, якія належаць Расіі, «прыняўшы тытул Вялікага герцага Літоўскага». Каб аслабіць саюзніцу Напалеона Аўстрыйскую імперыю, Аляксандр I прапанаваў ідэю «ўсталявання славянскага царства» для народаў Балкан. Сутыкнуліся расійска-французскія інтарэсы і на Блізкім Усходзе. Царызм імкнуўся да захопу Канстанцінопаля, а Напалеон жадаў зберагчы Турцыю ў процівагу Расіі.

12 чэрвеня 1812 г. 600-тысячная армія Напалеона перапраўлілася ў раёне Коўна ў межы Расійскай імперыі – на землі Беларусі і Літвы. 16 чэрвеня была занята Вільня. 1-я руская армія (127 тыс.) генерала Баркалая дэ Толі (штаб у Вільні) і 2-я руская армія (45 тыс.) генерала П. Баграціёна (штаб у Ваўкавыску) адступалі ад заходніх граніц з мэтай злучэння. Адступалі з баямі (буйнейшыя – пад Кобрынам, Мірам, Салтанаўкай, Полацкам). Французы занялі Магілёў і падрыхтавалі пазіцыі для сустрэчы рускіх ля вёскі Салтанаўка ў 11 км ад Магілёва. Тут адбыліся жорсткія баі. Корпусу генерала М. Раеўскага ўдалося на суткі скаваць значныя сілы французаў, што дазволіла Баграціёну з асноўнымі сіламі пераправіцца праз Днепр.

Каля мястэчка Клясціцы генерал Я. Кульнёў атрымаў перамогу над войскамі маршала Удзіно, які, страціўшы амаль увесь абоз і 900 палонных, быў вымушаны адступіць да Полацка. 12-тысячны атрад Кульнёва праследаваў яго, і ў баі каля вёскі Сівошына генерал загінуў. Злучыліся дзве арміі толькі 2 жніўня ў Смаленску.

## 2. Становішча Беларусі ў час вайны

Яшчэ задоўга да нападу Напалеона на Расію насельніцтва Беларусі было ўцягнута ў вадаварот вайны. Буйныя магнаты і спаланізаваная шляхта з энтузіязмам сустрэлі абяцанні Напалеона адрадзіць Рэч Паспалітую і яе састаўную частку – Вялікае княства Літоўскае. Яны кідалі свае маёнткі і ад'язджалі ў Прусію, Саксонію і герцагства Варшаўскае, каб уступіць у войска Напалеона і прыняць удзел у вайне з Расіяй. Дамінік Радзівіл за свой кошт арганізаваў 8-ы уланскі полк, які пасля ў авангардзе напалеонаўскіх войск першым увайшоў у Вільню. З палякаў і, часткова, з

беларусаў былі сфарміраваны дывізіі генералаў Дамброўскага, Княжэвіча, Камінскага, Заёнчака, якія ўваходзілі ў 5-ы корпус генерала Ю. Панятоўскага і налічвалі 36 400 чалавек. Усяго на тэрыторыі Беларусі на службу да Напалеона падчас вайны перайшло каля 50 000 чалавек. Гэта былі ў асноўным буйныя польскія памешчыкі, прадстаўнікі польскай інтэлігенцыі, каталіцкага духавенства і спаланізаванай беларускай шляхты, якія марылі аб адраджэнні Рэчы Паспалітай у граніцах 1772 г.

Аднак Напалеон не спяшаўся выконваць свае абяцанні. Негледзячы на тое, што 1 ліпеня 1812 г. па ўказу Напалеона ў Вільні быў створаны Часовы ўрад Вялікага княства Літоўскага, праз два тыдні пасля абвяшчэння ВКЛ на яго тэрыторыі была праведзена тэрытарыяльна-адміністрацыйная рэформа па ўзору Францыі. Губерні былі пераіменаваны ў дэпартаменты, уезды – у падпрэфектуры, воласці ў кантоны. На чале іх былі пастаўлены французскія інтэнданты, кола абавязкаў якіх разам з мясцовай адміністрацыяй зводзілася да аднаго – забеспячэнне французскай арміі. Калі члены магілёўскай дэпартаменцкай камісіі звярнуліся да маршала Даву з пытаннем, у чым павінны заключацца іх абавязкі, ён адказаў ім: «Панове, Напалеон патрабуе ад вас трох рэчаў: хлеба, хлеба і хлеба».

Для забеспячэння французскай арміі правіянтам і фуражом насельніцтва Беларусі было абкладзена ўсялякімі паборамі. За несвоечасовае выкананне паставак акупацыйныя ўлады падвяргалі насельніцтва карным экзекуцыям. Але, нягледзячы на жорсткія рэпрэсіі, сяляне адмаўляліся выконваць распараджэнні акупацыйных улад. Яны хавалі правіянт і фураж, а самі цэлымі вёскамі ўцякалі ў лес і вялі ўзброеную барацьбу з акупантамі.

З першых дзён акупацыі партызанская барацьба ў Беларусі набыла даволі шырокі размах. Першыя партызанскія атрады пачалі дзейнічаць на яе тэрыторыі ўжо ў ліпені 1812 года. Сяляне вёскі Трасцянкі Ігуменскага павета Мінскай губерні стварылі атрад, у які ўваходзіла ўсё дарослае насельніцтва вёскі. На чале яго стаяў селянін Тарас. Атрад нападаў на французскіх салдат і мясцовых памешчыкаў, якія актыўна супрацоўнічалі з акупантамі. У гэты ж час арганізавалі партызанскія атрады сяляне вёсак Стараселле, Мажаны, Кляўкі Барысаўскага ўезда і іншых населеных пунктаў Беларусі.

Асабліва шырокі размах партызанскі рух набыў у Віцебскай губерні. Аб тым, наколькі пагражальны характар ён меў на Віцебшчыне, сведчыць той факт, што Напалеон, незадоўга да падыходу сваёй арміі да Бара-

дзінскага поля, вымушаны быў выдзеліць з сваіх галоўных сіл атрад у 10 тыс. салдат і адправіць яго на падмацаванне віцебскага гарнізона, хаця тут ужо знаходзілася 12-тысячнае французскае войска. Напалеонаўскі інтэндант Віцебска маркіз дэ Пастарэ адзначаў у сваім дзённіку, што яму з вялікімі цяжкасцямі ўдавалася забяспечваць харчаваннем гарнізон горада, «з якога выйсці было немагчыма, не рызыкуючы трапіць у рукі партызан».

Масавае супраціўленне несельніцтва Беларусі акупантам прывяло да правалу рэквізіцыйнай сістэмы забеспячэння напалеонаўскай арміі. Фуражыры, рыскаўшыя па вёсках у пошуках правіянту і фуражу, у большасці выпадкаў вярталіся з пустымі рукамі або наогул не вярталіся. Усё гэта дрэнна ўплывала на баяздольнасць французскіх войск. Падала дысцыпліна, салдаты самавольна адлучаліся ад часцей, распаўсюджвалася марадзёрства, армія несла вялікія страты. Да пачатку жніўня, за 6 тыдняў вайны, армія Напалеона страціла больш 150 тыс. чалавек. Вялікімі былі і страты коней. З 22 тыс. за гэты час загінула больш як 8 тыс. Напалеон гаварыў у Віцебску, што асабовы склад і стан яго арміі такі, якім мог быць пасля генеральнага бою.

### 3. Разгром напалеонаўскіх войск. Вынікі вайны для Беларусі

Заняўшы Маскву і не дачакаўшыся адказу на прапановы аб міры, Напалеон у пачатку кастрычніка вымушаны быў аддаць загад аб адступленні з Масквы. У гэты час у баявыя дзеянні ўключыліся і расійскія войскі, якія знаходзіліся ў Беларусі. Корпус Вітгенштэйна, папоўнены рэзервамі і пецярбургскім апалчэннем, 6 – 8 (18 – 20) кастрычніка авалодаў Полацкам і развіў наступленне ў напрамку Ушачы – Лепель – Чашнікі. Каля Чашнікаў адбыўся бой. У гэтым баі удзельнічаў таксама корпус маршала Віктора, які прыбыў на дапамогу Сен-Сіру з-пад Смаленска. Перамогу атрымалі расійскія войскі.

Дунайская армія пад камандаваннем адмірала П.В. Чычагава, аб’яднаўшыся з 3-й арміяй генерала А.П. Тормасава, пачала актыўныя ваенныя дзеянні супраць Шванцэнберга і прымусіла яго адысці за Паўднёвы Буг, у Польшчу. 8 (20) кастрычніка Чычагаў заняў Слонім і атрымаў распараджэнне рухацца на Мінск, каб заняць рубеж ракі Бярэзіны. На шляху да Мінска Чычагаў сутыкнуўся з непрыяцельскім атрадам, якім камандаваў генерал А. Касецкі. 15 лістапада ў хуткацечным баі каля мястэчка Койданава супраціўленне непрыяцеля было зломлена.

Тым часам Напалеон прадаўжаў адступленне на захад, несучы вялікія страты. Прыбыўшы ў Барысаў і пераканаўшыся, што ў раёне горада пераправа цераз Бярэзіну немагчыма (у руках расійскай арміі знаходзіліся перадмоставыя ўмацаванні са значнай колькасцю артылерыі), Напалеон аддаў загад рыхтаваць пераправу каля вёскі Студзёнкі, у 15 км на поўнач ад Барысава.

Увесь дзень, 26 лістапада, французскія войскі перапраўляліся цераз Бярэзіну. Пераправа прадаўжалася да 10 гадзін раніцы 28 лістапада, да таго часу, калі па загаду Напалеона былі спалены масты. Застаўшыся на левым беразе Бярэзіны, французы імкнуліся прарвацца праз агонь палаючых мастоў. Некаторыя прадпрымалі спробу перайсці раку па лёдаваму насцілу, які скапіўся каля маставых канструкцый. Але льдзіны распаўзаліся, і людзі гінулі ў бурлівых патоках Бярэзіны. З 30 тыс. салдат напалеонаўскай арміі, якія знаходзіліся пад ружжом,募 пераадолець пераправу змаглі толькі каля 9 тыс. чалавек. Усяго Напалеон страціў на Бярэзіне больш за 50 тыс. чалавек. Галоўнае значэнне бітвы пры Студзёнцы заключалася ў тым, што на Бярэзіне напалеонаўская армія спыніла сваё існаванне як арганізаваная ваенная сіла.

3 снежня 1812 г. толькі каля 1600 салдат некалі грознай напалеонаўскай арміі перайшлі цераз Нёман ва Усходнюю Прусію. Разам з аўстрыйскімі і прускімі войскамі, дзейнічаючымі на тэрыторыі Польшчы і Літвы, яны налічвалі каля 50 тыс. чалавек. З больш чым 600-тысячнай арміі 550 тыс. чалавек загінулі або былі ўзяты ў палон. Так бясслаўна закончыўся паход Напалеона ў Расію.

Вайна 1812 г. прынесла беларускаму народу вялікія беды. У раёнах баявых дзеянняў многія гарады і вёскі былі моцна разбураны, а некаторыя ўвогуле знішчаны. Асабліва пацярпелі Орша, Дуброўна, Барысаў, Мінск. У грашовым вылічэнні агульныя страты Беларусі ад вайны, па далёка няпоўных звестках, склалі 51,8 млн рублёў серабром, вельмі значнай для таго часу сумы. Асабліва вялікія страты панесла насельніцтва Беларусі. Многа яе жыхароў загінула ад рук акупантаў. Толькі ў Гродзенскай губерні было забіта 4 тыс. мірных грамадзян. Многа людзей загінула ад голаду, холаду і хвароб. Па афіцыйных звестках, насельніцтва Мінска скарацілася амаль у 3 разы, Віцебска – у 3,2 разы.

За час вайны амаль напалову скарацілася пагалоўе жывёлы, асабліва коней. У Віцебскай губерні ва ўездах, акупаваных французскімі войскамі, не засталося ніводнага каня. Прыйшло ў заняпад і земляробства. Пасяўныя плошчы скараціліся напалавіну. Зямля ў многіх маёнтках не апрацоўвалася

наогул, паколькі большасць сялян уцякло ад сваіх гаспадароў у далёкія губерні, менш спустошаныя вайной. Многія сяляне думалі, што заслужылі сабе свабоду гераічным супраціўленнем непрыяцелю і небяспекай, якой яны падвяргаліся. Але царызм і памешчыкі з гэтым не лічыліся. Яны клапаціліся перш за ўсё аб сваім дабрабыце, імкнучыся ўзмацненнем феадальна-прыгонніцкіх адносін хутчэй аднавіць свае разбураныя маёнткі. Нягледзячы на цяжкі стан сялянскай гаспадаркі і вялікія людскія страты, царызм не вызваліў беларускае сялянства ад рэкруцкіх набораў і паставак на патрэбы расійскай арміі, якая працягвала паход на захад. Наадварот, прыгон і свавол памешчыкаў пасля вайны рэзка ўзмацніліся. Асабліва жорсткія меры прадпрымаліся царызмам супраць тых сялян, якія ў час вайны змагаліся супраць памешчыкаў. Усе яны былі аддадзены пад суд і жорстка пакараны. Што датычыць памешчыкаў, якія служылі акупантам, то цар іх прабачыў і вярнуў ім маёнткі, канфіскаваныя адразу ж пасля выгнання французскіх захопнікаў.

### Пытанні і заданні для самакантролю

1. Раскажыце, як ішла падрыхтоўка Францыі і Расіі да вайны?
2. Як пачаліся баявыя дзеянні Напалеона супраць Расіі і як развіваліся падзеі на тэатры ваенных дзеянняў у першыя дні вайны?
3. Прасачыце па карце ход баявых дзеянняў на тэрыторыі Беларусі летам – восенню 1812 года.
4. Прааналізуйце ролю баёў ля Полацка ў вайне 1812 года.
5. Як адносілася насельніцтва Беларусі да ваюючых бакоў?
6. Ахарактарызуйце акупацыйны рэжым на беларускіх землях падчас вайны 1812 года.
7. Як развіваліся ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі падчас адступлення напалеонаўскіх войск? Пакажыце на карце найбольш буйныя бітвы ў гэты перыяд.

## ЛЕКЦЫЯ 4
## Урадавая палітыка царызму ў першай палове XIX ст.

1. Эвалюцыя саслоўнай палітыкі.
2. Канфесіянальная палітыка.
3. Русіфікацыя і яе сутнасць.

## 1. Эвалюцыя саслоўнай палітыкі

Рэформы Пятра I паклалі пачатак заканадаўчаму афармленню саслоўнага падзелу тагачаснага грамадства Расійскай імперыі. Іх прадоўжылі рэформы Кацярыны II, а завяршылася ўсё кадыфікацыяй права ў 1832 г., у прыватнасці выхадам 9 тома Поўнага зводу законаў Расійскай імперыі «О состояниях». Гэты том пачынаўся з палажэння, што ў складзе гарадскога і сельскага насельніцтва «по различию прав состояния различаются законом четыре рода людей: 1) дворянство, 2) духовенство, 3) городские обыватели, 4) сельские обыватели. Все лица, принадлежавшие к одному из этих сословий, пользуются правом состояния, оному присвоенному». Саслоўі падзяляліся на непадатныя і падатныя. Да першых адносілася дваранства і духавенства. Да другіх – саслоўі сельскіх і гарадскіх абывацеляў, але дзве групы сярод апошніх – ганаровыя грамадзяне і купцы – карысталіся многімі правамі непадатных саслоўяў.

**Дваранства.** Асновай палітычнай і эканамічнай магутнасці дваранства з’яўлялася валоданне не толькі зямлёй, але і прыгоннымі, на што не мелі права іншыя саслоўі. Яно было пазбаўленае ўсялякіх падаткаў, цялесных пакаранняў, магло быць асуджаным толькі роўнымі сабе. У новаўтвораных губернях на тэрыторыі Беларусі і Літвы дваранству было дазволена  кожныя тры-чатыры гады збіраць сходы, якія ў дакументах канца XVIII – першай чвэрці XIX ст. традыцыйна зваліся сеймікамі. На сейміках абіралі губернскіх і павятовых «предводителей дворянства» (маршалкаў), уласных прадстаўнікоў у саслоўныя суды і ўстановы, абмяркоўвалі раскладку земскіх павіннасцей, вырашалі гаспадарчыя і грамадскія справы мясцовага жыцця. Палітыка царскага ўраду адносна выбараў у губернскія і павятовыя органы дваранскага самакіравання, суда і паліцыі на працягу часу змянялася. У 1805 г. права голасу атрымалі толькі тыя, хто быў старэйшым за 18 гадоў, валодаў нерухомымі маёнткамі, меў не менш за 150 руб. гадавога даходу і 8 дамоў. Фактычна дробная шляхта, якая не мела сваёй зямлі, была выключаная з удзелу ў выбарах.

Адным з галоўных і балючых пытанняў было дакументальнае пацвярджэнне дробнай шляхтай свайго паходжання. Па ўказу ад 20 студзеня 1816 г. уводзіўся новы парадак, паводле якога да канчатковага вырашэння пытання аб прыналежнасці да шляхты ўсе прэтэндэнты павінны былі плаціць падаткі. Паўстанне 1830 – 1831 г. выклікала рэзкую перамену палітычнага курса царскага ўрада ў Беларусі, Літве і Правабярэжнай Украіне. Пра гэтыя змены сведчыў указ ад 19 кастрычніка

1831 г. «О разборе шляхты в западных губерниях и об устройстве сего рода людей», які вызначыў адрозненне паміж тымі, хто даказаў свае правы на дваранства, і «асобамі, што называюць сябе шляхтаю». Першыя мелі ўсе правы расійскага дваранства, а другія былі падзеленыя на «сельскіх і гарадскіх абывацеляў» або «аднадворцаў» і «грамадзянаў». У выніку ў Беларусі было пераведзена толькі ў аднадворцы больш 10 тыс. былых шляхцічаў. У 1840 годзе было адменена дзеянне Статута ВКЛ 1588 года і беларуская шляхта страціла былую сістэму мясцовага самакіравання, быў узяты курс на русіфікацыю органаў мясцовага кіравання.

**Духавенства.** На тэрыторыі Беларусі і Літвы знаходзілася духавенства як хрысціянскіх (каталіцкае, праваслаўнае, уніяцкае, рэфармацкае (або кальвіністкае), лютэранскае і стараверскае), так і нехрысціянскіх (іудзейскае і мусульманскае) канфесій.

Асноўным накірункам канфесійнай палітыкі царызму ў першай трэці XIX ст. было імкненне ўзняць годнасць духавенства як саслоўя. Прычым царскі ўрад вымушаны быў улічваць своеасаблівасць краю, а менавіта нешматлікасць праваслаўнай канфесіі, моцны ўплыў каталіцкага духавенства ў розных галінах грамадскага жыцця і складаныя адносіны паміж духавенствам розных канфесій. Спецыфіка беларуска-літоўскіх земляў заключалася таксама і ў тым, што вышэйшае праваслаўнае, каталіцкае і уніяцкае духавенства належала ў асноўным да дваранскага саслоўя. Да яго ж адносілася каталіцкае і мусульманскае, значная частка праваслаўнага, уніяцкага і рэфармацкага прыходскага духавенства. Апроч таго, лютэранскія пастары атрымлівалі правы асабістага дваранства. Рабінам надаваліся правы купцоў I гільдыі. Указ Аляксандра I ад 22 мая 1801 г. адмяняў цялесныя пакаранні святароў. У 1804 г. духавенства было вызваленае ад зямельнага падатку і яму дазволілі набываць незаселеныя землі, а прадстаўнікам духавенства, якія мелі дваранскае паходжанне, было дазволена набываць землі разам з сялянамі. 1821 г. прынёс духавенству канчатковае вызваленне ад ваенных пастояў і паліцэйскіх збораў.

Удзел каталіцкага і уніяцкага духавенства ў паўстанні 1830 – 1831 г. прывёў да зменаў у канфесійнай палітыцы расійскага ўрада. Перш за ўсё, гэта праявілася ў скасаванні шэрагу каталіцкіх і уніяцкіх кляштароў і паскарэнні вырашэння лёсу уніяцкай царквы. Былі скасаваны 2/3 базіліянскіх кляштароў. Толькі ў 1832 г. у «заходніх губернях» былі зачыненыя 199 каталіцкіх кляштароў. У 1839 г. на Полацкім царкоўным саборы уніяцкая царква была, па сутнасці, ліквідавана. Згодна з указам

1842 г. пачала праводзіцца секулярызацыя духоўных маёмасцей у заходніх губернях. Асабліва яна паўплывала на становішча каталіцкага духавенства, якое страчвала значную колькасць былых зямель.

У 1842 г. населеныя маёнткі рэфармацкай царквы былі ўзятыя ў казну. А згодна з указам ад 18 чэрвеня 1853 г. лютэранскае духавенства выключалася з дзяржаўных расходаў і павінна было атрымліваць жалаванне ад свайго духоўнага ведамства.

У адрозненне ад хрысціанства, у ісламе і іудаізме няма пасярэднікаў паміж Богам і чалавекам, які сам павінен адказваць за свае грахі. Таму адсутнічае і духавенства, якое можа адпускаць грахі ад імя Бога. Мула, як і рабін, выконвае рэлігійныя функцыі ў сваёй абшчыне. Паводле ўказу ад 14 снежня 1837 г. абранне мулаў і іншых духоўных асобаў у мусульманскіх прыходах павінна было адбывацца па жаданню не менш 2/3 прыхаджан, якія лічыліся старшынямі сямействаў. Прыгавор грамадства пра абранне мулы падпісваўся мясцовымі ўладамі. Паколькі ў беларуска-літоўскіх мусульманаў не было духоўных вучылішчаў, то пасаду мулы займаў чалавек, які быў знаёмы з рэлігійнымі абрадамі і ўмеў чытаць Каран. Яўрэйскія абшчыны групаваліся вакол сваіх рабінаў, якія па «Палажэнню аб яўрэях» 1804 г. павінны былі быць зацверджаныя губернатарам. У 1840 г. урад вырашыў зацвердзіць пасаду губернскіх рабінаў, якіх павінны былі рыхтаваць рабінскія вучылішчы.

**Гарадскія абывацелі.** Гэтае саслоўе складалася з пяці наступных груп: «імянітыя грамадзяне», гільдзейскае купецтва (мясцовае і іншагародняе), мяшчане і пасадскія, рамеснікі або цэхавыя, работныя людзі. Кожны гарадскі абывацель павінен быў быць запісаны ў гарадскую абывацельскую кнігу, якая была падзеленая на шэсць частак. Гарадскія абывацелі ўваходзілі ў «городское общество». Для кіравання ім дазвалялася сфармаваць гарадскую думу з «гласных» і гарадскога галавы. Агульная гарадская дума выбірала шасцігалосную гарадскую думу, у якой кожнай катэгорыі абывацеляў даваўся адзін голас і на якую ўскладалася кіраўніцтва ўсёй гаспадаркай горада. Пры гэтым аб усіх даходах і расходах яна павінна была даваць справаздачу губернатару. Для рамеснікаў былі заснаваныя асобныя ўправы або цэхі.

Купецтва атрымала вызваленне ад рэкруцкай павіннасці (дакладней, дазвол адкупіцца ад яе). Прадстаўнікі I і II гільдый былі вызваленыя ад цялесных пакаранняў. Купецтва замацавала сваё прывілеяванае становішча ў органах гарадскога кіравання (думах) і на пачатку XIX ст. атрымала права набыцця зямлі, а таксама права хадайніцтва перад Міністэрствам

фінансаў. Гэтыя правы распаўсюджваліся на сем'і купцоў. Прывілеяванае становішча купецкай эліты знаходзіла адлюстраванне ва ўзнагароджанні ордэнамі, дараванні чыноў, а таксама асабістага і патомнага дваранства.

Самай значнай часткай саслоўя гарадскіх абывацеляў былі мяшчане. Яны складалі мяшчанскае грамадства ў горадзе, кіраванне якога было ў руках мяшчанскага старасты і яго памочнікаў, якіх абіралі на тры гады. Мяшчане неслі асноўны цяжар падаткаў і павіннасцей. Яны плацілі падушную подаць, падатак на будаўніцтва дарог, неслі рэкруцкую, земскую, падводную, пастойную і інш. павіннасці. Падушны збор з мяшчан у два разы перавышаў аналагічны збор з сялянаў. Каб прыпісацца да гэтай катэгорыі, быў патрэбны прыгавор аб звальненні са свайго былога грамадства, а таксама згода шасці «добранадзейных» грамадзянаў горада і мяшчанскай управы. Купцы і мяшчане з ліку хрысціянскага насельніцтва «заходніх губерняў» мелі пэўныя прывілеі. Згодна з указам Сенату ад 30 снежня 1841 г. аб распаўсюджванні гандлю і прамысловаці ў гэтых губернях купцам, мяшчанам і, наогул, людзям «свободного состояния и христианского исповедания», якія мелі правы пераходу ў гарадское саслоўе, дазвалялася прыпісвацца да яго «с одним свидетельством местных начальств». З 1 студзеня 1842 г. па 1 студзеня 1867 г. яны вызваляліся ад усіх падаткаў, павіннасцей і рэкрутства. А ўказам Сената ад 21 лютага 1842 г. купцы III гільдыі і мяшчане, якіх выбіралі на гарадскія пасады, вызваляліся ад цялесных пакаранняў.

Частку саслоўя гарадскіх абывацеляў складалі рамеснікі. У 42 гарадах Беларусі напрыканцы 30-х – напачатку 40-х г. XIX ст. налічвалася каля 13 530 цэхавых і няцэхавых рамеснікаў сарака прафесіяў. 16 красавіка 1852 г. Сенат выдаў указ, згодна з якім скасоўвалася цэхавая арганізацыя ў гарадах і мястэчках, дзе колькасць рамеснікаў была нязначнай. У такіх гарадах дазвалялася займацца рамяством, не ўступаючы ў цэх, а толькі запісаўшыся ў рамесную саслоўную групу, і абіраць толькі аднаго цэхавага старшыню. Нязначную колькасць саслоўя гарадскіх абывацеляў складалі ў Беларусі групы «ганаровых грамадзянаў» і «рабочых людзей».

**Сельскія абывацелі.** Гэтае саслоўе заканадаўча падзялялася на памешчыцкіх, дзяржаўных, свабодных і ўдзельных грамадзянаў.

Закон 1822 г. дазваляў памешчыкам высылаць сваіх прыгонных у Сібір. Па Укладанню 1845 г. за падачу скаргі на памешчыка прыгоннаму належала 50 udараў розгамі. Урад, аберагаючы правы дваранства, разглядаў бунт прыгонных супраць іх уладальнікаў як паўстанне супраць дзяржаўнай улады. Памешчыцкія сяляне не валодалі правам уласнасці.

Нерухомую маёмасць яны маглі набыць толькі на імя свайго памешчыка. У 1848 г. ім было дазволена набываць нерухомую ўласнасць на сваё імя, але са згоды памешчыка. Урад спрабаваў палепшыць прававое становішча прыгонных. У ліпені 1808 г. быў забаронены продаж прыгонных на кірмашах і таргах. З сакавіка 1812 г. забаранялася афармленне купчых на продаж людзей па аднаму і без зямлі, але продаж, не аформлены дакументальна, заставаўся. У 1818 г. было забаронена друкаваць аб'явы аб продажу сялян у газетах. Законам ад 2 мая 1833 г. забараняўся продаж і падараванне прыгонных паасобку з разбурэннем сям'і. З 1841 г. набыццё сялян было дазволена толькі асобам, якія валодалі населенымі маёнткамі.

Другім па колькасці разрадам сельскага насельніцтва былі дзяржаўныя сяляне. Змянілася і рэкруцкая павіннасць. Рэкрут браўся ўжо не з 500 або 1 тыс. душ муж. п., а толькі з 200 душ. У 1837 г. дзяржаўныя сяляне ўсіх разрадаў разам з удзельнымі перайшлі ў распараджэнне Міністэрства дзяржаўных маёмасцей. Павіннасці дзяржаўных сялян набылі грашовую форму рэнты, якая выплачвалася два разы ў год шляхам кругавой парукі або накіравання на палявыя работы.

Некаторую частку саслоўя складалі вольныя людзі, да якіх належала большасць рускіх стараевераў, перасяленцы з Польшчы, сяляне, якія атрымалі волю, яўрэі, што прынялі хрысціянства. Паводле ўказу ад 20 верасня 1840 г. вольныя людзі дзяржаўных маёнткаў былі ўведзеныя ў грамадствы дзяржаўных сялян і ўроўненыя з імі ў плацяжах падаткаў і адбыванні рэкруцкай, кватэрнай і іншых павіннасцяў

Усё сказанае вышэй сведчыць пра тое, што асноўнымі этапамі саслоўнай палітыкі ўраду на далучанай тэрыторыі Беларусі і Літвы можна лічыць: прынясенне прысягі на вернасць расійскай імператрыцы; распаўсюджванне расійскага заканадаўства на існаваўшае саслоўнае дзяленне і праведзенне ўніфікацыі саслоўяў па расійскаму ўзору.

## 2. Канфесіянальная палітыка

У канцы XVIII ст. на землях Вялікага княства Літоўскага, якія адышлі да Расійскай імперыі, пражывала каля 39 % уніятаў, 38 – католікаў, 10 – іудзеяў, 6,5 – праваслаўных, 4 – стараевераў, астатнія 2,5 % прыходзіліся на пратэстантаў, мусульман і караімаў. На далучаных землях царскі ўрад дазволіў дзейнасць усіх канфесій, але гэта верацярпімасць была адноснай. Замест існуючага тут каталіцтва ён імкнуўся зацвердзіць пануючае ў Расійскай імперыі праваслаўе, хаця на тэрыторыі Віленшчыны

і Гродзеншчыны яно практычна адсутнічала, а на Віцебшчыне і Міншчыне было нешматлікім.

22 красавіка 1794 г. Кацярына II выдала ўказ аб ліквідацыі ўсялякіх перашкод да вяртання уніятаў у праваслаўную веру. Пры яго выкананні кіраўніцтва намесніцтваў яўна перастаралася. Палітыка ўрада была непаслядоўнай. На некаторы час праваслаўнае духавенства пакінула уніяцкую царкву ў спакоі.

Практычная перадача духоўнай улады над уніяцкай царквой у рукі каталіцкага мітрапаліта С. Богуша-Сестранцэвіча прывяла да таго, што уніяцкае духавенства разгарнула агітацыю за вяртанне сваіх былых прыхаджан. Пачаліся масавыя пераходы з уніяцтва ў каталіцтва. Так, у 1803 г. у Полацкай уніяцкай епархіі перайшло ў каталіцтва каля 100 тыс. (паводле іншых звестак, каля 200 тыс.) уніятаў. Гэта прывяло да з'яўлення шэрага ўказаў цара Аляксандра I, што забаранялі агітацыю за пераход у каталіцкую царкву.

У канцы XVIII – пачатку XIX ст. у Расійскай імперыі працягвалася ўмяшанне свецкай улады ў справы царквы з мэтай пераўтварэння ўсёй царкоўнай структуры ў разнавіднасць дзяржаўнага апарату. Таму і на тэрыторыі беларуска-літоўскіх губерняў царскі ўрад імкнуўся паставіць пад свой кантроль не толькі каталіцызм і уніяцтва, якія знаходзіліся пад духоўным кіраўніцтвам Папы Рымскага, але таксама пратэстанцкія і нехрысціянскія канфесіі, якія наогул у той час нікому не падпарадкоўваліся. Гэта адбывалася шляхам стварэння сеткі прыходаў, набліжэння межаў епархій да межаў губерняў, падпарадкавання духоўным праўленням і кансісторыям. І калі праваслаўныя і стараверы былі падпарадкаваны Свяцейшаму Сіноду, то ўсе астатнія (у канчатковым выніку) – Дэпартаменту духоўных спраў замежных веравызнанняў Міністэрства ўнутраных спраў. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай у 1772 г. на далучанай да Расійскай імперыі тэрыторыі Усходняй Беларусі працягвалі сваю дзейнасць, з дазволу ўрада, Полацкае уніяцкае архіепіскапства і Магілёўская (Беларуская) праваслаўная епархія. Паколькі каталіцкія парафіі гэтай тэрыторыі ўваходзілі ў склад Віленскага каталіцкага епіскапства (цэнтр якога заставаўся за межамі імперыі), то для іх была створана ў 1773 г. Беларуская каталіцкая епархія (з цэнтрам у Магілёве), а ў 1782 г. – Магілёўскае архіепіскапства.

Пасля паўстання 1830 – 1831 гг. Мікалай I, каб узмацніць пазіцыі імперыі ў заходніх губернях, стаў на шлях скасавання уніяцкай царквы. Мэтай гэтага мерапрыемства было павелічэнне колькасці праваслаўнага

насельніцтва як сацыяльнай апоры расійскіх улад. У канцы 1827 г. – пачатку 1828 г. з'явіўся праект скасавання уніяцкай царквы, падпісаны міністрам народнай асветы і галоўным кіраўніком дэпартамента замежных веравызнанняў А. Шышковым. Асноўная яго ідэя заключалася ў тым, каб пазбавіць уніятаў ад уплыву каталіцтва шляхам скасавання часткі базыльянскіх кляштароў, стварэння асобнай ад каталіцкай грэка-уніяцкай духоўнай калегіі; адкрыцця новых навучальных устаноў для перападрыхтоўкі юнакоў у праваслаўных традыцыях. Таксама прадугледжвалася ліквідаваць залежнасць уніяцкага духавенства ад памешчыкаў-католікаў, якія, з'яўляючыся кцітарамі, аказвалі не толькі матэрыяльную дапамогу царкве, але і ўплывалі на выбар кандыдатуры святара ў сваім маёнтку.

12 лютага 1839 г. у Полацку ў прысутнасці вышэйшага уніяцкага духавенства быў падпісаны Саборны Акт з просьбай аб далучэнні уніяцкай царквы да праваслаўнай. Пастанова Свяцейшага Сінода была зацверджана Мікалаем I. Усе святочныя багаслужэнні з гэтай нагоды прайшлі ў Беларусі і Літве спакойна, не выклікаючы сур'ёзных пратэстаў. На былых уніяцкіх святароў былі распаўсюджаны ўсе тыя пастановы, якія тычыліся праваслаўнага духавенства.

### 3. Русіфікацыя і яе сутнасць

Пасля падаўлення паўстання значныя змены адбыліся і ў палітыцы царызму ў Беларусі. Страціўшы давер да польскай і спаланізаванай мясцовай шляхты, ён узяў курс на яе аслабленне, выкараненне паланізму і паслядоўную русіфікацыю края. Першым крокам у гэтым напрамку было пакаранне ўдзельнікаў паўстання. У адпаведнасці з указам цара ад 6 мая 1831 г. ва ўсіх губернях, ахопленых паўстаннем, былі створаны следчыя камісіі, якім даручалася вызначыць ступень віны ўдзельнікаў паўстанцкага руху. Тых, хто быў прыцягнуты ў паўстанцкія атрады прымусова або на працягу месяца пасля апублікавання ўказа добраахвотна з'явіўся з пакаяннем, камісіі ад адказнасці вызвалялі. Шляхцічы, якія свядома ўдзельнічалі ў паўстанцкім руху, садзейнічалі яго пашырэнню і прымалі ўдзел ва ўзброенай барацьбе, аддаваліся пад суд. Іх памесці канфіскоўваліся, сем'і высылаліся ў Сібір.

Але царызм разумеў, што адных рэпрэсій недастаткова. Неабходна было выпрацаваць сістэму мер, якія садзейнічалі б збліжэнню далучаных да Рэчы Паспалітай зямель з усёй тэрыторыяй Расіі. Для выпрацоўкі гэтых

мер пры цару ў пачатку 1832 г. быў створаны «Асобны камітэт па справах заходніх губерняў». У яго ўваходзілі міністры ўнутраных і ваенных спраў, дзяржаўных маёмасцей, асветы, фінансаў, обер-пракурор Сінода і інш. Узначальваў камітэт старшыня Кабінета міністраў граф В.П. Качубей.

Камітэт разглядаў праекты мерапрыемстваў у адносінах да Беларусі, Літвы і Правабярэжнай Украіны, якія паступалі ад міністэрстваў, губернатараў і генерал-губернатараў, а пасля падаваў іх на зацвярджэнне цару. Адным з такіх мерапрыемстваў, рэкамендаваных камітэтам, быў так званы «разбор шляхты», які прадугледжваў праверку дакументаў усіх, хто называў сябе шляхтай, аб дваранскім паходжанні. Тыя шляхцічы, якія не змаглі прадставіць у геральдычную камісію дакументаў, пацвярджаючых дваранскае званне, пераводзіліся ў падатковае саслоўе: аднадворцаў у сельскай мясцовасці і грамадзян у гарадах. Усе яны павінны былі адбываць павіннасці і плаціць падаткі як дзяржаўныя сяляне.

Па прапановах камітэта ў заходніх губернях быў праведзены яшчэ шэраг мерапрыемстваў, накіраваных на «выкараненне» тут польскага ўплыву. У маі 1832 г. як рассаднік «вальнадумства» і паланізму быў закрыты Віленскі універсітэт. Справаводства пераводзілася з польскай на рускую мову. Указам ад 25 чэрвеня 1840 г. у Беларусі і Літве адмянялася дзеянне Літоўскага статута і паўсюдна ўводзілася расійскае заканадаўства. Выкладанне ў навучальных установах пераводзілася на рускую мову. У 1836 г. было забаронена выкладанне польскай мовы як асобнага прадмета ва ўсіх тыпах навучальных устаноў. Польскія чыноўнікі вызваляліся ад займаемых пасад у органах дзяржаўнага кіравання, асветы і культуры, судах. На іх месца назначаліся толькі рускія чыноўнікі «благанадзейных паводзін». Ім прадстаўлялася перавага ў аплаце працы і забяспечваўся хуткі рост кар’еры. Расійскім чыноўнікам і дваранам прадастаўляліся льготы пры набыцці дзяржаўных і канфіскаваных у шляхты маёнткаў. Прадпрымаліся меры і па перасяленню сюды казённых сялян з расійскіх губерняў. Але выхадцы з Расіі не замацоўваліся на беларускіх землях. Дваране і чыноўнікі, набыўшы на льготных умовах маёнткі, перапрадавалі іх з вялікай выгадай для сябе, а сяляне перасяляліся неахвотна.

Каб аслабіць уплыў каталіцкай царквы, царскі ўрад паступова вёў скарачэнне тут каталіцкага святарства, падрываючы адначасова яго эканамічную базу. У 1832 г. з гэтай мэтай былі ліквідаваны некамплектныя (не маючыя поўнага складу манахаў) каталіцкія манастыры, а іх памесці перададзены казне. У снежні 1841 г. ужо ўсё

духавенства (праваслаўнае, каталіцкае і інш. канфесій) было пазбаўлена права мецць зямельную ўласнасць на падставе, што гэта перашкаджае ім выконваць добрасумленна свае святарскія абавязкі. Але, паколькі ў праваслаўнага духавенства зямлі практычна не было, то ў выніку гэтай акцыі зямельнай уласнасці ў першую чаргу пазбавілася каталіцкая царква. У выніку гэтых мер колькасць дзяржаўных сялян у Беларусі ўзрасла на 100 тыс. душ мужчынскага полу.

Адначасова вялося наступленне на уніяцкую царкву. Уладам удалося перацягнуць на свой бок вярхушку уніяцкага духавенства на чале з епіскапам Іосіфам Сямашкам, якія ў лютым 1839 г. склікалі ў Полацку царкоўны сабор, прыняўшы саборны акт з просьбай аб далучэнні уніяцкай царквы да праваслаўнай. 30 сакавіка 1839 г. Святы Сінод са згоды імператара зацвердзіў просьбу Полацкага сабора, у выніку чаго уніяцкая царква ў Беларусі была скасавана.

### Пытанні і заданні для самакантролю

1. Ахарактарызуйце палітыку царскіх улад у дачыненні шляхецкага саслоўя ў першай палове XIX ст.
2. Вызначце асноўныя накірункі канфесійнай палітыкі царызму ў першай трэці XIX ст.
3. Дайце характарыстыку саслоўя «гарадскіх абывацелей» ў першай палове XIX ст.
4. Прасачыце эвалюцыю саслоўнай палітыкі царскіх улад у першай палове XIX ст. Высновы падмацуйце прыкладамі.
5. Пакажыце ролю Полацкага царкоўнага сабору ў гісторыі Беларусі.
6. Прааналізуйце асноўныя накірункі палітыкі царскіх улад пасля падаўлення шляхецкага паўстання 1830 – 1831 гг.

## ЛЕКЦЫІ 5 – 6
## Светапогляд рамантызму і грамадска-палітычнае жыццё на Беларусі ў першай палове XIX ст.

1. «Вясна народаў» і ажыўленне грамадска-палітычнага руху.
2. Тайныя таварыствы і іх дзейнасць.
3. Шляхецкае паўстанне 1830 – 1831 гг.
4. Грамадскі рух у 30-я – 50-я гг XIX ст.

## 1. «Вясна народаў» і ажыўленне грамадска-палітычнага руху

Грамадска-палітычнае жыццё ў Беларусі ў першай палове XIX ст. значна актывізавалася. Супярэчнасці эпохі, выкліканыя крызісам феадальнага ладу, ставілі на парадак дня неабходнасць радыкальных пераўтварэнняў у сацыяльнай пабудове грамадства. Толькі вызваленне ад прыгоннага права, скасаванне саслоўных абмежаванняў і іншых прыкмет феадалізму магло забяспечыць далейшае развіццё вытворчых сіл, адкрыць магчымасць для развіцця краіны па шляху прагрэсу. Да сацыяльных праблем далучаліся праблемы нацыянальныя. Падзелы Рэчы Паспалітай і ліквідацыя яе дзяржаўнасці ў канцы XVIII ст. востра ставілі на парадак дня польскае пытанне. Беларусь, якая ў мінулыя часы пазнала паланізацыю, знаходзілася цяпер пад модным уплывам польскага нацыянальна-вызваленчага руху. Да яго далучылася спаланізаваная беларуская шляхта, якая ў першай трэці стагоддзя дзякуючы дзейнасці польскіх патрыётаў у сістэме адукацыі, літаратуры, мастацтва, а таксама моцнаму паланізуючаму ўздзеянню каталіцкага касцёла пачала ў пераважнай большасці ўсведамляць сябе «палякамі беларускага або літоўскага паходжання». Менавіта шляхта ў першай палове XIX ст. стала тым асяродкам, з якога выходзілі змагары за ўвядзенне новых капіталістычных парадкаў і скасаванне перажыткаў феадальнага ладу. Такое становішча было абумоўлена слабасцю буржуазіі, нізкім узроўнем палітычнай свядомасці сялянства. Гэта і прадвызначыла, што першая палова XIX ст. у Беларусі, як у Расіі і Польшчы, была перыядам дваранскай рэвалюцыйнасці, а рэвалюцыйны і нацыянальна-вызваленчы рух развіваўся пад моцным уздзеяннем расійскага рэвалюцыйнага і польскага нацыянальна-вызваленчага рухаў. Толькі ў 40 – 50-я гады тут пачала фарміравацца ўласна беларуская плынь, якая ў далейшым яскрава праявілася ў паўстанні 1863 г.

Рэвалюцыйны і нацыянальна-вызваленчы рух у Беларусі ў першай палове XIX ст. упісваўся ў агульнаеўрапейскую палітычную сітуацыю і быў яе неад’емнай часткай. Гэта знаходзіла адлюстраванне як у адзінстве ідэалаў, за якія змагаліся дзеячы рэвалюцыі і нацыянальна-вызваленчага руху ў краінах Еўропы, так і ў падабенстве арганізацыйных форм, у якіх ён праяўляўся.

У першыя дзесяцігоддзі XIX ст. галоўнай арганізацыйнай формай рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху ў Беларусі былі тайныя і паўлегальныя таварыствы. У еўрапейскіх краінах у гэтыя часы масавы характар набыло стварэнне разнастайных таварystваў – навуковых,

палітычных, самаўдасканаленне і інш. Шмат хто з даследчыкаў у гэтым бачыць не толькі модны павеў, але таксама ўплыў найбольш магутнай у тую эпоху напаўлегальнай арганізацыі, якой з'яўлялася масонства. Генетычна з масонствам былі звязаны і тайныя таварыствы студэнцкай і вучнёўскай моладзі, якія дзейнічалі ў Беларусі ў першай чвэрці XIX ст., а таксама дзекабрысцкія арганізацыі.

## 2. Тайныя таварыствы і іх дзейнасць

У Расійскай імперыі, дзе шырокія колы грамадства былі адлучаны ад палітычнага жыцця, дзе народам дазвалялася толькі «квітнець пад аховай рускай кароны», а дваранству – падносіць імператарам вернападданніцкія адрасы, што неаднаразова рабіла і беларуская шляхта, усялякі грамадскі рух, які меў палітычную афарбоўку, набываў апазіцыйны да самадзяржаўя характар. Не быў выключэннем і грамадска-палітычны рух на Беларусі. Больш таго, дзякуючы яму беларускія правінцыі імперыі лічыліся аднымі з самых ненадзейных.

Шумная расійская афіцыйная прапаганда, якая сцвярджала «законнасць» далучэння Беларусі да Расіі, не магла ўсё ж заглушыць горычы, што засталася ў тагачасным беларускім грамадстве пасля падзелаў Рэчы Паспалітай і падаўлення паўстання пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі.

Не выклікалі падтрымкі многія наступы царскіх улад на правы шляхты, асабліва дробнай, захады супраць уніяцкай царквы. У далучаных правінцыях (і гэта асабліва непакоіла імперскія ўлады) заставаўся былы дух «польскі» – «дух неспакою, незадаволенасці, супраціўлення». Рэчы Паспалітай, як дзяржавы, ужо не існавала, але многія прадстаўнікі беларускай шляхты, асабліва на заходніх землях краю, з надзеяй пaглядалі на Варшаву. Выхаваныя на традыцыях каталіцызму і польскай культуры, яны звязвалі лёс сваёй Радзімы з адраджэннем Рэчы Паспалітай.

Такія надзеі ўзмацніліся пасля стварэння ў 1809 г. Напалеонам Варшаўскага герцагства. Французскі імператар дараваў палякам Канстытуцыю і свой грамадзянскі кодэкс. Але спадзяванні на Францыю рухнулі ў канцы 1812 г. пасля выгнання з Расіі французскай арміі.

Рашэнні Венскага кангрэса аб перадачы часткі польскіх зямель з Варшавай Расіі і абяцанне Аляксандра I дараваць Царству Польскаму аўтаномію і канстытуцыйны лад праўлення мелі сур'ёзны ўплыў на грамадскія настроі ў Беларусі. Чакалі, што польская Канстытуцыя 1815 г. будзе пашырана хаця б на заходнія землі Беларусі, верылі ў імкненне цара

вырашыць тут сялянскае пытанне. Адмова Аляксандра ад такіх намераў выклікала расчараванне.

У грамадстве расла незадаволенасць існуючымі парадкамі, непаслядоўнай палітыкай расійскага ўрада, у выніку якой многія балючыя пытанні не толькі не вырашаліся, але і паглыбляліся, зацягваліся ў небяспечныя вузлы. Усё больш акрэслена ўсведамлялася неабходнасць палітычных і эканамічных змен і, перш за ўсё, скасавання прыгоннага права. Нізы нагадвалі пра гэта сялянскімі хваляваннямі і бунтамі, якія то тут, то там успыхвалі на Беларусі. У адукаванай частцы грамадства выспявалі думкі аб магчымасці вызвалення беларускіх сялян ад прыгоннай залежнасці. Такія меркаванні выказваліся на пасяджэннях масонскіх лож Беларусі. Як вядома, Аляксандр I дазволіў масонскім арганізацыям Расіі легалізаваць сваю дзейнасць. Ложы «вольных муляроў» Беларусі падпарадкоўваліся цэнтральнаму варшаўскаму «Вярхоўнаму збору Вялікага Усходу». У першыя дзесяцігоддзі яны існавалі ў Мінску, Слуцку, Навагрудку, Гродне, Нясвіжы, аб'ядноўвалі мясцовых шляхцічаў і афіцэраў рускай арміі. Рост грамадзянскай незадаволенасці і апазіцыйнасць большасці масонскіх таварыстваў імперыі прымусілі цара ў хуткім часе забараніць іх. У верасні 1821 года атрымалі ўказанне спыніць дзейнасць да «нявызначанага часу» і масоны Беларусі.

Ужо вельмі хутка пасля прыняцця Канстытуцыі 1815 г. стала відавочным, што Аляксандр I не змог спалучыць у Польшчы абсалютызм і парламентарызм. Пасля другога пасяджэння сейму (1820) паміж самадзержцам і яго польскімі «няўдзячнымі» падданымі ўзнікла ўзаемная халоднасць і непаразуменне. Пачалі ўзнікаць польскія тайныя таварыствы. Уплыў апошніх, у тым ліку «Патрыятычнага таварыства», «Таварыства падхарунжых» адчуваўся і на Беларусі. Ідэі нацыянальнага вызваленчага руху пранікалі ў масонскае асяроддзе. У 1823 – 1826 гадах многія польскія тайныя таварыствы былі выкрыты і разгромлены. У Вільні, і гэта ўлады лічылі адным са сваіх дасягненняў, былі выкрыты тайныя таварыствы філаматаў і філарэтаў.

Філаматамі – прыхільнікамі навук – называлі сябе юнакі з Беларусі і Літвы, члены тайнага студэнцкага згуртавання, якое пачало дзейнічаць у 1817 годзе ў Вільні. Заснавальнікі і актыўныя члены таварыства Т. Зан, А. Міцкевіч, Я. Чачот, І. Дамейка, М. Рукевіч і іншыя аб'ядналіся дзеля вывучэння навук, практыкавання ў прыгожай пісьменнасці і свабодных дыскусій. У гэтым асяроддзі нараджаўся польскі рамантызм, буйным прадстаўніком якога з'яўляўся А. Міцкевіч, і новая беларуская літаратура,

якую прадстаўляў Я. Чачот. Вялікі маральны і ідэйны ўплыў на членаў таварыства аказвалі выдатныя вучоныя – выкладчыкі універсітэта і, у першую чаргу, І. Лялевель, які чытаў курс усеагульнай гісторыі.

Выхаваныя на ідэалах Асветніцтва, філаматы верылі ў магчымасці чалавечага розуму. Асаблівую ўвагу яны надавалі маральнасці і звязвалі паняцце «чалавек маральны» з паняццем «грамадзянін». Паступова ад ідэі ўдасканалення асобы яны прыйшлі да ідэі ўдасканалення рэчаіснасці. У 1821 годзе Я. Чачот так акрэсліў пашыраныя заданні таварыства: «...пры дапамозе асветы і згуртавання суайчыннікаў яно павінна рабіць усё для шчасця і вызвалення айчыны». Філаматы марылі аб стварэнні новай сістэмы народнай асветы, якая адпавядала б запатрабаванням часу і высокім ідэалам. Яны цікавіліся матэрыяльнай і духоўнай культурай народа, рабілі апісанні паветаў і парафій, вывучалі побыт і лад жыцця сялянства, запісвалі ўзоры яго вуснай творчасці. У іх асяроддзі папулярнай была беларуская мова.

Філаматы прапаведвалі роўнасць людзей і народаў, віталі барацьбу за незалежнасць у Грэцыі, Італіі, Іспаніі. «Быць свабодным, – лічылі яны, – неад’емнае права кожнага чалавека і кожнага народа». У дэспатызме бачылі галоўную перашкоду натуральнаму развіццю грамадства. Надзеі на шчаслівае будучае Беларусі і Літвы філаматы звязвалі з перамогай польскай ідэі, а таксама з карэннымі эканамічнымі і сацыяльнымі рэформамі: ліквідацыяй прыгонніцтва, увядзеннем канстытуцыйнай формы праўлення і росквітам сярэдняга класа, які на Беларусі, на іх думку, складаўся са шляхты.

Імкненне філаматаў пашырыць уплыў на моладзь і легалізаваць сваю дзейнасць увасобілася ў створанай у маі 1820 года Т. Занам, з дазволу кіраўніцтва Віленскага універсітэта, студэнцкай культурна-асветніцкай арганізацыі «Прамяністыя». Сама назва адлюстроўвала сэнс абвешчанай ім тэорыі «выпраменьвання» дабратворных духоўных узаемаўплываў людзей. За кароткі час «прамяністымі» сталі каля 200 чалавек. Прапа-ведванне высокай маральнасці і духоўнасці было своеасаблівым выклікам амаральнаму грамадству. Таварыства «прамяністых» было распушчана ў той жа год па загаду зверху і пераўтварылася ў тайную арганізацыю філарэтаў – прыхільнікаў дабрачыннасці. Яна існавала да 1823 года. Філарэцкія філіі арганізоўваліся таксама ў правінцыях.

Інцыдэнт у Віленскай гімназіі ў 1823 годзе – з’яўленне на класнай дошцы надпісу «Няхай жыве Канстытуцыя 3 мая!» – падштурхнуў улады звярнуць асабліва пільную ўвагу на неблаганадзейных вучняў, што

дазволіла ў хуткім часе выкрыць таварыствы філарэтаў і філаматаў. Для расследавання ў Вільню прыбыў сенатар М.М. Навасільцаў, па загаду якога ў зняволенні, пакуль вялося следства, заставалася каля 100 чалавек. У красавіку 1824 года спецыяльна створаны па найвышэйшаму ўказу камітэт вынес прыгавор: 20 філаматаў і філарэтаў высылалася ў Пецярбург (А. Міцкевіч, Ю. Яжоўскі, Ф. Малеўскі) і ў аддаленыя губерні Расіі. Найбольш актыўныя – Т. Зан, Я. Чачот, А. Сузін – павінны былі адбыць турэмнае зняволенне з наступнай высылкай на Урал. Тады ж улады звярнулі ўвагу на сярэднія навучальныя ўстановы Беларусі і Літвы і выявілі ў многіх з іх, у тым ліку і Свіслацкай гімназіі, антыўрадавыя настроі. Пяць свіслацкіх вучняў былі здадзены ў салдаты «для перавыхоўвання».

Філамат Міхаіл Рукевіч, які ў 1823 годзе за недахопам улік быў адпушчаны на волю, неўзабаве стаў адным з арганізатараў у мястэчку Бранск Беластоцкага павета тайнага таварыства дзекабрысцкага тыпу «Ваенныя сябры» (1823). Яно аб’яднала афіцэраў Літоўскага корпуса, мясцовых чыноўнікаў, шляхцічаў, вучнёўскую моладзь. Таварыства мела тры ступені: «Ваенныя сябры» – кіраўнікі таварыства і афіцэры, «Згода» – грамадзянскія асобы і «Заране» – вучні Свіслацкай і Беластоцкай гімназій.

Па ініцыятыве кіраўнікоў «Ваенных сяброў» – капітана К.Г. Ігяльстрома і паручніка А.І. Вягеліна ў снежні 1825 года літоўскі, піянерны батальён адмовіўся прысягаць імператару Мікалаю І. За гэта дзяржаўнае злачынства і ўдзел у тайным згуртаванні, якое мела на мэце «дабрабыт усяго грамадства», К.Г. Ігяльстром, А.І. Вягелін, М.І. Рукевіч, М.Ф. Вільканец, падпаручнікі П.І. Гофман, Э.А. Пятроўскі, радавы А.М. Угрыніч-Трэбінскі, шляхціч І.С. Высоцкі, беластоцкі гімназіст К.В. Ардынскі былі прысуджаны да смяротнай кары, якую, аднак, замянілі праз некаторы час рознымі тэрмінамі катаргі ці службы на Каўказе. Ігяльстром, Вягелін, Рукевіч адбывалі пакаранне ў Сібіры разам з дзекабрыстамі.

У пачатку 1820 гадоў многіх дзекабрыстаў лёс звязаў з беларускімі землямі. Тут праходзілі вайсковую службу А.А. Бястужаў-Марлінскі, А.І. Адоеўскі, М.С. Лунін, К.Ф. Рылееў і іншыя. Кіраўнік Паўночнага таварыства М.М. Мураўёў напісаў у Мінску варыянт праекта канстытуцыі. Членамі дзекабрысцкіх арганізацый быў шэраг афіцэраў Бабруйскай крэпасці. Сярод іх С.І. Мураўёў-Апостал і М.П. Бястужаў-Румін. На іх думку, у 1823 годзе з арышту Аляксандра І на ваенным аглядзе ў Бабруйскай крэпасці павінна было пачацца ўсеагульнае паўстанне.

«Бабруйскі план» – адна з першых спроб адкрытага выступлення дзекабрыстаў – не здзейсніўся, бо быў прызнаны заўчасным. І спроба апошняга дзекабрысцкага выступлення таксама звязана з Беларуссю – у лютым 1826 года імкнуўся падняць паўстанне ў Палтаўскім палку Барысаўскага гарнізона член таварыства «З'яднаных славян» афіцэр С.П. Трусаў.

У ходзе следства па справе дзекабрыстаў адкрыліся спробы іх кантактаў з польскімі рэвалюцыянерамі, падчас якіх вялося высвятленне пазіцый, у тым ліку і наконт будучых граніц паміж вольнай Расіяй і вольнай Польшчай. Гэтае пытанне непасрэдна закранала Беларусь – ёй і тыя і другія адмаўлялі ў праве на самастойнае існаванне.

Разгром дзекабрысцкага руху, з якога пачалося праўленне далёкага ад лібералізму Мікалая І, спрыяў росту апазіцыйных настрояў на Беларусі. Ідэі ўзброенага паўстання супраць самадзяржаўя, якое рыхтавалі польскія тайныя таварыствы, тут знаходзілі водгук сярод пэўнай часткі шляхты, асабліва беднай і беззямельнай, сярод уніяцкага і каталіцкага духавенства, якое не было ўпэўнена ў заўтрашнім дні, а таксама і ў колах інтэлігенцыі.

Натуральна, што іскры моцнага рэвалюцыйнага выбуху, які прагучаў у 1830 г. у Еўропе, траплялі тут на вогненебяспечную глебу.

## 3. Шляхецкае паўстанне 1830 – 1831 гг.

Пасля разгрому дзекабрыстаў і польскага «Патрыятычнага грамадства» ў Польшчы і Беларусі некаторы час было адносна спакойна. Але праз некалькі гадоў пачалася новая рэвалюцыйная хваля. Гэтаму садзейнічала сітуацыя ў Заходняй Еўропе. У Грэцыі паспяхова завяршалася вайна за незалежнасць, у Францыі і Бельгіі ўлетку 1830 г. пачаліся новыя рэвалюцыі. Гэтыя падзеі не абыйшлі бокам Польшчу і Беларусь.

Яшчэ ў 1828 годзе ў Варшаве была створана таемная арганізацыя, у якую ўваходзілі курсанты Варшаўскай школы падхаружых. Узначальваў таварыства Пётр Высоцкі. У хуткім часе колькасць членаў таемнай арганізацыі дасягнула 300 чалавек. Асноўнай мэтай сваёй дзейнасці таварыства ставіла вызваленне Польшчы ад расійскага прыгнёту шляхам узброенага паўстання.

Дзейнасць таварыства не засталася незаўважанай царскімі ўладамі. Увосень 1830 г. Мікалай І загадаў арыштаваць яго ўдзельнікаў. У гэты жа

час у Варшаве пачалі распаўсюджвацца чуткі, што Мікалай I плануе выкарыстаць польскае войска для падаўлення рэвалюцыі ў Францыі. У адказ на гэта ў Варшаве ў ноч з 29 па 30 лістапада 1830 года ўспыхнула паўстанне. Актыўна падтрыманае жыхарамі горада, яно перамагло. Рускія войскі вымушаны былі пакінуць Польшчу.

Кіраўніцтва паўстаннем, мэтай якога было адраджэнне Рэчы Паспалітай у межах 1772 г., імкнулася распаўсюдзіць яго на тэрыторыю Беларусі, Літвы і Правабярэжнай Украіны. На іх тэрыторыі шырока распаўсюджваліся лісты з заклікам да паўстання, вялася вялікая агітацыйная прапаганда як мясцовымі актывістамі, так і прыезджымі эмісарамі.

Царскі ўрад прадпрымаў усе меры да таго, каб не дапусціць распаўсюджвання паўстання на беларускія, літоўскія і ўкраінскія землі. Яшчэ 1 снежня 1830 года ён абвясціў аб ваенным становішчы ў заходнебеларускіх, украінскіх і літоўскіх губернях. На іх тэрыторыі павялічвалася колькасць войскаў, ствараліся склады харчавання і фуражу. У Гарадзенскай губерні, на мяжы з Царствам Польскім, хуткімі тэмпамі ішло фармаванне войска, прызначанага для падаўлення паўстання. Яго галоўнакамандуючым быў прызначаны фельдмаршал І.І. Дзібіч-Забалканскі. Адначасова ў Літве, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне вялася канфіскацыя зброі, з дзяржаўных устаноў звальняліся службоўцы – палякі, уплывовыя польскія памешчыкі браліся пад хатні арышт. Але, нягледзячы на гэтыя меры, прадухіліць паўстанне ў Літве, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне не атрымалася.

Асабліва актыўна вялася падрыхтоўка да паўстання на Віленшчыне. У Вільні дзейнічала буйная таемная арганізацыя студэнцкай моладзі «Акадэмічны саюз», якая налічвала каля 400 чалавек. Пры яе актыўнай падтрымцы ў студзені-лютым 1831 г. у Вільні быў створаны для кіраўніцтва паўстаннем у Літве і Беларусі Віленскі Цэнтральны паўстанцкі камітэт. Але кіраўніцтва ў ім захапілі прадстаўнікі кансерватыўнага лагера. Яны не змаглі забяспечыць адначасовы выступ паўстанцкіх сіл і каардынацыю іх дзеянняў у розных раёнах. Паўстанне пачыналася і працякала ізалявана ў асобных паветах. У канцы сакавіка-красавіка яно ахапіла Літву і Заходнюю Беларусь (Ашмянскі, Браслаўскі, Свянцянскі і Дзісненскі паветы). У Гарадзенскай губерні яно пачалося ў маі, у Рэчыцкім, Мазырскім і Пінскам паветах – у чэрвені-ліпені. У чатырох

паўночна-заходніх паветах Беларусі колькасць удзельнікаў паўстання дасягнула 10 тыс. чалавек, у Гарадзенскай губерні – каля 1 тыс., у Рэчыцкім, Мазырскім і Пінскім паветах – каля 1300 чалавек.

Пры абвяшчэнні паўстання шляхта кожнага павета абірала ўрад і камандуючага войскамі. Павятовыя ўрады прыводзілі насельніцтва да прысягі, аб’яўлялі рэкруцкі набор у паўстанцкае войска, выдавалі лісты да насельніцтва з заклікам далучыцца да паўстання. Але сярод сялян гэты заклік не знаходзіў падтрымкі. Гэтаму садзейнічала і палітыка царызму. Баючыся, «каб бунт з польскага не ператварыўся ў сялянскі», Мікалай І 3 красавіка 1831 г. выдаў указ, у якім абяцаў сялянам прабачыць ім удзел у паўстанні, калі яны добраахвотна пакінуць атрады і вернуцца дахаты. Шляхцічы, удзельнікі паўстання, паводле гэтага жа ўказу, прыцягваліся да суду, а іх маёнткі канфіскоўваліся.

У сілу гэтага асноўным ядром паўстанцкіх атрадаў была польская або спаланізаваная беларуская шляхта, навучэнская моладзь і афіцэры-палякі. Сяляне і мяшчане мабілізоўваліся ў атрады пераважна пад прымусам і не былі зацікаўленыя ваяваць без вырашэння сваіх сацыяльных праблем.

Калі пачалося паўстанне ў Літве і Заходняй Беларусі, Нацыянальны ўрад Польшчы і галоўнае камандаванне польскага войска паслалі ў дапамогу мясцовым паўстанцам рэгулярныя часткі. У канцы мая 1831 г. сюды прыбыў 12-тысячны корпус генерала А. Гелгуда і атрад генерала Д. Хлапоўскага, у якім налічвалася 820 афіцэраў, унтэр-афіцэраў і інструктараў. Рухаючыся праз Свіслач, Масты, Ліду на Вільню, ён хутка папаўняўся паўстаўшымі і неўзабаве дасягнуў колькасці каля 5 тыс. чалавек. 19 чэрвеня каля Вільні адбыўся бой паміж аб’яднанымі сіламі паўстанцаў і прыбыўшых польскіх войскаў з царскімі войскамі. Паўстанцы пацярпелі паражэнне. Несучы вялікія страты, яны змушаныя былі адыходзіць на захад. Вялікая частка польскіх сіл у сярэдзіне ліпеня перайшла мяжу Прусіі і склала зброю. Іншая частка (каля 4 тыс. чалавек) на чале з генералам Г. Дэмбінскім праз Гарадзенскую губерню адступіла да Варшавы. Падчас гэтага пераходу ў Навагрудскім павеце адбылося паўстанне шляхты пад кіраўніцтвам Ю. Кашыца. У пачатку жніўня 1831 г. паўстанне ўжо было падаўлена на ўсёй тэрыторыі Беларусі, а ў верасні рускае войска пад камандаваннем фельдмаршала І.Ф. Паскевіча авалодала Варшавай.

Вынікам паражэння паўстання для Каралеўства Польскага была ліквідацыя канстытуцыі 1815 г., асобнага польскага войска, сойма, а таксама ўвядзенне расійскага тэрытарыяльна-адміністрацыйнага дзялення.

Пасля падаўлення паўстання значныя змены адбыліся ў палітыцы царызму і ў Беларусі. Страціўшы давер да польскай і спаланізаванай мясцовай шляхты, царызм узяў курс на яе паслабленне, выкараненне паланізма і паслядоўнае русіфікаванне краю.

## 4. Грамадскі рух у 30-я – 50-я гг. XIX ст.

Пасля падаўлення паўстання рэвалюцыйны рух ставіў і імкнуўся вырашаць папярэднія і новыя задачы. Надзеі на вырашэнне эканамічных і палітычных праблем у рамках закону згінулі, і гэта ўнесла новыя рысы ў грамадска-палітычную думку і рух. Апошні па-ранейшаму быў цесна звязаны з польскім бокам – у краі дзейнічалі ячэйкі «Садружнасці польскага народа» (Пінск, Слуцк). На Беларусі распаўсюджвалася і прагна чыталася эмігранцкая прапагандысцкая літаратура, творы І. Лялевеля, А. Міцкевіча. Польская эміграцыя, у сваю чаргу, асабліва леварадыкальныя яе сілы, у першыя часы не губляла надзеі на ўзнаўленне ваенных і партызанскіх дзеянняў на тэрыторыі «рускай Польшчы».

Менавіта такі намер мела экспедыцыя 1833 г., якую ўзначаліў палкоўнік Ю. Заліўскі. Тэрыторыя будучых партызанскіх дзеянняў была разбіта ім на акругі з фактычным цэнтрам у Гродне. Стаўка рабілася на падняцце шырокага сялянскага руху. У сакавіку частка эмісараў з фальшывымі пашпартамі здолела перайсці граніцу Расійскай імперыі. Сярод іх быў і Міхал Валовіч, ураджэнец маёнтка Парэчча Слонімскага павета. Яму даручана было ўзначаліць партызанскія дзеянні ў Слонімска-Наваградскай акрузе. У хуткім часе Валовіч сфарміраваў невялікі атрад, ядро якога склалі сяляне яго вёскі. Уладам, аднак, удалося напасці на след мяцежнікаў. Валовіч быў дастаўлены ў Гродна. На допытах ён паказаў, што мэтай сваёй барацьбы бачыў вызваленне сялян, свабоду, роўнасць усіх людзей, і быў прысуджаны да пакарання смерцю цераз павешанне.

У 1838 годзе ў Вільні публічна быў расстраляны яшчэ адзін прадстаўнік польскай эміграцыі – Шыман Канарскі, стваральнік і кіраўнік эміграцкага таварыства «Маладая Польшча». З гэтай арганізацыяй і яе кіраўніком цесныя сувязі падтрымлівала віленскае «Дэмакратычнае таварыства», якое ўзначальваў ураджэнец Піншчыны, рэвалюцыянер і беларускі паэт Франц Савіч (1815 – 1845), адна з самых яркіх асоб у

гісторыі Беларусі XIX ст. Выхаванец Пінскага павятовага вучылішча Ф. Савіч у 1833 г. стаў студэнтам створанай на руінах разгромленага царскім урадам Віленскага універсітэта Віленскай медыка-хірургічнай акадэміі. Тут ён арганізаваў «Дэмакратычнае таварыства», у задачы якога ўваходзіла барацьба з дэспатызмам і падрыхтоўка рэвалюцыйнага выступлення. Мэты таварыства асноўваліся на арганічным непрыманні рускага самадзяржаўя як амаральнай формы праўлення і разуменні таго, што дэспатычная ўлада не пойдзе на ўступкі. Ідэалам палітычнага ладу для Савіча і яго сяброў было грамадства роўных магчымасцей. Яны вучыліся на ўроках гісторыі французскай рэвалюцыі, дзекабрысцкага руху і паўстання 1830 – 1831 гг., асэнсоўвалі памылкі папярэднікаў – шляхецкіх рэвалюцыянераў.

Адзін з папрокаў удзельнікам польскага паўстання члены «Дэмакратычнага таварыства» фармулявалі так: «Чаму тады ж не прызналі роўнасці мужыкоў?» Сам Савіч, па сведчанню сучаснікаў, быў «няўмольны ганіцель паноў». З’яўляючыся максімалістам і фанатыкам, ён дзеля вырашэння сялянскай праблемы не спыняўся і перад магчымасцю фізічнага знішчэння памешчыкаў.

Але ў 1838 годзе «Дэмакратычнае таварыства» было выкрыта, а праз год Савіч быў высланы на Каўказ у дзеючую армію. Спрабаваў уцякаць, але беспаспяхова. У красавіку 1841 года на беразе Церака былі знойдзены яго адзенне і «перадсмяротная» запіска – Савіч інсцэніраваў самагубства. Аднак і гэтыя ўцёкі, як і спроба дайсці да румынскай граніцы, не ўдаліся. Беглы салдат Савіч быў прысуджаны да двухгадовага зняволення ў ціраспальскай турме. Далей была зноў салдатчына і зноў уцёкі, цяпер удалыя. Потым затрымка ў Янішпале з-за вывіхнутай нагі, медыцынская практыка пад імем доктара Гельгега і раптоўная смерць ад халеры, калі пераход граніцы стаў для яго рэальнай магчымасцю.

Страх перад рэвалюцыйным рухам прымушаў уладу ўзмацніць нагляд за «напрамкам розумаў» жыхароў Беларусі. Пастаянна вяліся пошукі палітычных змоў і тайных таварystваў. Былі выкрыты змовы шляхцічаў у Віцебскай губерні ў 1848 г. і ў Мінску ў 1855 г. Здаралася, у празмернай руплівасці і пагоні за зычлівасцю начальства жандары не спыняліся і перад фабрыкацыяй палітычных спраў. Жандарская і паліцэйская актыўнасць мела вынікі: сялянскае паўстанне ў Галіцыі і рэвалюцыйныя падзеі ў Еўропе 1848 года адгукнуліся на Беларусі рэхам менш значным, чым чакалася. Аднак задушыць апазіцыйныя настроі ў краі не ўдалося.

У 1848 годзе з адозвай да сялян выступіў смаргонскі шляхціч Юльян Бакшанскі. Ён заклікаў сялян аб’яднацца з мяшчанамі, салдатамі і выступіць супраць паноў-прыгнятальнікаў. «Адозва да смаргонскіх сялян», народжаная галіцыйскімі падзеямі, моцна напалохала ўлады. Яны зрабілі ўсё, каб звузіць яе распаўсюджанне. Аўтар быў арыштаваны і прысуджаны да дванаццацігадовай катаргі. У 1863 годзе ён стане адным з кіраўнікоў паўстанцкага атрада і загіне ў сутычцы з царскімі войскамі.

Адзнака часу – актывізацыя ў грамадска-палітычным руху вучнёўскай моладзі краю. Юнакі чыталі і распаўсюджвалі нелегальную літаратуру, творы рэвалюцыйных дэмакратаў Польшчы і Расіі. Гурток, члены якога марылі «пра шчасце ўсяго грамадства», існаваў у Мінскай гімназіі. Некаторыя яе вучні ўваходзілі ў тайнае гарадское таварыства, якое існавала ў канцы 1840 гадоў і мэтай якога была падрыхтоўка паўстання. Члены яго вялі прапаганду сярод салдат Мінскага гарнізона, Бабруйскай крэпасці, сялян і былі звязаны з рэвалюцыйна настроенай студэнцкай моладдзю з Беларусі, Літвы, Украіны ва універсітэтах Расіі. Актыўна дзейнічала на Беларусі і падтрымлівала сувязі з групамі ў Лідскім, Навагрудскім, Слонімскім паветах віленскае тайнае таварыства «Брацкі саюз», створанае ўраджэнцамі Лідскага павета братамі Далеўскімі.

У асяроддзі тайных згуртаванняў гэтага часу, якое папаўнялася за кошт разначыннай плыні, выспявала рэвалюцыйна-дэмакратычная думка, назапашвалася глеба для будучага паўстання.

### Пытанні і заданні для самакантролю

1. Выдзеліце асаблівасці, асноўныя накірункі і формы грамдска-палітычнага руху ў першай палове XIX ст.

2. Назавіце першыя тайныя таварыствы студэнцкай і вучнёўскай моладзі, якія дзейнічалі на тэрыторыі Беларусі і Літвы ў першай чвэрці XIX ст. Калі яны ўзніклі, якія мэты і задачы ставілі?

3. Прааналізуйце дзейнасць дзекабрыстаў на Беларусі. Назавіце прозвішчы рэвалюцыянераў-дзекабрыстаў, звязаных з нашай краінай.

4. Які водгук знайшлі на тэрыторыі Беларусі падзеі польскага паўстання 1830 – 1831 гг.? Як аднеслася сялянства Беларусі да паўстання?

5. Калі на Беларусі з’явіліся першыя арганізацыі разначынна-рэвалюцыйнага накірунку? Назавіце іх.

6. Якая роля належыць Францу Савічу ў развіцці рэвалюцыйнага руху на Беларусі?

# ЛЕКЦЫЯ 7
## Культура. Ад асветніцтва да рамантызму

1. Сацыяльна-палітычныя ўмовы і асноўныя накірункі развіцця культуры.
2. Фарміраванне сістэмы свецкай і духоўнай адукацыі.
3. Станаўленне беларусазнаўства.
4. Выспяванне беларускай нацыянальнай ідэі ў мастацкай літаратуры.

### 1. Сацыяльна-палітычныя ўмовы развіцця культуры

У першай палове XIX ст. у жыцці народа і ў развіцці беларускай культуры пачаўся новы перыяд, які адрозніваўся ад папярэдняга, калі Беларусь знаходзілася ў складзе Рэчы Паспалітай. Змены адбываліся істотныя, хоць і неадназначныя па сваім характары. З аднаго боку, далучэнне беларускага краю да расійскай гаспадарчай сістэмы з яе шырокім рынкам садзейнічала агульнаму ажыўленню эканамічнага жыцця, пашырэнню гандлю, прамысловасці, будаўніцтву новых дарог і каналаў, развіццю гарадоў. З другога – сам напрамак палітыкі Расійскай дзяржавы з яе імперскімі інтарэсамі і манархічнымі ідэаламі садзейнічаў ігнараванню нацыянальна адметнага і паступовай русіфікацыі тых народаў (беларусаў і ўкраінцаў), якія, згодна з тагачаснымі афіцыйнымі ўяўленнямі, з’яўляліся толькі этнічнымі адгалінаваннямі ад рускіх.

Жорсткі сацыяльна-палітычны прыгнёт з боку царскага самаўладства, а таксама і польскіх памешчыкаў, якія працягвалі гаспадарыць на беларускіх землях; цяжкая спадчына мінулага, якая падрывала веру ў саму магчымасць аднаўлення беларускай культуры; амаль поўная дэнацыяналізаванасць інтэлігенцыі; бяспраўнае становішча беларускай мовы, на якую ў тыя, ды і пазнейшыя, часы глядзелі не іначай як на «мужыцкі дыялект»; адсутнасць друкаваных выданняў на беларускай мове і як вынік гэтага аслабле-насць сувязей паміж людзьмі, што праяўлялі цікавасць да беларускай культуры, – усё гэта вельмі адмоўна адбівалася на развіцці культуры Беларусі першай паловы XIX ст.

І ўсё ж у дачыненні да нацыянальна-культурнага развіцця беларускага народа далучэнне Беларусі да Расійскай імперыі аб’ектыўна адыграла станоўчую ролю. Яно стварыла такую сітуацыю, якая востра паставіла праблему нацыянальнай самаідэнтыфікацыі беларусаў, паступова абудзіла павышаную цікавасць грамадскасці з расійскага боку да беларускага

пытання, да беларускай гісторыі, культуры, вуснай народнай творчасці, мовы, нарэшце, паставіла пытанне аб магчымасці існавання асобай нацыянальнай літаратуры на гэтай мове.

Важным фактарам фармавання асаблівасцей літаратуры, навукі, мастацтва і іншых галін культуры быў інтэнсіўны нацыянальна-вызваленчы рух. Ва ўмовах жорсткага паліцэйскага рэжыму, які асабліва моцна заявіў аб сабе ў час мікалаеўскай рэакцыі другой чвэрці стагоддзя, літаратура і мастацтва заставаліся бадай што адзінай трыбунай для прапаганды вызваленчых і прагрэсіўных ідэй. У самой культуры ішла вострая барацьба прагрэсіўных і рэакцыйных плыняў, ідэалаў, накірункаў.

Вызначальнай з’явай гісторыка-культурнага працэсу на Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. было паступовае фарміраванне беларускай нацыянальнай культуры. Нягледзячы на існаванне прыгонніцтва, аслоўны падзел грамадства, іншыя праявы феадальнага ладу, якія стрымлівалі працэс фарміравання нацыі і нацыянальнай культуры, а таксама насуперак памкненням улад, культура беларусаў перажывала ў гэты час перыяд адраджэння. Адной з найбольш важных прыкмет гэтага працэсу была прафесіяналізацыя беларускай культуры, узнікненне нацыянальнай літаратуры, тэатра, журналістыкі, асветы і іншых яе галін. У гэты перыяд пачынаюць закладвацца характэрныя, тыпалагічныя рысы беларускай культуры як культуры Новага часу.

Змены, якія адбываліся ў культуры, закраналі як формы культурнага жыцця, так і яго змест. Да новых форм арганізацыі культурнай дзейнасці належалі камерцыйны тэатр, мастацкія выстаўкі, перыядычны друк, публічныя бібліятэкі, кніжныя крамы і г. д. У гэты час пачынаецца працэс фарміравання інтэлігенцыі як адной з груп буржуазнага грамадства. У адрозненне ад Расіі, дзе ў інтэлігенты ў гэты час выбіваліся пераважна прадстаўнікі падатных саслоўяў, на Беларусі інтэлігенцкія прафесіі абіралі для сябе шляхцічы, пераважна небагатыя. Гэта была адна з магчымасцей забяспечыць сябе сродкамі для існавання, калі адсутнічала ўласная зямля і прыгонныя. Паходжанне інтэлігенцыі з шэрагаў паланізаванай беларускай шляхты абумоўлівала дваісты сацыяльны статус дзеячаў культуры, акрэслівала іх нацыянальныя сімпатыі і ўдзел у нацыянальна-вызваленчым руху.

Важнай зменай у ідэйна-сутнасным ладзе культуры ў першай палове XIX ст. было яе далейшае вызваленне з-пад улады царквы і рэлігійнага светаўспрымання. Працэс секулярызацыі культуры (аддзяленне ад царквы), распачаты ў часы Асветніцтва, быў працяглым і супярэчлівым,

па-рознаму праяўляўся ў галінах культуры. Але, нягледзячы на гэта, культура Беларусі ў першай палове мінулага стагоддзя мела ўжо выразныя свецкія рысы.

У першай палове XIX ст. назіраліся глыбокія перамены ў ідэйна-стылявым вобліку літаратуры і мастацтва. У адрозненне ад мінулых часоў, калі стылявыя накірункі панавалі ў мастацтве стагоддзямі (рэнесанс, барока), у XIX ст. мела месца хуткая іх змена – класіцызм, сентыменталізм, рамантызм, рэалістычнае мастацтва. На Беларусі з прычыны блізкасці моцных культур – польскай і рускай, а таксама асаблівасцей і ўмоў культурнага працэсу, гэтыя стылявыя накірункі ў многіх галінах мастацтва існавалі паралельна, пераплятаючыся нават у творчасці аднаго майстра ці ў спадчыне адной мастацкай школы.

Асаблівасці гістарычнага лёсу Беларусі абумовілі такое становішча ў культуры, што многія культурныя з’явы належалі адначасова мастацкай і літаратурнай спадчыне некалькіх народаў, якія ўваходзілі ў колішняе Вялікае княства Літоўскае.

## 2. Фарміраванне сістэмы свецкай і духоўнай адукацыі

Царскія ўлады сустрэлі на далучаных землях даволі складаную сітуацыю ў культурным жыцці – па многіх паказчыках яны былі вышэй у сваім развіцці, чым Расія. Напрыклад, даволі высокую адукаванасць мела шляхта, духавенства, мяшчане, пэўная частка сялянства. Сотні маладых людзей з заможных сем’яў ужо атрымалі адукацыю ці вучыліся ў еўрапейскіх навучальных установах. Справай адукацыі займаліся розныя багатыя і ўплывовыя манаскія ордэны, у першую чаргу – езуіты. Яны мелі школы ва ўсіх гарадах і мястэчках. У тагачасных калегіумах даваліся веды па матэматыцы, фізіцы, астралогіі, старажытных мовах і г. д., але насаджаліся сярэдневяковая схаластыка, рэлігійны фанатызм, варожасць да іншаверцаў.

Такое становішча існавала да 1803 г., калі пачалася першая школьная рэформа на Беларусі. Да гэтага часу тут мелася 130 пачатковых школ, 33 сярэднія і няпоўныя сярэднія школы, значная частка яўрэйскіх рэлігійных школ, каля 40 школ розных каталіцкіх ордэнаў. Агульная колькасць навучэнцаў складала (за выключэннем яўрэйскіх школ) каля 4 тыс. чалавек. Народныя вучылішчы былі даступнымі для ўсіх слаёў гарадскога насельніцтва.

У 1804 г. быў прыняты «Статут навучальных установ, падведамных універсітэтам». Утваралася наступная сістэма адукацыі: універсітэт – гімназія – павятовыя вучылішчы – прыходскія вучылішчы. Цікавым было тое, што кожная з адзначаных ступеняў мела свае мэты адукацыі, а таксама змест навучання. Утваралася і паслядоўнасць у атрыманні адукацыі – знізу ўверх. Тыя дзеці, што вучыліся дома, павінны былі здаваць экзамен, напрыклад, у гімназію. У павятовыя вучылішчы прымаліся толькі тыя вучні, якія атрымалі падрыхтоўку ў прыходскім вучылішчы ці іншай навучальнай установе.

Новымі навучальнымі ўстановамі для Беларусі сталі гімназіі – сярэднія агульнаадукацыйныя навучальныя ўстановы. У першай чвэрці XIX ст. былі адкрыты Мінская, Свіслацкая, Магілёўская, Жыровіцкая, Гродзенская гімназіі, а ў 1827 г. у гімназію было пераўтворана Слуцкае павятовае вучылішча. Спачатку гімназіі былі рэальнага накірунку, а тэрмін навучання складаў 4 гады. Выкладаліся фізіка, матэматыка, пачатковыя асновы тэхналогіі і камерцыйных навук, філасофія, гісторыя, геаграфія, статыстыка (да 1844 г.), польская, руская, лацінская, французская, нямецкая мовы і інш. Паводле школьнага статута 1828 г., тэрмін навучання быў падоўжаны на 7 год. Выкладаліся Закон Божы, царкоўная гісторыя, логіка (да 1847 г.), начартальная і аналітычная геаметрыя (да 1845 г.), чарчэнне і інш.

Абмежаванні пачынаюць уводзіцца расійскімі ўладамі пасля вядомага рэскрыпту Мікалая I, які ў 1827 г. дазволіў прымаць ва універсітэты і гімназіі толькі людзей свабодных саслоўяў, а памешчыцкім прыгонным сялянам і дваравым людзям «не забаранялася» вучыцца ў прыходскіх і павятовых вучылішчах. Афіцыйна пачынае дзейнічаць саслоўны прынцып адукацыі.

Пасля паўстання 1830 – 1831 гг. у адукацыі на Беларусі пачаўся перыяд «русіфікацыі» школьнай справы. Але да гэтага часу на адукацыю моцным быў польскі ўплыў. Вельмі спрыяла таму дзейнасць Віленскага універсітэта, утворанага ў 1803 г. на аснове вядомай нам Галоўнай школы ў Вільні. Менавіта гэты універсітэт быў вышэйшай навучальнай установай для беларускіх зямель да 1832 г. Універсітэт узначальваў Віленскую навучальную акругу, у якую ўваходзілі навучальныя ўстановы Віцебскай, Віленскай, Гродзенскай, Мінскай, Магілёўскай, Кіеўскай, Валынскай і Падольскай губерняў. Папячыцелем гэтай акругі стаў А. Чартарыйскі, які дамагаўся аб'яднання ўсіх зямель Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. пад агульным кіраўніцтвам рускага цара. Пад апекай Віленскага універсітэта ў

1803 г. знаходзілася 69 навучальных устаноў, больш паловы (44) з якіх утрымліваліся на сродкі розных манаскіх ордэнаў. Выкладанне ў большасці навучальных устаноў вялося на польскай мове. Паланізацыя насельніцтва, асабліва моладзі, дасягнула найбольшага маштабу ў параўнанні з папярэднімі гадамі.

Станоўчая роля Віленскага універсітэта ў тым, што пад яго кіраўніцтвам у кожным губернскім горадзе былі адчынены гімназіі, а ў цэнтрах уездаў (паветаў) – вучылішчы: у 1804 г. было 6 гімназій і 17 павятовых вучылішчаў, колькасць пачатковых (прыходскіх) школ узрасла да 154 з 2700 вучнямі ў іх.

У гэтых навучальных установах вывучаліся фундаментальныя навукі, як прыродазнаўчыя, так і гуманітарныя. Грунтоўна вывучаліся філасофія, гісторыя, лацінская, нямецкая, французская мовы, палітэканомія, статыстыка, матэматыка, фізіка (акрамя пачатковых школ).

Пасля паўстання 1830 – 1831 гг. царскія ўлады закрылі ў 1832 г. Віленскі універсітэт. Але на базе яго факультэтаў пэўны час існавалі Віленская медыка-хірургічная акадэмія і Віленская рымска-каталіцкая духоўная акадэмія. Так, медыка-хірургічная акадэмія (1832 – 1842 гг.) мела права складаць праграмы лекцый, выбіраць загадчыкаў кафедраў, бяспошлінна ўвозіць кнігі з-за мяжы, пасылаць маладых вучоных на стажыроўку ў замежныя універсітэты.

Першай вышэйшай навучальнай установай на тэрыторыі сучаснай Беларусі лічыцца Полацкая езуіцкая акадэмія. Заснавана яна была на базе езуіцкай калегіі ў 1812 г., за тыдзень да пачатку вайны Францыі і Расіі. Рэгулярныя заняткі пачаліся толькі 8 студзеня 1813 г. на трох факультэтах: тэалагічным, моў і мастацтваў, філасофіі і вольных навук. Напрыклад, на факультэце моў і мастацтваў выкладаліся руская, польская, французская, нямецкая, лацінская, грэчаская і старажытнаяўрэйская мовы. На факультэце філасофіі і вольных навук выкладалася філасофія, паэзія, рыторыка, логіка, чыстая і прыкладная метафізіка, грамадзянская і ваенная архітэктура, натуральнае права, агульная і прыродная гісторыя і інш. Колькасць студэнтаў – каля 600, а выкладчыкаў – 39.

Акадэмія мела правы універсітэта. Яе выпускнікі атрымлівалі чын 14-га класа і вучоную ступень. Паступова пачалі выкладаць у акадэміі і новыя навукі: хімію, заалогію, батаніку, палітычную эканомію, статыстыку. Мелася вялікая бібліятэка – каля 40 тыс. тамоў і буйная друкарня, дзе здолелі выпусціць каля 500 кніг на дзесяці мовах. Акадэмія

мела ілюстраваны часопіс «Полацкі штомесячнік», уплывала на развіццё грамадскай думкі, спрыяла абуджэнню грамадскай самасвядомасці.

З ліку студэнтаў Полацкай акадэміі выйшлі: гісторык, этнограф і археолаг К. Тышкевіч, філосаф А. Доўгірд, астраном Я. Накціяновіч. Тут вучыліся В. Ваньковіч, Я. Баршчэўскі.

Існаванне Полацкай акадэміі было забаронена ў адпаведнасці з царскім указам ад 13 сакавіка 1820 г., калі была забаронена дзейнасць ордэна езуітаў у межах Расійскай імперыі. Уся яе маёмасць перайшла да казны. Друкарня апынулася ў Кіеве. Каштоўныя мастацкія творы былі вывезены ў Пецярбургскую Акадэмію мастацтваў. З бібліятэкі Полацкай акадэміі было звезена 256 пудоў кніг.

У першай палове XIX ст. на ўсходняй Беларусі ўтвараецца яшчэ адзін навуковы і культурны цэнтр, яшчэ адна навучальная ўстанова вышэйшага тыпу – Горы-Горацкі земляробчы інстытут. Ён быў заснаваны ў 1848 г. у выніку рэарганізацыі ў інстытут вышэйшага разраду Горы-Горацкай земляробчай школы, якая існавала тут з верасня 1840 г. Тэрмін навучання складаў 4 гады. Прымалі выпускнікоў гімназій (без экзаменаў) і асоб, якія здалі экзамены за гімназічны курс. У розныя гады ў інстытуце навучалася ад 112 да 222 студэнтаў. Выкладаліся фізіка, хімія, батаніка, заалогія, паляводства, лугаводства, жывёлагадоўля, лесаводства, бухгалтэрыя, архітэктура, геадэзія, а таксама гуманітарныя навукі, на якія адводзілася амаль 1/4 вучэбнага часу. Сярод гуманітарных дысцыплін былі такія, як руская мова, гісторыя рускай літаратуры, замежная мова, права, логіка і інш. Адной з форм навучання была пастаноўка перад студэнтамі конкурсных задач, адказы на якія даваліся ў выглядзе сачыненняў, лепшыя з якіх адзначаліся залатым медалём.

Выпускнікі інстытута атрымлівалі спецыяльнасць агранома. Пры інстытуце дзейнічалі музеі (заалагічны, анатамічны і сельскагаспадарчых машын), батанічны сад (калекцыя налічвала больш за 5870 раслін), бібліятэка (больш за 7 тыс. тамоў), праводзіліся навуковыя даследаванні, навуковыя з’езды і сельскагаспадарчыя выстаўкі. За ўдзел студэнтаў і выкладчыкаў у паўстанні 1863 – 1864 гг. заняткі ў інстытуце былі спынены, а ў 1864 г. ён быў пераведзены ў Пецярбург і быў названы Пецярбургскім земляробчым інстытутам.

Такім чынам, знаёмства з сістэмай адукацыі, зместам навучання ў ёй, складам навучэнцаў і выкладчыкаў у разглядаемы перыяд дае падставы лічыць, што народная адукацыя знаходзілася ў сумным становішчы.

Нягледзячы на тое, што да 1860 г. было адкрыта звыш 100 школ для дзяцей дзяржаўных сялян, у якіх вучыліся звыш 2000 чалавек, адукацыя наогул не адпавядала сучасным патрабаванням. Не хапала сродкаў, трухлелі будынкі школ. Не хапала настаўнікаў, асабліва з ліку карэнных жыхароў. Настаўнікаў з Расіі заманьвалі на Беларусь больш высокай зарплатай, рознымі сацыяльнымі льготамі. Свецкія школы ўтвараліся там, дзе нагляд за імі можна было даручыць праваслаўнаму духавенству.

## 3. Станаўленне беларусазнаўства

Ужо ў часы існавання Віленскага універсітэта сярод яго студэнтаў і выкладчыкаў узнікла цікавасць да гісторыі і культуры Беларускага краю. Мясцовая шляхта таксама збірала калекцыі даўніны. Грамадскія вярхі займаліся самапазнаннем у польскамоўнай форме. Ва ўмовах царскай няволі, калі ішоў пошук шляхоў да незалежнасці, вартасць ведаў пра гісторыю свайго краю і пра свой народ узрастала. Мясцовых патрыётаў вельмі непакоіў той сацыяльны, рэлігійны і духоўны антаганізм, які існаваў паміж землеўладальнікамі і сялянамі Беларусі. Ён ніяк не спрыяў грамадскай кансалідацыі. Таму мясцовыя сяляне апынуліся ў цэнтры ўвагі многіх даследчыкаў. Хутка стала відавочна, што простыя людзі Беларусі не атаясамлівалі сябе ні з палякамі, ні з рускімі, а лічыліся «тутэйшымі». А гэта толькі ўзнімала цікавасць даследчыкаў. Напрыклад, мовазнаўца, фалькларыст, археолаг і этнограф Зарыян Даленга-Хадакоўскі (1784 – 1825) вызначыў тэрыторыю распаўсюджання беларускай мовы, апісваў беларускія абрады, шмат зрабіў для вывучэння старадаўніх гарадзішчаў Беларусі. Археолаг і этнограф Яўстафій Тышкевіч (1814 – 1873) на аснове шматлікіх матэрыялаў напісаў, а ў 1847 г. выдаў на польскай мове кніжку «Апісанне Барысаўскага павета». У 1855 г. ён стварыў Віленскі музей старажытнасцей, а пры ім Археалагічную камісію, якая арганізоўвала і кантралявала раскопкі ў краі. Гадаванец Віленскага універсітэта Тэадор Нарбут у 1834 – 1841 гг. напісаў дзевяцітомную гісторыю «літоўскага народа» (належнага да Вялікага Княства Літоўскага). Беларускі народ як самастойны суб’ект гісторыі пры гэтым яшчэ не вылучаўся. Аднак разуменне адметнасці беларусаў і іх гісторыі ўжо бачна ў працах прафесараў права Віленскага універсітэта Юзафа Ярашэвіча (1793 – 1860), Ігнація Даніловіча. Грунтоўная трохтомная праца Юзафа Ярашэвіча «Вобраз Літвы з пункту погляду цывілізацыі ад найдаўнейшых часоў да

канца XVIII стагоддзя» (1844 – 1845) стала першай гісторыяй беларускага права і дзяржаўнага ладу. Закрыццё Віленскага універсітэта звузіла магчымасці навуковай дзейнасці. Інтэлектуальнае жыццё канцэнтравалася вакол штогодніка «Дзённікі» Адама Кіркора і іншых польскамоўных выданняў, якія змяшчалі шмат матэрыялаў пра Беларусь. Гісторыку і літаратару Адаму Кіркору (1818 – 1886) належыць шэраг артыкулаў пра Беларусь, якія ўвайшлі ў вядомую працу «Живописная Россия» пад рэдакцыяй П. Сямёнава. Цэлая плеяда навукоўцаў даследавала мінулы і сучасны стан свайго краю. Канкрэтныя матэрыялы адкрывалі вочы на сапраўднае аблічча Беларусі. Вучоныя не знаходзілі тут нічога этнічна польскага і пачыналі шанаваць беларускую глебу, на якой самі стаялі. Таму іх навуковыя працы спрыялі ўмацаванню беларускасці, абуджалі ў адукаваных колах грамадства патрыятычныя пачуцці.

Рускамоўныя працы займалі сціплае месца ў жыцці беларусаў – часткова таму, што адрасаваліся рускаму чытачу і друкаваліся ў маладаступных навуковых выданнях. Асяродкі рускай культуры толькі пачыналі стварацца. У 1824 г. пры падтрымцы рускага графа Мікалая Румянцава пратаіерэй Іван Грыгаровіч (1792 – 1852) выдаў «Беларускі архіў», дзе былі сабраныя старабеларускія граматы. Ён жа быў складальнікам і першага «Слоўніка заходнерускай мовы». Этнограф Пётр Шпілеўскі (1823 – 1861) друкаваўся ў рускіх часопісах «Современник», «Иллюстрация», «Пантеон». Беларус па паходжанні, ён з вялікай любоўю ставіўся да сваёй Айчыны, добра ведаў яе звычаі і абрады, лічыў свой народ нашчадкам старажытных крывічоў і дрыгавічоў і ўшчыльную падыходзіў да разумення яго самабытнасці. Вядомасць Пятру Шпілеўскаму прынесла краязнаўчая кніжка «Падарожжа па Палессі і Беларускім краі». Ураджэнец Беларусі генерал-маёр Генеральнага штаба Міхаіл Без-Карніловіч (1796 – 1862) напісаў кніжку «Гістарычныя звесткі пра славутыя мясціны ў Беларусі...» (1855), дзе расказаў пра мясцовыя гарады з беларускага пункту гледжання. Такую ж пазіцыю займаў гісторык Восіп Турчыновіч у сваёй працы «Агляд гісторыі Беларусі ад старажытнейшых часоў» (1857). Гэта быў першы даследчык, які заявіў, што Беларусь мае ўласную гісторыю. Рускамоўныя навукоўцы, як і польскамоўныя, ішлі па адным і тым шляху, які вёў іх да збліжэння са сваім народам. Праўда, гэтаму істотна перашкаджаў моцны ўплыў на іх расійскай афіцыйнай імперскай дактрыны.

## 4. Выспяванне беларускай нацыянальнай ідэі ў мастацкай літаратуры

Вядучай сферай праяўлення беларускага нацыянальна-культурнага адраджэння з самага пачатку стала мастацкая літаратура. Ля яе вытокаў стаялі А. Міцкевіч, Я. Чачот, Я. Баршчэўскі, А. Рыпінскі, А. Вярыга-Дарэўскі, У. Сыракомля, В. Дунін-Марцінкевіч.

Адным з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры па праву лічыцца Я. Чачот (1796 – 1847). Ніколі не страцяць сваёй эстэтычнай вартасці сабраныя ім беларускія народныя песні і прыказкі. Выданне іх у 1837 – 1846 гг. у шасці зборніках «Вясковыя песні з-над Нёмана і Дзвіны» былі першымі па часе. Такім чынам, Я. Чачот – адзін з першаадкрывальнікаў беларускага фальклору. Упершыню пасля двух стагоддзяў маўчання са старонак добра аформленых друкаваных кніг загучала жывое беларускае слова. Два фальклорныя зборнікі паэта (1844 і 1846 гг.), у якіх ён змясціў уласныя беларускія вершы, засведчылі факт нараджэння новай беларускай літаратуры. Пяру Я. Чачота належаць і поўныя маладога запалу беларускія студэнцкія вершы і песні, якія былі папулярныя сярод яго сяброў-філаматаў, а таксама цікавыя, заснаваныя на народных паданнях рамантычныя балады, што істотна паўплывалі на А. Міцкевіча. Арыгінальныя творы Я. Чачота на беларускай мове, іх арыентацыя на дэмакратычнага чытача, грамадзянскі пафас і лірызм уздзейнічалі на далейшае развіццё беларускай літаратуры.

Свой след у айчыннай літаратуры пакінуў і А. Рыпінскі (1811 – 1900). У канцы 1839 г. на пасяджэнні Польскага літаратурнага таварыства ў Парыжы ён прачытаў даклад аб беларускіх народных песнях, а пазней дапоўніў яго гісторыка-літаратурнымі і этнаграфічнымі звесткамі, апісаннямі і характарыстыкамі абрадаў, выслоўяў беларусаў Віцебшчыны. Усе гэтыя матэрыялы ляглі ў аснову этнаграфічна-фальклорнай кнігі «Беларусь», якая пабачыла свет у Парыжы ў 1840 г.

Ілюструючы сваё даследаванне шматлікімі цытатамі, А. Рыпінскі зрабіў агляд розных жанраў беларускага фальклору. На яго думку, народная паэзія ў вуснай народнай творчасці тоіць «новыя невычарпальныя крыніцы мовы, гісторыі і паэзіі». На думку А. Рыпінскага, менавіта на фальклоры можна даследаваць «сапраўды нацыянальную, свабодную ад чужаземшчыны літаратуру». Паэт выкарыстоўваў беларускі фальклор і ва ўласных паэтычных творах.

Сярод літаратурнай спадчыны першай паловы XIX ст. асобнае месца займае ўзор рамантычнай прозы «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях» Я.Баршчэўскага (1794 – 1851), у якім шырока выкарыстаны народныя казкі і паданні. Крытыкі называлі гэты твор беларускім цыклам «Тысяча і адна ноч». На прыкладзе гэтага аўтара бачна, з якімі цяжкасцямі сустракалася на сваім шляху маладая беларуская літаратура. Яны не ў малой ступені заключаліся ў тым, што значная частка адукаваных беларусаў лепш валодала польскай і рускай, чым роднай мовай. Менавіта з такой акалічнасцю давялося лічыцца аднаму з пачынальнікаў беларускай літаратуры Я. Баршчэўскаму. Названы твор напісаны ім на беларускім матэрыяле, але па-польску. Аўтар тлумачыць гэта наступным чынам: «Не ўсім чытачам можа быць зразумела беларуская мова, таму мясцовыя апавяданні, якія я пачуў з вуснаў народа, я вырашыў, наколькі змог, перадаць у даслоўным перакладзе па-польску». Тут Я. Баршчэўскі мог мець на ўвазе чытачоў не толькі карэнных польскіх, але і беларускіх зямель, тым больш што і сама кніга выйшла з друку не ў Варшаве, а ў Пецярбургу.

І ўсё ж беларускую нацыянальную ідэю, якая нараджалася і выспявала менавіта ў XIX ст., наймацней успрыняў В. Дунін-Марцінкевіч (1807 – 1884). Хоць ён, як і яго папярэднікі, быў выхаваны на ўзорах польскай літаратуры і культуры і па-польску пісаў больш, чым па-беларуску, але першым глыбока зразумеў, што беларуская літаратура можа ўзнікнуць толькі на грунце духоўнага народнага жыцця.

Па тэматыцы, ахопу з’яў сучаснай яму рэчаіснасці спадчына В. Дуніна-Марцінкевіча найшырэйшая і найбагацейшая ў беларускай літаратуры XIX ст. У адрозненне ад іншых пісьменнікаў, ён не абмінае ў сваіх творах жыцця дваранства, шляхецкага, дробнамаёнткавага асяроддзя («Сялянка», «Вечарніцы», «Гапон», «Пінская шляхта»), а таксама гістарычнай тэматыкі («Славяне ў XIX стагоддзі», «Люцынка, або Шведы на Літве»), чым значна пашырае межы айчыннай літаратуры. Але, як і ў іншых беларускіх пісьменнікаў, большая частка напісанага прысвечана жыццю вёскі, яе побыту, апісанню характару селяніна. Вясковы чалавек, яго праца, кола этычных, маральных, эстэтычных уяўленняў – усё гэта складае асноўны змест творчасці В. Дуніна-Марцінкевіча. Менавіта яму айчынная літаратура абавязана глыбокім мастацкім пранікненнем у душу свайго народа. Пасля азнаямлення з яго творамі няўмольна змяншалася

колькасць людзей, што адмаўлялі арыгінальны характар, самабытнасць беларускай мастацкай літаратуры, якая стваралася толькі на ўласцівым для яе адной моўным матэрыяле.

Гаворачы пра беларускую літаратуру першай паловы XIX ст., варта падкрэсліць, што яна з’яўлялася найважнейшым сродкам і формай развіцця агульнанацыянальнай літаратурнай мовы. Апошняя пачала фарміравацца на аснове жывой шматдыялектнай народнай гаворкі без непасрэднай апоры на здабыткі і традыцыі старабеларускага пісьменства. Нанова, вядома, склаліся правапісныя і граматычныя нормы, грамадска-палітычная, навуковая і іншая лексіка. Пры гэтым пісьменнікі выкарыстоўвалі ў сваёй творчасці дыялекты роднай ім мясцовасці і ў залежнасці ад паходжання і культуры выхавання – розны алфавіт: ці лацінскі – польскага ўзору, ці кірылічны – рускага. Так, аўтарамі выдатных твораў нацыянальнай літаратуры «Энеіда навыварат» і «Тарас на Парнасе», імёны якіх засталіся невядомымі, былі прадстаўнікі беларускай творчай інтэлігенцыі, выхаванай у рускай культуры. Першая паэма напісана ў 10 – 20-я гг. XIX ст., другая – не пазней сярэдзіны стагоддзя. Упершыню яны з’явіліся ў друку адпаведна ў 1845 і 1889 гг. Гэтыя творы – выдатныя ўзоры літаратурнай апрацоўкі сярэднебеларускай гаворкі, якая і стала асновай новай беларускай літаратурнай мовы.

## Пытанні і заданні для самакантролю

1. Якія фактары ўплывалі на культурнае развіццё Беларусі ў першай палове XIX ст. Ахарактарызуйце іх.

2. Якія змены адбыліся ў сістэме адукацыі ў першыя дзесяцігоддзі XIX ст.?

3. Вызначце ролю Віленскага універсітэта ў сістэме адукацыі нашага краю.

4. Назавіце імёны выдатных навукоўцаў Беларусі таго часу. З якімі галінамі навукі і навучальнымі ўстановамі яны былі звязаны?

5. З дзейнасцю якіх навучальных устаноў звязана духоўная адукацыя на Беларусі ў першай палове XIX ст.?

6. Каго з пісьменнікаў і паэтаў Беларусі першай паловы XIX ст. вы ведаеце? Як іх творчасць паўплывала на выспяванне беларускай нацыянальнай ідэі?

## ЛЕКЦЫЯ 8
## Беларусь у другой палове XIX ст.

1. Асноўныя напрамкі і вынікі навуковых даследаванняў.
2. Класіфікацыя крыніц і іх асноўныя віды.

### 1. Асноўныя напрамкі і вынікі навуковых даследаванняў

У якасці важнейшых праблем гістарычнага развіцця Беларусі ў другой палове XIX ст. выдзяляюцца: адмена прыгоннага права і рэалізацыя рэформы 1861 г., паўстанне 1863 – 1864 гг., палітыка царызму пасля падаўлення паўстання, буржуазныя рэформы 60 – 70-х гадоў, развіццё капіталізму ў сельскай гаспадарцы і прамысловасці, фарміраванне класаў буржуазнага грамадства, грамадска-палітычны рух, фарміраванне беларускай нацыі і развіццё культуры і інш.:

- *адмена прыгоннага права і рэалізацыя рэформы 1861 г.* (Улащик, Н.Н. Предпосылки крестьянской реформы 1861 г. в Литве и Западной Белоруссии / Н.Н. Улащик. – М., 1965; Фридман, М.Б. Отмена крепостного права в Белоруссии / М.Б. Фридман. – Минск, 1958.; Зайончковский, П.А. Отмена крепостного права в России / П.А. Зайончковский. – М., 1968);
- *паўстанне 1863 – 1864 гг. і палітыка царызму пасля падаўлення паўстання* (Ігнатоўскі, У.М. 1863 год на Беларусі. Нарыс падзей / У.М. Ігнатоўскі. – Мінск, 1930; Смирнов, А.Ф. Революционные связи народов России и Польши / А.Ф. Смирнов. – М., 1962; Ён жа. Восстание 1863 года в Литве и Белоруссии. – М., 1963; Самбук, С.М. Политика царизма в Белоруссии во второй половине XIX века / С.М. Самбук. – Минск, 1980; Казбярук, У. Нацыянальнае і аграрнае пытанне ў час паўстання 1863 – 1864 гг. / У. Казбярук // Беларускі гістарычны часопіс. – 1993. – № 3; Кісялёў, Г.В. Сейбіты вечнага. – Мінск, 1963; Кісялёў Г.В. На пераломе дзвюх эпох. Паўстанне 1863 г. на Міншчыне / Г.В. Кісялёў. – Мінск, 1990; Шалькевич, В. Кастусь Калиновский: Страницы биографии / В. Шалькевич. – Мінск, 1988);
- *буржуазныя рэформы 60 – 70-х гадоў* (Великие реформы в России. 1856 – 1874. – М., 1992; Соболева, Е.В. Организация науки в пореформенной России / Е.В. Соболева. – Л., 1983; Чернуха, В.Г. Внутренняя политика царизма с середины 50-х до начала 80-х гг. XIX в. / В.Г. Чернуха. – Л, 1978; Юхо І.А. Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі. – Мінск, 1994;

Свір, А.Ф. Асаблівасці правядзення судовай рэформы на Грдзеншчыне // Весці АН Беларусі. Серыя грамадскіх навук / А.Ф. Свір. – 1993. – № 4);

- *развіццё капіталізму ў сельскай гаспадарцы і прамысловасці і фарміраванне класаў буржуазнага грамадства* (Довнар-Запольский, М.В. Народное хозяйство Белоруссии (1861 – 1914 гг.) / М.В. Довнар-Запольский. – Минск, 1926; Дудкоў, Д.А. Аб развіцці капіталізму ў Беларусі ў другой палове XIX і пачатку XX стст. / Д.А. Дудкоў. – Мінск, 1932; Абезгауз, З.Е. Развитие промышленности и формирование пролетариата Белоруссии во второй половине XIX в. / З.Е. Абезгауз. – Минск, 1971; Бейлькин, Х.Ю. Аграрный кризис конца XIX века и структурная реконструкция сельского хозяйства Беларуси / Х.Ю. Бейлькин. – Минск, 2001; Болбас, М.Ф. Промышленность Белоруссии (1860 – 1900) / М.Ф. Болбас. – Минск, 1978; Кожушков, А.И. Развитие капитализма в сельском хозяйстве Белоруссии во второй половине XIX в. / А.И. Кожушков. – Минск, 1963; Липинский, Л.П. Развитие капитализма в сельском хозяйстве Белоруссии (2-я половина XIX века) / Л.П. Липинский. – Минск, 1971; Панютич, В.П. Социально-экономическое развитие белорусской деревни в 1861 – 1900 г. / В.П. Панютич. – Минск, 1990; Панютич, В.П. Из истории формирования пролетариата Белоруссии (1861 – 1914 гг.) / В.П. Панютич. – Минск, 1969; Шыбека, З. Гарады Беларусі (60-я гады XIX – пачатак XX ст.) / З. Шыбека. – Мінск, 1997);
- *грамадска-палітычны рух* (Бич, М.О. Развитие социал-демократического движения в Белоруссии в 1883 – 1903 г. / М.О. Бич. – Минск, 1973; Бригадин, П.И. Эсеры в Белоруссии (конец XIX – февраль 1917 г.) / П.И. Бригадин. – Минск, 1994; Лосинский, Н.Б. Революционно-народническое движение в Белоруссии 1870 – 1884 г. / Н.Б. Лосинский. – Минск, 1983; Нарысы з гісторыі грамадскай думкі на Беларусі ў XIX і пачатку XX стст. – Мінск, 1993; Самбук, С.М. Общественно-политическая мысль Белоруссии во второй половине XIX в. / С.М. Самбук. – Минск, 1976; Соколова, М.А. Общественные объединения и движения в Беларуси в конце XVIII – начале XX века: проблемы становления гражданского общества / М.А. Соколова. – Минск, 2002; Солошенко, В.И. От народничества к марксизму / В.И. Солошенко. – Минск, 1973);
- *фарміраванне беларускай нацыі і развіццё культуры* (Луцкевіч, А. Да гісторыі беларусскага руху: выбранныя творы / А. Луцкевіч. – Мінск 2003; Цьвікевіч, А. «Западноруссизм»: Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX в. / А. Цьвікевіч. – Мінск, 1993; Карнейчык, Я.І. Беларуская нацыя. Гістарычны нарыс / Я.І. Карнейчык. –

Мінск, 1969; Очерки истории и культуры Беларуси IX – начала XX в. – Минск, 1996; Культурна-нацыянальныя працэсы на Беларусі ў другой палове XIX – XX ст.: зб. навук. прац / пад агульн. рэд. М. Забаўскага, І. Канапацкага. – Мінск, 1998; Снапкоўская, С.В. Ля вытокаў нацыянальнай педагогікі: з гісторыі школы і педагагічнай думкі Беларусі канца XIX – пачатку XX ст. / С.В. Снапкоўская. – Мінск, 1995; Дробов, Л.Н. Живопись Белоруссии XIX – начала XX в. / Л.Н. Дробов – Минск, 1974; Каханоўскі, Г.А. Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI – XIX стст. / Г.А. Каханоўскі. – Мінск, 1984).

## 2. Класіфікацыя крыніц і іх асноўныя віды

Важную групу гістарычных крыніц складаюць *помнікі заканадаўства.* Гэта законы, маніфесты, палажэнні, указы, рэскрыпты ўрада Расійскай імперыі, якія дазваляюць прасачыць яго палітыку на тэрыторыі Беларусі. Асноўнай публікацыяй дадзеных крыніц, безумоўна, з'яўляецца «Полное собрание законов Российской империи» (Собр. 2-е с 12 декабря 1825 г.: в 55 т. СПб., 1830 – 1885; Собр. 3-е с 1 марта 1881 г.: в 33 т. СПб., 1885 – 1916).

Зводы законаў дапаўняюцца тэматычнымі зборамі заканадаўчых актаў. Сярод іх – зборнікі, для якіх спецыяльна падбіраліся дакументы, што маюць дачыненне да розных галін жыцця заходніх губерняў (Никотин, И.А. Столетний период (1772 – 1872) русского законодательства в воссоединенных от Польши губерниях и законодательство о евреях (1649 – 1876): в 2 т. / И.А. Никотин. – Вильно, 1886; Полный хронологический сборник законов и положений, касающихся евреев. – СПб, 1874; Громачевский, С.Г. Ограничительные законы по землевладению в Западном крае / С.Г. Громачевский. – СПб., 1904; Блосфельдт, Г. Сборник законов о российском дворянстве. 1901 – 1902 гг. / Г. Блосфельдт. – СПб., 1903).

Вялікую групу дакументаў, без якіх немагчыма вывучэнне ніводнай праблемы па гісторыі Беларусі канца XVIII – пачатку XX ст., складаюць *матэрыялы справаводства цэнтральных і мясцовых органаў дзяржаўнай улады.* Апрацоўка гэтага велізарнага дакументальнага пласта, які з'яўляецца крыніцазнаўчым фундаментам для кожнага гістарычнага даследавання, пачалася яшчэ ў XIX – пачатку XX ст. У выніку з'явіліся

зборнікі дакументаў, якія не страцілі навуковай каштоўнасці да нашых дзён (Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-западной Руси. Вильна, 1867. Т. 2; Акты, издаваемые Виленскою комиссиею для разбора древних актов: в 39 т. – Вильно, 1865 – 1915. – Т. 16, 1889; Т. 31, 1906; Т. 37, 1912; Архив Государственного совета. СПб., 1869). Значная колькасць матэрыялаў справаводства знаходзіцца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ў г. Мінску (Ф. 1430 – канцылярыя Віцебскага грамадзянскага губернатара, Ф. 295 – Мінскага губернатара, Ф. 2001 – Магілёўскага губернатара).

Для гісторыкаў, якія цікавяцца асобнымі праблемамі гісторыі Беларусі XIX – пачатку XX ст., вялікую каштоўнасць уяўляюць *тэматычныя зборнікі матэрыялаў* афіцыйнага справаводства, падборкі дакументальных дадаткаў, што суправаджалі тыя ці іншыя манаграфічныя выданні (Восстание в Литве и Белоруссии 1863 – 1864 гг. Документы и материалы. – М., 1965; Белоруссия в эпоху капитализма: в 2 т. – Минск, 1983. – Т. 1; – Минск, 1990. – Т. 2.; Архив «Земли и воли» и «Народной воли»: сб. док. / ред. и предисл. С.Н. Волка. – М., 1932; Первый съезд РСДРП. Документы и материалы. – М., 1958).

Выключна важнай, а ў шэрагу выпадкаў і адзінай крыніцай для вывучэння гістарычных працэсаў, што адбываліся на тэрыторыі Беларусі ў азначаны перыяд, з’яўляюцца *статыстычныя матэрыялы* (Статистический временник Российской империи. Серия II. Вып. 8 – 25. – СПб., 1872 – 1884; Серия III. Вып. 3 – 25. – СПб., 1884 – 1890; Статистика Российской империи. – СПб. – Пг, 1890 – 1916. Т. 11 – 93; Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, Ф. 2502 – Віцебскі губернскі Статыстычны камітэт, Ф. 21 – Мінскі, Ф. 2187 – Магілёўскі, «Эканамічны стан гарадскіх пасяленняў Еўрапейскай Расіі ў 1861 – 1862 гг.», «Спіс землеўладальнікаў Мінскай губерніі за 1876 г.»).

Асноўнай дэмаграфічнай крыніцай другой паловы XIX ст. з’яўляюцца *перапісы насельніцтва*. Першы ўсеагульны перапіс насельніцтва Расійскай імперыі 1897 г. – адзіная больш-менш дакладная крыніца, якая дае шырокі спектр дэмаграфічных характарыстык народанасельніцтва канца XIX ст. Абсалютная большасць матэрыялаў перапісу 1897 г. была апрацавана і выдадзена асобнымі кнігамі па кожнай губерні, у тым ліку і пяці беларускіх (Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 г. Вып. IV, V, XI, XXII, XXIII. – СПб., 1903 – 1904).

Вялікі інфармацыйны матэрыял утрымліваюць разнастайныя *органы перыядычнага друку* («Губернскія ведамасці», «Епархіяльныя ведамасці», «Памятныя кніжкі…»). Значная колькасць матэрыялаў пра Беларусь друкавалася ў часопісах: «Часопіс Міністэрства ўнутраных спраў», «Часопіс мануфактур і гандлю», «Часопіс міністэрства народнай асветы», «Руская старына» і інш. Аналіз перыядычных выданняў адыгрывае важную ролю ў разуменні працэсу развіцця грамадскіх рухаў. Перш за ўсё гэта часопіс «Вестник Западной России», газеты «Мужыцкая праўда», «Минский листок» і інш.

### Пытанні і заданні для самакантролю

1. Вызначце асноўныя напрамкі і тэмы навуковых даследаванняў па гісторыі Беларусі другой паловы XIX ст.
2. Працы якіх гісторыкаў прысвечаны развіццю капіталізма ў сельскай гаспадарцы і прамысловасці Беларусі?
3. Якія падыходы да праблемы фарміравання беларускай нацыі існуюць у гістарыяграфіі?
4. Назавіце класіфікацыю і асноўныя віды крыніц па гісторыі Беларусі другой паловы XIX ст.
5. Ахарактарызуйце матэрыялы органаў перыядычнага друку другой паловы XIX ст. як адну з важнейшых інфармацыйных крыніц па гісторыі Беларусі.

## ЛЕКЦЫЯ 9
## Мадэрнізацыйныя працэсы ў Беларусі

1. Мадэрнізацыя і яе асноўныя накірункі ў другой палове XIX ст.
2. Фарміраванне сацыяльнай структуры буржуазнага грамадства.

### 2. Мадэрнізацыя і яе асноўныя накірункі ў другой палове XIX ст.

Мадэрнізацыя грамадства, альбо ўдасканаленне (змяненне) палітычнай, эканамічнай, сацыяльнай і культурнай сфер жыцця ў адпаведнасці з патрабаваннямі часу, у Беларусі ў другой палове XIX ст., была звязана з пераходам ад феадальнага грамадства да буржуазнага.

У краінах Заходняй Еўропы пераход да капіталістычных адносін суправаджаўся наступнымі з'явамі:

**У палітычным жыцці**:

• Прыход буржуазіі да ўлады прыводзіць да разбурэння феадальнага абсалютызму, станаўлення рэспублік уласнікаў, у якіх правамі грамадзяніна валодаюць толькі ўласнікі сродкаў вытворчасці (маёмасны цэнз).

• Буржуазія здзяйсняе палітычнае кіраўніцтва праз парламенты, муніцыпалітэты.

• Адбываецца падзел заканадаўчай, судовай і выканаўчай улад (прынцып падзелу ўлад).

• Фарміруюцца буржуазныя правы і свабоды.

**У эканамічным жыцці:**

• Пераход ад рамеснай вытворчасці да мануфактурнай і фабрычна-завадской.

• Фарміраванне буржуазнай уласнасці на сродкі вытворчасці.

• Эксплуатацыя наёмнай працы.

• Хуткае развіццё таварна-грашовых адносін, якое садзейнічае фарміраванню агульнадзяржаўнага ўнутранага рынка.

• Інтэнсіўны працэс урбанізацыі.

**У сацыяльным і культурным жыцці:**

• значнае спрашчэнне сацыяльнай структуры грамадства ў выніку знікнення некаторых пластоў і праслоек феадальнага грамадства, з’яўленне двух асноўных класаў – буржуазіі і пралетарыяту;

• дыферэнцыяцыя вёскі;

• фарміраванне нацыянальнай буржуазнай інтэлігенцыі;

• фарміраванне буржуазных нацый.

**Асаблівасці фарміравання капіталістычных адносін на Беларусі:**

• захаванне вялікай удзельнай вагі дробнатаварнай вытворчасці ў прамысловасці;

• прускі шлях развіцця капіталізму ў сельскай гаспадарцы;

• канцэнтрацыя какпіталу ў сельскай мясцовасці;

• абмежаваныя палітычныя змяненні ва ўмовах панавання феадальнага абсалютызму;

• перашкоды палітыкі русіфікацыі Расійскага самадзяржаўя фарміраванню беларускай нацыі;

• спецыфіка сацыяльнага і нацыянальнага складу насельніцтва Беларусі.

## 2. Фарміраванне сацыяльнай структуры буржуазнага грамадства

У другой палове XIX ст. на Беларусі адбывалася фарміраванне асноўных класаў і сацыяльных груп буржуазнага грамадства: пралетарыяту, буржуазіі і інтэлігенцыі. Утварэнне прамысловага пралетарыяту Беларусі пачалося яшчэ ў дарэформенны перыяд, але працэс гэты ішоў марудна. Пастаянныя кадры вольнанаёмных рабочых складваліся па меры росту капіталістычнай вытворчасці.

Якія пласты насельніцтва з’яўляліся асноўнай крыніцай фарміравання рабочага класа Беларусі? Па-першае, развіццё капіталізму ў сельскай гаспадарцы прыводзіла да разарэння сялянства і ўтварэння лішняй рабочай сілы ў вёсцы. У 1890 г. у вёсках пяці беларускіх губерній было 1127,7 тыс. рабочых рук, якія не знаходзілі выкарыстання ў сельскай гаспадарцы. Значная частка лішняга сельскага насельніцтва была занята неземляробчым промыслам. Збяднелае сялянства з’яўлялася важнейшай крыніцай, у якой магла чэрпаць рэзервы рабочай сілы прамысловасць.

Па-другое, у ходзе развіцця капіталізму разараліся мяшчане-саматужнікі, рамеснікі, дробныя гандляры, якія таксама папаўнялі шэрагі рабочага класа. Пралетарыят Беларусі папаўняўся і за кошт членаў сямей рабочых – жанчын і падлеткаў, аплата працы якіх была значна меншая, чым у мужчын.

У канцы XIX ст. у прамысловасці Беларусі скláліся кадры пастаянных рабочых. У 1900 г. на прадпрыемствах з колькасцю працуючых больш за 50 пастаянныя рабочыя складалі па Гродзенскай губерніі 98 %, Віленскай і Віцебскай – 88 %, Магілёўскай – 85 %, Мінскай – 79 %.

Кадры прамысловых рабочых Беларусі фарміраваліся галоўным чынам з мясцовага насельніцтва. Аднак іх шэрагі часткова папаўняліся выхадцамі з цэнтральных прамысловых раёнаў Расіі, а таксама з Польшчы. Яны перадавалі беларускім рабочым свае вытворчыя навыкі і рэвалюцыйныя традыцыі.

Па ступені канцэнтрацыі пралетарыяту Беларусь адставала не толькі ад галоўных прамысловых цэнтраў, але і ад усёй краіны. Тут пераважалі сярэднія і дробныя прадпрыемствы, на кожным з якіх працавала менш за 50 чалавек. К канцу XIX ст. яны складалі 85,5 % ад прадпрыемстваў

цэнзавай прамысловасці (па Расіі 70,5 %). У той жа час фабрык і заводаў з колькасцю рабочых больш за 500 чалавек на Беларусі было толькі 9, або 1,1 % ад агульнай колькасці прадпрыемстваў (па Расіі 3,5 %).

Распыленасць рабочых па дробных прадпрыемствах і нязначная ўдзельная вага рабочых, занятых на буйных фабрыках і заводах, з'яўлялася спецыфічнай асаблівасцю структуры рабочага класа Беларусі. Рабочыя дробных і сярэдніх прадпрыемстваў, асабліва размешчаных у сельскай мясцовасці, мелі шырокія сувязі з сельскай гаспадаркай, што ўплывала на рост іх палітычнай свядомасці і рэвалюцыйнай актыўнасці.

К канцу XIX ст. асноўная маса рабочых была занята ў металаапрацоўчай, вінакурна-гарэлачнай, лесапільнай і дрэваапрацоўчай, запалкавай, шкляной, цагельна-ганчарнай, папярова-кардоннай прамысловасці. Найбольш хуткі рост колькасці рабочых назіраўся ў запалкавай, лесапільнай і дрэваапрацоўчай, крахмальна-патачнай, шкляной і металаапрацоўчай вытворчасцях.

Рабочы клас Беларусі быў шматнацыянальны па свайму складу. Разам з беларусамі ў прамысловасці працавалі рускія, украінцы, яўрэі, палякі, літоўцы, латышы і інш. Па падліках беларускага даследчыка М. В. Біча, у канцы XIX ст. у прамысловасці, на транспарце, у гандлі, сувязі, а таксама ў якасці хатняй прыслугі і падзёншчыкаў было занята 290 тыс. рабочых, з іх 49,7 тыс. (17,1 %) беларусаў, 29,4 (10,1 %) рускіх, 29,6 (10,2 %) палякаў, 174 тыс. (60 %) яўрэяў, 2,3 тыс. (0,8 %) літоўцаў, 3,6 (1,3 %) латышоў, 1,6 тыс. (0,6 %) украінцаў. У складзе фабрычна-заводскага і чыгуначнага пралетарыяту, які налічваў 85 тыс. чалавек, большасць складалі беларусы, рускія і палякі.

Суадносіны паміж рабочымі розных нацыянальнасцей залежалі ад месца знаходжання прадпрыемстваў і характару прамысловай вытворчасці. На прадпрыемствах, размешчаных у сельскай мясцовасці, а таксама на чыгунцы было больш беларусаў, палякаў, рускіх. У рамеснай і дробнай вытворчасці пераважалі рабочыя – яўрэі. Але і тут значную частку складалі беларусы, рускія, палякі і прадстаўнікі іншых нацыянальнасцей. У асяроддзі фабрычна-заводскага пралетарыяту пераважалі беларускія, рускія і польскія рабочыя, якія складалі не менш як 75 % усіх рабочых, занятых у буйной прамысловасці і на чыгуначным транспарце. Шматнацыянальны склад прамысловага пралетарыяту выкарыстоўвалі заводчыкі і адміністрацыя для распальвання нацыянальнай варожасці паміж рабочымі і наступлення на жыццёвы ўзровень працоўных.

На Беларусі большай, чым у другіх раёнах краіны, заўсёды была рэзервовая рабочая сіла, якая ў пошуках свайго прымянення ішла на сезонныя або пастаянныя работы на прамысловыя прадпрыемствы цэнтральных губерняў Расіі. У канцы XIX ст. каля 92 тыс. ураджэнцаў Беларусі пастаянна працавалі за яе межамі. Вялікая колькасць сялян і рамеснікаў, якія даходзілі да галечы, перасялялася ў Сібір або эмігравала за мяжу, пераважна ў ЗША і Канаду.

Развіццё прамысловасці і гандлю спрыяла фарміраванню значнага слоя прадпрымальнікаў. Буржуазія пашыралася за кошт прадстаўнікоў розных саслоўяў, найперш дваранства і купецтва, а таксама мяшчан, пачэсных грамадзян і інш. Асноўная маса мануфактур і фабрык да канца XIX ст. належала дваранам. Гэта былі пераважна прадпрыемствы па прамысловай перапрацоўцы сельскагаспадарчай прадукцыі з памешчыцкіх маёнткаў. Уладальнікамі дробных прадпрыемстваў у гарадах і мястэчках Беларусі з'яўляліся звычайна мяшчане, у большасці яўрэі.

За другую палову XIX ст. агульная колькасць уладальнікаў прамысловых прадпрыемстваў Беларусі вырасла з 28,2 тыс. у 1860 г. да 77,1 тыс. чалавек у 1900 г. У іх лік уваходзілі гаспадары рамесных, дробнакапіталістычных і мануфактурна-фабрычных прадпрыемстваў. 75 % уладальнікаў прадпрыемстваў складалі прадстаўнікі першых дзвюх катэгорый (рамесных і дробнакапіталістычных). Астатнія 25 % з'яўляліся ўладальнікамі мануфактурна-фабрычных прадпрыемстваў, але толькі каля 2,5 % з іх (1897 чалавек) адносіліся да буйной і сярэдняй буржуазіі.

У 1890 г. сярод 343 уладальнікаў фабрык і заводаў у Беларусі, улічаных афіцыйнымі статыстычнымі крыніцамі Расійскай імперыі, 169 (49,3 %) з'яўляліся дваранамі, 113 (32,9 %) – купцамі, 14 (4,1 %) – мяшчанамі, 5 (1,5 %) – сялянамі. З цягам часу паступова змяншалася доля дваран сярод уладальнікаў буйных і сярэдніх прамысловых прадпрыемстваў.

У паслярэформенныя дзесяцігоддзі значна пашырылася гандлёвае прадпрымальніцтва. Да канца XIX ст. заканадаўча яно спалучалася з прыналежнасцю да купецкага саслоўя. Перапіс 1897 г. зафіксаваў на тэрыторыі Беларусі звыш 18 тысяч прадстаўнікоў купецтва. Па памерах капіталаў гандлёвая буржуазія ў Беларусі пераважала над прамысловай.

Як і пралетарыят, буржуазія была неаднародная па свайму нацыянальнаму складу. Па падліках М.В. Біча, з 80 тысяч уладальнікаў гандлёва-прамысловых прадпрыемстваў і ўстаноў на долю беларусаў прыпадала толькі 20 тыс., або 25 %, на долю яўрэяў – каля 60 %. Сельская

буржуазія складалася галоўным чынам з беларусаў, а гандлёва-прамысловая – з яўрэяў, беларусаў і іншых.

Такім чынам, на Беларусі ў перыяд прамысловага капіталізму ішоў працэс складвання асноўных класаў новага буржуазнага грамадства. Барацьба паміж гэтымі асноўнымі класамі капіталістычнага грамадства з 90-х гадоў XIX ст. пачала адыгрываць рашаючую ролю ў грамадска-палітычным жыцці.

### Пытанні і заданні для самакантролю

1. Ахарактарызуйце сутнасць працэса мадэрнізацыі на Беларусі ў другой палове XIX ст.
2. Якімі з'явамі суправаджаўся прцэс мадэрнізацыі ў розных сферах жыцця заходнееўрапейскага грамадства? У чым асаблівасці гэтага працэса на Беларусі?
3. Назавіце асноўныя класы і сацыяльныя групы буржуазнага грамадства Беларусі ў другой палове XIX ст.
4. Як ішоў прцэс фарміравання рабочага класа на Беларусі, у чым яго асаблівасці?
5. Як развіццё капіталістычных адносін у прамысловасці ўплывала на склад гарадскога насельніцтва Беларусі ў другой палове XIX ст.?

## ЛЕКЦЫЯ 10
## Адмена прыгоннага права

1. Падрыхтоўка сялянскай рэформы 1861 г.
2. Асноўныя дакументы рэформы.
3. Надзяленне сялян зямлёй і выкупная аперацыя.
4. Змены ў рэалізацыі рэформы, звязаныя з паўстаннем 1863 г.

### 1. Падрыхтоўка сялянскай рэформы 1861 г.

Абвастрэнне сялянскай барацьбы вымусіла Аляксандра II пагадзіцца з думкай аб неабходнасці вызвалення сялян. У пачатку 1857 г. быў створаны Сакрэтны камітэт з мэтай падрыхтоўкі рэформы. Пры гэтым урад вырашыў скарыстацца ініцыятывай дваранскіх інвентарных камітэтаў Віленскай, Гродзенскай і Ковенскай губерняў, якія выказаліся за вызваленне сялян ад прыгоннай залежнасці без зямлі. Такім шляхам

памешчыкі беларуска-літоўскіх губерняў спадзяваліся вызваліцца ад абавязковых інвентароў, увядзеннем якіх яны былі незадаволены. Адпаведныя хадайніцтвы ад пералічаных камітэтаў у верасні 1857 г. праз віленскага генерал-губернатара У.І. Назімава былі накіраваны ў Пецярбург.

Адказам на прапановы памешчыкаў стаў рэскрыпт Аляксандра II на імя Назімава ад 20 лістапада 1857 г., якім дазвалялася дваранам пералічаных губерняў у спецыяльных губернскіх камітэтах распрацоўваць праекты адмены прыгону на ўмовах, выкладзеных урадам. Захоўваючы за памешчыкамі права на ўсю зямлю, рэскрыпт патрабаваў перадаць сялянам іх сядзібы за выкуп. Памешчыкам таксама прапаноўвалася перадаць у карыстанне сялянам за павіннасці некаторую колькасць ворнай зямлі. Для выкупу сядзіб вызначаўся пераходны перыяд да 12 гадоў. За памешчыкамі захоўвалася права вотчыннай паліцыі. 5 снежня такі ж рэскрыпт быў дадзены пецярбургскаму генерал-губернатару П.Н. Ігнацьеву, а затым разасланы начальнікам іншых губерняў з тым, каб памеснае дваранства прыступіла да распрацоўкі праектаў адмены прыгону па прапанаванай урадам праграме. Камітэты павінны былі складацца выключна з прадстаўнікоў памешчыкаў.

У 1858 г. у Расійскай імперыі дзейнічалі 44 губернскія камітэты і 2 камісіі, у якіх разгарнулася барацьба паміж групоўкамі памешчыкаў за розныя шляхі адмены прыгону. На Беларусі і ў Літве, акрамя камітэтаў у кожнай губерні, была створана яшчэ Віленская агульная камісія, задача якой складалася ў абагульненні прапаноў Віленскага, Гродзенскага і Ковенскага губернскіх камітэтаў і выпрацоўцы агульнага для іх праекта. У губернскіх камітэтах былі галоўным чынам сярэднія памешчыкі, якія мелі ад 100 да 500 дзес. зямлі. Паколькі пытанне аб вызваленні сялян ад прыгоннай залежнасці было фактычна вырашана, у камітэтах вакол яго не ўзнікала дыскусій. У цэнтры іх увагі аказаліся такія пытанні, як надзяленне сялян зямлёй, вызначэнне павіннасцей за сядзібу і ворную зямлю, адміністрацыйнае ўладкаванне сялян.

У адпаведнасці з пануючымі сярод памешчыкаў тэндэнцыямі губернскія камітэты Беларусі і Літвы, як і Расіі ў цэлым, падзяліліся на дзве неаднолькавыя групы. Меншасць у іх выказалася за вызваленне сялян з палявой зямлёй за выкуп, за ліквідацыю вотчыннай улады памешчыкаў. Гэта частка пануючага класа імкнулася атрымаць неабходныя для перабудовы гаспадаркі грашовыя сродкі ў выглядзе выкупных плацяжоў. За абавязковы выкуп сялян не толькі з сядзібамі, але і з палявымі надзеламі выступалі і тыя памешчыкі, землі якіх былі настолькі малаўрадлівыя, што

уладальнікі палічылі за лепшае пазбавіцца ад іх, атрымаць выкуп, які намнога перавышаў кашточнасць гэтых зямель, і жыць на даход з капіталу. Такога погляду прытрымліваліся камітэты Магілёўскай і Віцебскай губерняў, а таксама памешчыкі Мазырскага і Рэчыцкага паветаў Мінскай губерні, дзе пераважалі малаўрадлівыя землі. Але і яны імкнуліся зменшыць сялянскія надзелы, вызначыць высокія павіннасці, што не адпавядалі даходнасці зямлі, г. зн. здзейсніць рэформу за кошт сялян.

У Віленскай, Гродзенскай і частцы Мінскай губерняў землі ацэньваліся даражэй, а многія сярэднія і дробныя памешчыкі самі кіравалі фальварковай гаспадаркай, здаючы ў арэнду толькі частку зямельных угоддзяў. У многіх маёнтках тут практыкаваўся наём парабкаў з беззямельных сялян. У сувязі з гэтым большасць памешчыкаў дадзенага рэгіёна выступала за беззямельнае вызваленне сялян, што знайшло адлюстраванне ў праектах адпаведных дваранскіх камітэтаў.

Прэтэндуючы на захаванне ў сваіх руках усёй зямлі маёнтка, памешчыкі Гродзенскай, Віленскай і большай часткі Мінскай губерняў пагаджаліся пакінуць у карыстанні сялян за пэўныя павіннасці палявыя надзелы толькі на пераходны перыяд. Па заканчэнні гэтага перыяду камітэты Гродзенскай і Мінскай губерняў прапаноўвалі даць сялянам права арэнды панскай ворнай зямлі на падставе добраахвотных пагадненняў з памешчыкамі.

Ад гэтага плана грабяжу сялян па сутнасці не адрозніваліся прапановы, якія былі прыняты Віленскім губернскім камітэтам і Віленскай агульнай камісіяй. Яны зводзіліся да таго, каб замацаваць сялян за маёнткамі шляхам перадачы ім у карыстанне за адпрацоўкі ўчасткаў зямлі ад 5 да 20 дзес. на двор. Права на такія ўчасткі прызнавалася толькі за сялянамі, якія мелі да рэформы не менш за 5 дзес. на двор. Астатнія прыгонныя пазбаўляліся права карыстання зямлёй, у тым ліку сядзібай. І ў гэтым выпадку памешчыкі захоўвалі права ўласнасці на ўсю зямлю і забяспечвалі сябе таннымі рабочымі рукамі. Абеззямеленыя сяляне пайшлі б у фальварак парабкамі. Сяляне, якія атрымалі ў карыстанне кавалачак зямлі, вымушаны былі б расплачвацца за яго працай на памешчыка. Абодва праекты давалі памешчыкам права ўключаць у склад фальваркаў угоддзі, якія знаходзіліся да рэформы ў сялян, выдзяляючы замест іх па сваім меркаванні іншыя землі.

Усе губернскія камітэты Беларусі выказаліся на карысць захавання ў маёнтках ранейшых павіннасцей. На час пераходнага перыяду яны ўсталёўваліся ў тых жа памерах і выглядзе. Пасля яго заканчэння пытанне аб павіннасцях фактычна мог вырашаць сам памешчык.

Такім чынам, у ходзе абмеркавання асноў будучага вызвалення сялян памеснае дваранства Беларусі, як і ўсёй Расіі, выявіла відавочнае імкненне абараніць свае правы і прывілеі на зямлю і сялян, захаваць свой уплыў на вясковае жыццё. Яны намагаліся стварыць такія ўмовы сялянскага землекарыстання, якія дазволілі б ужываць ранейшыя прыгонніцкія прыёмы эксплуатацыі.

Рознагалоссі ў губернскіх камітэтах паміж дзвюма групоўкамі памешчыкаў не мелі прынцыповага характару. Яны былі прадстаўнікамі аднаго класа, стаялі на глебе прызнання непарушнасці правоў памешчыкаў на ўсю зямлю і спрачаліся толькі аб тым, ці «выгадней для памешчыка мець арандатара (або «адработачнага» селяніна) зусім без зямлі ці «з надзелам», г. зн. прымацаванага да месца, прывязанага кавалачкам зямлі, з якога нельга жыць і на якім прыходзіцца шукаць «заработкаў» – ісці ў кабалу да памешчыка».

Галоўны камітэт па сялянскай справе, у які быў перайменаваны Сакрэтны камітэт, у канцы снежня 1858 г. прапанаваў новую праграму будучай рэформы. Апрача ліквідацыі асабістай залежнасці ад памешчыкаў і права на выкуп сядзіб, сяляне павінны былі атрымаць магчымасць выкупіць свае надзелы. Урад адмовіўся таксама ад думкі захаваць вотчынныя правы памешчыкаў. Такім чынам, новая праграма прадугледжвала не толькі асабістае вызваленне сялян, але і паступовую адмену феадальных вытворчых адносін. Яна адкрывала дарогу буржуазнаму аграрнаму развіццю.

Для разгляду розных праектаў адмены прыгону, якія былі прапанаваны губернскімі камітэтамі, і распрацоўкі ўрадавага праекта рэформы ў пачатку 1859 г. былі ўтвораны Рэдакцыйныя камісіі. Яны выражалі інтарэсы ўсіх панскіх груповак, паміж якімі вяліся вострыя спрэчкі. Праекты губернскіх камітэтаў Заходняй Беларусі і Віленскай агульнай камісіі, што супярэчылі ўрадавай праграме, былі адхілены.

## 2. Асноўныя дакументы рэформы

19 лютага 1861 г. Аляксандр II зацвердзіў усе заканадаўчыя акты (іх было 17), якія тычыліся адмены прыгоннага права, і звярнуўся да народа з маніфестам. Але апублікаваны ўсе гэтыя дакументы былі 5 сакавіка 1861 г. Такі значны разрыў паміж датай зацвярджэння царом заканадаўчых актаў і іх апублікаваннем для ўсеагульнага азна-ямлення тлумачыцца тым, што патрэбна было не толькі надрукаваць неабходную колькасць экзэмпляраў

гэтых вялікіх дакументаў, але і прыняць шэраг прэвентыўных (папераджальных) захадаў на выпадак хваляванняў, якія небеспадстаўна прагназіраваліся ўладамі. Былі падрыхтаваны неабходныя вайсковыя часці ў сталіцах, а ў губерні для назірання за парадкам накіраваны флігель-ад'ютанты, якія ў неабходных выпадках мелі права дзейнічаць ад імя цара.

Усе дакументы, апублікаваныя 5 сакавіка 1861 г., можна падзяліць на тры групы: агульныя палажэнні, мясцовыя палажэнні, дадатковыя правілы. Юрыдычных актаў, пад нормы якіх падпадала ўся імперыя, было некалькі. Гэта – Агульнае палажэнне аб сялянах, якія выйшлі з прыгоннай залежнасці, Палажэнне аб упарадкаванні дваровых лю-дзей, якія выйшлі з прыгоннай залежнасці, Палажэнне аб выкупе сялянамі, якія выйшлі з прыгоннай залежнасці, іх сядзібнай аседласці і аб садзейнічанні ўрада набыццю гэтымі сялянамі ва ўласнасць палявых надзелаў, Палажэнне аб губернскіх і павятовых па сялянскіх справах установах, а таксама «Правілы аб парадку ўвядзення ў дзеянне Палажэнняў аб сялянах, якія выйшлі з прыгоннай залежнасці». З мясцовых палажэнняў непасрэдна тэрыторыі Беларусі тычылася два: Мясцовае палажэнне аб пазямельным уладкаванні сялян, якія паселены на памешчыцкіх землях у губернях: Вялікарасійскіх, Новарасійскіх і Беларускіх (пад гэта палажэнне падпадалі Магілёўская губерня і большая частка Віцебскай) і Мясцовае палажэнне аб пазямельным уладкаванні сялян, якія паселены на памешчыцкіх землях у губернях: Віленскай, Гродзенскай, Ковенскай, Мінскай і частцы Віцебскай (ахоплівала астатнюю тэрыторыю Беларусі).

У маніфесце і палажэннях былі заканадаўча замацаваны ўсе агульныя для сялян асабістыя і маёмасныя правы, правы грамадскага кіравання сялян, дзяржаўныя і земскія павіннасці. Галоўным звяном у заканадаўчых актах рэформы былі асабістыя правы сялян. У маніфесце падкрэслівалася, што адмена прыгоннага права з'яўляецца вынікам добраахвотнай ініцыятывы «высакароднага дваранства». У адпаведнасці з маніфестам селянін адразу атрымліваў асабістую свабоду. Былы прыгонны, у якога раней памешчык мог забраць усю яго маёмасць, а самога прадаць, падараваць, закласці, зараз атрымліваў не толькі магчымасць вольна распараджацца сваёй асобай, але і шэраг грамадзянскіх правоў: ад свайго імя заключаць розныя грамадзянскія і маёмасныя пагадненні, адкрываць гандлёвыя і прамысловыя прадпрыемствы, пераходзіць у іншыя саслоўі.

Разам з тым маніфест аб'яўляў, што сяляне на працягу 2 гадоў (да 19 лютага 1863 г.) абавязаны несці тыя ж самыя павіннасці, што і ў часы

прыгоннага права. Адмяняліся толькі т. зв. дадатковыя зборы (яйкі, масла, лён, палатно і да т. п.). Паншчына абмяжоўвалася 2 жаночымі і 3 мужчынскімі днямі з цягла на тыдзень, крыху скарачалася падводная павіннасць, забараняўся перавод сялян з аброку на паншчыну і ў дваровыя.

Агульныя палажэнні ўводзілі новую сістэму кіравання вёскай. Яна была заснавана на выбарнасці ніжэйшых службовых асоб. Сяляне, якія жылі на зямлі аднаго памешчыка, складалі сельскую грамаду (абшчыну). На сходзе сельскай грамады выбіраўся стараста. Некалькі сельскіх абшчын, якія адносіліся да аднаго царкоўнага прыхода, стваралі воласць. На валасным сходзе сельскія старасты і ўпаўнаважаныя ад кожных 10 двароў выбіралі валаснoe праўленне, валаснога старшыню і суддзю. Сельскія і валасныя праўленні займаліся раскладкай і зборам падаткаў, выконвалі распараджэнні мясцовых улад, рэгулявалі пазямельныя адносіны сялян, сачылі за парадкам у вёсцы. За своечасовае выкананне ўсіх павіннасцей сяляне неслі адказнасць на аснове кругавой парукі, а судовыя справы вырашаліся паводле норм і традыцый звычаёвага права.

Для непасрэднага правядзення рэформы на месцах ствараліся спецыяльныя органы – павятовыя міравыя з'езды і губернскія ўстановы па сялянскіх справах. Кантралявалі дзейнасць гэтых органаў губернатары. Першай інстанцыяй па ўрэгуляванні адносін паміж сялянамі і памешчыкамі з'яўляліся міравыя пасрэднікі, якія прызначаліся губернатарам з мясцовых дваран. Асноўным абавязкам міравых пасрэднікаў было садзейнічанне складанню ўстаўных грамат – нарматыўных актаў, дзе вызначаліся пазямельныя адносіны сялян і памешчыкаў. На складанне і падпісанне ўстаўных грамат адводзілася два гады.

Спецыяльныя «Дадатковыя правілы» датычылі пазямельнага ўладкавання сялян дробнапамесных уласнікаў. На ўсходзе Беларусі, як і ў рускіх губернях, да іх прылічалі памешчыкаў, што мелі менш за 75 вышэйшых душавых надзелаў, г. зн. меней чым 300 – 400 дзес., у цэнтры і на захадзе – менш за 300 дзес. На 1858 г. у 5 заходніх губернях было 3184 дробнапамесныя ўласнікі, у маёнтках якіх налічвалася 25 268 душ мужчынскага полу, ці 2,2 % панскіх прыгонных. Іх вызвалялі на больш цяжкіх умовах, чым астатніх панскіх сялян. Дробнапамесныя дваране не абавязаны былі павялічваць сялянскі надзел, нават калі ён быў меншы за ніжэйшую норму, вызначаную для дадзенай мясцовасці. Беззямельныя сяляне надзела не атрымлівалі. Яны падпарадкоўваліся правілам аб вызваленні дваровых. Сяляне дробнапамесных уласнікаў, не надзеленыя

зямлёй, маглі сяліцца на казённых землях, атрымліваючы пэўную дапамогу на абзавядзенне. Але яны мелі права на пасяленне толькі ў той грамадзе дзяржаўных сялян, дзе на рэвізскую душу ў малазямельных паветах прыходзілася больш чым 8 дзес., а ў многазямельных – звыш 15 дзес. Сяляне, што атрымалі зямельны надзел, маглі перайсці на казённыя землі толькі са згоды памешчыка. Пры гэтым яму вярталі сялянскую надзельную зямлю. Нарэшце, па-мешчыку было дадзена права перадаваць сялян разам з надзелам у казну за адпаведную ўзнагароду ў суме капіталізаванага гадавога аброку .

На Беларусі частка малазямельных сялян дробнапамесных уласнікаў адмовілася ад надзела і перайшла на казённыя землі. Некаторым сялянам у сувязі з недахопам свабодных дзяржаўных зямель на месцы было прапанавана перасяліцца ў іншыя рэгіёны краіны. Памешчыкі таксама перадавалі сялян у казённае ведамства за грашовую ўзнагароду або пераводзілі ў дваровыя, пазбаўляючы зямельных надзелаў.

### 3. Надзяленне сялян зямлёй і выкупная аперацыя

Велічыня надзелаў і павіннасцей сялян на ўсходзе і захадзе Беларусі вызначалася на аснове розных прынцыпаў. Паводле мясцовага «Палажэння» для рускіх, паўднёваўкраінскіх і ўсходнебеларускіх губерняў, у Віцебскай (8 паветаў) і Магілёўскай губернях, як і ў цэнтральных рэгіёнах Расіі, быў устаноўлены душавы зямельны надзел. Зямля давалася ў пастаяннае карыстанне сельскай грамадзе, дзе адводзілася толькі мужчынам. Для кожнай мясцовасці былі ўстаноўлены вышэйшая і ніжэйшая нормы душавых надзелаў, прычым найменшая павінна была складаць трэць найбольшай. Гэтыя нормы прымяняліся пры пераходзе на абавязковы выкуп. У Віцебскай (8 паветаў) і Магілёўскай губернях памеры вышэйшага душавога надзела па асобных паветах ваганіся ад 4 да 5,5 дзес, ніжэйшага – ад 1 дзес. 800 кв. саж. да 1 дзес. 2000 кв. саж. Калі дарэформенны надзел перавышаў найбольшую ўстаноўленую норму, то памешчык меў права адрэзаць лішак зямлі на сваю карысць. У выпадку, калі ў распараджэнні памешчыка заставалася менш чым 1/3 агульнай плошчы ўгоддзяў маёнтка, ён мог утрымаць за сабой да трэці ўсіх прыдатных зямель. Калі ж сялянскі надзел быў менш за ніжэйшую норму, то памешчык павінен быў або павялічыць яго, або адпаведна паменшыць павіннасці за карыстанне зямлёй. Памешчыкі

захоўвалі ворныя і сенакосныя землі, якія знаходзіліся ў часовым карыстанні сялян за дадатковыя павіннасці.

Паводле мясцовага «Палажэння» для Віленскай, Гродзенскай, Ковенскай, Мінскай і часткі Віцебскай губерняў, за сялянскай грамадой замацоўваліся надзельныя землі, якія знаходзіліся ў пастаянным карыстанні сялян да 19 лютага 1861 г. Але калі памер надзела быў вышэйшы за інвентарны або ў памешчыка пасля рэформы заставалася менш чым 1/3 угоддзяў маёнтка, праводзілася адпаведная адрэзка сялянскай зямлі. У склад сялянскага надзела не ўключалі і зямельныя ўгоддзі, якія знаходзіліся ў часовым карыстанні сялян (так званыя прыёмныя землі). За апошнія яны адбывалі дадатковыя павіннасці. Толькі на пачатку 1862 г. да надзельнай зямлі былі аднесены тыя з прыёмных зямель, за якія сяляне адбывалі паншчыну. Дарэформенны надзел не мог быць паменшаны больш чым на 1/6 частку.

Надзелы, дадзеныя беларускім сялянам па мясцовых «Палажэннях», у мностве маёнткаў былі ўрэзаны, скарачаліся. Такім чынам, адным памешчыкам рэформа адкрывала вялікія магчымасці для эксплуатацыі малазямельнага сялянства шляхам адпрацовак за карыстанне адрэзкамі і фальварковымі ўгоддзямі, другім стварала спрыяльныя ўмовы для выкарыстання ў гаспадарцы таннай наёмнай працы ўчарашніх прыгонных.

Да правядзення выкупной аперацыі сяляне лічыліся часова-абавязанымі і за карыстанне атрыманай зямлёй павінны былі адбываць паншчыну або плаціць памешчыку аброк. У Магілёўскай і Віцебскай губернях за вышэйшы надзел паншчына складала 40 мужчынскіх і 30 жаночых дзён у год (ці 8 рублёў аброку). У заходняй частцы Беларусі павіннасці памяншаліся на 10 % супраць інвентароў і вызначаліся наступным чынам: для паншчыны – не больш 23 дзён, для аброку – не больш 3 рублёў з дзесяціны ў год. Свой надзел зямлі сяляне павінны былі выкупіць ва ўласнасць. Правілы выкупной аперацыі былі аднолькавыя па ўсёй Расіі.

Выкупная сума вызначалася праз шасціпрацэнтную капіталізацыю гадавога аброку. Напрыклад, калі аброк з сялянскага надзелу складаў 6 рублёў у год, то агульная сума, якую селяніну трэба было заплаціць, складала 100 рублёў (6 руб. – 6 %, 100 руб. – 100 %). Ад 20 да 25 % гэтай сумы (у залежнасці ад велічыні надзелу) сяляне плацілі непасрэдна памешчыку. Астатнюю частку памешчыкі атрымлівалі ад дзяржавы ў выглядзе каштоўных папер, якія можна было прадаваць ці закладваць. У выніку такой аперацыі сяляне станавіліся даўжнікамі дзяржавы. На

працягу 49 гадоў трэба было вярнуць доўг у выглядзе выкупных плацяжоў, куды ўключаліся яшчэ і працэнты за пазыку. За гэты час сялянам даводзілася выплаціць да 300 % пазычанай ім сумы.

Такім чынам, агульная сума, якую сяляне вымушаны былі заплаціць за атрыманыя надзелы, значна перавышала рыначны кошт гэтай зямлі (на Беларусі – у 3 – 4 разы). Атрымлівалася, што сяляне не толькі выкуплялі зямлю, але і кампенсавалі памешчыкам страту іх уласнасці ў асобе селяніна. Праводзячы выкупную аперацыю, казна вырашыла і праблему спагнання дарэформенных даўгоў з памешчыкаў. На Беларусі, паводле даных за 1859 г., 59,8 % прыгонных сялян (увогуле па Расіі – 65 %) былі закладзены іх уладальнікамі ў розных крэдытных установах. Гэты доўг утрымліваўся з выкупной пазыкі памешчыкам, што вызваліла іх ад даўгоў і выратавала ад фінансавага банкруцтва.

## 4. Змены ў рэалізацыі рэформы, звязаныя з паўстаннем 1863 г.

Абвяшчэнне рэформы выклікала пад'ём сялянскага руху і паказала, што сяляне засталіся незадаволеныя «дараванай» ім свабодай. Яны не падпарадкоўваліся загадам мясцовых улад, адмаўляліся адбываць паншчыну і выконваць іншыя павіннасці. Упартую барацьбу вялі сяляне супраць складання ўстаўных грамат (актаў, што вызначалі пазямельнае падпарадкаванне і павіннасці сялян на карысць памешчыка). Граматы меркавалася ўвесці да 19 лютага 1863 г., аднак супраціўленне сялян сарвала намечаныя тэрміны і ўвядзенне іх было завершана толькі к маю 1864 г. Пры гэтым звыш 78 % грамат так і не было падпісана сялянамі. Асабліва шырокі размах сялянскі рух набыў у Гродзенскай і Мінскай губернях. Усяго ў Беларусі ў 1862 г. адбылося звыш 150 сялянскіх выступленняў, з іх больш паловы ў сувязі з увядзеннем устаўных грамат.

У пачатку 1863 г. сялянскі рух значна ўзмацніўся. Сяляне спадзяваліся атрымаць сапраўдную волю ў сувязі з пераводам іх у становішча часоваабавязаных. Узмацненне сялянскай барацьбы на Беларусі супала па часе з нацыянальна-вызваленчым паўстаннем. Паўстанне ахапіла частку Беларусі і Літвы, дзе яго ўзначаліў рэвалюцыянер-дэмакрат Кастусь Каліноўскі (1838 – 1864).

Уздым сялянскага руху на Беларусі вымусіў урад пайсці на істотныя ўступкі сялянам заходніх губерняў. Па загаду ад 1 сакавіка 1863 г. часоваабавязанае становішча сялян Мінскай, Віленскай, Гродзенскай і часткова Віцебскай губерняў адмянялася з 1 мая, яны пераводзіліся на

выкуп і станавіліся ўладальнікамі сваіх надзелаў. 21 лістапада 1863 г. гэты загад быў пашыраны на астатнія паветы Віцебскай і Магілёўскую губерні. Тут часоваабавязаныя адносіны спыняліся з 1 студзеня 1864 г. Адначасова змяншаліся выкупныя плацяжы. У параўнанні з вызначанымі ва ўстаўных граматах яны былі паменшаны ў Мінскай губерні на 75,4, у Гродзенскай – на 68,8, Віленскай – на 64, 9, Магілёўскай – на 23,8 %.

9 красавіка 1863 года былі створаны камісіі, якія павінны былі праверыць памеры сялянскіх надзелаў і ў двухгадовы тэрмін скласці выкупныя акты. Сяляне, якія былі пазбаўлены зямлі пасля складання інвентароў, надзяляліся трыма дзесяцінамі зямлі на сям'ю, а абеззямеленым пасля 1857 г. выдзяляўся поўны зямельны надзел. У Мінскай, Гродзенскай і Віленскай губернях атрымалі зямлю больш за 20 тыс. двароў. Сялянам Віцебскай і Магілёўскай губерняў вярнулі частку зямлі, адрэзанай пры складанні ўстаўных грамат. За імі захоўваліся таксама сервітуты, але толькі ў тых маёнтках, дзе яны існавалі да рэформы 1861 г.

Памешчыкі Беларусі былі незадаволены дзейнасцю праверачных камісій у сувязі з павелічэннем надзелаў і змяншэннем павіннасцей. Таму пасля падаўлення сялянскіх выступленняў работу праверачнай камісіі пачалі пераглядаць з улікам скаргаў памешчыкаў. У хуткім часе яны былі ліквідаваны зусім, а завяршэнне выкупных аперацый было даручана павятовым міравым з'ездам. Складанне выкупных актаў на Беларусі было завершана ў асноўным да пачатку 70-х гг.

Палітычныя падзеі 1863 г. прымусілі перагледзець і землеўпарадкаванне дзяржаўных сялян, якія складалі каля 20 % сельскага насельніцтва Беларусі. Умовы вызвалення дзяржаўных сялян ад феадальнай залежнасці былі больш спрыяльнымі, чым памешчыцкіх. У адпаведнасці з законам ад 16 мая 1867 г. яны адразу пераводзіліся з аброку на выкуп і станавіліся ўладальнікамі зямельных надзелаў, але выкуп для іх не быў абавязковым. Дзяржаўныя сяляне ў асноўным захавалі свае надзелы, якія аказаліся вышэйшымі, чым у памешчыцкіх. За карыстанне зямлёй сяляне павінны былі плаціць дзяржаве аброчны падатак.

Да канца 80-х гг. XIX ст. урад прыняў шэраг законаў і ўказаў, якія вызначалі ўмовы землекарыстання і пераходу на выкуп іншых, адносна нешматлікіх катэгорый сельскага насельніцтва (чыншавікоў, аднадворцаў, стараевераў і т. д.). Захоўваючы істотныя феадальныя перажыткі, гэтыя законы, тым не менш, садзейнічалі развіццю капіталістычнага ладу ў

беларускай вёсцы, зліццю асобных груп сельскага насельніцтва з асноўнай масай сялян.

Такім чынам, рэформа ў Беларусі і Літве была праведзена на больш выгадных для сялян умовах. Сярэднія памеры надзелаў былых памешчыцкіх сялян Беларусі аказаліся вышэйшымі, чым у цэлым па Расіі (у Беларусі 4,2 – 5,7 дзесяціны, па Расіі – 3,3 дзесяціны). Акрамя таго, на перыяд часоваабавязанага становішча беларускім, таксама як і літоўскім сялянам, былі зменшаны павіннасці.

Аднак гэтыя ўступкі самадзяржаўя не ліквідавалі сялянскага малазямелля. Памешчыкі ўтрымлівалі ў сваіх руках звыш паловы лепшай зямлі. У той жа час каля 40 % былых памешчыцкіх сялян атрымалі надзелы, не дастатковыя для самастойнага вядзення гаспадаркі. Калі на адну буйную памешчыцкую гаспадарку прыходзілася ў сярэднім 2915 дзесяцін зямлі, то на адну сялянскую – каля 12.

Такім чынам, галоўным прыгонніцкім перажыткам у эканоміцы пасля рэформы з'яўлялася памешчыцкае землеўладанне. Захоўваліся таксама сервітуты, цераспалосіца, ва ўсходняй частцы Беларусі не было ліквідавана абшчыннае землекарыстанне: 86 % усіх сялянскіх двароў Магілёўскай і 46 % Віцебскай губерняў уваходзілі ў абшчыны, якія звязвалі сялян кругавой парукай і прымацоўвалі іх як да зямлі, так і да памешчыка. Нават зніжаныя выкупныя плацяжы аказаліся не пад сілу сялянам. Нядоімкі па іх былі настолькі вялікімі, што ўрад вымушаны быў указам ад 28 снежня 1881 г. зрабіць агульнае зніжэнне выкупных плацяжоў, якое закранула таксама і Беларусь.

Разам з тым рэформа з'явілася паваротным момантам у гістарычным развіцці ўсёй Расіі, у тым ліку і Беларусі. Сяляне атрымалі асабістыя і маёмасныя правы, саслоўнае самакіраванне. Была ліквідавана манаполія памешчыкаў на эксплуатацыю сялянскай працы, што садзейнічала росту рынку рабочай сілы ў прамысловасці і сельскай гаспадар-цы. Значна хутчэй сталі развівацца прадукцыйныя сілы, склаліся ўмовы для ўстанаўлення капіталістычнага спосабу вытворчасці.

### Пытанні і заданні для самакантролю

1. Дакажыце, што асноўнай прычынай рэформы 1861 г., быў крызіс феадальна-прыгонніцкай сістэмы і выспяванне ў яе нетрах новых капіталістычных адносін.

2. Як ішла падрыхтоўка рэформы 1861 г. па адмене прыгоннага права?

3. Дайце характарыстыку асноўных дакументаў, на падставе якіх праводзілася рэформа 1861 г.на Беларусі.

4. Ахарактарызуйце асаблівасці правядзення рэформы 1861 г. у Беларусі.

5. Раскрыйце сутнасць выкупной аперацыі па рэформе 1861 г. Хто такія часоваабавязаныя сяляне?

6. Якія змены мелі месца ў рэалізацыі рэформы пасля падаўлення паўстання 1863 г.?

7. Вызначце характар і ролю рэформы 1861 г. для Беларусі.

## ЛЕКЦЫЯ 11
## Урадавая палітыка царызму пасля падаўлення паўстання 1863 – 64 гг.

1. Асаблівасці саслоўнай палітыкі на Беларусі.
2. Канфесіянальная палітыка.
3. Русіфікацыя Беларусі.

### 1. Асаблівасці саслоўнай палітыкі на Беларусі

Пасля падаўлення паўстання, у другой палове 60-х гадоў, перад царскім урадам востра паўстала праблема ліквідацыі польскага ўплыву на заходніх землях. Апора паланізацыі бачылася ім у шляхце. Таму быў прадпрыняты шэраг мер палітычнага і эканамічнага характару з мэтай яе ізаляцыі.

Шляхта заходніх губерняў была або польскага, або мясцовага, у асноўным беларускага паходжання, аднак даўно спаланізаваная. Не была яна аднароднай і ў маёмасным плане. У пачатку 60-х гадоў толькі 14 % шляхты былі ўладальнікамі зямлі і сялян. Астатнія 86 % або мелі невялікі ўчастак зямлі (без прыгонных сялян), або арандавалі яе. Значная частка шляхты атрымоўвала сродкі на пражыццё за кошт службы ці працы па найму.

Памешчыкі, чыноўнікі і афіцэры, хто па наследству атрымоўваў памесці, адносіліся да дваранскага саслоўя. Аднак і яны ў большасці сваёй (9261 з 9929 памешчыкаў Паўночна-Заходняга краю – 1862 г.) былі польскага паходжання. Толькі нязначны працэнт дваранства тут складалі выхадцы з Расіі і Прыбалтыкі, а таксама татары. Традыцыйна, ігнаруючым

фактам існавання беларусаў, царскія ўлады падраздзялялі дваран на рускіх (праваслаўных) і палякаў (каталікаў).

Каб падарваць эканамічны і палітычны ўплыў польскай шляхты ў заходніх губернях царскі ўрад у 1864 г. увёў новыя правілы пацвярджэння дваранства. Для доказу прыналежнасці да саслоўя дваран, згодна з новымі правіламі, неабходна было прадставіць на працягу 3-х гадоў дакументы, пацвярджаючыя права на валоданне зямлёй з сялянамі, або прыналежнасць да шляхецкага саслоўя ў часы Рэчы Паспалітай. Падаўляючая большасць дробнай шляхты (больш 200 тыс. чалавек) такіх дакументаў не змагла прадставіць, што аўтаматычна пераводзіла яе ў разрад аднадворцаў або грамадзян.

Паколькі галоўнай рухаючай сілай паўстання 1863 г. была шляхта, то царскі ўрад жорстка расправіўся з яго ўдзельнікамі. Памесці паўстанцаў былі канфіскаваны, а іх уладальнікі высланы ў Сібір. Былі прадугледжаны меры і па замене польскіх землеўладальнікаў выхадцамі з Расіі. 10 снежня 1865 г. Аляксандр II зацвердзіў закон, па якому ўсім высланым з заходніх губерняў прапаноўвалася на працягу 2-х гадоў прадаць або абмяняць свае землі. Купляць жа гэтыя землі маглі толькі праваслаўныя. Асобам польскага паходжання (каталікам) гэта рабіць забаранялася.

Хутка памешчыкі аднак паспрабавалі выкарыстаць лазейку, пераходзячы з каталіцызму ў праваслаўе. Але міністэрства дзяржаўнай маёмасці 10 красавіка 1869 г. выдала распараджэнне, у адпаведнасці з якім толькі патомкі, якія перайшлі ў праваслаўе, лічыліся рускімі і мелі права захаваць за сабой свае землі.

З мэтай прывабіць у заходнія губерні вялікую колькасць рускіх землеўладальнікаў і чыноўнікаў была прадугледжана цэлая сістэма льгот. На льготных умовах ім выдавалася ссуда, права на вінакурэнне, прадавалася канфіскаваная зямля, прадугледжвалася 50 % надбаўка да службовых акладаў.

Палітыка замены мясцовых чыноўнікаў-католікаў на рускіх, гарантаваныя льготы прыезджым зрабілі Паўночна-Заходні край прывабным для многіх жадаючых хутка разбагацець.

Пасля падаўлення паўстання ў заходніх губернях некаторы час захоўвалася ваеннае становішча. Дзейнічалі следчыя камісіі і суды. Прадаўжаліся арышты ўдзельнікаў паўстання, у большасці сваёй асоб польскага паходжання. Закон аб ваенным становішчы забараняў асобам мужчынскага полу, акрамя сялян, выязджаць з месца жыхарства больш чым на 30 вёрст без дазволу мясцовых улад. Польская шляхта

пазбаўлялася магчымасці адзначаць нават сямейныя святы, так як існавала забарона збірацца разам па некалькі ча-лавек. За самае дробнае парушэнне гэтых правіл накладваліся штрафы. Мясцовая адміністрацыя разгарнула такую бурную дзейнасць у гэтым напрамку, што рэгуляваннем штрафаў вымушаны быў заняцца пераемнік Мураўёва на пасадзе віленскага генерал-губернатара Каўфман. У 1866 г. ім быў складзены пералік «праступкаў», падлягаючых штрафам: выкарыстанне польскай мовы ў грамадскіх месцах і ў афіцыйнай перапісцы, нашэнне жалобы, розных польскіх адрозненняў і ўзнагарод, непаважлівыя адносіны да праваслаўнай царквы, яе духавенства і інш.

З мэтай выцяснення польскай шляхты з Заходняга краю царызм выкарыстоўваў таксама так званую «сармацкую» тэорыю. Згодна з ей, паходжанне польскай шляхты выводзілася ад качэўнікаў-сарматаў, якія яшчэ ў глыбокай старажытнасці падпарадкавалі сабе палякаў-славян і ператварылі іх у сялян. Ліквідуючы сармацкую шляхту, царызм такім чынам прадстаўляўся выратавальнікам палякаў-сялян і аб’яднальнікам усіх славянскіх народаў пад скіпетрам рускага самадзяржаўя.

У канцы 60-х гадоў царызм вымушаны быў унесці некаторыя змены ў сваю палітыку ў Паўночна-Заходнім краі. Гэтаму садзейнічаў шэраг прычын. Пацярпелі няўдачу намаганні ўрада на падрыў польскага землеўладання. Да 1869 г. усе канфіскаваныя землі былі прададзеныя, а прычын для новых канфіскацый не з’яўлялася. Да таго ж польскае дваранства прыйшло да разумення неабходнасці адысці ад прамой канфрантацыі з царызмам, каб захаваць сваё маёмаснае становішча і падрыхтавацца ў будучым да барацьбы за незалежнасць Польшчы. Улічваючы сітуацыю ў краі, царскі ўрад вырашыў арыентавацца не толькі на рускае і нямецкае (остзейскае) памеснае і служылае дваранства, але і на благанадзейную частку польскіх памешчыкаў. Паступова, на працягу 1866 – 1870 гг., у Беларусі было адменена ваеннае становішча. У канцы 70-х гадоў у паўночна-заходніх губернях было створана таварыства сельскіх гаспадароў, патрэбнасць у якім востра адчувалі мясцовыя землеўладальнікі. Аднак яго дзейнасць строга рэгламентавалася. Забаранялася абмяркоўваць пытанні, што выходзілі за рамкі сельскагаспадарчых адносінаў. Пад уплывам гэтых змен дваранства беларускіх губерняў пачало праяўляць лаяльнасць да рускага самадзяржаўя. Сведчаннем таму быў адносны спакой у рэгіёне ў перыяд уздыму народніцкага руху. Але, нягледзячы на гэта, царызм не пайшоў на значнае пашырэнне праваў шляхты. Дапускаліся толькі некаторыя паслабленні, у прыватнасці замена

рускіх прадвадзіцеляў дваранства мясцовымі памешчыкамі з ліку праваслаўных. У якасці выключэння назначаліся на гэтыя пасады і памешчыкі-палякі, але толькі пасля скрупулёзнай праверкі на прадмет іх палітычнай благанадзейнасці. Мясцоваму каталіцкаму дваранству ў абыход існуючых цыркуляраў дазвалялася таксама паступаць на службу ў губернскія і ўездныя дзяржаўныя ўстановы.

У канцы 70-х – пачатку 80-х г. царызм ізноў перайшоў да больш жорсткіх мер у сваёй палітыцы ў адносінах да польскай шляхты. Гэта было выклікана недаверам і падазронасцю ў адносінах да польскага дваранства. Зыходзячы з афіцыйнай устаноўкі, новы віленскі генерал-губернатар Коханаў правёў чыстку дзяржаўных устаноў. У 1884 – 1885 гг. большасць палякаў была звольнена з дзяржаўнай службы і заменена рускімі чыноўнікамі. Гэта датычыла і прадвадзіцеляў дваранства. Дваранскаму банку было забаронена выдаваць крэдыты землеўладальнікам каталіцкага веравызнання.

## 2. Канфесіянальная палітыка

Для ўзмацнення пазіцый праваслаўнай царквы ў беларуска-літоўскіх губернях улады прымалі не толькі заканадаўчыя меры. Хуткімі тэмпамі будаваліся і рамантаваліся праваслаўныя храмы, пераводзіліся з унутраных губерняў святары. Для праваслаўных цэркваў прыстасоўвалі закрытыя пасля паўстання касцёлы. Аб маштабах царкоўнага будаўніцтва ў Беларусі сведчаць наступныя лічбы. За 25 гадоў, што прайшлі пасля паўстання, за кошт дзяржаўных крэдытаў на царкоўнабудаўнічую справу былі пабудаваны і адрамантаваны: у Мінскім павеце – 30 прыходскіх цэркваў, у Барысаўскім – 44, у Ігуменскім – 15, у Навагрудскім – 22, у Слуцкім – 23, у Бабруйскім – 35 і інш., а ўсяго па Мінскай губерні – 211 праваслаўных храмаў. Канфесіянальная палітыка царызму ў 60 – 90-я гг. XIX ст. адносна беларускіх зямель садзейнічала таму, што колькасць праваслаўных вернікаў тут значна ўзрасла. За некалькі гадоў пасля паўстання ў цэлым па Расійскай імперыі праваслаўнымі сталі больш за 80 тыс. католікаў.

У мэтах распаўсюджання і замацавання праваслаўнай веры было вырашана адрадзіць брацкі рух. У 1864 г. былі зацверджаны асноўныя правілы для заснавання праваслаўных царкоўных брацтваў. Найбольш вядомымі з іх у Беларусі сталі брацтвы ў Полацку, Магілёве, Віцебску. Гэтым жа мэтам – зацвярджэнню пазіцый праваслаўя ў беларускіх губернях – служылі і праваслаўныя манастыры.

У адрозненне ад праваслаўнай царквы, пазіцыі якой у 60 – 90-я гг. значна ўзмацніліся, каталіцкая царква працягвала страчваць свой былы ўплыў у Беларусі. Больш таго, у палітыцы расійскага ўрада адносна каталіцкай царквы адбыліся даволі істотныя перамены. Яны былі выкліканы той пазіцыяй, якую займала каталіцкае духавенства ў паўстанні, а менавіта: большасць ксяндзоў і манахаў апынулася на баку паўстанцаў ці шчыра спачувала ім.

У адказ урад павёў у адносінах да каталіцкай царквы ў Беларусі больш мэтанакіраваную і жорсткую лінію. Галоўнай яе мэтай стала змяншэнне ўплыву каталіцкага духавенства на мясцовае насельніцтва. Жорсткасць жа праяўлялася ў тых метадах, якімі гэта палітыка ажыццяўлялася на практыцы. Шырока праводзіліся рэпрэсіўныя меры супраць каталіцкага духавенства, што прыняло ўдзел у паўстанні, адбывалася скасаванне касцёлаў і кляштароў і перавод рознымі шляхамі вернікаў у праваслаўе, прымаліся абмежавальныя законы ў адносінах да дзейнасці каталіцкай царквы. За ўдзел у паўстанні на Літве і Беларусі восем каталіцкіх святароў былі пакараны смерцю. Прычым кожны другі – толькі за чытанне рэвалюцыйнага маніфеста. Дзесяткі ксяндзоў былі сасланы ў Сібір або ва ўнутраныя губерні Расіі, пазбаўлены сана, панеслі іншыя пакаранні. Да рэпрэсіўных мер, што прымяняліся да каталіцкай царквы, адносілася і закрыццё касцёлаў і кляштароў. За 1864 – 1867 гг. па Віленскай і Гродзенскай губернях іх было скасавана 140.

У мэтах паслаблення ўплыву каталіцкіх святароў на беларускі народ быў распрацаваны план пад назвай «распалячванне касцёла». Сутнасць яго зводзілася да таго, каб увесці ў каталіцкіх касцёлах беларускіх губерняў рускую мову замест польскай у дадатковае набажэнства і казанні.

У 60 – 70-я гг. XIX ст. адбываюцца змены ва ўрадавай палітыцы ў адносінах да стараевераў: прыхільнікам так званых «менш шкодных» сект была даравана палёгка ў іх грамадскіх правах і выкананні духоўных адпраў. Дазвалялася ствараць школы граматы, пасылаць дзяцей у агульныя навучальныя ўстановы без абавязковага вывучэння Закона Божага. Стараверы атрымалі права чыніць грамадскую малітву, выконваць адправы і набажэнствы па сваіх абрадах, пры ўмове, каб не было публічнага «спакуслівага» для праваслаўных уплыву. Яшчэ адзін важны дакумент, які сведчыць аб дэмакратызацыі палітыкі ўлад у адносінах да стараевераў, – указ ад 3 мая 1863 г. Згодна з гэтым дакументам члены ўсіх стараверчаскіх сектаў, акрамя скапцоў, атрымлівалі пашпарты і маглі перамяшчацца

ўнутры Расійскай імперыі на агульных умовах. Ім дазвалялася займацца гандлем і промысламі, займаць службовыя пасады і г. д.

Колькасць пратэстантаў у Беларусі, як і раней, была нязначнай. У пачатку 60-х гг. у пяці губернях пражываў 19 951 чалавек, што належалі да рэфарматаў і лютэран. Адносіны пратэстантаў з адміністрацыйнымі ўладамі і праваслаўнай царквой былі звычайна памяркоўнымі. З-за малалікасці пратэстанцкіх вернікаў царскія ўлады вялікіх перашкод ім не чынілі, але пры магчымасці імкнуліся стрымліваць рост колькасці вернікаў і культавых устаноў пратэстантаў.

У палітыцы ўрада ў дачыненні да нехрысціянскіх канфесій (іудаізму, мусульманства) у 60 – 90-я гг. вялікіх змен не назіралася.

Іудзеі складалі даволі значную ў колькасных адносінах групу па веравызнаннях. Калі ў пачатку 60-х гг. у пяці губернях пражывала 463 217 іудзеяў, то, згодна з перапісам, у 1897 г. – 1 209 815. Палітыка русіфікацыі Беларускага краю наклала свой адбітак і на яўрэйскае насельніцтва. Забаранялася насіць яўрэйскае адзенне, «пейсы хасідаў». У яўрэйскіх навучальных установах уводзілася абавязковае вывучэнне рускай мовы. Яўрэйскія абшчыны стваралі школы рускай граматы, арганізоўвалі прыватнае вывучэнне рускай мовы для дзяцей, час ад часу гучала руская мова і ў сінагогах. У 1882 г. яўрэям было забаронена сяліцца за межамі гарадоў і мястэчак, арандаваць і купляць зямлю. У пачатку 90-х гадоў у Беларусь была выселена значная колькасць яўрэяў з гарадоў Цэнтральнай Расіі, у выніку чаго ўзнікла штучная перанаселенасць яўрэямі беларускіх гарадоў.

Акрамя таго, не страціла сваю вастрыню ва ўзаемаадносінах улад і іудзейскай канфесіі і праблема рабінату. Прычына яе была ў тым, што, не ўнікаючы глыбока ў традыцыі іудзейскай веры, расійскі ўрад надаваў рабінам нязвыклыя, з пункту гледжання яўрэйства, функцыі. Асабліва ўскладнілася гэта праблема пасля прыняцця закона 1857 г., згодна з якім яўрэйскія грамадствы павінны былі выбіраць рабінаў з тых асоб, якія скончылі курс у рабінскіх і казённых яўрэйскіх вучылішчах 2-га разраду або мелі атэстат аб заканчэнні сярэдніх ці вышэйшых навучальных устаноў агульнага тыпу. Пасля скасавання рабінскіх вучылішч іх месца занялі яўрэйскія настаўніцкія інстытуты. Аднак праблема засталася. Яўрэйскія абшчыны, падпарадкоўваючыся ўладам, выбіралі так званых «казённых» рабінаў, але бачылі ў іх галоўным чынам чыноўнікаў, якія вялі акты грамадзянскага стану. Разам з тым выбіралі і духоўных рабінаў, якіх і лічылі сваімі сапраўднымі духоўнымі кіраўнікамі. З пункту гледжання

расійскага заканадаўства гэтыя рабіны не мелі ніякіх правоў, і таму пытанні аб іх легалізацыі неаднаразова ставіліся прадстаўнікамі яўрэйскіх абшчын перад уладамі. Улады вырашылі гэта пытанне часткова: было дазволена ўключаць у склад духоўных праўленняў малітоўных абшчын так званых «вучоных», г. зн. тлумачальнікаў веры і рэлігійных пытанняў.

Палітыка ўлад у дачыненні да мусульман была больш памяркоўнай. Дакладней, татары-мусульмане, што пражывалі ў беларуска-літоўскіх губернях, не прыцягвалі пільнай увагі. На гэта ўплывалі дзве прычыны: па-першае, невялікая колькасць татараў-мусульман. У пачатку 60-х гг. яны пражывалі ў Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губернях у колькасці 6 196 чалавек. У 1897 г. гэта лічба склала 13 877 чалавек. Па-другое, добрыя адносіны татараў-мусульман з іншымі народамі і канфесіямі, чаму спрыяла працаздольнасць і высокая маральнасць мусульман.

Лаяльнасць улад да мусульман не азначала, аднак, што яны аказвалі матэрыяльную падтрымку гэтай канфесіі. Згодна з заканадаўствам Расійскай імперыі духоўныя асобы мусульман і мячэці павінны былі ўтрымлівацца на сродкі саміх прыхаджан. Спробы мусульманскіх абшчын атрымаць грошы ад казны, як правіла, поспеху не прыносілі.

Такім чынам, канфесіянальная палітыка царскіх улад у Беларусі ў 60 – 90-я гг. XIX ст. садзейнічала таму, што пазіцыі праваслаўнай царквы тут значна ўмацаваліся. У той жа час абмежавальныя законы ў адносінах да каталіцкай царквы, адкрытыя рэпрэсіўныя дзеянні з боку ўлад абцяжарвалі дзейнасць каталіцкага духавенства, звужалі сферу яго дзейнасці. Больш цярпімымі былі адносіны ўлад да нешматлікіх хрысціянскіх і нехрысціянскіх канфесій.

### 3. Русіфікацыя Беларусі

Адносна «беларускага пытання» царскі ўрад вёў сябе неадназначна. Беларускі народ, у аснове сваёй сялянства, падлягаў русіфікацыі. У час паўстання царызм пачаў заігрываць з сялянамі: ліквідаваў часова-абавязанае становішча, знізіў на 20 % штогадовыя выкупныя плацяжы, надзяліў беззямельных сялян трыма дзесяцінамі зямлі. Чыноўнікі і служыцелі праваслаўнай царквы натраўлівалі сялян супраць польскіх памешчыкаў, распальвалі нянавісць да палякаў Мелі месца выпадкі, асабліва ва ўсходняй частцы Беларусі, калі сяляне разам з царскімі войскамі нападалі на атрады паўстанцаў, сачылі за польскімі

памешчыкамі, дакладвалі ўладам аб іх дзеяннях і г. д. Выкарыстоўваліся нават подкупы за даносы.

З мэтай узмацнення расійскага ўплыву на мясцовае праваслаўнае насельніцтва царскі ўрад распрацаваў сваю стратэгію ў гэтым пытанні. Асаблівая ўвага была звернута на пачатковую школу. У большай ступені, чым у цэнтральных губернях, яна ставілася пад кантроль праваслаўнай царквы. Школа і царква былі прызваны выхоўваць дзяцей-беларусаў у духу пакорнасці, вернасці манархіі, садзейнічаць русіфікацыі краю. На аснове гэтых пастулатаў складаліся вучэбныя праграмы, падбіраліся настаўніцкія кадры. У канцы 60-х гадоў у пачатковых класах школ пяці заходніх губерняў, акрамя настаўнікаў, выкладанне вялі 580 святароў, 93 дыяканы і прычэтнікі, 116 выпускнікоў праваслаўных духоўных семінарый.

Выкладанне вялося на рускай мове. Беларуская мова, як і польская, выцяснялася са сферы ўжытку. Куратар Віленскай вучэбнай акругі, спасылаючыся на «недасканаласць» і «беднасць» беларускай мовы, настойваў на тым, што няма сэнсу «друкаваць кнігі на беларускім дыялекце». У другой палове XIX ст. не было выдана ніводнай кнігі на беларускай мове.

Улады закрылі ўсе дваранскія вучылішчы і гімназіі, за выключэннем губернскіх гарадоў. Гэтыя навучальныя ўстановы рыхтавалі ў асноўным чыноўнікаў для дзяржаўнай службы і былі, на думку улад, рассаднікамі польскіх ідэй. Таму доступ у іх дзяцей польскай шляхты быў абмежаваны. У гімназіях і вучылішчах забаранялася выкарыстанне польскай мовы, канфіскоўваліся польскія кнігі з бібліятэк, забаранялася выданне і выкарыстанне польскіх падручнікаў.

У «рускім духу» прадугледжвалася і развіццё жаночай адукацыі. Навучанне і выхаванне ў жаночых навучальных установах будавалася з такім разлікам, каб іх выпускніцы ў будучым выхоўвалі дзяцей у духу вернасці Расіі і самадзяржаўю і ўплывалі ў гэтым напрамку на сваіх мужоў – мясцовых чыноўнікаў і памешчыкаў.

Барацьбе з паланізацыяй служыла таксама штучнае стрымліванне развіцця вышэйшай адукацыі ў краі. Выхадцы з паўночна-заходніх губерняў павінны былі атрымоўваць адукацыю ў вышэйшых навучальных установах Расіі і пасля іх заканчэння працаўладкоўвацца на службу там, бо на радзіме іх на працу не прымалі. Дыскрымінацыйныя меры прадпрымаліся таксама ў галіне культуры. У Паўночна-Заходнім краі забаранялася выданне любой літаратуры на польскай мове, акрамя малітоўнікаў.

## Пытанні і заданні для самакантролю

1. Чым вызначаліся асаблівасці саслоўнай палітыкі на Беларусі ў другой палове XIX ст.?

2. Якія меры прадпрымаў царызм па ліквідацыі польскага ўплыву на тэрыторыі Беларусі пасля падаўлення паўстання 1863 г.?

3. Што рабілася ў беларускіх губернях для ўмацавання рускага ўплыву на мясцовае беларускае насельніцтва?

4. Якія мерапрыемствы праводзіліся ў беларускіх губернях па ўмацаванню пазіцый праваслаўнай царквы?

5. У чым сутнасць палітыкі «распалячвання касцёла» ў другой палове XIX ст.?

6. Якія яшчэ канфесіі дзейнічалі на Беларусі з дазволу царскіх улад? Ахарактарызуйце іх становішча.

7. Якой палітыкі прытрымліваўся царызм у адносінах да «беларускага пытання»?

## ЛЕКЦЫЯ 12
## Сельская гаспадарка Беларусі ў другой палове XIX ст.

1. Асаблівасці буржуазнай эвалюцыі сельскай гаспадаркі Беларусі.

2. Памешчыцкае і сялянскае землеўладанне.

3. Аграрны крызіс 80-х гг. і яго ўплыў на рыначную спецыялізацыю сельскай гаспадаркі.

4. Сялянскі рух у 60-я – 90-я гады.

### 1. Асаблівасці буржуазнай эвалюцыі сельскай гаспадаркі Беларусі

Рэформа 1861 г., праведзеная ў інтарэсах памешчыкаў, абумовіла «прускі шлях» развіцця аграрнага капіталізму ў Расіі. На Беларусі яго рысы былі яшчэ больш выразныя. Тут пераважала памешчыцкае землеўладанне. Паводле даных 1877 г., памешчыкам належала 50,3 % зямлі, сялянам – 33,4 %, казне, царкве, розным установам – 11,2 %. Буржуазнае землеўладанне складала ўсяго 5,1 % ад агульнай зямельнай плошчы. Памешчыцкае землеўладанне на Беларусі мела выразны латыфундыяльны характар. Буйныя памешчыкі валодалі дзесяткамі і сотнямі тысяч дзесяцін зямлі. Граф Чарнышоў-Круглікаў меў 74,5 тыс. дзесяцін зямлі, князь Паскевіч – 83,5 тыс., граф Патоцкі – 121,6 тыс., князь

Радзівіл – 150 тыс., а князь Вітгенштэйн – амаль 1 млн дзесяцін. У той жа час сялянскія надзелы складалі ў сярэднім ад 2 да 5 дзесяцін.

На змену прыгонніцтву прыйшла пераходная сістэма гаспадарання, якая спалучала ў сабе рысы феадальнай і капіталістычнай сістэм, – так званая адпрацоўчая сістэма. Яна зводзілася да таго, што малазямельныя сяляне вымушаны былі арандаваць зямлю ў памешчыкаў і за гэта адпрацоўваць яе частку сваім інвентаром і работай жывёлай. У адрозненне ад паншчыннай сістэмы гаспадарання, селянін працаваў на памешчыка не з прычыны пазаэканамічнага прымусу, а ў выніку эканамічнай неабходнасці. Падабенства адпрацоўчай і капіталістычнай сістэм заключалася ў тым, што і пры гэтай сістэме селянін быў асабіста свабодны, але пры капіталістычнай сістэме гаспадарання памешчыцкая зямля апрацоўвалася інвентаром і рабочай жывёлай уладальніка.

У 60 – 70 я гг. ХІХ ст. у памешчыцкіх гаспадарках Беларусі панавала адпрацоўчая сістэма. Шырокае распаўсюджванне набылі здольшчына, палавіншчына, адработкі за ўсялякія ўгоддзі. Частка памешчыкаў адразу пасля рэформы пачала выкарыстоўваць вольнанаёмную працу, але адсутнасць сродкаў прыводзіла да таго, што яны адмаўляліся ад новаўвядзенняў і ўжывалі адработкі.

Адпрацоўчая і капіталістычная сістэмы гаспадарання існавалі як паасобку, так і разам, часам у адным і тым жа маёнтку, калі адны работы выконваліся на падставе адработак, а другія – шляхам капіталістычнага найму. Адпрацоўчая сістэма паступова падрывалася і выціскалася капіталістычнай. У канцы 80-х гг. ХІХ ст. у заходніх беларускіх губернях – Мінскай, Гродзенскай, Віленскай – пераважала капіталістычная сістэма гаспадарання, ва ўсходніх – Віцебскай і Магілёўскай – змешаная адпрацоўча-капіталістычная сістэма.

У парэформенны час на Беларусі, як і ва ўсёй Расіі, ішоў працэс пераходу саслоўнага землеўладання ў бессаслоўнае, але тут ён адбываўся больш замаруджана. Гэта тлумачылася, з аднаго боку, адноснай эканамічнай устойлівасцю буйных памешчыцкіх гаспадарак, у большасці арганізаваных на капіталістычны лад, а з другога – пераход зямлі ад дваран да іншых саслоўяў тармазіўся царскім урадам, які пасля паўстання 1863 г. забараніў памешчыкам-католікам зноў набываць зямлю, а сялянам-католікам купляць яе больш за 60 дзесяцін на аднаго чалавека. Забаранялася мець зямлю яўрэям. Гэта, безумоўна, затрымлівала працэс фарміравання сельскай буржуазіі. Разам з тым царскі ўрад насаджаў на Беларусі прыватнае землеўладанне рускіх памешчыкаў, плошча ўладанняў

якіх павялічылася ў Мінскай, Гродзенскай, Віцебскай, Віленскай губернях з 1,8 млн дзесяцін у 1865 г. да 3,6 млн дзесяцін у 1870 г., альбо ў 2 разы. Рэформа 1861 г., якая вызваліла сялян ад прыгоннай залежнасці, стварыла передумовы для канчатковага падрыву натуральнай гаспадаркі. Сельская гаспадарка Беларусі ўсё шырэй уцягвалася ў рыначныя адносіны. Менавіта рынак з'явіўся тым рычагом, які рэгуляваў яе развіццё. Ён патрабаваў павелічэння вытворчасці розных сельскагаспадарчых вырабаў, што ў сваю чаргу было абумоўлена развіццём прамысловасці, чыгуначным будаўніцтвам, ростам гарадоў і гарадскога насельніцтва. На рост гандлёвага земляробства і жывёлагадоўлі ўплывала і канцэнтрацыя войскаў на Беларусі, для ўтрымання якіх таксама патрабавалася шмат прадуктаў.

Павелічэнне сельскагаспадарчай вытворчасці адбывалася шляхам пашырэння пасяўных плошчаў. На памешчыцкіх землях заходніх губерняў у 70-я гг. у параўнанні з 60-мі яны ўзраслі ў сярэднім на 12 % і асабліва хутка пашыраліся ў Мінскай (на 55,5 %) і Гродзенскай (на 22,5 %) губернях.

## 2. Памешчыцкае і сялянскае землеўладанне

Вядучае месца ў гаспадарках памешчыкаў у першае парэформеннае дваццацігоддзе займала вытворчасць збожжа. У 70-я гг. у параўнанні з 50-мі валавы збор збожжа павялічыўся на 62,6 %, а чыстыя зборы (за вылікам насення) – на 96 %. Беларусь у другой палове 70-х гг. становіцца важным у Расіі раёнам экспарту збожжа. Збожжавыя тавары праз Рыгу, Лібаву (цяпер Ліепая), Польшчу вывозіліся за мяжу. Напрыклад, у 1878 г. з заходніх губерняў па чыгуначных шляхах і рэках было вывезена 20,5 млн пудоў збожжа. За мяжу вывозіліся жыта, авёс, ячмень, а ўвозілася пшаніца.

У памешчыцкіх гаспадарках пачалі распаўсюджвацца мнагапольныя севазвароты, выкарыстоўвацца сельскагаспадарчыя машыны. Напрыклад, у Мінскай губерні ў канцы 70-х гг. амаль у 20 % абследаваных маёнткаў прымяняліся мнагапольныя севазвароты і палепшаныя машыны і прылады. Паступова таварны характар набывалі таксама жывёлагадоўля, льнаводства. Разам з тым узровень развіцця капіталізму ў памешчыцкай гаспадарцы ў 60 – 70-я гг. не трэба перабольшваць, бо ён рабіў толькі першыя крокі па гэтым шляху.

Да сістэмы капіталістычнай вытворчасці паступова далучалася і гаспадарка сялян. Паказчыкам гэтага працэсу з'явіліся рост гандлёвага земляробства, а таксама маёмаснае расслаенне сялянства.

У выніку аграрнай рэформы сяляне былі абрабаваны памешчыкамі. Набытых надзелаў у большасці выпадкаў не хапала для вядзення ўласнай гаспадаркі. Сярэдні надзел памешчыцкіх сялян вагаўся па губернях ад 3,9 да 5,1 дзесяцін на рэвізскую мужчынскую душу, а былых дзяржаўных – ад 5,5 да 6 дзесяцін. На Беларусі, дзе патрабавалася ўзмоцненае ўгнаенне глебы, пражытачны мінімум мог забяспечыць надзел не менш чым 8 дзесяцін зямлі на душу. З прыростам сельскага насельніцтва і ў выніку абменаў, адрэзкаў, прырэзкаў, развярстання сялянскіх угоддзяў надзелы сялян паменшыліся і ў канцы 70-х гг. у сярэднім у былых памешчыцкіх сялян складалі 3,3 дзесяціны, а ў былых дзяржаўных – 4,5 дзесяціны на рэвізскую душу. У 80 – 90-я гг. скарачэнне сялянскіх надзелаў працягвалася. З 1880 да 1900 г. сярэдні надзел на душу мужчынскага пола паменшыўся з 3,2 да 2,1 дзесяціны.

Галоўнай галіной сялянскай гаспадаркі было земляробства. З пачатку 60-х да канца 90-х гг. XIX ст. на сялянскіх надзельных землях Беларусі пасевы збожжавых узраслі на 23,9 %, а іх ураджайнасць – на 50 %. Хутчэй пашыраліся пасевы і раслі зборы кармавых і тэхнічных раслін. За парэформенны час пасяўная плошча пад бульбай узрасла ў 2 разы, чыстыя зборы – у 4,6 раза, льновалакна – адпаведна на 35 і 82,5 %. Трэба адзначыць, што прырост прадукцыі ўсіх культур быў дасягнуты як экстэнсіўным, так і інтэнсіўным шляхам. У гаспадарках заможных сялян пачалі выкарыстоўвацца палепшаныя прылады працы, штучныя ўгнаенні, сартавое насенне.

Важнай галіной народнай гаспадаркі з'яўлялася жывёлагадоўля. У канцы 90-х гг. XIX ст. у параўнанні з пачаткам 70-х пагалоўе буйной рагатай жывёлы павялічылася на 50 %. Але гэтая галіна вытворчасці развівалася галоўным чынам у гаспадарках заможных сялян.

Узрослы попыт на сельскагаспадарчую прадукцыю на ўнутраным і знешнім рынках абумовіў павелічэнне таварнасці сялянскай гаспадаркі. У другой палове XIX ст. на Беларусі сялянства давала каля 1/4 таварнага збожжа, 3/4 таварнага льну, значную частку бульбы, а таксама прадуктаў мясной і малочнай жывёлагадоўлі.

Але, нягледзячы на развіццё капіталістычных адносін, сялянская гаспадарка ўвогуле заставалася адсталай. У пераважнай большасці выкарыстоўваліся руцінныя прылады працы – драўляная саха і барана.

Збожжа і травы ўбіраліся ўручную, сярпамі і косамі. Пераважала трохпольная сістэма земляробства.

Развіццё прадукцыйных сіл у сялянскай гаспадарцы стрымлівалася шматлікімі перажыткамі прыгонніцтва. Акрамя буйнога памешчыцкага землеўладання, розных подацей і павіннасце, да іх адносіліся захаванне ў некаторых губернях сялянскай абшчыны, сервітутаў, цераспалосіца, малазямелле.

У другой палове 70-х гг. на Беларусі налічвалася 7,7 тыс. абшчын былых прыватнаўладальніцкіх і 17 тыс. былых дзяржаўных сялян, якія былі найбольш пашыраны ў Магілёўскай і Віцебскай губернях (больш за 96 % усёй колькасці двароў з абшчынным землеўладаннем). Хаця ў парэформенны час перадзелы зямлі амаль што не мелі месца, абшчынная ўласнасць не магла быць прададзена селянінам другой асобе без згоды абшчыннікаў. Як і раней, існавала кругавая парука пры выплаце падаткаў і адбыцці павіннасцей. Такім чынам, абшчына садзейнічала захаванню адработкаў і росту аграрнага перанасялення.

Анахранізмам прыгонніцкай эпохі з’яўляліся таксама сервітуты. Сервітутныя ўгоддзі былі ўласнасцю памешчыкаў, і сяляне маглі карыстацца імі толькі на пэўных умовах. У 60 – 90-я гг. XIX ст. імі карысталася каля 50 % сялянскіх двароў.

Малазямелле сялян узмацнялася цераспалосіцай. Сялянскія надзелы вельмі часта размяшчаліся не на адным месцы, а паасобку, сярод памешчыцкіх угоддзяў. У заходніх губернях цераспалосіца была распаўсюджана больш, чым ва ўнутраных раёнах Расіі. Яна затрымлівала ўвядзенне рацыянальнай сістэмы земляробства, інтэнсіфікацыю сялянскай гаспадаркі.

З ростам таварна-грашовых адносін паскорыўся працэс маёмаснага і класавага расслаення сялянства. У канцы 70-х гг. 61,9 % сялянскіх двароў мелі каля 15 дзесяцін зямлі, а 10,4 % – звыш 20. У выніку рэформаў 60-х гг. зямля стала аб’ектам куплі-продажу, і на Беларусі павялічвалася колькасць сялян, якія набывалі дзесяткі і нават сотні дзесяцін зямлі. Некаторыя з іх куплялі цэлыя маёнткі. Ужо ў 70-я гг. XIX ст. былі сяляне, якія купілі маёнткі плошчай больш за тысячу дзесяцін, нават 2400 – 2800 дзесяцін. Важную ролю ў працэсе куплі зямлі адыграў Сялянскі банк, заснаваны царскім урадам у 1882 г. Банк выдаваў доўгатэрміновыя пазыкі сялянам з мэтай куплі зямлі і садзейнічаў памешчыкам у выгадным продажы зямлі сялянам па завышаных цэнах. Пазыкі выдаваліся, як правіла, на 55 з паловай гадоў пры ўмове штогадовага пагашэння іх у

памеры 6,5 % даўгавой сумы. Банкаўская ацэнка прадаваемай зямлі праводзілася на выснове капіталізацыі з разліку 5 % яе даходнасці. З павелічэннем попыту на зямельныя ўгоддзі цэны на зямлю пачалі хутка расці. У 90-я гг. у параўнанні з 60-мі яны ўзраслі ў пяці заходніх губернях з 11 руб. 45 кап. да 34 руб. 87 кап. за дзесяціну, гэта значыць, больш чым у 3 разы. Высокія цэны на зямлю абумовілі і высокія плацяжы па банкаўскіх пазыках. У канцы XIX ст. яны складалі ў сярэднім 3,6 % на дзесяціну пакупной зямлі. Але, нягледзячы на гэта, купля зямлі сялянамі пры садзейнічанні Сялянскага банка паступова ўзрастала. У 1886 – 1890 гг. у параўнанні з 1883 – 1885 гг. колькасць пакупак павялічылася больш чым у 20 разоў. Да 1890 г. сяляне ў пяці заходніх губернях набылі праз Сялянскі банк 984,3 тыс. дзесяцін зямлі.

У беларускай вёсцы пераважала пакупка зямлі таварыствамі, а не асобнымі гаспадарамі. Яны лічыліся банкамі больш надзейнымі ў сэнсе пагашэння пазыкі. Сяляне, якія аб'ядноўваліся ў таварыства, маглі яе прадаць, перадаць па спадчыне, здаць у арэнду, але ўсе гэтыя здзелкі разглядаліся і зацвярджаліся таварыствам, якое павінна было сачыць за плацежаздольнасцю сваіх членаў.

## 3. Аграрны крызіс 80-х гг. і яго ўплыў на рыначную спецыялізацыю сельскай гаспадаркі

Працэс развіцця капіталістычных адносін у сельскай гаспадарцы Беларусі, асабліва ў памешчыцкіх гаспадарках, паскорыўся ў 80-я гады. Значную ролю ў гэтым адыграў сусветны аграрны крызіс 80 – 90-х гадоў. Непасрэднай прычынай крызісу з'явіўся ўвоз у Еўропу таннага збожжа з США, Канады, Аргенціны і Аўстраліі. У выніку рэзка ўпалі цэны на збожжа на рынках еўрапейскіх краін і ў Расіі. У Беларусі ў пачатку 80-х гадоў яны знізіліся больш чым у 2 разы і гандаль збожжам пачаў цярпець вялікія страты. Гэта прымусіла беларускіх памешчыкаў перайсці на вытворчасць такой прадукцыі, якая ва ўмовах рынка магла забяспечыць высокую норму прыбытку. Такой галіной сельскагаспадарчай вытворчасці стала малочная жывёлагадоўля.

У сувязі з пераарыентацыяй сельскай гаспадаркі на вытворчасць малочнай прадукцыі ў памешчыцкіх гаспадарках Беларусі хуткімі тэмпамі пачало расці пагалоўе буйной рагатай жывёлы. За 1883 – 1900 гг. яе колькасць павялічылася ў 2 разы. Многія памешчыкі пачалі заводзіць палепшаныя пароды кароў (галандскую, сіментальскую, цірольскую і

інш.), адкрывалі спецыяльныя фермы (заводы) для іх вырошчвання. У передавых гаспадарках адкрываліся сыраварныя і маслаpобчыя заводы. Іх прадукцыя ішла як на ўнутраны, так і на знешні рынак. У канцы XIX ст. у Беларусі ўжо налічвалася не менш 200 маслаpобчых і сыраварных заводаў, на якіх штогод выраблялася ад 500 да 650 тыс. пудоў масла і сыра.

Другім важным напрамкам спецыялізацыі памешчыцкіх гаспадарак у Беларусі было вінакурэнне. У 1893 – 1894 гг. у пяці беларускіх губернях дзейнічалі 404 вінакурныя заводы. Асноўнай сыравінай для вытворчасці спірту з'яўлялася бульба. Адыходы ад вінакурэння – брага выкарыстоўвалася на корм жывёле.

Спецыялізацыя памешчыцкай гаспадаркі ў Беларусі на малочнай жывёлагадоўлі і вінакурэнні суправаджалася значнымі зменамі ў структуры пасяўных плошчаў. Найбольш высокімі тэмпамі развівалася травасеянне. Плошчы пад кармавымі культурамі (канюшына, віка, сырадэла, цімафееўка і інш.) у 80 – 90-я гады павялічыліся ў Беларусі ў 7 разоў. У 3,3 разы павялічыліся пасевы бульбы. Плошчы пад збожжавымі культурамі таксама выраслі, але ўдзельная вага іх у агульнай пасяўной плошчы знізілася. З пачатку сусветнага аграрнага крызісу збожжавыя ў Беларусі вырошчваліся ў асноўным для ўнутранага выкарыстання (выпечкі хлеба, на корм жывёле і для вінакурэння).

Важным напрамкам спецыялізацыі сельскай гаспадаркі ў памесцях Віцебскай і некаторых уездах Віленскай губерняў з'яўлялася ільнаводства, на Магілёўшчыне – вырошчване канаплі. У Гродзенскай і Мінскай губернях у 60 – 70-я гады шырокае развіццё атрымала танкарунная авечкагадоўля. Воўна з гэтых губерняў паступала як на мясцовыя суконныя фабрыкі, так і ў Польшчу, Германію і Аўстра-Венгрыю. Але пазней, з-за канкурэнцыі больш таннай воўны з паўднёвых раёнаў Расіі і Аўстраліі, авечкагадоўля ў Беларусі пачала прыходзіць ва ўпадак. У памешчыцкіх гаспадарках у 80 – 90-я гады таварны характар пачала набываць свінагадоўля.

Сусветны аграрны крызіс аказаў свой уплыў і на сялянскую гаспадарку. З аднога боку, ён паскорыў працэс маёмаснай дыферэнцыяцыі сялянства, з другога – садзейнічаў паглыбленню яго спецыялізацыі. Але гэта датычыла ў першую чаргу заможных сялян. Яны спецыялізавалі свае гаспадаркі ў тых жа напрамках, у якіх спецыялізаваліся памешчыцкія памесці.

Аграрны крызіс стымуляваў попыт у памешчыкаў і заможных сялян на палепшаныя прылады працы і розную сельскагаспадарчую тэхніку

(жалезныя плугі, бароны, сеялкі, жняяркі, малацілкі, веялкі і г. д.). У Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губернях палепшаныя прылады працы і машыны ў гаспадарках памешчыкаў і заможных сялян выкарыстоўваліся шырэй, чым у Віцебскай і Магілёўскай губернях. Іх прымяненне істотным чынам сказвалася на інтэнсіфікацыі сельскагаспадарчай вытворчасці і росце ўраджайнасці сельскагаспадарчых культур. У комплексе з больш шырокім выкарыстаннем арганічных і мінеральных угнаенняў ураджайнасць і валавыя зборы асноўных сельскагаспадарчых культур бесперапынна раслі. За 30 паслярэформенных гадоў сярэднегадавы чысты збор збожжа ў Беларусі вырас у 2,1 раза, бульбы – у 4,8 разоў.

Такім чынам, у 60 – 90-я гады ў выніку развіцця таварна-грашовых адносін сельская гаспадарка Беларусі пераадолела шлях ад феадалізму да капіталізму. Гэта адбывалася пры наяўнасці розных форм гаспадарання, у першую чаргу спалучэння двух асноўных – адпрацоўчай і капіталістычнай. У Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губернях у канцы 80-х гадоў ужо пераважала капіталістычная сістэма, у Магілёўскай і Віцебскай – змешаная.

Сутнасць капіталістычнай сістэмы заключалася ў выкарыстанні наёмных рабочых (гадавых, сезонных, падзённых і інш.), якія апрацоўвалі зямлю інвентаром уладальніка гаспадаркі. Такія гаспадаркі паступова набывалі гандлёвы, прадпрымальніцкі характар. Яны ўводзілі шматпольныя севазвароты, пародзістую жывёлу, палепшаныя прылады працы, сельскагаспадарчыя машыны і г. д.

Адпрацоўчая сістэма з’яўлялася анахранізмам феадальнага спосабу вытворчасці. Тыя памешчыцкія гаспадаркі, якія арыентаваліся пераважна на адпрацоўчую сістэму з яе старадзедаўскімі метадамі земляробства, ва ўмовах рыначных адносін не вытрымлівалі канкурэнцыі і, абцяжараныя шматлікімі даўгамі, хутка разараліся. У канцы 80-х гадоў у 5 беларускіх губернях ужо было заложана ў банках 3075 тыс. дзесяцін памешчыцкай зямлі. У адной толькі Мінскай губерні ў 1890 г. былі заложаны 763 памешчыцкія гаспадаркі, у 1895 г. – 1656. Многія з іх пападалі на аўкцыёны і распрадаваліся. У пачатку 90-х гадоў пачалася распрадажа буйнейшай у Беларусі латыфундыі графа Вітгенштэйна. Да мая 1891 г. было ўжо прададзена 190 тыс. дзесяцін зямлі.

Вынікам гэтых працэсаў з’явілася скарачэнне саслоўнага, перш за ўсё дваранскага землеўладання, і рост бессаслоўнай прыватнай зямельнай уласнасці. Але ў Беларусі гэты працэс адбываўся значна павольней, чым у

Еўрапейскай частцы Расіі. За 1877 – 1905 гг. дваране ў беларускіх губернях страцілі 10,8 % сваіх зямель, у Еўрапейскай частцы Расіі – 27,2 %.

Працэс распаду дваранскай зямельнай уласнасці ў Беларусі адбываўся павольней, перш за ўсё таму, што памешчыцкія гаспадаркі, у якіх былі больш развітыя таварна-грашовыя адносіны, мелі большую эканамічную устойлівасць. Царскі ж урад тут таксама настойліва насаджаў рускае памешчыцкае землеўладанне, прадаючы на льготных умовах рускім памешчыкам і чыноўнікам канфіскаваныя ў польскіх памешчыкаў землі за ўдзел іх у паўстанні 1863 г. Толькі за 1864 – 1870 гг. у чатырох беларускіх губернях (Віленскай, Гродзенскай, Мінскай і Віцебскай) рускім дваранам і чыноўнікам было прададзена больш 1 тыс. канфіскаваных памесцяў і іх землеўладанне павялічылася тут больш чым у 2 разы, дасягнуўшы 3,7 млн дзесяцін.

Фарміраванне буржуазнай зямельнай уласнасці ў беларускіх губернях стрымлівалася таксама выключэннем з гэтага працэсу яўрэйскай буржуазіі, якая наогул была пазбаўлена права купляць зямлю па-за межамі гарадоў і мястэчак. Не мелі права набываць зямлю, акрамя наследавання, і памешчыкі-католікі. Існавалі абмежаванні і для сялян каталіцкага веравызнання. Яны не маглі набыць зямлю больш 60 дзесяцін на сям’ю.

## 4. Сялянскі рух у 60-я – 90-я гады

Развіццё капіталізму ў сельскай гаспадарцы Беларусі ў 60 – 90-я гады суправаджалася разарэннем і абядненнем сялянства, што з’яўлялася пастаяннай асновай сялянскай барацьбы. У 1864 – 1880 гг. у Беларусі штогод адбывалася 8 – 10 выступленняў сялян, а на працягу 1864 – 1900 г. мела месца каля 400 выступленняў.

У 60 – 70-я гады асноўнымі формамі выступленняў сялян былі іх пратэсты супраць адрэзу зямлі ў карысць памешчыкаў пры адводзе сялянскіх надзелаў, адмовы ад аплаты выкупных плацяжоў і іншых подацей. Асабліва актыўна пратэставалі сяляне ў сувязі з тым, што мясцовыя ўлады з адабрэння віленскіх генерал-губернатараў (спачатку Баранава, затым Патапава) імкнуліся адняць у сялян тыя ўступкі, якія яны атрымалі ў выніку паўстання 1863 г. У шэрагу ўездаў праверачныя камісіі ўстанавілі «лішкі» надзельнай зямлі ў сялян і імкнуліся іх адняць у карысць памешчыкаў. У Дзярэжыцкай і Лоеўскай валасцях Рэчыцкага ўезда Мінскай губерні праверачныя камісіі адрэзалі ў сялян 1860 дзесяцін зямлі і павялічылі суму выкупнога доўгу на 5300 рублёў. Сяляне

адмовіліся аддаваць адрэзаную зямлю, спынілі выплату выкупных плацяжоў і аказвалі актыўнае супраціўленне паліцыі, якая імкнулася прымусіць сялян падпарадкавацца ўладам. Хваляванні прадаўжаліся з 1867 па 1871 г. і былі падаўлены войскамі.

На гэтай жа глебе адбываліся хваляванні сялян у мястэчку Лагішын Пінскага ўезда Мінскай губерні. Каб падавіць супраціўленне сялян, у мястэчка былі ўведзены батальён пяхоты і дзве сотні казакоў. Тым не менш, выступленне сялян закончылася перамогай. Улады вымушаны былі вярнуць сялянам 2600 дзесяцін адрэзанай зямлі. Падобныя выступленні сялян мелі месца таксама ў шэрагу валасцей Слуцкага, Бабруйскага і Рэчыцкага ўездаў.

Масавы характар у гэты час мелі і іншыя формы барацьбы сялянства: самавольны выпас жывёлы на памешчыцкіх землях, парубкі лесу, супраціўленне памешчыцкай адміністрацыі, падпалы памешчыцкіх пабудоў і сабранага ўраджаю, забойствы памешчыкаў, іх прыслугі і г. д. Усе гэтыя формы перапляталіся і дапаўнялі адна другую.

У 80-я гады сялянскі рух развіваўся ў абстаноўцы паглыблення класавага расслаення сялян і ўзмацнення памешчыцкай і капіталістычнай эксплуатацыі. У Гродзенскай, Віленскай і Мінскай губернях барацьба сялянства ішла галоўным чынам за спрэчныя землі і сервітутныя ўгоддзі. У Магілёўскай і Віцебскай губернях шырокае распаўсюджанне атрымаў перасяленчы рух на свабодныя землі ў Сібіры і іншых губерняў Расійскай імперыі. У Магілёўскай губерні з-за цяжкіх і невыносных умоў на радзіме выказала жаданне перасяліцца сёмая частка сельскага насельніцтва. У Віцебскай губерні заявы на перасяленне падало больш за 50 тыс. сялян. Але самавольнае перасяленне афіцыйна не дазвалялася і падаўлялася ўладамі. Тым не менш, сяляне распрадавалі маёмасць і масамі збіраліся на чыгуначных станцыях, каб выехаць у Сібір. На шляху да станцый і на саміх станцыях адбываліся сутыкненні з паліцыяй і войскамі. Самавольшчыкаў арыштоўвалі і вярталі назад на папярэдняе месца жыхарства і там падвяргалі экзекуцыям. Але і гэтыя меры не маглі спыніць перасяленчага руху. З 1885 па 1900 г. з 5 беларускіх губерняў выехала за Урал 104 414 чалавек, у тым ліку з Віцебскай і Магілёўскай губерняў больш за 64 тысячы.

У 90-я гады, у сувязі з пагаршэннем становішча сялян, выкліканага аграрным крызісам, далейшым ростам малазямелля і беззямелля, запазычанасці многіх сялянскіх гаспадарак, сялянскі рух набыў больш вострыя формы. Шырокае распаўсюджанне ў гэты час атрымалі

самавольныя парубкі лясоў, падпалы памешчыцкіх памесцяў. У гэтыя гады павялічылася і колькасць сялянскіх выступленняў супраць кулацтва. Гэта была ўжо новая з'ява ў сялянскай барацьбе, звязаная з яе другім напрамкам. Яна таксама знаходзіла выражэнне ў падпалах кулацкіх пабудоў і ўраджаю, захопах маёмасці і г. д. Але такіх выступленняў у цэлым было яшчэ мала, а барацьба сельскагаспадарчых рабочых супраць памешчыкаў і кулакоў знаходзілася яшчэ ў зародкавым стане.

У цэлым жа сялянскі рух па свайму характару і зместу быў неаднолькавым. Адны выступленні сялян насілі стыхійны характар, другія – былі арганізаванымі. Але ўсе яны былі накіраваны супраць сацыяльнага прыгнечання, памешчыцкага землеўладання і іншых перажыткаў феадалізму.

### Пытанні і заданні для самакантролю

1. Якім шляхам развіваліся капіталістычныя адносіны ў сельскай гаспсдарцы Беларусі ў другой палове XIX ст.?

2. Дайце характарыстыку памешчыцкага землеўладання ў Беларусі пасля адмены прыгоннага права?

3. Як памешчыцкая гаспадарка прыстасоўвалася да таварна-грашовых адносін?

4. Што складала аснову сялянскай гаспадаркі ў другой палове XIX ст.?

5. Якія перашкоды існавалі на шляху развіцця сялянскай гаспадаркі?

6. У якім накірунку развівалася спецыялізацыя сельскай гаспадаркі ў 60 – 70-я гг. XIX ст.?

7. Якую ролю ў далейшым развіцці сельскагаспадарчай вытворчасці і яе спецыялізацыі ў Беларусі адыграў сусветны аграрны крызіс 80 – 90-х гг. XIX ст.?

8. Ахарактарызуйце асноўныя формы барацьбы сялян у другой палове XIX ст.

9. Якія новыя з'явы праявіліся ў сялянсім руху ў 90-я гг. XIX ст.?

## ЛЕКЦЫЯ 13
## Прамысловасць і гарады ў другой палове XIX ст.

1. Асаблівасці прамысловай рэвалюцыі ў Беларусі.
2. Спецыялізацыя беларускай прамысловасці, яе галіновая структура.
3. Рост гарадоў.

## 1. Асаблівасці прамысловай рэвалюцыі ў Беларусі

Усе тры асноўныя формы арганізацыі прамысловасці XIX ст. – дробнатаварная, мануфактурная і фабрычная вытворчасць – склаліся яшчэ ў дарэформеннай Беларусі. Пасля адмены прыгоннага права і рэформаў 60 – 70-х гг. XIX ст. яны захаваліся і атрымалі далейшае развіццё. Пры гэтым значна ўзрасла роля фабрычна-заводскай прамысловасці, якая ўпэўнена заняла дамінуючае месца ў прамысловым сектары беларускай эканомікі. Яна з’яўлялася лідэрам тэхнічнага прагрэсу, выключна на ёй базіравалася новая для Беларусі вытворчасць прамысловых тавараў.

Мануфактурная і дробнатаварная вытворчасць хаця і саступала фабрычна-заводскай па тэхнічнаму ўзбраенню і ступені канцэнтрацыі прадукцыйных сіл, у агульным памеры вытворчасці займала значнае месца. Паралельнае існаванне, а не аўтаматычная змена рамяства мануфактурай і мануфактуры – фабрыкай не сведчыла аб агульнай адсталасці беларускай прамысловасці. Справа ў тым, што тэхнічны ўзровень таго часу дазваляў весці машынную перапрацоўку далёка не ўсіх сыравінных рэсурсаў Беларусі, а наяўнасць значнага лішку танных працоўных рук па-свойму стрымлівала тэхнічны прагрэс. Гэтым і тлумачыцца трываласць у эканоміцы Беларусі дробнатаварнай вытворчасці і мануфактуры.

Пераважнае месца ў дробнатаварнай вытворчасці займалі рамесныя майстэрні, колькасць якіх узрастала. Калі ў пачатку 60-х гг. у Беларусі мелася каля 10 тыс. рамесных майстэрняў, то ў канцы 70-х гг. – 17 тыс., 80-х гг. – 24 тыс., 90-х гг. – 50 тыс. У 1900 г. у дробнай і рамеснай прамысловасці Беларусі налічвалася 84 тыс майстэрняў з 144 тыс. рабочых.

Развіццё мануфактур не мела эканамічных перспектыў. Яны прайгравалі дробнатаварным прадпрыемствам як больш дынамічным і здольным хутчэй прыстасавацца да патрэб рынку. Саступалі яны фабрыкам і заводам па памерах вытворчасці на асобна ўзятым прадпрыемстве і па якасці прадукцыі. З адменай прыгоннага права адпала магчымасць прымусовага выкарыстання працы прыгонных сялян, а новыя энергетычныя магчымасці – паравыя рухавікі, а ў канцы XIX ст. – электрычнасць і першыя рухавікі ўнутранага згарання – відавочна дэманстравалі сваю перавагу перад ручной працай. Але працэс заняпаду мануфактурнай вытворчасці не насіў абвальны характар і ішоў паступова.

У дробнатаварнай і мануфактурнай прамысловасці назіраліся і некаторыя рысы канцэнтрацыі вытворчасці. Так, мястэчка Смаргонь

Віленскай губерні стала цэнтрам гарбарнай прамысловасці, мястэчка Дуброўна Магілёўскай губерні спецыялізавалася на вытворчасці талесаў, былы павятовы цэнтр Копысь Магілёўскай губерні – на вытворчасці кафлі.

Фабрычна-заводская вытворчасць, заснаваная на скарыстанні машын, засведчыла сваю жыццяздольнасць ва ўсіх галінах беларускай прамысловасці. Асабліва бурнае развіццё фабрыкі і заводы Беларусі атрымалі ў канцы XIX ст. Гэты перыяд можна лічыць пачаткам індустрыялізацыі. Прычым на працягу 80 – 90-х гг. XIX ст. у Беларусі было пабудавана ў чатыры разы больш прадпрыемстваў, чым у двух папярэдніх дзесяцігоддзях (па Расійскай імперыі – у 2,6 раза).

Важным паказчыкам індустрыялізацыі з’яўляецца рост энергетычнай узброенасці прамысловасці. У пачатку 90-х гг. у Беларусі дзейнічала 294 паравыя рухавікі агульнай магутнасцю 5346 к.с., у 1900 г. – 527 рухавікоў магутнасцю 12 268 к.с. У 1889 г. пры Добрушскай папяровай фабрыцы (Гомельскі павет) пачала дзейнічаць першая ў Беларусі электрастанцыя.

Да ліку буйнейшых і найбольш тэхнічна дасканалых прадпрыемстваў не толькі Беларусі, але і ўсёй Расійскай імперыі належалі Добрушская (Магілёўская губерня) папяровая фабрыка, суконныя фабрыкі ў Альбярціне (Гродзенская губерня) і Парэччы (Мінская губерня). Яны, як і шэраг іншых беларускіх прадпрыемстваў, неаднаразова ўдзельнічалі ў айчынных і замежных выстаўках і атрымлівалі высокія ўзнагароды, што сведчыла аб адпаведнасці іх прадукцыі еўрапейскім і сусветным узорам.

Сваю нішу ў прамысловасці Беларусі знайшла і такая форма арганізацыі вытворчасці, як акцыянерныя таварыствы. Далёка не ўсе з іх змаглі паспяхова весці эканамічную дзейнасць, але ў канцы XIX ст. у Беларусі існавала каля дзесяці акцыянерных таварыстваў. Прыкладам найбольш выдатнай канцэнтрацыі рэсурсаў у форме акцыянернага капіталу з’яўлялася «Таварыства Добрушскай князя Паскевіча папяровай фабрыкі». Яно было заснавана ў 1877 г. з капіталам у 550 тыс. руб., падзеленых на 550 акцый.

Значную ролю ў ажыўленні эканомікі Беларусі адыграў указ ад 8 снежня 1867 г. аб дазволе яўрэям быць арандатарамі або аканомамі млыноў і заводаў пры маёнтках заходніх губерняў. Тым самым у пэўнай меры здымалася забарона на жыхарства яўрэяў у сельскай мясцовасці, а, з іншага боку, стваралася магчымасць для спалучэння прадукцыйных сіл, якія меліся ў памешчыкаў, з арганізацыйнымі і фінансавымі здольнасцямі заможных пластоў яўрэйскага насельніцтва.

Усяго за 40 парэформенных гадоў сума фабрычна-заводскай вытворчасці ў Беларусі ўзрасла з 1,9 да 72,1 млн руб. (у 38 разоў), у той час як мануфактурнай – у 14 разоў, дробнатаварнай у 3 раза. Колькасць

фабрык і заводаў узрасла з 76 да 1137 (у 15 разоў), мануфактур – у 5,4 раза, дробных прадпрыемстваў – у 1,2 раза. У 1900 г. на беларускіх фабрыках і заводах выраблена больш за 46 % прамысловай прадукцыі, на мануфактурах адпаведна – 15 %.

## 2. Спецыялізацыя беларускай прамысловасці, яе галіновая структура

Прамысловасць парэформеннай Беларусі, як і раней, базіравалася ў асноўным на выкарыстанні і перапрацоўцы мясцовых сыравінных рэсурсаў, у першую чаргу лясных багаццяў і прадукцыі сельскай гаспадаркі. Аднак пры захаванні амаль што традыцыйнай галіновай структуры беларускай прамысловасці ў ёй адбыліся колькасныя змены і відавочнае якаснае паляпшэнне. Вядучае месца засталося за рознымі галінамі харчасмакавай прамысловасці. Другараднае значэнне мелі іншыя прамысловыя галіны: тэкстыльная, гарбарная, шкляная, сілікатна-будаўнічая.

Парэформенная Беларусь заставалася адным з галоўных раёнаў вінакурства ў Расійскай імперыі. Хаця ў апошнія два дзесяцігоддзі XIX ст. колькасць вінакурных заводаў у Беларусі некалькі скарацілася, іх агульная вытворчасць значна ўзрасла. Гэта адбылося за кошт тэхнічнага ўдасканалення, асабліва ў апошняе пяцігоддзе XIX ст.

Працэсы скарачэння колькасці прадпрыемстваў разам з іх узбуйненнем і павелічэннем вытворчасці назіраліся і ў піваварнай прамысловасці. Мукамольна-крупяная галіна харчовай прамысловасці ўяўляла сабою спалучэнне ўсіх формаў вытворчасці, ад прымітыўных вадзяных і ветраных да паравых, з адзінкавай вытворчасцю да 2000 тыс. пудоў штогод. Крухмальна-патачныя і алейныя прадпрыемствы другой паловы XIX ст. часцей за ўсё адносіліся да дробнатаварных і мануфактурных.

Тытунёвыя прадпрыемствы меліся ў кожнай губерні і канцэнтраваліся выключна ў гарадах. Самым буйным прадпрыемствам у гэтай галіне стала гродзенская фабрыка Шарашэўскага, заснаваная ў 1862 г. У 1884 г. 688 рабочых гэтай фабрыкі вырабілі 4,8 тыс. пудоў тытуню, 22,4 тыс. пудоў махоркі, 9,3 млн цыгар і 48,2 млн штук папярос на 344 тыс. руб. У 1900 г. на фабрыцы працавала 1347 чалавек, гадавы выраб складаў 2,4 млн руб. –

больш за палову агульнай сумы вытворчасці беларускай тытунёвай прамысловасці на той час.

70-я гг. XIX ст. сталі дзесяцігоддзем найбольшага росквіту цукровай прамысловасці Беларусі. Тры буйнейшыя цукровыя заводы: Скірмунта ў маёнтку Парэчча (Пінскі павет), Вітгенштэйна ў маёнтку Івань (Слуцкі павет) і Паскевіча ў Гомелі выраблялі каля 25 тыс. пудоў цукру штогод. Але ўжо ў 80-я гг. усе цукровыя заводы Беларусі спынілі сваё існаванне, не вытрымаўшы канкурэнцыі з боку цукровай прамысловасці Украіны.

Якасныя змены адбываліся ў лясной прамысловасці. Побач з вывазам сырога лесу, які павялічваўся з кожным годам, у Беларусі ўзніклі прадпрыемствы па глыбокай перапрацоўцы драўніны. Лідэрам у сваёй галіне, і не толькі ў Беларусі, стала Добрушская папяровая фабрыка. Дзякуючы таленту і арганізацыйным здольнасцям А. Стульгінскага, які бесперапынна з 1877 па 1915 г. быў яе дырэктарам, фабрыка атрымала першакласнае тэхнічнае абсталяванне, пачала выкарыстоўваць новыя тэхналогіі і да 1900 г. давяла памеры гадавой вы-творчасці да 317,5 т паперы на суму 1601 тыс. руб.

Даволі вялікія папяровыя фабрыкі дзейнічалі паблізу Чашнікаў у Лепельскім павеце («Скіна», заснавана ў 1885 г.) і ў Шклове (заснавана ў 1890 г.).

Да ліку прамысловых галін Беларусі, якія развіваліся вельмі дынамічна, адносілася вытворчасць запалак. У канцы XIX ст. буйныя запалкавыя фабрыкі дзейнічалі ў Барысаве, Койданаве, Мазыры, Пінску Мінскай губерні і Навабеліцы Магілёўскай губерні.

Па памерах вытворчасці не мела сабе роўных у Расійскай імперыі пінская шавецка-шпілечная фабрыка, якая дзейнічала з 1879 г. Шырокую вядомасць набыла мэбля бабруйскай фабрыкі Мартыскевіча і Гонесці. Шматлікія прадпрыемствы лясной прамысловасці Беларусі выраблялі дошкі, гонт, паркет, шпалы, запалкавую саломку, драўняную масу, картон. Відавочным сведчаннем канцэнтрацыі вытворчасці ў лесахімічнай прамысловасці было з’яўленне ў канцы XIX ст. буйных заводаў сухой перагонкі драўніны ў Аршанскім, Рагачоўскім і Сенненскім паветах.

У 70-я гг. XIX ст. закрыліся апошнія металургічныя прадпрыемствы Беларусі, аднак металаапрацоўка і машынабудаўніцтва працягвалі развівацца, абслугоўваючы ў асноўным патрэбы сельскай гаспадаркі. Цэнтрамі вытворчасці сельскагаспадарчых машын і абсталявання з’яўляліся Мінск, Брэст, Горкі, мястэчка Ракаў Мінскага павета. У сяле Барань пад Оршай з 1873 г. паспяхова дзейнічаў драцяна-цвікавы завод.

Удзельная вага прадукцыі тэкстыльных прадпрыемстваў у агульнай прамысловасці Беларусі зніжалася. Нягледзячы на існаванне шэрагу дарэформенных суконных фабрык, значнага развіцця гэта галіна не атрымала. У канцы XIX ст. адкрыліся некалькі шоўкакруцільных фабрык з удзелам замежнага капіталу.

Гарбарная, шкляная і сілікатна-будаўнічая галіны прамысловасці паступова павялічвалі памеры вытворчасці. Аднак часцей за ўсё гэта былі змены колькаснага характару. Тэхнічны прагрэс пакуль што слаба закрануў іх.

Новай з’явай у эканоміцы Беларусі другой паловы XIX ст. было будаўніцтва асобных прадпрыемстваў, якія займалі выключнае, часта манапольнае становішча ў адпаведнай вытворчасці. Так, сын харкаўскага купца 1-й гільдыі М. Эльяшаў у 1878 г. атрымаў дазвол на будаўніцтва ў Гродне алоўкавай фабрыкі. Усяго на той час у Расійскай імперыі існавала чатыры такіх прадпрыемствы. На ўсерасійскай выстаўцы ў Маскве (1882) прадукцыю гродзенскай алоўкавай фабрыкі ўзнагародзілі бронзавым медалём, на сусветнай выстаўцы ў Парыжы (1889) яна атрымала ганаровы водгук. У 1892 г. у Віцебску пачала дзейнічаць фабрыка акуляраў і аптычных прылад – першая ў Расійскай імперыі. Адзіным у паўночна-заходніх губернях суднабудаўнічым заводам стаў завод, адкрыты ў 1884 г. у Пінску.

## 3. Рост гарадоў

Развіццё прамысловасці і чыгуначнай сеткі садзейнічала росту гарадоў. У многіх з іх у апошняй трэці XIX – пачатку XX ст. найбуйнейшымі прамысловымі прадпрыемствамі сталі чыгуначныя майстэрні і дэпо. У 1905 г. у Галоўных майстэрнях Палескіх чыгунак у Пінску працавалі 1320 чалавек, у Галоўных майстэрнях Лібава-Роменскай чыгункі ў Гомелі – 1290, у майстэрнях і дэпо Маскоўска-Брэсцкай чыгункі ў Мінску – 750 чалавек і г. д. Самым буйным прамысловым прадпрыемствам у Віцебску (900 рабочых) з’яўлялася льнопрадзільная фабрыка «Дзвіна», пабудаваная ў 1900 г. На пачатку XX ст. Віцебск стаў адным з цэнтраў па выпуску плугоў на Беларусі. Найбуйнейшым прадпрыемствам у Гродне, ды і ва ўсёй Беларусі з’яўлялася тытунёвая фабрыка Шарашэўскага (у 1900 г. – 1445 рабочых). На Гродзенскай прыстані ў канцы 90-х гадоў працавалі да 4 тыс. суднарабочых. Пінск, Мазыр,

Бабруйск, Барысаў, Слонім фарміраваліся як цэнтры дрэваапрацоўчай, у тым ліку запалкавай, прамысловасці.

У Брэсце ў сярэдзіне 90-х гадоў найбольшая колькасць рабочых (каля 850) была занята на гільзавых прадпрыемстах і тытунёвай фабрыцы (110). У Магілёве ў 1900 г. дзейнічала больш за 70 гарбарных «заводаў» (224 рабочыя), 3 тытунёвыя «фабрыкі» (71 рабочы), якія фактычна з'яўляліся мануфактурамі, 3 друкарні і іншыя прадпрыемствы.

Пасля рэформы 1861 г., асабліва ў 80 – 90-я гады, даволі шпарка развівалася прамысловасць і ў многіх беларускіх мястэчках. У Дуброўне Горацкага павета ў 1902 г. налічвалася да 4 тыс. ткачоў, якія займаліся вытворчасцю шарсцяных тканін. У Ружанах Слонімскага павета дзейнічалі 4 суконныя фабрыкі (250 рабочых). Смаргонь Ашмянскага павета стала буйным цэнтрам гарбарнай прамысловасці. У пачатку XX ст. тут налічвалася 40 прадпрыемстваў мануфактурнага тыпу з агульнай колькасцю рабочых каля 1,5 тыс., якія выпрацоўвалі тавараў на 2 млн руб. у год. У Копысі Горацкага павета было больш за 20 кафельных мануфактур, на якіх працавалі каля 800 рабочых. Ганчарная вытворчасць развівалася ў Івянцы Мінскага павета, вытворчасць плугоў – у Жлобіне Рагачоўскага павета і г. д. У мястэчку Ракаў Мінскага павета дзейнічалі 10 майстэрань-мануфактур, у якіх вырабляліся веялкі, малатарні, саламарэзкі і іншыя сельскагаспадарчыя прылады і машыны. У пачатку XX ст. гэтыя прадпрыемствы знаходзіліся ў залежнасці ад мінскіх машынабудаўнічых заводаў.

У сувязі з развіццём прамысловасці і чыгуначнага транспарту паскорыўся рост гарадскога насельніцтва, якое з 1863 г. па 1897 г. павялічылася на Беларусі з 330 тыс. да 648 тыс. Па колькасці жыхароў найбуйнейшымі гарадамі Беларусі ў канцы XIX ст. з'яўляліся Мінск (90,9 тыс.), Віцебск (65,9 тыс.), Гродна (46,9 тыс.), Брэст (46,6 тыс.), Магілёў (43,1 тыс.), Гомель (36,8 тыс.), Бабруйск (34,3 тыс.), Пінск (28,4 тыс.). Перш за ўсё раслі гарады, якія сталі чыгуначнымі вузламі або станцыямі. Сфера гандлёва-эканамічнага ўздзеяння гарадоў прыкметна пашырылася. Мінск па сваёй эканамічнай ролі паступова набываў значэнне галоўнага горада Беларусі.

Узрастала і насельніцтва мястэчак, хоць і не так хутка, як гарадское. За 40 паслярэформенных гадоў яно вырасла з 500 тыс. да 679 тыс. Некаторыя мястэчкі ператварыліся ў прыкметныя прамысловыя цэнтры рэгіянальнага значэння (Смаргонь, Дуброўна і інш.) і пераўзышлі ў гэтых

адносінах асобныя павятовыя гарады. У канцы 90-х гадоў каля 60 % местачковага насельніцтва Беларусі складалі яўрэі. Пазбаўленыя права купляць зямлю і займацца сельскай гаспадаркай, яны засяроджваліся на прамысловых і гандлёвых занятках, у сферы бытавога абслугоўвання, возніцтва і г. д. Жыхары мястэчак з ліку беларусаў у пераважнай большасці займаліся земляробствам, толькі частка іх мела дачыненне да прамысловай і гандлёвай дзейнасці. Афіцыйнай статыстыкай таго часу ўсё местачковае насельніцтва адносілася да сельскага.

Прыведзеныя звесткі сведчаць, што ў паслярэформеннае 40-годдзе буйных прамысловых цэнтраў на Беларусі не ўзнікла. Галоўнай прычынай таму была спецыялізацыя беларускай прамысловасці на апрацоўцы мясцовай сельскагаспадарчай, лясной і мінеральнай сыравіны, якая прывязвала яе да сельскай мясцовасці. У 1900 г. 2/3 фабрык і заводаў і 45,4 % рабочых знаходзіліся ў мястэчках і маёнтках. Памешчыцкая прамысловасць або непасрэдна працягвала сельскагаспадарчую вытворчасць (вінакурныя, масларобчыя, сыраварныя, алейныя, крухмала-патачныя заводы, млыны і г. д.), або распрацоўвала прыродныя багацці маёнткаў (лесапільні, смалакурні, дзягцярні, цагельні, гуты і да т. п.). Капіталістаў, якія не мелі зямельнай уласнасці, у сельскую мясцовасць прыцягвала не толькі меншая арэндная плата за зямельныя ўчасткі, але і больш танная, а разам з тым і менш патрабавальная рабочая сіла. Размяшчэнню прамысловасці ў мястэчках і вёсках садзейнічала таксама наяўнасць на Беларусі адносна густой чыгуначнай і рачной сеткі.

### Пытанні і заданні для самакантролю

1. Назавіце асноўныя формы арганізацыі прамысловасці ў Беларусі ў другой палове XIX ст.

2. Ахарактарызуйце галіновую структуру прамысловасці Беларусі ў другой палове XIX ст.

3. Вызначце асаблівасці прамысловай рэвалюцыі на Беларусі.

4. Што садзейнічала хуткаму росту гарадоў і развіццю мястэчак на Беларусі?

5. Прывядзіце прыклады найбуйнейшых гарадоў і мястэчак на Беларусі ў другой палове XIX ст.

6. Дайце характарыстыку нацыянальнага і сацыяльнага складу насельніцтва гарадоў і мястэчак Беларусі ў другой палове XIX ст.

## ЛЕКЦЫЯ 14
## Транспарт, гандаль, крэдыт. Будаўніцтва чыгунак

1. Транспартная сістэма Беларусі ў другой палове XIX ст.
2. Фарміраванне фінансава-крэдытнай сістэмы.
3. Развіццё гандлю.

### 1. Транспартная сістэма Беларусі ў другой палове XIX ст.

Вырашальнае значэнне для развіцця эканомікі Беларусі мела інтэнсіўнае чыгуначнае будаўніцтва, якое разгарнулася з 60-х гг. XIX ст. Праз Гродна ў 1862 г. прайшла чыгунка Пецярбург – Варшава. У 1866 – 1868 гг. Віцебск і Полацк сталі станцыямі Рыга-Арлоўскай чыгункі. У 1871 г. з усходу на захад Беларусь перасекла чыгунка Масква – Брэст. Яна прайшла праз Оршу, Барысаў, Мінск, Баранавічы. Праз два гады пачаўся рух на беларускім участку (Смаргонь – Маладзечна – Мінск – Асіповічы – Бабруйск – Жлобін – Гомель) Лібава-Роменскай чыгункі. У той жа час праз Брэст прайшла чыгунка з Украіны да мяжы з Прусіяй. Такім чынам, беларускія губерні атрымалі надзейны сродак зносін з Пецярбургам і Масквой, Украінай, партовымі гарадамі Рыгай і Лібавай, Варшавай і Заходняй Еўропай. Для перамяшчэння грузаў і пасажыраў былі падпісаны адпаведныя пагадненні з чыгункамі еўрапейскіх дзяржаў.

Да 80-х гг. XIX ст. чыгункі ў Беларусі будаваліся прыватнымі акцыянернымі кампаніямі з удзелам замежнага, у прыватнасці англійскага, капіталу. З пачатку 80-х гг. у сувязі з правядзеннем дзяржаўнай рэарганізацыі ўсёй сістэмы чыгуначнага транспарту пачаўся выкуп прыватных чыгунак у казну. 18 сакавіка 1891 г. з’явіўся ўказ аб выкупе ў казну Лібава-Роменскай чыгункі. Да канца XIX ст. усе асноўныя чыгункі Беларусі сталі дзяржаўнымі. За казённы кошт вялося ў далейшым і будаўніцтва ў беларускіх губернях новых чыгунак. 8 жніўня 1887 г. на станцыі Гомель урачыста адзначалася завяршэнне будаўніцтва сеткі казённых Палескіх чыгунак. Іх агульная даўжыня складала больш за 1400 вёрст.

Кожны рэгіён Беларусі, праз які праходзіла чыгунка, атрымліваў моцны стымул для эканамічнага росту. Напрыклад, за першыя 25 гадоў эксплуатацыі Палескіх чыгунак іх грузаабарот узрос у 50 разоў. Калі ў 1885 г. на Палессі было ўсяго шэсць лесапільных заводаў з агульнай вытворчасцю 150 тыс. руб. у год, то ў 1909 г. – 48 з агульнай вытворчасцю больш за 2 млн руб. Колькасць гарбарных заводаў павялічылася з 24 да 100, іх гадавая вытворчасць – да 500 тыс. руб. Агульная колькасць усіх

фабрык і заводаў у раёне Палескіх чыгунак узрасла з 674 да 4000 з гадавой вытворчасцю каля 60 млн руб.

У сувязі з тым, што асноўныя сродкі ішлі на будаўніцтва чыгунак, у развіцці водных шляхоў зносін у другой палове XIX ст. не назіралася істотных змен. На тэрыторыю парэформеннай Беларусі прыходзілася прыкладна 1/3 даўжыні каналаў Расійскай імперыі і ў тры разы больш водных шляхоў, чым у сярэднім па еўрапейскай Расіі. Асноўнае месца сярод грузаў, якія адпраўляліся па вадзе, займалі лесаматэрыялы.

Індустрыялізацыя ахапіла і водны транспарт. Колькасць паравых суднаў па рэках Беларусі за 1860 – 1900 гг. узрасла з 20 да 164.

Статыстыка чыгуначных і водных шляхоў зносін дастаткова выразна сведчыць аб эканамічным уздыме беларускіх губерняў у другой палове XIX ст. У 1866 – 1900 гг. агульны грузаабарот чыгуначнага і воднага транспарту края павялічыўся ў 18,3 раза, з 19,6 млн да 357,7 млн пудоў.

Рэалізацыя велізарнай праграмы будаўніцтва чыгунак прывяла да амаль поўнага згортвання будаўніцтва сухапутных дарог. Аднак з канца XIX ст. пракладка новых шасэ зноў стала адным з прыярытэтаў Міністэрства шляхоў зносін і мясцовай адміністрацыі. З зацвярджэннем у 1883 г. дзялення сухапутных дарог на два класы большасць беларускіх гасцінцаў трапіла ў першы разрад – дарог агульнадзяржаўнай значнасці, куды былі аднесены ўсе дарогі на захад ад рэк Дняпра і Заходняй Дзвіны.

Паштова-тэлеграфная сувязь надзейна звязвала паміж сабою губернскія і павятовыя гарады Беларусі, хаця ў сельскай мясцовасці назіраўся недахоп камунікацыйных сродкаў.

Даволі хутка з’явіўся ў Беларусі новы сродак сувязі – тэлефон, які ў 1876 г. вынайшаў амерыканец А. Бэл. Першая ў беларускіх губернях тэлефонная сетка належала прыватнай асобе. 18 снежня 1882 г. Міністэрства ўнутраных спраў дазволіла будаўніцтва тэлефонных ліній уладальніку Гомельскага маёнтка графу І. Паскевічу-Эрыванскаму. У Мінску тэлефонная сетка для службовага карыстання была наладжана ў 1890 г. У 1896 г. Мінск – першы з беларускіх гарадоў – атрымаў тэлефонную станцыю грамадскага карыстання (53 абаненты, 57 апаратаў).

## 2. Фарміраванне фінансава-крэдытнай сістэмы

Фінансавая сістэма парэформеннай Расійскай імперыі не надта садзейнічала паспяховаму вядзенню эканамічных спраў. Захоўваўся бюджэтны дэфіцыт, курс рубля падаў. Падаўленне паўстання 1863 – 1864 гг. абышлося казне ў 71,1 млн руб., расійска-турэцкая вайна 1876 – 1878 гг. – у

1,4 млрд руб. Імперыя апынулася на мяжы банкруцтва. На 1 студзеня 1887 г. дзяржаўная запазычанасць складала 6,5 млрд руб. Толькі пасля правядзення ў 1895 – 1897 гг. міністрам фінансаў С. Вітэ рэформы рубель стаў адной з самых стабільных грашовых адзінак у свеце. Пры гэтым трываласць расійскага рубля засноўвалася не столькі на эканамічных поспехах імперыі, колькі на велізарным дзяржаўным залатым запасе. Аднак гэта садзейнічала прытоку замежнага капіталу і агульнаму ажыўленню эканамічнага жыцця.

Дзяржаўны банк Расійскай імперыі быў заснаваны ў 1860 г. У адрозненне ад класічных цэнтральных эмісійных банкаў, ён займаўся не толькі эмісійнай справай (г. зн. выпускам грошай у абарот), але і ўзначаліў усю крэдытную сістэму дзяржавы, захаваў функцыю буйнейшага камерцыйнага банка. Аддзяленні дзяржбанкаў 1881 – 1885 гг. былі арганізаваны ва ўсіх беларускіх губернскіх гарадах. Па колькасці ўлічаных вексаляў мінскае аддзяленне Дзяржбанка на рубяжы вякоў займала пятае месца ў Расійскай імперыі.

У якасці саслоўных крэдытных устаноў дзейнічалі іпатэчныя дзяржаўныя банкі – Сялянскі пазямельны банк (з 1883 г.), Дваранскі зямельны банк (з 1885 г.) і прыватны Віленскі акцыянерны зямельны банк, якія мелі ў Беларусі свае філіялы. Аднак атрымаць у іх пазыку маглі далёка не ўсе. Так, паводле ўказа ад 25 верасня 1885 г. для атрымання пазыкі ў дзяржаўным Дваранскім зямельным банку патрабавалася прад'явіць пасведчанне аб праве набыцця маёнтка ў беларускіх губернях, якога не мелі так званыя асобы «польскага» паходжання.

Новы дзяржаўны курс у галіне фінансава-крэдытных адносін выявіўся ў дазволе на дзейнасць прыватных банкаў. Першы такі банк быў створаны ў Санкт-Пецярбургу ў 1864 г. 8 студзеня 1870 г. быў падпісаны сенацкі ўказ аб стварэнні ў Гомелі грамадскага банка. Больш дробныя гарадскія банкі дзейнічалі ў Полацку (з 1874 г.), Віцебску (з 1882 г.), Барысаве (з 1900 г.).

У 1873 г. пачаў сваю дзейнасць Мінскі камерцыйны банк – буйнейшы прыватны банк Беларусі. У 1875 г. дэлегаты ад яго прынялі ўдзел у рабоце першага расійскага з'езда прадстаўнікоў акцыянерных банкаў камерцыйнага крэдыту, які разгледзеў пытанні аб аднолькавай форме банкаўскіх справаздач і ўзаемных адносінах акцыянерных банкаў паміж сабой і з Дзяржаўным банкам.

За 1876 – 1897 гг. асноўны капітал Мінскага камерцыйнага банка павялічыўся з 500 тыс. да 1 млн руб. У перыяд прамысловага пад'ёма 90-х гг. Банк адкрыў 11 філіялаў, у тым ліку 9 – за межамі беларускіх губерняў.

Дробнае і кароткачасовае крэдытаванне ажыццяўлялі банкірскія і банкаўскія канторы. У канцы XIX ст. 37 такіх крэдытных устаноў існавалі ў 16 населеных пунктах Беларусі, у тым ліку ў Ваўкавыску, Кобрыне, Ляхавічах, Нясвіжы, Пружанах, Слоніме.

У 1874 г. з'явіліся першыя таварыствы ўзаемнага крэдыту – мінскае і магілёўскае. На пачатак XX ст. іх стала 7 з 3,7 тыс. пайшчыкаў і 2,4 млн руб. укладаў і бягучых рахункаў.

Пачынаючы з 90-х гг. XIX ст., прамысловы ўздым у Беларусі ў значнай меры забяспечваўся прыцягненнем крэдытных сродкаў з-за мяжы беларускіх губерняў. Актыўна дзейнічалі на тэрыторыі Беларусі агульна-расійскія і рэгіянальныя прыватныя камерцыйныя банкі: Пецярбургска-Азоўскі, Арлоўскі, Віленскі і Беластоцкі. На 1 студзеня 1900 г. дысконтна-пазыковыя аперацыі ў Беларусі складалі 16,5 млн руб. (па Расійскай імперыі – 953 млн руб.). Прычым на долю Дзяржаўнага банка прыходзілася 46,7, акцыянерных банкаў – 25,3, таварыстваў узаемнага крэдыту – 21,8, гарадскіх банкаў – 6,2 %.

## 3. Развіццё гандля

Будаўніцтва чыгунак паскорыла развіццё ўнутранага і знешняга гандлю. Прадукты сельскай гаспадаркі і вырабы прамысловасці Беларусі вывозіліся ў гарады Расіі, Украіны, Польшчы, Германіі. Напрыклад, прадукцыя запалкавых фабрык знаходзіла збыт у Ромнах, Растове, Палтаве, Адэсе, Харкаве, Варшаве, Баку, Кішынёве і іншых гарадах, папера і кардон вывозіліся ў Кіеў, Екацярынаслаўль, Рыгу, Беласток, вырабы шкляной і керамічнай прамысловасці – у Маскву, Кіеў, Адэсу.

Варта асабліва зазначыць, што з пачаткам будаўніцтва чыгунак пачала хутка памяншацца роля кірмашовага гандлю. Усё большае значэнне набываў крамны і магазінны гандаль. Гэта сведчыла аб тым, што рыначныя сувязі беларускіх гарадоў і вёсак, а таксама Беларусі з іншымі часткамі краіны станавіліся ўсё больш рэгулярнымі і трывалымі.

У канцы XIX ст. на Беларусі ўжо скласліся мясцовыя (абласныя) рынкі, якія былі цесна звязаны паміж сабой, і ў той жа час наладжваліся сувязі з усерасійскім рынкам. Асаблівасцю ўтварэння нацыянальнага рынку на Беларусі з'яўлялася тое, што тут эканамічная агульнасць не ўмацоўвалася дзяржаўным аб'яднаннем у рамках нацыя-нальнай тэрыторыі, паколькі беларуская нацыя, якая толькі складвалася, не мела сваёй дзяржаўнасці. Цэнтрам абласных рынкаў становяцца ў канцы XIX ст.

найбольш буйныя гарады: Мінск, Віцебск, Магілёў, Гомель, Гродна, Брэст і Пінск. Характар гандлёвых сувязей унутры мясцовых рынкаў вызначаўся асаблівасцю эканамічнага развіцця кожнага з раёнаў.

Галоўным гандлёва-прамысловым цэнтрам Беларусі ў гэты час стаў Мінск, які знаходзіўся ў прамых ці ўскосных сувязях з усёй яе тэрыторыяй. На мінскім рынку гандлявалі пераважна вырабамі шкляной вытворчасці, паперай, кардонам, сельскагаспадарчымі машынамі. Сюды прывозілі шмат прамыслова-мануфактурных тавараў з Маскоўскага, Пецярбургскага раёнаў, Польшчы. Мінск у якасці зборнага і размеркавальнага пункта абслугоўваў большую частку раёнаў Палесся, многія раёны поўначы і захаду Беларусі. З прадуктаў сельскай гаспадаркі пераважаў гандаль збожжам, малочнымі прадуктамі, мясам, рыбай і г. д.

Буйным гандлёвым цэнтрам з’яўляўся таксама Гомель, які абслугоўваў суседнія паветы Магілёўскай, Мінскай і Чарнігаўскай губерняў. Прамысловыя тавары, якія выраблялісь ў Гомельскім раёне, – папера, запалкі, цэгла, кафля, аконнае шкло, вяроўкі, канаты і г. д. – вывозіліся нават за межы Беларусі. Гомель з’яўляўся размеркавальным пунктам для лясных матэрыялаў і дроў, якія сплаўляліся ў сярэдняе і ніжняе Падняпроўе, галоўным чынам у Адэсу, Екацярынаслаўскую, Кіеўскую і іншыя губерні.

Частка грузаў вывозілася па чыгунцы на поўнач і ўсход, у Рыгу, Пецярбург, Лібаву. У Гомель лясныя матэрыялы ў сваю чаргу дастаўляліся з Рэчыцкага, Рагачоўскага, Мазырскага і іншых паветаў. З сельскагаспадарчых прадуктаў, якія траплялі на гомельскі рынак, пераважала ўкраінскае збожжа.

Для Магілёўскага эканамічнага раёна найбольш характэрным з’яўляўся гандаль striнымі і земляробчымі прадуктамі. Магілёў знаходзіўся ў цеснай сувязі з сярэднім і ніжнім Падняпроўем, а таксама з Оршай, праз якую ішлі тавары ў Мінскую і Смаленскую губерні. З Оршы адпраўляліся галоўным чынам лясныя грузы, збожжа, пянька, макуха, вотруб’е, яблыкі і іншыя тавары. Прывозілі на аршанскі рынак хлебныя прадукты, соль, газу, нафту, будаўнічыя матэрыялы.

Значная частка Магілёўскай губерні мела сувязі з Віцебскім эканамічным раёнам. Галоўнымі прадметамі вывазу адсюль былі лес і прадукты льнаводства, якія вывозіліся большай часткай за мяжу. Лясныя грузы сплаўляліся па Заходняй Дзвіне ў Рыгу, з Украіны прывозіліся пшанічная мука і цукар.

Важнае месца ў гандлёвых сувязях Беларусі займаў Гродна. Праз яго ажыццяўляўся гандаль з Польшчай, Літвой і замежнымі краінамі.

Гродзенскі рынак быў цесна звязаны з Ваўкавыскім раёнам, а таксама з Мінскам, Вільняй, Масквой, Пецярбургам. Галоўнымі прадметамі збыту з Гродзенскага раёна былі лясныя грузы, аржаная мука, вотруб'е, спірт, малочныя прадукты, бульбяная мука.

Сярод гандлёвых цэнтраў Беларусі асабліва вылучаўся Пінск. Ён служыў размеркавальным цэнтрам збыту прамысловых тавараў і лясных грузаў, якія перавозіліся з басейнаў Дняпра і Прыпяці ў сістэмы Нёмана і Віслы.

Такім чынам, Беларусь з'яўлялася часткай усерасійскага рынку. Для гандлю Беларусі характерная перавага вывазу сельскагаспадарчай сыравіны і лясных матэрыялаў. У той жа час яна служыла рынкам збыту прамысловых тавараў і збожжа, якія ўвозіліся з іншых раёнаў Расіі.

### Пытанні і заданні для самакантролю

1. Пакажыце на карце чыгункі, якія праходзілі праз Беларусь у другой палове XIX ст.
2. Ахарактарызуйце развіццё і ролю чыгуначнага транспарту на Беларусі ў 60 – 90-я гг. XIX ст.
3. Якія яшчэ сродкі транспарту і сувязі існавалі на Беларусі ў другой палове XIX ст?
4. Што ўяўляла сабой фінансава-крэдытная сістэма Беларусі ў другой палове XIX ст.?
5. Адзначце асаблівасці ў развіцці ўнутранага і знешняга гандлю ў беларускіх губернях у другой палове XIX ст.
6. Дайце характарыстыку буйнейшым гандлёвым цэнтрам Беларусі ў другой палове XIX ст.

## ЛЕКЦЫЯ 15
## Паўстанне 1863 – 1864 гг. на Беларусі

1. Прычыны і падрыхтоўка паўстання.
2. Пачатак і ход паўстання.
3. Падаўленне паўстання і яго значэнне.

### 1. Прычыны і падрыхтоўка паўстання

Уздым нацыянальна-вызваленчага руху ў Еўропе на рубяжы 50 – 60-х гадоў не мінуў Каралеўства Польскага, а таксама закрануў і тэрыторыю Беларусі. У шматнацыянальных заходніх губернях Расійскай імперыі

амаль што самым вострым было польскае пытанне. З часоў падзелу Рэчы Паспалітай польскі патрыятычны рух не даваў спакою расійскім уладам, якія то бізуном, то пернікам спрабавалі зняць напал супраціўлення.

Пасля даволі жорсткай антыпольскай палітыкі Мікалая І, выкліканай паўстаннем 1830 – 1831 гг., урад Аляксандра ІІ палічыў патрэбным зрабіць некаторыя ўступкі палякам. Было адменена ваеннае становішча, частка сасланых паўстанцаў вернута з Сібіры. Дазволена заснаваць у Варшаве «Земляробчае таварыства» для вывучэння сялянскага пытання. Аднак прынятыя меры не аслабілі, а, наадварот, узмацнілі антырускія настроі сярод грамадства. У 1855 г. у Вільні пры падтрымцы генерал-губернатара В.І. Назімава быў адчынены Музей старажытнасцей, які адразу ж стаў духоўным асяродкам ваяўнічага паланафільства. Пачала адкрыта прапагандавацца барацьба супраць рускага ўрада, распаўсюджвацца рэвалюцыйная літаратура. У 1860 г. у Варшаве, іншых гарадах Польшчы, а таксама ў Літве і заходніх губернях Беларусі і Украіны пракацілася хваля патрыятычных дэманстрацый.

Патрыятычны лагер падзяляўся на дэмакратаў, якія выступалі за паўстанне, і лібералаў, прыхільнікаў мірных сродкаў барацьбы. Тыя, хто быў за паўстанне, атрымалі назву «чырвоныя». Фактычна яны ўяўлялі сабой шырокі і разнастайны дэмакратычны блок, у які ўваходзілі рэвалюцыянізаваная дробная і беззямельная шляхта, афіцэры, дробная гарадская буржуазія, інтэлігенцыя, студэнцтва. Праціўнікаў паўстання называлі «белымі». Гэта былі пераважна памешчыкі з «Земляробчага таварыства», сярэдняя буржуазія, частка інтэлігенцыі.

Узрастанне нацыянальных настрояў у канцы 50-х гадоў адбывалася ва ўмовах складвання рэвалюцыйнай сітуацыі ў Расійскай імперыі напярэдадні адмены прыгоннага права. Таму сялянскае пытанне заняло не апошняе месца ў праграмах польскіх патрыётаў, самыя радыкальныя з якіх знаходзіліся пад уплывам ідэй Герцэна, Дабралюбава, Чарнышэўскага. Яшчэ з 1858 г. у Пецярбургу існаваў гурток палякаў – слухачоў вайсковых акадэмій і афіцэраў. Ім кіравалі сябры Т.Шаўчэнкі і М.Чарнышэўскага Зыгмунт Серакоўскі і Яраслаў Дамброўскі. Яны былі прыхільнікамі саюзу паміж рэвалюцыянерамі Польшчы і Расіі, спалучэння нацыянальнага паўстання з сацыяльным пераваротам, з вырашэннем аграрнага пытання на карысць сялян.

Аднак сярод «чырвоных» не было адзінства наконт метадаў дасягнення сваіх мэт. Яны падзяляліся на правых – памяркоўных і левых – прадстаўнікоў рэвалюцыйна-дэмакратычных колаў. Правыя рабілі стаўку

на шляхту і асцерагаліся шырокага сялянскага руху. Яны прызнавалі роўнасць нацыянальных правоў беларусаў, літоўцаў, украінцаў з палякамі, але выступалі за адзіную незалежную Польшчу ў межах 1772 г. Правыя прадугледжвалі надзяленне сялян зямлёй за кошт яе частковай канфіскацыі ў памешчыкаў пры абавязковай грашовай кампенсацыі. Левыя ж разлічвалі на сялянскую рэвалюцыю. Поспех паўстання, на іх думку, быў гарантаваны толькі ў саюзе і адзінстве дзеянняў з рускімі рэвалюцыянерамі. Яны прызнавалі права на нацыянальнае самавызначэнне літоўцаў, украінцаў і беларусаў. Аграрнае пытанне планавалася вырашыць шляхам ліквідацыі памешчыцкага землеўладання.

«Белыя» былі адназначна супраць паўстання, не жадалі ніякіх сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў, катэгарычна адмаўлялі права на нацыянальна-палітычнае самавызначэнне літоўцаў, украінцаў і беларусаў. Яны хацелі дабіцца аднаўлення Польшчы ў межах 1772 г., выкарыстоўваючы націск заходнееўрапейскіх краін на расійскія ўлады. Падобныя палітычныя плыні сфарміраваліся і існавалі не толькі ў Польшчы, але і на тэрыторыі Беларусі і Літвы.

Штуршком для непасрэднай арганізацыйнай падрыхтоўкі паўстання стаў расстрэл царскімі войскамі патрыятычнай дэманстрацыі ў Варшаве 8 красавіка 1861 г. Увосень 1861 г. у Варшаве з разнастайных рэвалюцыйных груповак быў арганізаваны паўстанцкі гарадскі Камітэт руху, перайменаваны ў 1862 г. у Цэнтральны нацыянальны камітэт (ЦНК). Камітэт здолеў наладзіць шырока разгалінаваную агульнапольскую арганізацыю. Рэвалюцыйныя сілы сталіцы ўзначаліў прадстаўнік левага крыла «чырвоных» Яраслаў Дамброўскі. Ён падрыхтоўваў паўстанне ў саюзе з рэвалюцыйна настроенымі афіцэрамі рускіх гарнізонаў у Польшчы. Рускія афіцэры мелі ў войску сваю згуртаваную тайную арганізацыю. Левыя «чырвоныя» вялі перамовы з Герцэнам у Лондане і з кіраўніцтвам «Зямлі і волі» ў Пецярбургу і дамовіліся аб узаемнай падтрымцы.

З мэтай падрыхтоўкі паўстання на Беларусі і ў Літве ўлетку 1862 г. у Вільні быў створаны Літоўскі правінцыяльны камітэт (ЛПК), які фармальна падначальваўся ЦНК. У яго ўваходзілі як «чырвоныя», так і «белыя». Сярод «чырвоных» былі капітан генеральнага штаба рускай арміі Л. Звяждоўскі, інжынер-паручнік Я. Козел, доктар Б. Длускі, юрысты Э. Вярыга і К. Каліноўскі.

Левых на Беларусі ўзначальваў Канстанцін Каліноўскі (1838 – 1864). Ён паходзіў з сям'і збяднелага шляхціча Гродзенскай губерні, скончыў у

званні кандыдата Пецярбургскі універсітэт, актыўна ўдзельнічаў у тайным гуртку польскага рэвалюцыянера З. Серакоўскага. Вярнуўшыся ў 1861 г. на радзіму, К. Каліноўскі разам з В. Урублеўскім стварыў у Гродне нелегальную рэвалюцыйную арганізацыю з разначыннай інтэлігенцыі, якая мела сувязі з арганізацыямі Вільні, Масквы, Пецярбурга. У 1862 – 1863 гг. ён разам з В. Урублеўскім і Ф. Ражанскім выдаваў падпольную рэвалюцыйную газету на беларускай мове «Мужыцкая праўда» (друкавалася лацінкай). Газета была прасякнута рэвалюцыйна-дэмакратычнымі ідэямі, яна выкрывала прыгонніцкі характар рэформы 1861 г., заклікала беларускі народ да ўзброенай барацьбы супраць самадзяржаўя і паноў, ідэалізавала мінулае беларускага народа, паказвала агульнае ў жыцці і марах беларускага і польскага сялянства, заклікала беларускіх сялян падтрымаць польскі нацыянальна-вызваленчы рух. «Мужыцкая праўда» брала пад абарону уніяцкую царкву.

Пачынаючы выданне «Мужыцкай праўды», К. Каліноўскі і яго сябры, выхаваныя на ідэях Герцэна, Дабралюбава і Чарнышэўскага, мелі на мэце перш за ўсё прыцягненне да паўстання сялян, якіх яны лічылі галоўнай рэвалюцыйнай сілай. А каб сяляне лепш зразумелі іх, і была выкарыстана беларуская мова. Аднак нельга перабольшваць уплыў гэтай газеты. За год выйшла ўсяго 7 нумароў (апошні ўжо ў час паўстання), тыраж якіх быў недастатковы, каб ахапіць значную колькасць беларускага сялянства. Пераважнае значэнне «Мужыцкая праўда» мае ў гісторыі нацыянальнай культуры і мовы як газета, надрукаваная на беларускай мове і разлічаная на беларускае насельніцтва.

Падрыхтоўка да паўстання яшчэ не была завершана, калі ў канцы 1862 г. стала вядома аб намеры царскага ўрада правесці ў Польшчы масавы рэкруцкі набор. Набору падлягалі якраз тыя групы насельніцтва, з якіх вербаваліся члены будучых паўстанцкіх атрадаў. Гэта паведамленне прымусіла ЦНК, ваенным кіраўніком якога пасля арышту Дамброўскага стаў З. Падлеўскі, прызначыць паўстанне на студзень 1863 г. 22 студзеня 1863 г. ЦНК абвясціў сябе Часовым нацыянальным урадам і заклікаў паўстанцкія атрады да нападзення на царскія войскі ў правінцыяльных гарнізонах. У маніфесце і двух аграрных дэкрэтах Часовага нацыянальнага ўрада была выкладзена праграма паўстання: Польшча абвяшчалася незалежнай краінай з роўнымі правамі ўсіх яе грамадзян перад законам; дазвалялася уніяцкае веравызнанне, планавалася перадаць сялянам іх зямельныя надзелы ў поўнае ўладанне, а памешчыкам выплаціць кампенсацыю з дзяржаўнай казны; пасля перамогі было паабяцана

надзяліць зямлёй беззямельных удзельнікаў паўстання. Спецыяльны зварот да насельніцтва Беларусі і Літвы заклікаў падтрымаць паўстанне ў Польшчы, але ў ім нічога не гаварылася аб нацыянальна-палітычным самавызначэнні гэтых тэрыторый.

## 2. Пачатак і ход паўстання

Пачатак паўстання быў нечаканым для царскага камандавання, якое сканцэнтравала войскі ў некалькіх буйных польскіх гарадах. Нягледзячы на гэтыя спрыяльныя ўмовы, рэвалюцыянеры не скарысталі час для папаўнення і ўзбраення сваіх атрадаў. Памылковая абарончая тактыка, недахоп зброі і вайсковай вывучкі, рознагалоссі паміж кіраўніцтвам не дазволілі паўстанцам авалодаць колькі-небудзь значнымі гарадамі і перамагчы праціўніка. Паўстанне ператварылася ў незлічоную колькасць партызанскіх баёў і сутычак у сельскай мясцовасці.

ЛПК не быў папярэджаны аб пачатку паўстання, але вырашыў падтрымаць польскіх патрыётаў. Перайменаваны ў Часовы ўрад Літвы і Беларусі на чале з К. Каліноўскім, ён 1 лютага 1863 г. звярнуўся да насельніцтва Беларусі і Літвы з маніфестам, у якім заклікаў падтрымаць паўстанне ў Польшчы. Каб не парушаць адзінства дзеянняў, ЛПК вымушаны быў адобрыць у сваім маніфесце і праграму паўстання, прынятую ў Варшаве.

У студзені – лютым 1863 г. на Беларусі з’явіліся першыя паўстанцкія атрады, якія прыйшлі з Польшчы. Самы буйны з іх узначальваў Р. Рагінскі. Яго атрад здолеў дайсці да Слуцкага павета, дзе быў разбіты. Мясцовыя атрады пачалі дзейнічаць у сакавіку – красавіку і былі падначалены «беламу» камітэту ў Вільні. Яны складаліся з дробнай шляхты, афіцэраў, рамеснікаў, студэнтаў, гімназістаў старэйшых класаў, сялян.

Адзінага плана баявых дзеянняў у паўстанцаў не было. Асобныя спробы ўзаемадзеяння паўстанцкіх атрадаў заканчваліся беспаспяхова. Многія з атрадаў былі разбіты ў самым пачатку фарміравання. Паўстанцам не ўдалося авалодаць якімі-небудзь значнымі стратэгічнымі пунктамі. Толькі атрад Л. Звяждоўскага пры падтрымцы студэнтаў Горы-Горацкага земляробчага інстытута ў красавіку 1863 г. на кароткі тэрмін здолеў захапіць павятовы горад Горкі (Магілёўская губерня). Найбольш актыўна паўстанцы дзейнічалі ў Гродзенскай губерні, дзе ваяводскім камісарам быў К. Каліноўскі.

Самыя радыкальныя з кіраўнікоў паўстанцкіх атрадаў: В. Урублеўскі і Ф. Ражанскі ў Гродзенскай губерні, М. Чарняк у Віленскай, З. Серакоўскі і А. Мацкявічус у Ковенскай, А. Трусаў у Мінскай, Л. Звяждоўскі ў Магілёўскай – імкнуліся прыцягнуць да ўдзелу ў паўстанні як мага больш сялян. Левыя «чырвоныя» ў ЛПК, асабліва К. Каліноўскі, планавалі пашырыць паўстанне на прыбалтыйскія і рускія губерні. Для гэтага прадугледжвалася стварэнне атрадаў у Латвіі і Эстоніі (З. Серакоўскім), у Віцебскай губерні (О. Грабніцкім і Б. Кульчынскім). З мэтай арганізацыі паўстання ў Смаленскай і Маскоўскай губернях з Пецярбурга на дапамогу Л. Звяждоўскаму прыехалі афіцэры І. Будзіловіч і К. Жаброўскі.

Але планы рэвалюцыянераў не ажыццявіліся. Сялян сярод паўстанцаў было няшмат, асабліва ва ўсходніх губернях Беларусі: у Віцебскай – 7 %, Магілёўскай – 13, Мінскай – 20 %. Толькі ў Віленскай і Гродзенскай губернях сяляне складалі больш за чвэрць паўстанцаў – адпаведна 27 % і 33 %. Для сялян Беларусі былі незразумелыя лозунгі Варшаўскага ЦНК аб адраджэнні Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. Не магла іх задаволіць і вельмі абмежаваная аграрная праграма паўстанцаў. Апроч таго, на сялян значны ўплыў аказалі шырокая антыпаўстанцкая агітацыя з боку царскіх улад і паслабленне для беларускіх губерняў умоў рэформы 1861 г.

Значнай перашкодай пашырэнню паўстання з’явілася далучэнне да паўстанцаў «белых». Больш таго, паступова яны ўзялі кіраўніцтва паўстаннем у свае рукі. Спадзеючыся на англа-французскае выступленне супраць Расіі, «белыя» жадалі толькі пратрымацца некаторы час і ўсяляк перашкаджалі перарастанню баявых дзеянняў асобных паўстанцкіх атрадаў у народную сялянскую вайну. У сакавіку 1863 г. па загаду Часовага нацыянальнага ўрада ў Варшаве Віленскі часовы ўрад Літвы і Беларусі быў распушчаны і створаны Аддзел кіраўніцтва правінцыямі Літвы, у які ўвайшлі «белыя». Аддзел узначаліў ковенскі памешчык Якуб Гейштар. К. Каліноўскі спрабаваў супраціўляцца, але, каб не ўносіць раскол у рады паўстанцаў, вымушаны быў падпа-радкавацца. Ён заняў пасаду ваяводскага камісара на Гродзеншчыне.

Спадзяванні «белых» на падтрымку Англіі і Францыі не спраўдзіліся. Гэтыя дзяржавы не жадалі, ды і не мелі неабходных сіл, каб ваяваць з Расіяй з-за Польшчы, а іх дыпламатычныя захады царскі ўрад рашуча адхіліў. Ужо ў маі 1863 г. паўстанне ў Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях было задушана, а летам рускае камандаванне рушыла буйныя вайсковыя сілы на Літву і Польшчу. Атрады паўстанцаў пачалі адыходзіць на поўдзень, да аўстрыйскай граніцы.

### 3. Падаўленне паўстання і яго значэнне

Падавіць паўстанне царскія ўлады змаглі не толькі дзякуючы вайсковай сіле і жорсткім рэпрэсіям у адносінах да паўстанцаў. У маі І863 г. віленскім генерал-губернатарам быў назначаны М.М. Мураўёў. Ён атрымаў назву «вешальнік». Гэта быў энергічны дзяржаўны дзеяч, які з веданнем справы рабіў тое, да чаго быў заклікаIны. У Вільню М.М. Мураўёў прыехаў з планам дзейнняў і з неабмежаванымі паўнамоцтвамі. Значную ўвагу ён звярнуў на цывільнае кіраванне, маючы на мэце знайсці ў краі тыя элементы, на якія царскія ўлады маглі б абаперціся. Перш за ўсё гэта было сялянства. М.М. Мураўёў дабіўся, каб у краі не толькі выконваліся нормы «Палажэнняў» 1861 г., але і значнага іх паслаблення: было ліквідавана часоваабавязанае становішча сялян, уведзены абавязковы выкуп сялянскіх надзелаў, сялянам вернуты адрэзкі, на 20 % зменшаны выкупныя плацяжы, беззямельныя сяляне надзяляліся трыма дзесяцінамі зямлі. Больш таго, сялянам перадавалася зямля ўдзельнікаў паўстання. М.М. Мураўёў абавязаў сельскія таварыствы наглядаць за мясцовай шляхтай, арганізаваў спецыяльныя сялянскія каравулы, якія павінны былі весці барацьбу з паўстанцамі. Ажыццяўлялася шырокая антыпаўстанцкая і антыпольская агітацыя. Усе гэтыя меры сціскалі раён дзейнняў паўстанцаў і адхілялі ад іх сялян.

М.М. Мураўёў таксама зрабіў захады для замены польскіх чыноўнікаў рускімі (праваслаўнымі), зачыняў каталіцкія кляштары і касцёлы, спрабаваў узмацніць значэнне праваслаўнага духавенства і падняць яго матэрыяльны дабрабыт. У навучальных і грамадскіх установах была ўведзена руская мова як абавязковая, забаронена выкладанне польскай мовы ў сельскіх школах, зачыняліся польскія бібліятэкі.

Прадчуваючы хуткае паражэнне паўстання, «белыя» пачалі пакідаць свае пасады ў кіраўніцтве. Да ўлады зноў прыйшлі «чырвоныя». У чэрвені ў Вільню вярнуўся К. Каліноўскі, а ў ліпені ён стаў старшынёй Віленскага аддзела. Да канца лета ў руках К. Каліноўскага было сканцэнтравана ўсё кіраўніцтва паўстанцкімі атрадамі на тэрыторыі Літвы і Беларусі. Сваіх прыхільнікаў ён назначаў на галоўныя пасады, паспрабаваў аднавіць сувязі з рэвалюцыйнай арганізацыяй «Зямля і воля». Аднак выратаваць паўстанне было ўжо немагчыма. Мясцовыя памешчыкі канчаткова адышлі ад паўстанцаў.

28 жніўня 1863 г. Польскі нацыянальны ўрад загадаў спыніць ваенныя дзеянні. У верасні 1863 г. узброеная барацьба ў заходніх губернях

Беларусі і ў Літве была спынена, а летам 1864 г. ліквідавана апошняя рэвалюцыйная арганізацыя ў Навагрудскім павеце. У Польшчы некаторыя паўстанцкія атрады дзейнічалі яшчэ да восені 1864 г., але таксама былі разбіты. К.Каліноўскі па даносу здрадніка арыштаваны ў студзені 1864 г. Ваенна-палявы суд прыгаварыў яго да расстрэлу, аднак М.М. Мураўёў замяніў расстрэл павешаннем. 22 сакавіка таго ж года К. Каліноўскі быў павешаны ў Вільні. Увогуле за ўдзел у паўстанні 128 чалавек былі пакараны смерцю, 853 сасланы на катаргу, каля 12,5 тыс. выселены, у тым ліку 504 – у Сібір.

За барацьбой палякаў з глыбокім спачуваннем сачылі рэвалюцыянеры ўсіх краін. Рэвалюцыйныя дэмакраты ў Расіі, прадстаўнікі рускай палітычнай эміграцыі лічылі справу Польшчы сваёй кроўнай справай. У абарону паўстанцаў выступіў «Колокол» А. Герцэна. М. Бакунін апублікаваў адозву «Да рускага, польскага і да ўсіх славянскіх народаў», дзе заклікаў падтрымаць польскіх патрыётаў. Нямала рускіх змагалася ў радах паўстанцаў. У заходнееўрапейскай прэсе распаўсюджвалася інфармацыя аб ходзе паўстання, сабіралася і накіроўвалася ў Польшчу зброя, з эмігрантаў вербаваліся добраахвотнікі. З дапамогай цэнтра «Маладая Еўропа» і асабіста Дж. Гарыбальдзі рыхтаваліся палітычныя і ваенныя кіраўнікі паўстанцаў. Пры непасрэдным удзеле К. Маркса і Ф. Энгельса, якія лічылі польскае пытанне важнай састаўной часткай еўрапейскай рэвалюцыі, арганізоўваліся акцыі салідарнасці заходнееўрапейскіх рабочых з польскім народам.

Паўстанне 1863 – 1864 гг. па сваіх мэтах было нацыянальнай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыяй, накіраванай супраць самадзяржаўя, саслоўнай і нацыянальнай няроўнасці. Пад націскам паўстання царскія ўлады былі вымушаны пайсці на значнае паслабленне ўмоў сялянскай рэформы 1861 г. у беларускіх і літоўскіх губернях. Сяляне Беларусі апынуліся ў больш выгадным эканамічным і прававым становішчы, чым сяляне іншых губерняў Расіі. Паўстанне дало штуршок развіццю беларускага нацыянальнага руху.

Разам з тым паўстанне мела і адмоўныя вынікі. Перш за ўсё гэта тычыцца буржуазных рэформ 60 – 70-х гадоў, якія на Беларусі ці не праводзіліся ўвогуле (як земская), ці ажыццяўляліся са значным спазненнем і істотнымі адступленнямі ад агульнарасійскіх прынцыпаў (як судовая і гарадская). Да канца 60-х гадоў у краі захоўвалася ваеннае становішча.

## Пытанні і заданні для самакантролю

1. Назавіце асноўныя прычыны паўстання 1863 – 64 гг.на Беларусі.
2. Ахарактарызуйце палітычную сітуацыю напярэдадні паўстання.
3. Якія палітычныя групы і сацыяльныя сілы бралі ўдзел у паўстанні? Дайце характарыстыку іх праграм.
4. Якія падзеі адбыліся на Беларусі ў пачатку паўстання?
5. Прасачыце па карце ход паўстання 1863 – 64 гг. на Беларусі.
6. Якую ролю адыграла «Мужыцкая праўда» у прапагандзе ідэй паўстання?
7. Вызначце асноўныя прычыны паражэння паўстання.
8. Раскрыйце значэнне паўстання 1863 г. для Беларусі.

# ЛЕКЦЫЯ 16
# Грамадска-палітычнае жыццё на Беларусі ў другой палове XIX ст.

1. Ідэалогія манархізму ў Беларусі.
2. Дзейнасць народнікаў на Беларусі.
3. Эвалюцыя рабочага руху.
4. Першыя сацыял-дэмакратычныя арганізацыі.

## 1. Ідэалогія манархізму ў Беларусі

У другой палове XIX ст. змест палітычнай барацьбы быў звязаны з развіццём капіталізму і захаваннем шматлікіх рэшткаў феадалізму ў эканоміцы, палітычнай сістэме грамадства. Хуткі працэс перабудовы ўсёй гаспадаркі на капіталістычны лад, вызначаны эканамічнай рэформай 1861 г., прывёў да значных змен у сацыяльным складзе насельніцтва. Узмацніліся пазіцыі буржуазіі, вырас і пачаў арганізацыйна афармляцца клас пралетарыяту, нацыянальнай інтэлігенцыі. З другога боку, у дзяржаўным ладзе і сацыяльна-эканамічнай структуры грамадства захавалася шмат феадальных перажыткаў: прывілеяванае становішча дваранства, памешчыцкае землеўладанне, царскае самадзяржаўе і самаўладства царскай адміністрацыі, нацыянальны прыгнёт і інш.

Грамадска-палітычнае жыццё Беларусі ў другой палове XIX ст. было прадстаўлена трыма грамадскімі лагерамі: дваранска-манархічным, ліберальна-буржуазным і рэвалюцыйна-дэмакратычным.

Сацыяльна-палітычную апору самадзяржаўя складаў дваранска-манархічны лагер, асновай якога з'яўляліся дваране-паўпрыгоннікі, рускае чыноўніцтва, прыдворныя колы і праваслаўнае духавенства. Іх палітычная пазіцыя была вызначана знакамітай трыадай: праваслаўе, самадзяржаўе, народнасць. Праваслаўе прызнавалася асновай усяго рускага жыцця і пануючай у краіне верай. Самадзяржаўе разглядалася непарушнай сілай грамадства, а за царом прызнаваўся прыярытэт у заканадаўстве.

Прадстаўнікі гэтага лагера падкрэслівалі неабходнасць захавання непадзельнасці Расіі, адмаўлялі права народаў на самавызначэнне. Пасля паўстання 1863 – 1864 гг. паскорылася канцэптуальнае афармленне заходнерусізма, якому спрыяла разгорнутая русіфікацыя на Беларусі, што праводзілася пад лозунгам «распалячвання».

Абгрунтаванне гэтай ідэалогіі было найбольш сістэматызавана ў працах М. Каяловіча «Лекцыі па гісторыі Заходняй Русі» (1864 г.) і «Гісторыя рускай самасвядомасці» (1884 г.), дзе прызнавалася пэўная гісторыка-этнічная адметнасць Беларусі, але выключалася мажлівасць яе нацыянальна-культурнага і дзяржаўнага самавызначэння. З другога боку, прадстаўнік кансерватыўнага вялікадзяржаўна-шавіністычнага накірунку заходнерусізма К. Гаворскі наогул адмаўляў этнічныя асаблівасці беларусаў, лічыў іх вынікам польска-каталіцкай экспансіі. Прапаганда ідэй заходнерусізма ажыццяўлялася праз часопіс «Вестник Западной России», газету «День» і інш.

Дваранска-манархічны лагер да кастрычніка 1905 г. не меў сваіх палітычных аб'яднанняў Гэта тлумачыцца, па-першае, пазіцыяй самадзяржаўя, якое не дазваляла стварэння ніякіх грамадска-палітычных арганізацый, нават для ўласнай абароны. Па другое, шматлікія прывілеі, якімі карысталіся дваране, забяспечвалі ім асобае палажэнне. І пакуль іх класавыя ўстоі і інтарэсы захоўваліся самадзяржаўем, яны не імкнуліся да стварэння сваіх палітычных аб'яднанняў. Прадстаўлялі дваранска-манархічны лагер на Беларусі рускамоўныя выданні, перш за ўсё «Губернские ведомости», «Виленский вестник», «Сельское чтение», у якіх друкаваліся пастановы ўлад, артыкулы антыпольскага і антысяміцкага накірунку.

Пасля падаўлення паўстання 1863 – 1864 гг. з мэтай узмацнення пазіцый расійскага самадзяржаўя ў мясцовай адміністрацыі павялічваецца колькасць чыноўнікаў расійскага паходжання. Адначасова пашыраецца ўплыў праваслаўнай царквы як апоры царскай улады ў заходніх губернях.

Толькі ў пачатку 60-х гадоў 30 тыс. каталікаў у Літоўскай і 37 тыс. у Мінскай епархіях былі пераведзены ў праваслаўе.

Падобныя меры тлумачацца не толькі агульнай урадавай стратэгіяй, накіраванай на ўзмацненне русіфікатарскіх працэсаў, але і спецыфікай становішча дваранскага саслоўя ў заходніх губернях. Найперш адзначым шматлікасць дваранства. Згодна з данымі Міністэрства юстыцыі, у 1858 г. у 9 заходніх губернях налічвалася больш за 192 тыс. дваран мужчынскага полу, г. зн. 2/3 ад агульнай колькасці ў краіне. Царызм, не прызнаваўшы факт існавання беларускай нацыі, дзяліў прадстаўнікоў гэтага саслоўя на асоб «польскага» і «няпольскага» паходжання. Ва ўрадавых дакументах другой паловы XIX ст. мясцовае дваранства выступала як непасрэдна дваранства і як шляхта. Да першай катэгорыі адносіліся памешчыкі, чыноўнікі і афіцэры, чые продкі валодалі населенымі сялянамі маёнткамі, да другой – усе тыя, хто не валодаў зямельнай уласнасцю або меў ва ўласнасці зямлю, але не меў сялян.

Шляхта была неаднароднай па-свайму маёмаснаму стану. Меншая яе частка пераўтваралася ў заможных гаспадароў, а асноўная маса разаралася. Гэтая частка дваранства вельмі востра рэагавала на нацыянальны прыгнёт урада і знаходзілася ў апазіцыі да самадзяржаўя.

## 2. Дзейнасць народнікаў на Беларусі

Арганізаваны рэвалюцыйны рух на Беларусі пачаў адраджацца толькі ў сярэдзіне 70-х гадоў. У той час пануючым накірункам апазіцыйнай грамадскай думкі ў Расіі было народніцтва. Ідэалагічна яно грунтавалася на тэорыі сялянскага сацыялізму, заснавальнікамі якой былі А. Герцэн і М. Чарнышэўскі. Народнікі верылі ў асаблівы шлях развіцця Расіі. Ім не падабаўся капіталізм, які суправаджаўся пралетарызацыяй дробных уласнікаў. Народнікі спадзяваліся, што Расія мае магчымасць пазбегнуць капіталістычнай стадыі і, абапіраючыся на сялянскую абшчыну, перайсці адразу да сацыялізму. Сваіх прыхільнікаў народніцтва знайшло перш за ўсё сярод разначыннай інтэлігенцыі.

З самага пачатку ў народніцтве існавалі дзве плыні – рэвалюцыйная і рэфарматарская. Прадстаўнікі першай асноўным сродкам дасягнення сваіх мэт лічылі сялянскую рэвалюцыю і рабілі ўсё магчымае, каб падштурхнуць сялян да рашучай барацьбы супраць самадзяржаўя і перажыткаў прыгонніцтва. Памяркоўныя народнікі хацелі перайсці да сацыялізму шляхам паступовага рэфармавання існуючага ладу Расіі. У 70-я – пачатку

80-х гадоў найбольш папулярным было рэвалюцыйнае народніцтва, якое выпрацавала тры праграмы дзеянняў: прапагандысцкую. (П.Л. Лаўроў), бунтарскую (М.А. Бакунін) і змоўніцкую (П.М. Ткачоў).

Народніцкі рух на Беларусі быў ідэйна і арганізацыйна звязаны з агульнарасійскім. Сярод вядомых расійскіх народнікаў 70-х гадоў былі ўраджэнцы Беларусі М. Судзілоўскі, С. Кавалік, І. Грынявіцкі, Р. Ісаеў, К. Брэшка-Брэшкоўская, А. Бонч-Асмалоўскі. У другой палове 70 – пачатку 80-х гадоў у Мінску, Магілёве, Гродне, Віцебску, Пінску, Оршы, Слуцку і іншых гарадах Беларусі дзейнічалі народніцкія гурткі. Іх наведвалі ў першую чаргу навучэнцы, якія пад выглядам самаадукацыі вывучалі забароненую літаратуру. Меліся спробы весці агітацыю сярод сялян. Магчымасці гэтых гурткоў былі вельмі абмежаваныя. Удзельнікі іх не бачылі асаблівасцей гістарычнага, сацыяльна-эканамічнага і нацыянальнага развіцця краю, іх дзейнасць цалкам залежала ад тых працэсаў, што адбываліся ў народніцкіх арганізацыях цэнтра Расіі.

Калі летам 1879 г. пецярбургская арганізацыя «Зямля і воля» раскалолася на «Народную волю» і «Чорны перадзел», большасць народнікаў на Беларусі падтрымала апошнюю, якая кіравалася старой прапагандысцкай тактыкай. У 1879 і 1880 гг. на Беларусь двойчы прыязджаў лідэр «Чорнага перадзелу» Г.В. Пляханаў. У Мінску была арганізавана цэнтральная падпольная друкарня «Чорнага перадзелу», якая ў пчатку 1881 г. выпусціла тры нумары цэнтральнага органа арганізацыі – газеты «Черный передел», столькі ж нумароў газеты для рабочых «Зерно» і дзве пракламацыі. Між тым «Чорны перадзел» праіснаваў нядоўга. У 1882 г. арганізацыя распалася, яе кіраўнікі, у тым ліку і Пляханаў, выехалі за мяжу. Былыя прыхільнікі «Чорнага перадзелу», што засталіся ў Расіі, пачалі пераходзіць на пазіцыі «Народнай волі».

У сваёй дзейнасці нарадавольцы рабілі стаўку на індывідуальны палітычны тэрор супраць прадстаўнікоў улады. 1 сакавіка 1881 г., пасля некалькіх няўдалых спроб, яны забілі Аляксандра II. Бомбу ў цара кінуў ураджэнец Мінскай губерні І. Грынявіцкі. Кіраўнікі «Народнай волі» спадзяваліся, што забойства цара з’явіцца сігналам да народнага паўстання ў Расіі. Аднак ніякага паўстання не адбылося, а рэпрэсіі супраць рэвалюцыянераў у хуткім часе прывялі да знішчэння цэнтральных і многіх правінцыяльных арганізацый «Народнай волі». Рэвалюцыйнае народніцтва апынулася ў глыбокім ідэйна-арганізацыйным крызісе.

Народнікі на Беларусі спрабавалі аб’яднацца ў адзіную арганізацыю. У пачатку 1882 г. у Вільні была створана Паўночна-заходняя арганізацыя

«Народнай волі». Праўда, праіснавала яна нядоўга. Ужо ў канцы года паліцыі ўдалося раскрыць і арыштаваць членаў цэнтральнай групы. На Беларусі засталіся дзейнічаць толькі некаторыя мясцовыя гурткі: у Гродне, Мінску, Віцебску, Пінску, Магілёве, Горках.

У першай палове 80-х гадоў у Пецярбургу існавалі гурткі студэнтаў – выхадцаў з Беларусі нарадавольніцкага і ліберальна-асветніцкага накірункаў. Падпольна яны выдалі некалькі публіцыстычных твораў, напісаных на рускай мове: адозвы «Да беларускай моладзі» і «Да беларускай інтэлігенцыі», «Лісты пра Беларусь. Ліст першы», «Пасланне да землякоў-беларусаў». У 1884 г. члены групы «Гоман» (А. Марчанка, Н. Ратнер і інш.) выступілі з ініцыятывай аб'яднання ўсіх народніцкіх гурткоў Беларусі. Імі было выдадзена два нумары гектаграфічнага часопіса «Гоман» (на рускай мове). Гоманаўцы падзялялі праграму «Народнай волі», з'яўляліся прыхільнікамі аб'яднання ўсіх рэвалюцыйных сіл Расіі для барацьбы з самадзяржаўем. Іх ідэалам была вольная ад сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту Расія, пабудаваная на аснове федэрацыі самастойных абласцей.

Гоманаўцы аб'явілі сябе «Беларускай сацыяльна-рэвалюцыйнай групай». Яны мелі сувязі з народніцкімі гурткамі Мінска, Віцебска, Магілёва, але аб'яднаць усіх рэвалюцыйных народнікаў Беларусі ў той час не былі здольныя. Як і іншыя арганізацыі рэвалюцыйнага народніцтва Расіі, беларускія народнікі перажывалі значны крызіс. У другой палове 80-х – 90-я гады пануючым накірункам у народніцтве з'яўляўся ліберальны. Ліберальныя народнікі адмовіліся ад рэвалюцыйных метадаў барацьбы і галоўную ўвагу звярнулі на рэфармаванне зямельнага заканадаўства з мэтай павялічыць сялянскае землеўладанне і захаваць абшчыну ў вёсцы. Гэтым яны спадзяваліся вырашыць аграрную праблему. Разам з тым беларускія ліберальныя народнікі цікавіліся гісторыяй і культурай свайго краю, спрыялі развіццю нацыянальнай самасвядомасці беларусаў.

## 3. Эвалюцыя рабочага руху

У 60 – 80-я гг. XIX ст. у Беларусі вялося інтэнсіўнае будаўніцтва чыгунак. На землякопныя работы прыцягваліся сотні тысяч сялян. Незвычайна цяжкія ўмовы працы і побыту, дрэннае харчаванне, розныя злоўжыванні і самавольства падрадчыкаў выклікалі пратэст, які найчасцей праяўляўся ў падачы калектыўных скаргаў уладам і ў групавых уцёках з месца працы. Такія выступленні («хваляванні») вясною і летам 1864 г.

адбываліся на будаўніцтве Дзвінска-Віцебскай чыгункі ў Дрысенскім, а праз год – у Віцебскім паветах. З хваляваннямі на будаўніцтве чыгункі ў Дрысенскім павеце былі звязаны ўцёкі васьмі сельскагаспадарчых рабочых з маёнтка Зарэчча.

У 1872 г. хваляванні назіраліся на будаўніцтве Лібава-Роменскай чыгункі ў Мінскім павеце, у 1883 і 1884 гг. – Віленска-Ровенскай чыгункі на ўчастку Беняконі – Воранава Лідскага і ў мястэчку Моўчадзь Слонімскага паветаў. Два хваляванні ў 70-х гг. адзначаны на прамысловых прадпрыемствах Беларусі.

Усяго ў Беларусі ў 1864 – 1884 гг. адбылося дзевяць хваляванняў рабочых. Іх удзельнікамі з’яўляліся фактычна сяляне, якія часова трапілі ў становішча наёмных работнікаў. Гэтым тлумачыцца поўная адсутнасць у згаданых выступленнях праяў пралетарскай свядомасці і прымітыўнасць фомаў пратэсту. Усе выступленні мелі абарончы характар і з’яўляліся рэакцыяй рабочых на празмерную эксплуатацыю і самавольства прадпрымальнікаў.

Якасныя зрухі ў рабочым руху ў Беларусі пачаліся ў другой палове 70-х гг. Яны праявіліся ў прымяненні рабочымі такой эфектыўнай формы барацьбы за паляпшэнне свайго становішча, як страйкі (стачкі). Эфектыўнасць масавых арганізаваных страйкаў да таго часу была добра апрабавана на вопыце барацьбы пралетарыяту заходніх краін.

Першую ў Беларусі стачку ў сакавіку 1876 г. арганізавалі 300 рабочых мінскіх майстэрняў Маскоўска-Брэсцкай чыгункі з патрабаваннем рэгулярнай выдачы заработнай платы. Яе падтрымалі чыгуначнікі ў Стоўбцах (Мінскі павет). У 1879 г. першы страйк арганізавалі рамесныя рабочыя Беларусі. Адбыўся ён у Гродне і ахапіў некалькі кравецкіх майстэрняў, рабочыя якіх выставілі патрабаванне скарачэння рабочага дня.

У 1881 г. адбыўся страйк у чыгуначных майстэрнях у Гомелі, выкліканы нявыдачай заработку, а ў 1882 г. – у сталярным цэху вагонных майстэрняў у Брэст-Літоўску, дзе рабочыя пратэставалі супраць паніжэння зарплаты. Як вынікае з гэтых фактаў, пачынальнікамі стачачнага руху ў Беларусі былі рабочыя чыгуначных майстэрняў. Паказальна і тое, што ўсе іх стачкі мелі ў гэты час абарончы характар.

Узнікненне ў 1880-х гг. першых сацыял-дэмакратычных гурткоў практычна ніяк не паўплывала на свядомасць рабочых. Іх барацьба за паляпшэнне свайго становішча ў гэты час заставалася па-за межамі ўздзеяння сацыял-дэмакратаў. Тым не менш, у ёй заўважаюцца прыкметы росту класавай свядомасці і арганізаванасці рабочых.

Найбольш буйныя стачкі ў другой палове 80-х – пачатку 90-х гг. Арганізавалі рабочыя чыгуначных майстэрняў. У сакавіку 1886 г. баставалі сталяры ў Гомельскіх майстэрнях, а ў ліпені таго ж года – усе рабочыя гэтага прадпрыемства (472 чалавекі), пратэстуючы супраць паніжэння заробкаў і пагаршэння ўмоў працы. Адміністрацыя чыгункі пад націскам магілёўскага губернатара пайшла на саступкі. У пачатку сакавіка 1894 г. гомельскія чыгуначнікі (696 чалавек) аб’явілі забастоўку з патрабаваннем вярнуць грошы, адлічаныя ў пенсійную касу на крайне нявыгадных для іх умовах. Аднак пад уплывам угавораў і пагроз начальства забастоўка на трэці дзень была спынена. Наступленне адміністрацыі на правы рабочых і змены правіл унутранага распарадку ў горшы для іх бок выклікалі ў студзені 1893 г. агульны страйк у майстэрнях Палескіх чыгунак у Пінску (500 чалавек). Праз тыдзень іх патрабаванні былі задаволены.

У Мінску ў другой палове 80-х гг. пачалася барацьба рамесных рабочых за ўвядзенне 12-гадзіннага рабочага дня (з 6 гадзін раніцы да 6 гадзін вечара) з двухгадзінным перапынкам. З гэтым патрабаваннем у 1886 г. баставалі рабочыя дзвюх шпалерных майстэрняў, сталяры, друкары (наборшчыкі) і краўчыхі, а ў маі 1887 г. – слесары шасці майстэрняў. Успаміны І. Гурвіча сведчаць, што мінскія сацыял-дэмакраты таго часу да адзначаных стачак дачынення не мелі.

У пачатку 90-х гг. у Мінску рамесныя рабочыя дамагаліся скарачэння рабочага дня шляхам падачы ўладам калектыўных прашэнняў. Аднак улады практычна не рэагавалі на іх. Гэта штурхала рабочых да нелегальнага аб’яднання на прафесійнай (цэхавай) аснове вакол стачачных кас з мэтай правядзення эканамічных страйкаў, забароненых расійскім заканадаўствам. У 1894 г. у Мінску ўтварыліся стачачныя касы пераплётчыкаў, слесараў, шчаціннікаў і краўцоў, якія аб’яднալі 220 рабочых і паспяхова вытрымалі некалькі страйкаў. У тым жа годзе першыя эканамічныя страйкі арганізавалі рамесныя рабочыя (маляры, слесары і краўцы) Гомеля .

У цэлым за 1885 – 1894 гг. у Беларусі адбыліся 22 стачкі і 4 хваляванні рабочых. У стачках удзельнічалі больш за 1800 чалавек, з іх прыблізна 5/6 складалі рабочыя чыгуначных майстэрняў. Вынікі барацьбы вядомы ў 12 выпадках. У 10 з іх рабочыя дамагліся поспеху. Параўнанне паказчыкаў за 1885 – 1894 гг. з папярэднім перыядам сведчыць аб прыкметным колькасным і якасным росце рабочага руху. Перш за ўсё гэта праявілася ў замацаванні стачак як асноўнай формы барацьбы і ва

ўзнікненні сярод рамесных рабочых зародкаў прафесійных саюзаў (стачачных кас).

Нягледзячы на паліцэйскія рэпрэсіі, у Беларусі ў 1898 – 1900 гг. працягваўся ўздым рабочага руху. Усяго за гэтыя гады ўлічана 178 эканамічных забастовак. Большасць іх была арганізавана рабочымі Віцебска (57), Гомеля (44), Мінска (17), Гродна (12). Агульная колькасць стачачнікаў дасягала 6,4 тыс. Найбольш актыўна змагаліся рабочыя гарбарна-абутковай, харчасмакавай, дрэваапрацоўчай, швейна-вязальнай і металаапрацоўчай вытворчасці. Так, 80 % забастовак адбылося ў сферы рамеснай і дробна-капіталістычнай прамысловасці, але большасць стачачнікаў (56 %) складалі рабочыя мануфактурных і фабрычных прадпрыемстваў. Захоўваўся пераважна наступальны характар рабочага руху.

У ходзе эканамічнай барацьбы рабочыя ўсё часцей сутыкаліся з рэпрэсіямі ўлад і самавольствам паліцыі, да якіх са скаргамі і даносамі звярталіся ўласнікі прадпрыемстваў. У адказ пачаліся антыўрадавыя выступленні рабочых у форме вулічных дэманстрацый і маніфестацый. 1 Мая 1900 г. віцебскія рабочыя адзначылі ўсеагульнай забастоўкай. У Мінску ў гэты дзень адбывалася вулічная дэманстрацыя, у Смаргоні ў антыўрадавую дэманстрацыюператварылася пахаванне рабочага. У цэлым за 1889 – 1900 гг. у Беларусі былі праведзены тры палітычныя страйкі (усе ў Віцебску), дзевяць дэманстрацый (чатыры ў Віцебску, па дзве ў Гродне і Мінску, адна ў Смаргоні). Амаль усе вулічныя выступленні таго часу мелі напаўстыхійны характар. Яны падштурхнулі мясцовыя сацыял-дэмакратычныя камітэты да пашырэння палітычнай агітацыі. Школай палітычнага выхавання рабочых паступова станавіліся маёўкі (тайныя сходкі), якія праводзіліся з нагоды 1 Мая, дня забойства нарадавольцамі Аляксандра II (1 сакавіка), дня адмены прыгоннага права (19 лютага) і іншых падзей.

## 4. Першыя сацыял-дэмакратычныя арганізацыі

У 70-х – пачатку 80-х гг. у практычнай дзейнасці прадстаўнікоў розных плыняў народніцтва выявілася негрунтоўнасць тэорыі сялянскага сацыялізму: сялянства як клас дробных уласнікаў не ўспрымала сацыялістычных ідэй. Не дапамагала і змена тактыкі. Ні мірная прапаганда «Зямлі і волі» і «Чорнага перадзелу», ні індывідуальны палітычны тэрор «Народнай волі», ахвярай якога 1 сакавіка 1881 г. стаў імператар

Аляксандр II, не абудзілі сялянскай рэвалюцыі. У сувязі з гэтым народніцтва ў цэлым уступіла ў паласу глыбокага ідэйна-арганізацыйнага крызісу. У пачатку 1882 г. распаўся «Чорны перадзел». У той жа час былі арыштаваны амаль усе члены Выканаўчага камітэта «Народнай волі» і разгромлены яе цэнтральныя арганізацыі. Многія адышлі ад рэвалюцыйнай дзейнасці. Пануючай у народніцтве да канца 90-х гг. стала ліберальна-асветніцкая, рэфармісцкая плынь.

Моцны ўдар па народніцкай ідэалогіі нанеслі лідэры «Чорнага перадзелу» Г. Пляханаў, П. Аксельрод і В. Засуліч, якія ў 1883 г. абвясцілі аб сваім разрыве з народніцтвам і прызналі адзінай навуковай тэорыяй сацыялізму вучэнне К. Маркса і Ф. Энгельса. З мэтай распаўсюджвання марксізму ў Расіі яны заснавалі ў Швейцарыі першую расійскую марксісцкую арганізацыю – групу «Вызваленне працы» і арганізавалі выданне твораў Маркса і Энгельса ў перакладзе на рускую мову. Адначасова ў сваіх друкаваных працах яны разгарнулі вострую крытыку асноўных пастулатаў тэорыі сялян-скага сацыялізму. Заснавальнікі групы «Вызваленне працы» даказвалі, што парэформенная Расія развіваецца па шляху капіталізму, і менавіта з ім звязвалі выспяванне перадумоў сацыялістычнай рэвалюцыі. Пры гэтым яны зыходзілі з галоўнай ідэі Маркса, што знішчэнне капіталізму і пабудова сацыялізму з’яўляецца «гістарычнай місіяй» пралетарыяту.

У той жа час прапаганду марксізму пачалі дзеячы польскай партыі «Пралетарыят», сярод якіх было нямала ўраджэнцаў Беларусі. Яны выдавалі творы Маркса і Энгельса ў перакладзе на польскую мову. Выданні расійскіх і польскіх марксістаў у 80-х – першай палове 90-х гг. распаўсюджваліся і вывучаліся ў рабочых гуртках Вільні, Мінска, Віцебска, Гродна, Смаргоні, Гомеля, падпольных зямляцкіх арганізацыях студэнтаў – ураджэнцаў беларуска-літоўскіх і ўкраінскіх губерняў – у ВНУ Пецярбурга і Масквы.

У Мінску прапаганду марксізму ў 1884 – 1885 гг. пачалі студэнт Дэрпцкага універсітэта Э. Абрамовіч і былы чорнаперадзелец І. Гурвіч. Паводле ўспамінаў апошняга, у заснаваных імі гуртках летам 1886 г. займалася каля 130 мінскіх рабочых. Да ліку першых беларускіх марксістаў належалі В. Сяліцкі, С. Трусевіч, Я. Спонці. Праграма заняткаў з рабочымі, распрацаваная Э. Абрамовічам, выкарыстоўвалася не толькі ў Мінску, але і ў Вільні і іншых гарадах краю. Гурткі ставілі мэтай падрыхтоўку новых кадраў прапагандыстаў, якія з цягам часу маглі б паўплываць на свядомасць большасці рабочых. Прапаганда ў цэлым мела

абстрактны, асветніцка-кніжны характар, амаль не звязвалася з рэальным становішчам рабочых. Сацыял-дэмакратычныя гурткі Беларусі ў той час мелі сувязь з групай «Вызваленне працы», партыяй «Пралетарыят», Саюзам польскіх рабочых, сацыял-дэмакратычнымі групамі ў Пецярбургу, Маскве, Кіеве. Увогуле, з'яўленне першых сацыялістычных гурткоў – народніцкіх і сацыял-дэмакратычных мела важнае значэнне для далейшай арганізацыі рабочага руху, асабліва, калі з'явіліся рабочыя саюзы і сацыял-дэмакратычныя партыі і арганізацыі.

Пад іх кіраўніцтвам разгортвалася барацьба рабочых за паляпшэнне свайго становішча. Усяго за адзначаныя гады ў Беларусі было праведзена 114 страйкаў, у якіх удзельнічалі каля 5,1 тыс. рабочых. У пераважнай большасці выступленні мелі наступальны характар і заканчваліся саступкамі прадпрымальнікаў. Пад уплывам сацыял-дэмакратаў рабочыя Мінска, Брэста, Гомеля, Смаргоні, Ашмян у 1895 – 1896 гг. пачалі адзначаць на канспіратыўных сходах 1 мая як Дзень міжнароднай пралетарскай салідарнасці.

Узнікненне буйных агульнагарадскіх арганізацый рабочых у шэрагу гарадоў беларуска-літоўскіх губерняў ставіла на парадак дня іх аб'яднанне ў рэгіянальныя рабочыя саюзы і нацыянальныя сацыял-дэмакратычныя партыі. Як ужо адзначалася, імкненне да аб'яднання рабочых па нацыянальнай прыкмеце праяўлялася пры пераходзе да масавай агітацыі ў асяроддзі яўрэйскіх і нацыянальна настроеных літоўскіх сацыял-дэмакратаў. Апошнія імкнуліся прывіць апалячаным рабочым-літоўцам разам з сацыял-дэмакратычнай ідэалогіяй нацыянальную свядомасць і вялі агітацыю на літоўскай мове. Такой дзейнасцю ў Вільні займалася група А. Дамашэвіча. Пад назвай «Літоўская сацыял-дэмакратыя» выступалі таксама марксісты Літвы-Беларусі, якія вялі агітацыйную дзейнасць у асяроддзі рабочых-хрысціян (беларусаў, рускіх, палякаў), карыстаючыся рускай і польскай мовамі. Не цураліся яны і рабочых-яўрэяў. У якасці лідэра гэтай часткі сацыял-дэмакратаў у сярэдзіне 90-х гг. вызначыўся С. Трусевіч (псеўданім – Казімір Злеўскі). Летам 1895 г. ён пераехаў з Мінска ў Вільню, дзе неўзабаве стварыў групу з рабочых чыгуначнікаў і гарбароў. Пад яго кіраўніцтвам дзейнічалі таксама сацыял-дэмакратычныя групы ў Мінску і Смаргоні. Назву «Літва» С. Трусевіч і яго паплечнікі разумелі ў гістарычным значэнні і адносілі яе да Віленскай, Мінскай і Гродзенскай губерняў, не звязваючы з літоўскім этнасам.

У красавіку 1896 г. з удзелам С. Трусевіча адбыўся з'езд Літоўскай сацыял-дэмакратыі. З'езд абвясціў аб утварэнні Літоўскай сацыял-

дэмакратычнай партыі, прыняў яе праграму і вызначыў тактыку. У першым пункце праграмы фармулявалася патрабаванне стварэння самастойнай Літоўскай дэмакратычнай рэспублікі. У рэзалюцыях з'езда канстатавалася поўнае супадзенне палітычных інтарэсаў пралетарыяту Польшчы, Літвы і Русі (Беларусі і Украіны) і заяўлялася аб тым, што агульнымі сіламі ён зможа дамагчыся незалежнай ад Расіі федэрацыі Польшчы, Літвы, Беларусі і Украіны. Пытанні аб звяржэнні самадзяржаўя ў Расіі і ўзаемадзеянні з расійскім пралетарыятам не ставіліся. Раней падобную пазіцыю заняла Польская партыя сацыялістычная (ППС).

С. Трусевіч рашуча выступіў супраць такіх установак ЛСДП, расцаніўшы іх як сепаратысцкія, але падтрымкі не знайшоў і пакінуў з'езд. У маі 1896 г. па яго ініцыятыве быў склікань з'езд прадстаўнікоў Віленскай, Мінскай і Смаргонскай рабочых арганізацый, на якім быў утвораны Рабочы саюз Літвы (РСЛ). Яго праграма зыходзіла з тэзіса, што «барацьба з рускім дэспатызмам можа быць паспяховай толькі пры ўмове цеснага аб'яднання ўсіх сацыял-дэмакратычных груп Расіі». На гэтай падставе РСЛ прызнаў для сябе неабходным уступленне ў будучую Расійскую сацыял-дэмакратычную партыю на правах аўтаномнай арганізацыі. «Змагаючыся разам з рабочымі ўсёй Расіі, мы завяюем неабходную нам канстытуцыю, якая будзе адным з этапаў на шляху да сацыялістычнага ладу», – гаварылася ў праграме. Нацыянальнае пытанне ў ёй абміналася. Самай важнай і актуальнай сваёй задачай РСЛ прызнаваў «агітацыю сярод рабочых мас Літвы на аснове іх паўсядзённых эканамічных інтарэсаў». Разам з тым ставілася задача выкарыстання ў агітацыі любога выпадку, які паказваў адносіны ўрада да рабочага класа, а таксама ўкаранення ў свядомасці рабочых пастулата, што толькі замена капіталістычнага ладу сацыялістычным вызваліць іх ад эксплуатацыі.

У верасні 1897 г. адбыўся з'езд прадстаўнікоў яўрэйскіх сацыял-дэмакратычных арганізацый Вільні, Мінска, Віцебска, Беластока і Варшавы, які прыняў рашэнне аб утварэнні Усеагульнага яўрэйскага рабочага саюза ў Літве, Польшчы і Расіі – Бунда. Разам з тым з'езд выказаўся за ўступленне Бунда ў агульнарасійскую сацыял-дэмакратычную партыю пры ўмове захавання за ім аўтаноміі ў сферы абслугоўвання спецыяльных патрэб яўрэйскага пралетарыяту, зацвердзіў газету «Арбайтэр Штыме» («Рабочы голас») цэнтральным друкаваным органам і выбраў ЦК Бунда ў складзе А. Крэмера, А. Мутніка і У. Касоўскага. Найважнейшай сваёй задачай Бунд лічыў разгортванне

эканамічнай барацьбы яўрэйскіх рабочых, якую прызнаваў лепшай формай выхавання іх палітычнай свядомасці.

Утварэнне Бунда выклікала неадназначную рэакцыю ў мясцовых рабочых арганізацыях. У Мінску значная частка арганізаваных рамесных рабочых не пагадзілася з эканамічным ухілам і нацыянальным сепаратызмам Бунда, парвала з ім і склала ядро мясцовай арганізацыі Рабочай партыі палітычнага вызвалення Расіі, якая стала прапагандаваць ідэі тэрарыстычнай барацьбы з самадзяржаўем. Супраць уступлення ў Бунд выказалася прыблізна 1/3 членаў Гродзенскай рабочай арганізацыі. Яны стварылі асобную арганізацыю на чале з Рабочым камітэтам, якая неўзабаве далучылася да ППС.

На хвалі ўздыму рабочага і сацыял-дэмакратычнага руху ў Расіі ў 1896 – 1897 гг. выспявала ідэя ўтварэння агульнарасійскай сацыял-дэмакратычнай партыі. Яна была рэалізавана ў пачатку сакавіка 1898 г. на з’ездзе ў Мінску прадстаўнікоў Пецярбургскага, Маскоўскага, Кіеўскага і Екацярынаслаўскага Саюзаў барацьбы за вызваленне рабочага класа, кіеўскай «Рабочай газеты» і Бунда. Дзевяць дэлегатаў з’езда прынялі рашэнне аб аб’яднанні прадстаўленых імі арганізацый у адзіную Расійскую сацыял-дэмакратычную рабочую партыю (РСДРП). Пры вырашэнні мясцовых пытанняў кожная арганізацыя захоўвала аўтаномію. Дэлегаты прынялі шэраг статутных рашэнняў, выбралі ЦК РСДРП у складзе С. Радчанкі (Пецярбург), Б. Эйдэльмана (Кіеў) і А. Крэмера, зацвердзілі «Рабочую газету» цэнтральным друкаваным органам партыі. Сфармуляваць ідэйна-тактычную плат-форму партыі з’езд даручыў ЦК у форме маніфеста, выдадзенага ў красавіку1898 г. у друкарні ЦК Бунда ў Бабруйску. У ім у агульнай форме акрэсліваліся задачы партыі ў барацьбе за палітычную свабоду і канчатковае вызваленне ўсіх працоўных ад эксплуатацыі, адзначалася вернасць РСДРП асноўным прынцыпам міжнароднай сацыял-дэмакратыі.

У выніку арыштаў у сакавіку і ліпені 1898 г. РСДРП і Бунд страцілі свае кіруючыя цэнтры. Бундаўцы ў 1899 г. змаглі правесці свой ІІ з’езд і аднавілі цэнтральныя структуры. РСДРП ж, не маючы праграмы і цэнтральных органаў, уступіла ў паласу ідэйна-арганізацыйнага крызісу. У Беларусі ў канцы 90-х гг. дзейнічаў толькі адзін не бундаўскі камітэт РСДРП – Гомельскі, але і ён летам 1900 г. далучыўся да Бунда. У 1898 – 1900 гг. у шэрагу гарадоў і мястэчак Беларусі, Літвы і Усходняй Польшчы ўзніклі прафесійныя арганізацыі гарбароў і шчаціннікаў. На пераломе XIX – XX стст. яны аб’ядналіся ў рэгіянальныя прафесійныя саюзы на чале з

цэнтральнымі камітэтамі, якія таксама апынуліся пад уплывам Бунда. Найбуйнейшымі арганізацыямі Бунда ў Беларусі ў той час былі Віцебская, Мінская, Гродзенская і Гомельская.

У Мінску, Смаргоні і Вільні ў гэты час існавалі невялікія групы Рабочага саюза Літвы (РСЛ), моцна аслабленага арыштамі ў 1897 г. На з’ездзе прадстаўнікоў гэтага саюза і сацыял-дэмакратыі Каралеўства Польскага (СДКП) (1900 г., Мінск) аб’ядналіся ў адну партыю – Сацыял-дэмакратыю Каралеўства Польскага і Літвы (СДКПіЛ). З’ездам кіравалі С. Трусевіч і Ф. Дзяржынскі, якім удалося ўцячы з ссылкі.

### Пытанні і заданні для самакантролю

1. Якія фактары ўплывалі на грамадска-палітычнае развіццё Беларусі ў другой палове XIX ст.?

2. Ахарактарызуйце дваранска-манархічны лагер як сацыяльна-палітычную апору манархізма.

3. У чым сутнасць ідэалогіі «заходнерусізма»? Назавіце асноўныя накірункі гэтай ідэалогіі і іх прадстаўнікоў.

4. Вызначце асноўныя рысы народніцкага руху на Беларусі ў 60 – 70-я гг. XIX ст.

5. Назавіце прозвішчы вядомых дзеячаў народніцкага руху, выхадцаў з Беларусі.

6. Якія мэты ставіла і якіх поглядаў прытрымлівалася група «Гоман»?

7. Прааналізуйце працэс эвалюцыі рабочага руху на Беларусі ў другой палове XIX ст.

8. Ахарактарызуйце дзейнасць найбольш буйных сацыял-дэмакратычных гурткоў на тэрыторыі Беларусі ў 80 – пачатку 90-х гг. XIX ст.

9. Якія першыя палітычныя партыі ўзніклі на тэрыторыі Беларусі? Дайце характарыстыку іх асноўных праграмных патрабаванняў.

## ЛЕКЦЫЯ 17
## Фарміраванне беларускай нацыі

1. Эканамічныя ўмовы ўтварэння беларускай нацыі.
2. Этнічная тэрыторыя і насельніцтва Беларусі.
3. Фарміраванне нацыянальнай мовы.

## 1. Эканамічныя ўмовы ўтварэння беларускай нацыі

Нацыя – гістарычная супольнасць людзей, якая характарызуецца ўстойлівымі эканамічнымі і тэрытарыяльнымі сувязямі, агульнасцю мовы, культуры, характару, побыту, традыцый, звычаяў, самасвядомасці. Нацыі ўзнікаюць на базе феадальных народнасцей у перыяд станаўлення капіталістычнага спосабу вытворчасці. Рашаючую ролю ў пераўтварэнні народнасцей у нацыі адыгрываюць капіталістычныя эканамічныя сувязі, фарміраванне ўнутранага рынку.

Адной з асноўных прыкмет нацыі з'яўляецца агульнасць эканамічнага жыцця насельніцтва адпаведнай этнічнай тэрыторыі. Развіццём капіталізму забяспечваецца больш высокі ўзровень гэтай агульнасці ў параўнанні з феадалізмам. Рэформа 1861 г., вызваліўшы сялян ад прыгоннай залежнасці, стварыла ўмовы для капіталістычнай перабудовы памешчыцкай і сялянскай гаспадарак з арыентацыяй на рынак. Рабочая сіла стала таварам, пашырыліся магчымасці яе міграцыі. Прамысловасць атрымала неабходную рабочую сілу з ліку абеззямеленых і пралетарызаваных сялян, а таксама рынак збыту прадукцыі, які пашыраўся ў ходзе разбурэння натуральнай і паўнатуральнай памешчыцкай і сялянскай гаспадаркі.

Уцягванне гаспадаркі Беларусі ў рыначныя сувязі прывяло да змен у яе структуры. У сельскагаспадарчай вытворчасці пераважнае значэнне набылі малочная жывёлагадоўля і вырошчванне тэхнічных культур, што садзейнічала яе арыентацыі на ўнутраны і знешні рынак. У структуры прамысловасці асноўнае месца займалі галіны, якія выкарыстоўвалі мясцовую сыравіну (вінакурэнне, дрэваапрацоўка, сілікатна-цагельная і гарбарна-абутковая вытворчасці). Павелічэнню аб'ёму эканамічных сувязей паміж рознымі рэгіёнамі Беларусі спрыяла будаўніцтва чыгунак і іншых шляхоў зносін. Кансалідацыі беларускай нацыі садзейнічалі таксама рост гарадоў і павелічэнне гарадскога насельніцтва. Губернскія цэнтры Беларусі і іншыя яе буйныя гарады паступова станавіліся цэнтрамі лакальных мясцовых рынкаў, цесна звязаных паміж сабой і з агульнарасійскім рынкам.

На аснове зрухаў у станаўленні капіталістычнай рыначнай эканомікі адбывалася разлажэнне класаў – саслоўяў феадальнага грамадства – дваран-памешчыкаў, сялян, рамеснікаў, гандляроў, купцоў і фарміраванне асноўных класаў капіталістычнага грамадства – пралетарыяту і буржуазіі. Сацыяльнай базай для фарміравання пралетарыяту з'яўляліся сялянская

бедната, якой на Беларусі ў канцы XIX ст. налічвалася 2,8 млн чалавек, дробныя рамеснікі і гандляры, збяднелыя мяшчане і шляхта. На рубяжы XIX – XX стст. у прамысловасці Беларусі працавала 237 тыс. рабочых, на чыгунцы – каля 25 тыс., у іншых сферах гаспадаркі (рачны і гужавы транспарт, будаўніцтва, гандаль, сельская і лясная гаспадарка і г. д.) – каля 200 тыс., усяго колькасць наёмных рабочых перавышала 460 тыс. чалавек. Прамысловы пралетарыят Беларусі характарызаваўся шмат-нацыянальнасцю і адносна невысокай канцэнтрацыяй.

Гандлёва-прамысловая буржуазія Беларусі была таксама шматнацыянальнай, прычым большую яе частку складалі прадстаўнікі небеларускага этнічнага насельніцтва (яўрэйскія, польскія і рускія прамыслоўцы і купцы). Паводле перапісу насельніцтва 1897 г., 84,5 % купцоў 5 заходніх губерняў складалі яўрэі, 10,7 % – рускія і толькі 1,7 % былі беларусамі. Больш чым палова фабрык і заводаў (51 %) з'ўлялася ўласнасцю яўрэйскай буржуазіі.

Беларуская нацыянальная буржуазія амаль цалкам складалася з заможных сялян і выхадцаў з дробнай шляхты. Яна была нешматлікай (у канцы XIX ст. у беларускай вёсцы налічвалася толькі каля 50 тыс. заможных гаспадароў), асноўныя капіталы краю – прамысловы, зямельны, гандлёвы, банкаўскі – знаходзіліся не ў яе руках, а ва ўласнасці яўрэйскіх, польскіх і рускіх прамыслоўцаў, памешчыкаў і купцоў. Раскіданая па вясковай глухамані, расколатая паводле канфесійнай прыналежнасці (праваслаўныя і католікі), беларуская нацыянальная буржуазія не ўсведамляла сваёй ролі ў нацыянальна-культурным адраджэнні і абыякава, іншы раз варожа, ставілася да яго.

Слабасць нацыянальнай буржуазіі ў пэўнай ступені замаруджвала працэс кансалідацыі беларускай нацыі. Адмоўнае ўздзеянне на гэты працэс аказвала і тое, што ў шматгранным жыцці беларускага горада ў XIX ст. не выкарыстоўвалася, за нязначнымі выключэннямі, беларуская мова.

## 2. Этнічная тэрыторыя і насельніцтва Беларусі

У канцы XIX ст, паступова стабілізавалася этнічная тэрыторыя беларусаў. Асновай утварэння тэрытарыяльнай супольнасці нацыі з'яўляецца наладжванне і развіццё гаспадарчых сувязей, якія пераадольваюць эканамічную замкнёнасць асобных раёнаў і сцягваюць іх у адно кампактнае цэлае. Этнічная тэрыторыя беларусаў уваходзіла ў межы 5 заходніх губерняў Расійскай імперыі. Яна ўключала поўнасцю

Магілёўскую і Мінскую губерні; Лідскі, Ашмянскі і паўднёвую частку Свянцянскага павета ў Віленскай губерні; Віцебскі, Гарадоцкі, Дрысенскі, Лепельскі і Полацкі паветы Віцебскай губерні; Брэсцкі, Ваўкавыскі, Пружанскі і Слонімскі паветы Гродзенскай губерні. Гэтыя межы ў асноўным адпавядаюць сучасным межам Беларусі.

Галоўным арэалам кансалідацыі беларускай нацыі былі цэнтральная і паўночна-заходняя часткі Беларусі, найбольш развітыя ў эканамічных, сацыяльных, палітычных і культурных адносінах у параўнанні з іншымі раёнамі. Тут пражывала амаль палова пісьменных беларусаў, адсюль выйшла большасць дзеячаў беларускага нацыянальна-вызваленчага руху і культуры таго перыяду. Сярэднебеларускія гаворкі склалі дыялектную аснову беларускай літаратурнай мовы.

Працэс фарміравання беларускай нацыі закрануў і насельніцтва Палесся, якое, аднак, захоўвала моўныя і культурныя асаблівасці. На тэрыторыі ўсходняй часткі Беларусі працэсы нацыянальнай кансалідацыі ішлі больш замаруджана, яе насельніцтва было менш устойлівым перад пашырэннем там расійскага ўплыву.

Паводле перапісу 1897 г., на тэрыторыі 5 заходніх губерняў пражывала 5 млн 408 тыс. беларусаў, 3,1 млн рускіх, палякаў, украінцаў, яўрэяў, літоўцаў, латышоў. Польскае і літоўскае насельніцтва канцэнтравалася ў асноўным у заходніх паветах Гродзенскай і Віленскай губерняў, рускае і латышскае – у паўночных паветах Віцебскай губерні, украінскае – у Кобрынскім і Брэсцкім паветах Гродзенскай губерні. Яўрэйскае насельніцтва пражывала на ўсёй тэрыторыі Беларусі, у гарадах і мястэчках. Сярод гараджан 5 заходніх губерняў яўрэі складалі 53,5 %, а ва ўсім насельніцтве – 13,8 %.

Абсалютная большасць беларусаў жыла ў сельскай мясцовасці (больш за 90 %). Доля тых беларусаў-гараджан, якія гаварылі на роднай мове, складала ў сярэднім толькі 14,5 %. Асаблівасцю беларусаў як этнасу быў падзел паводле канфесійнай прыналежнасці на праваслаўных і католікаў. Праваслаўная царква і каталіцкі касцёл не прызнавалі існавання беларускага этнасу, зыходзячы з таго, што праваслаўныя беларусы ёсць рускія, а беларусы-католікі – палякі. Пасля скасавання ў 1839 г. Брэсцкай уніі і далучэння уніятаў да дзяржаўнай царквы праваслаўныя сярод беларусаў сталі значнай большасцю (у 1897 г. – 81,2 %).

Развіццё капіталістычных рыначных адносін прывяло да хуткага росту насельніцтва, найбольш інтэнсіўнага за ўсю гісторыю Беларусі.

За 40 паслярэформенных гадоў колькасць яе жыхароў падвоілася. У пачатку XX ст. прырост насельніцтва некалькі паменшыўся. Гэта было звязана з развіццём міграцыйных працэсаў у выніку класавай дыферэнцыяцыі і аграрнай перанаселенасці беларускай вёскі. **Па-першае,** меліся сезонныя перамяшчэнні збяднелых сялян у пошуках заробку на сплаве лесу, будаўніцтве чыгунак і шашэйных дарог, заводах, фабрыках, рудніках, шахтах і г. д. У 90-х гадах XIX ст. сялян-адыходнікаў на Беларусі налічвалася да 300 тыс. чалавек штогод. Яны накіроўваліся ў розныя раёны Беларусі, а таксама на прадпрыемствы цэнтральна-прамысловага раёна Расіі, шахты і руднікі Данбаса, порты Рыгі і Адэсы. **Па-другое,** сяляне перамяшчаліся за межы Беларусі: у Прыуралле, Сібір, на Далёкі Усход, перасяляліся беларусы ў ЗША, Канаду і іншыя замежныя краіны, што было абумоўлена попытам на танную рабочую сілу на Еўрапейскім і Амерыканскім кантынентах. На рубяжы XIX – XX стст. пачаўся працэс фарміравання беларускай дыяспары за межамі сваёй радзімы. **Трэці накірунак** міграцыйных працэсаў быў звязаны з перасяленнямі сялян у гарады. У канцы 90-х гадоў выхадцы з сельскай мясцовасці складалі амаль 1/5 усіх гараджан Беларусі. Аднак працэс урбанізацыі на Беларусі быў даволі абмежаваны, таму перасяленцы часта накіроўваліся ў гарады Прыбалтыкі, Украіны, Расіі.

## 3. Фарміраванне нацыянальнай мовы

Агульнасць мовы – адна з самых істотных прыкмет нацыі. Як важнейшы сродак чалавечых зносін яна ўдзельнічае ў працэсе ўтварэння на пэўнай тэрыторыі супольнасці эканамічнага жыцця і псіхічнага складу людзей, з’яўляецца асновай развіцця ўсіх галін нацыянальнай культуры і фарміравання нацыянальнай свядомасці.

Нацыянальная супольнасць немагчыма без агульнай мовы, адзінай і зразумелай для ўсёй нацыі. Да канца XVIII стагоддзя беларуская мова заставалася мовай народнасці з уласцівай ёй стракатасцю тэрытарыяльных дыялектаў і гаворак. Яна не мела яшчэ агульнапрынятых граматычных норм, замацаваных у літаратуры. Такая мова не магла абслугоўваць нацыянальныя сувязі, гаспадарчае, грамадска-палітычнае і культурнае жыццё народа.

Стварэнне эканамічнай супольнасці пацягнула за сабою нівеліроўку тэрытарыяльных дыялектаў і паступовае іх згладжванне. Слоўнікавы склад мовы стаў папаўняцца новымі словамі, узнікшымі ў сувязі з развіццём

прамысловасці, гандлю, сельскай гаспадаркі, транспарта. Адначасова з слоўнікавага складу мовы выйшла з ужывання шмат састарэлых слоў, звязаных з аджыўшымі з’явамі феадальнай эпохі. Жывая народная гутарковая мова пачала паступова замацоўвацца ў літаратуры.

Літаратурная мова беларускай нацыі складалася на аснове жывой гутарковай мовы поўнача-заходняй мінска-маладзечанскай группы сярэднебеларускіх гаворак. Гэта было гістарычна абумоўлена. Тэрыторыя, на якой былі распаўсюджаныя гэтыя гаворкі, была найболей развіта ў эканамічных, грамадска-палітычных і культурных адносінах. На гэтай тэрыторыі пражывалі і дзейнічалі найвыдатныя прадстаўнікі беларускай культуры XIX – пачатку XX стагоддзяў: У.І. Дунін-Марцінкевіч, Ф. Багушэвіч, Я. Лучына, А. Гурыновіч, Я. Купала, Я. Колас, А. Пашкевіч, З. Бядуля і іншыя. Кожны з іх сваімі творамі прыўнёс у беларускую літаратуру элементы пераважна сярэднебеларускіх гаворак.

Беларуская літаратурная мова развівалася як мова мастацкай літаратуры і публіцыстыкі (газета «Мужыцкая праўда», ананімныя «гутаркі», падпольныя лістоўкі і іншыя). Але ў ёй пераважала бытавая лексіка, адсутнічала палітычная, навукова-тэхнічная, юрыдычная і адміністрацыйна-канцылярская тэрміналогія.

Фарміраванне беларускай літаратурнай мовы суправаджалася выпрацоўкай лексічных, фанетычных і граматычных норм, замацаваннем іх у літаратуры. Аднак на працягу XIX стагоддзя такія нормы ў літаратуры яшчэ не ўсталяваліся. Тлумачыцца гэта яшчэ слабым развіццём беларускай літаратуры, праследуемай царызмам, а таксама абмежаваным колам пісьменнікаў і паэтаў, адсутнасцю беларускіх выдавецтваў, якія звычайна вядуць рэдактарскую працу, якая садзейнічае нармалізацыі мовы. Пэўныя поспехі ў выпрацоўцы літаратурных норм мовы былі дасягнутыя толькі ў пачатку XX стагоддзя, калі ў літаратуру прыйшла плеяда выбітных беларускіх пісьменнікаў і паэтаў на чале з Я. Купалам і Я. Коласам, пачалі выдавацца на беларускай мове кнігі і газеты.

Сур’ёзнай перашкодай развіццю беларускай мовы і замацаванню яе ў літаратуры было тое, што яна была мовай прыгнечанай нацыі, якая не мела сваёй дзяржаўнасці. Аж да кастрычніка 1905 года на ёй не дазвалялася друкаваць кнігі, газеты, яе не вывучалі ў школе, не дапушчалі ў дзяржаўныя ўстановы. Яна практычна не выкарыстоўвалася ў дзелавым, гаспадарчым і культурным жыцці гарадоў. І тым не менш, беларуская мова развівалася і аказвала садзейнічанне развіццю і ўмацаванню нацыянальных сувязей, паколькі абслугоўвала асноўную групу насельніцтва края.

У працэсе фарміравання асноўных прыкмет беларускай нацыі складалася і такая яе прыкмета, як псіхічны склад, які праяўляецца, першым чынам, у агульнасці нацыянальнай культуры. Псіхічны склад, або нацыянальны характар, з'яўляецца адлюстраваннем матэрыяльна-бытавых умоў жыцця шматлікіх пакаленняў народа, найважнейшых падзей, наклаўшых адбітак на жыццё і развіццё нацыі. У працэсе гістарычнага досведу ў беларусаў выпрацаваліся такія рысы нацыянальнага характару, як любоў да Радзімы, памяркоўнасць, талерантнасць, разважлівасць, гаспадарчасць, нянавісць да прыгнятальнікаў і мужнасць у барацьбе з імі, павага і братэрскія пачуцці да іншых народаў, трываласць і цярпенне ў пераадоленні цяжкасцей і пазбаўленняў, працавітасць.

### Пытанні і заданні для самакантролю

1. Раскрыйце сутнасць паняцця «нацыя».
2. Прааналізуйце станоўчыя і адмоўныя фактары, якія паўплывалі на фарміраванне беларускай нацыі.
3. Як умовы эканамічнага жыцця садзейнічалі фарміраванню нацыі?
4. Якім было насельніцтва Беларусі па нацыянальным складзе адпаведна перапісу 1897 г.?
5. Раскажыце аб умовах развіцця беларускай мовы і культуры ў другой палове XIX ст.
6. Хто з найбольш вядомых дзеячаў беларускай навукі і культуры XIX – пачатку XX стст. унёс свій уклад у развіццё беларускай літаратурнай мовы?

## ЛЕКЦЫЯ 18
## Культура Беларусі ў 60 – 90-я гг.

1. Развіццё мастацкай літаратуры.
2. Архітэктура і горадабудаўніцтва.
3. Жывапіс і яго асноўныя жанры.
4. Развіццё беларусазнаўства.

### 1. Развіццё мастацкай літаратуры

У другой палове XIX ст. пачаўся новы этап у развіцці беларускай літаратуры, абумоўлены новымі з'явамі ў сацыяльна-эканамічным і палітычным жыцці. Заканчваўся перыяд пераважна паўананімнага

нелегальнага развіцця літаратуры. Пісьменнікі паступова пераадольвалі вузкае фальклорнае апісальніцтва, станавіліся на шлях стварэння развітай літаратуры. Ішоў працэс жанравага яе ўзбагачэння, удасканальвалася вершаскладанне.

Пэўны адбітак на развіццё беларускай літаратуры аказала паўстанне 1863 – 1864 гг. Шырока распаўсюджваліся ананімныя «гутаркі», складзеныя дзеячамі польскага нацыянальна-вызваленчага руху, адрасаваныя беларускім сялянам і прысвечаныя крытыцы сацыяльных парадкаў у царскай Расіі. Яркім прыкладам мастацкай рэвалюцыйнай публіцыстыкі з'яўляецца газета К. Каліноўскага «Мужыцкая праўда» і яго «Пісьмы з-пад шыбеніцы». Выкарыстоўваючы фальклорную сімволіку і традыцыйную форму народнай «гутаркі», аўтар «Мужыцкай праўды» заклікаў сялян да барацьбы за лепшую долю. У «Пісьмах з-пад шыбеніцы» К. Каліноўскі развітваецца са сваім народам перад пакараннем смерцю і выказвае веру ў тое, што народ яшчэ ўзнімецца на барацьбу.

Традыцыі пачатку 60-х гадоў прадоўжылі Ф. Багушэвіч, А. Гурыновіч і Я. Лучына, якія прыйшлі ў літаратуру ў канцы 80 – пачатку 90-х гадоў.

Вяршыняй развіцця беларускай літаратуры другой паловы XIX ст. стала творчасць Ф. Багушэвіча. У 1891 г. у Кракаве выдадзены яго першы зборнік «Дудка беларуская» пад псеўданімам Мацей Бурачок. У 1896 г. таксама за мяжой пад псеўданімам Сымон Рэўка з-пад Барысава з'явіўся зборнік «Смык беларускі». Да гэтых зборнікаў Ф. Багушэвіч складаў прадмовы, дзе імкнуўся абудзіць нацыянальную свядомасць беларускага народа. Ён першы з беларускіх пісьменнікаў абвясціў існаванне беларускага этнасу і адзначыў самастойнасць беларускай мовы. Цэнтральная тэма творчасці Ф. Багушэвіча – жыццё паднявольнага сялянства, яго пошукі справядлівасці і выйсця з сацыяльнага бяспраўя. Пачынальнік крытычнага рэалізму ў беларускай літаратуры, Ф. Багушэвіч праз дэмакратычную паэзію і публіцыстыку станоўча паўплываў на сваіх сучаснікаў – Я. Лучыну і А. Гурыновіча.

У творчасці Я. Лучыны (І. Неслухоўскага) знайшлі адлюстраванне любоў да беларускага селяніна, імкненне бачыць яго адукаваным і шчаслівым. Лірычны верш з'яўляецца асноўным жанрам яго творчасці на беларускай мове. Вершы Лучыны былі пасмяротна сабраны ў зборніку «Вязанка», выдадзеным у 1903 г.

Літаратурных твораў А. Гурыновіча захавалася вельмі мала. За рэвалюцыйную дзейнасць паэт быў арыштаваны царскімі ўладамі.

У сваіх лірычных і сатырычных вершах ён асноўную ўвагу надаваў паказу жыцця беларускага сялянства, заклікаў яго да барацьбы. Творы А. Гурыновіча былі выдадзены толькі пасмяротна.

На лепшыя дасягненні літаратуры другой паловы XIX ст., на традыцыі, закладзеныя К. Каліноўскім, Ф. Багушэвічам, Я. Лучынам, А. Гурыновічам, абапіралася новая беларуская літаратура пачатку XX ст. Развівалася яна таксама і пад дабратворным уплывам рускай, польскай і ўкраінскай літаратур. Менавіта ў пачатку XX ст. беларуская літаратура набыла рысы развітай літаратуры з разнастайнымі жанрамі і стылявымі накірункамі.

Новыя тэмы, матывы і вобразы прынесла ў беларускую літаратуру Цётка (А. Пашкевіч). Яе кнігі рэвалюцыйных вершаў «Скрыпка беларуская» і «Хрэст на свабоду» сталі першымі арыгінальнымі зборнікамі беларускай паэзіі XX ст. Цётка з’явілася адной з пачынальнікаў апавядальнага жанру. Яна напісала чытанку «Першае чытанне для дзетак-беларусаў», выступала як публіцыст, даследчык гісторыі беларускага народнага тэатра.

Як народны паэт, адзін з заснавальнікаў беларускай літаратуры і беларускай літаратурнай мовы, нацыянальнай школы перакладу ўвайшоў у гісторыю Я. Купала (І.Д. Луцэвіч). Першы яго верш «Мужык» быў апублікаваны ў маі 1905 г., а першы зборнік вершаў «Жалейка» ўбачыў свет у 1908 г. Найбольш значны паэтычны зборнік Я. Купалы дарэвалюцыйнай пары – «Шляхам жыцця» – быў выдадзены ў 1913 г.

Героіка-рамантычныя паэмы Я. Купалы «Курган», «Бандароўна» вылучылі яго як стваральніка класічнага нацыянальнага эпасу. П’есы Я. Купалы «Паўлінка», «Раскіданае гняздо» ўяўляюць сабой найвышэйшае дасягненне беларускай драматургіі пачатку XX ст. У сваёй перакладчыцкай дзейнасці Я. Купала выступіў у якасці прапагандыста дасягненняў славянскіх літаратур, стварыўшы пераклады твораў М. Някрасава, І. Крылова, А. Міцкевіча, Т. Шаўчэнкі. Значэнне творчасці Я. Купалы заключаецца ў тым, што ён узняў беларускую літаратуру на якасна новы ўзровень і сваёй творчасцю і грамадскай дзейнасцю спрыяў фарміраванню і развіццю беларускай літаратурнай мовы.

Разам з Я. Купалам заснавальнікам новай беларускай літаратуры і літаратурнай мовы стаў Я. Колас (К.М. Міцкевіч). Першы верш паэта «Наш родны край» з’явіўся ў друку ў 1906 г. Першы зборнік вершаў «Песні-жальбы» быў надрукаваны ў 1910 г. У сваёй грамадзянскай лірыцы Я. Колас часта звяртаецца да селяніна, імкнучыся абудзіць яго свядомасць.

У 1912 г. выйшаў першы зборнік яго празаічных твораў «Апавяданні», а ў 1914 г. – «Родныя з'явы», куды ўвайшлі хрэстаматыйныя сёння апавяданні «Нёманаў дар» і «Малады дубок». Я. Колас пачаў стварэнне сваіх класічных паэм «Новая зямля» і «Сымон-музыка». Дакастрычніцкая творчасць паэта – сапраўдны мастацкі летапіс жыцця беларускага народа.

М. Багдановічу належыць адзіны паэтычны зборнік «Вянок», аднак ён дазволіў паэту заняць значнае месца ў беларускай літаратуры. М. Багдановіч узбагаціў беларускую лірыку новымі тэмамі, вобразамі і формамі. Для яго лірыкі было характэрна паглыбленне ва ўнутраны свет героя, філасофскі роздум. Акрамя вершаў, М. Багдановіч пісаў празаічныя творы, літаратуразнаўчыя і публіцыстычныя артыкулы.

У беларускай літаратуры пачатку XX ст. раскрыліся творчыя здольнасці М. Гарэцкага, З. Бядулі, Ц. Гартнага, К. Каганца і інш. Новая беларуская літаратура пачала знаходзіць прызнанне ў суседніх, перш за ўсё славянскіх, народаў, паступова ўключацца ў сусветны гісторыка-літаратурны працэс.

## 2. Архітэктура і горадабудаўніцтва

Архітэктура Беларусі знаходзіцца пад моцным расійскім уплывам, з аднаго боку, і змяняецца пад пашырэннем капіталістычных адносін, з другога боку. Гарады і мястэчкі відазмяняюцца і паступова становяцца зручнымі для прамысловасці і гандлю. Ствараюцца зоны для пражывання маламаёмасных класаў і беднякоў. Усё гэта адбываецца адпаведна з праектнымі планамі забудоў гарадоў. Удзел у ажыццяўленні гэтых планаў прымалі як мясцовыя, так і расійскія архітэктары. Пры гэтым капітальныя забудовы папярэдняга часу (манастыры, ратушы, мураваныя жылыя дамы, а таксама вуліцы і плошчы, якія склаліся гістарычна) улічваліся пры перабудове. Узводзіліся адміністрацыйныя будынкі, залы, тэатры, шматпавярховыя даходныя дамы. Ішоў актыўны пошук сродкаў мастацкай выразнасці разнастайных збудаванняў, які прывёў да эклектызму і стылізатарству. Пры будаўніцтве дзяржаўных устаноў рознага тыпу выкарыстоўваліся пераважна посткласіцыстычныя формы (напрыклад, гімназія ў Вілейцы, дом дваранскага сходу ў Слуцку) так званай «цаглянай» архітэктуры, мастацкімі сродкамі якой была высакаякасная муроўка, разнастайны дробны дэкор з фасоннай цэглы.

У канцы XIX – пачатку XX ст. на змену эклектызму прыйшоў стыль мадэрн, які імкнуўся пераадолець супярэчнасці паміж мастацкім і

утылітарным. Пабудовам у стылі мадэрн характэрна свабодная рацыянальная планіроўка ў спалучэнні з маляўнічай асіметрычнай кампазіцыяй аб'ёмаў, новы характар сінтэзу мастацтваў, сімвалічная трактоўка дэкору, што ў цэлым надавала збудаванням выразнае індывідуальнае аблічча (вакзалы ў Барысаве, Маладзечне, будынак пазямельна-сялянскага банка ў Віцебску, земляробчай школы ў Лужасне Віцебскага раёна).

Пашырэнне ідэі нацыянальнага адраджэння прымушала ў архітэктуры шукаць свой нацыянальна-адметны стыль. Дойліды Беларусі ўзялі за аснову раманскі стыль, які прывабліваў канструктыўнай абгрунтаванасцю аб'ёмаў, лагічнасцю і строгасцю форм. У выніку яго перапрацоўкі шляхам спалучэння розных па форме выступаў, кансоляў, вежачак разнастайнай канфігурацыі, двухколернага рашэння фасадаў (спалучэння чырвонай цэглы з белай тынкоўкай, кафляй любога колеру) стваралася падабенства да архітэктурных помнікаў Вялікага княства Літоўскага (сядзібны дом у вёсцы Чырвоны Бераг Жлобінскага раёна).

Агульным для помнікаў гэтага перыяду было: праектаванне з пераходам ад функцыянальна абгрунтаванага плана да аб'ёмна-прасторавай кампазіцыі, калі вобраз будынка павінен быў раскрывацца паступова, пры аглядзе яго з усіх бакоў, адыход ад строгай акадэмічнай сіметрыі да кампазіцыйна вытраманай, ураўнаважнай асіметрыі, выкарастанне арнаменту і дэкору толькі ў якасці ўпрыгожання; шырокае прымяненне новых будаўнічых матэрыялаў і канструкцый, выкарыстанне розных прыёмаў асвятлення. Трэба таксама падкрэсліць, што на Беларусі шырока выкарыстоўвалі дрэва як традыцыйны матэрыял.

У канцы XIX ст. у гарадах Беларусі рэзка вырасла шчыльнасць забудовы цэнтральных кварталаў. У гарадах стала парушацца цэльнасць архітэктурных ансамбляў. На ўскраінах гарадоў узніклі рабочыя пасёлкі з неўпарадкаванай, скучанай і хаатычнай драўлянай забудовай (Старая Слабада, Ніжняя Ляхаўка і Камароўка ў Мінску і інш.).

Рэзка адрозніваліся характарам добраўпарадкаваныя цэнтральныя гарадскія раёны, дзе сяліліся пануючыя класы, ад ускраін: меўся вадаправод, каналізацыя, электраасвятленне, тэлефон. Тут таксама былі скверы, сады і паркі.

У пачатку XX ст. у архітэктуры Беларусі развіваліся розныя плыні: неакласіцызм (будынак рэальнага вучылішча ў Гродна); неараманскі стыль (дом архірэя ў Мінску).

Вясковая архітэктура другой паловы XIX – пачатку XX ст., у адрозненне ад гарадской, мянялася больш павольна. Амаль усе будынкі ў вёсках рабіліся з дрэва, пераважна з хвоі, радзей з елкі. Былі і мураваныя будынкі з валуноў, цэглы, гліны. Стрэхі звычайна крылі саломай, на Палессі – трыснягом і чаротам, у лясных краях таксама драўляным матэрыялам. Паводле планіроўкі сялянскія дамы былі 2- (хата + сенцы) або 3-камернымі (хата + сенцы + камора). Інтэр’ер хаты беларускага селяніна амаль не змяніўся і захоўваў традыцыйныя рэчы хатняга побыту: стол, паліцы, лавы, кублы, скрыні, жорны і г. д. Курныя хаты даволі хутка саступаюць месца так званым чыстым, якія мелі печы з дымаходам і паліліся «пабеламу». Гэты працэс хутчэй ішоў у вёсках дзяржаўных сялян.

Так, у пачатку 1860-х гадоў з 34 тыс. двароў дзяржаўных сялян Гродзенскай губерні крыху больш за палову ўжо мелі «чыстыя» хаты, у той час як сярод 47 тыс. двароў прыватнаўласніцкіх сялян пераважалі курныя хаты (80 – 83 %). На Беларускім Палессі да 1870 г. іх была большасць. Наогул, на Беларускім Палессі своеасаблівыя экалагічныя і этнакультурныя ўмовы адбіваліся і на характары рассялення і арганізацыі жылога асяроддзя сялян. Вёскі размяшчаліся па берагах рэк і яроў. Структура, планіроўка і контуры палескай вёскі нярэдка паўтаралі рэльеф мясцовасці. Вёскі вулічнага тыпу найчасцей размяшчаліся паралельна рацэ, сядзібы часцей выходзілі да ракі сваімі задворкамі і агародамі. Сяляне карысталіся для ўпрыгожвання сваіх хат векавымі дэ-каратыўнымі элементамі народнага дойлідства.

## 3. Жывапіс і яго асноўныя жанры

У другой палове XIX – пачатку XX ст. выдатных поспехаў дасягнула беларускае выяўленчае мастацтва.

На тэрыторыі Беларусі пасля закрыцця Віленскага універсітэта не было вышэйшай мастацкай навучальнай установы. Першым крокам на шляху арганізацыі прафесійнай падрыхтоўкі мастакоў з’явілася стварэнне ў 1866 г. Віленскай рысавальнай школы пад кіраўніцтвам І. Трутнева. Надзвычай важная роля гэтага мастака як нястомнага збіральніка і даследчыка культурных помнікаў беларускай старажытнасці і аўтара карцін на беларускую тэматыку. У 90-я гады XIX ст. былі адчынены мастацкія школы В. Мааса ў Мінску і Ю. Пэна ў Віцебску.

Значны ўплыў на развіццё беларускага жывапісу аказвала рускае мастацтва. На Беларусі жылі і працавалі рускія жывапісцы К. Савіцкі,

І. Шышкін. Цэлы перыяд творчай дзейнасці І. Рэпіна звязаны з беларускай зямлёй, калі ён жыў у сваім маёнтку Здраўнёва на Віцебшчыне. У эцюдзе «Беларус» мастак адлюстраваў тыповыя рысы беларускага народа. І. Рэпін дапамог атрымаць мастацкую адукацыю многім таленавітым выхадцам з Беларусі: Ю. Пэну, Л. Альпяровічу, Я. Кругеру. Рэалістычныя тэндэнцыі рускіх мастакоў-перасоўнікаў знаходзілі жывы водгук сярод беларускай грамадскасці. У 1899 г. у Мінску адкрылася выстава перасоўнікаў, дзе экспанаваліся палотны У.Макоўскага, А. Васняцова, І. Рэпіна, Р. Мясаедава, М. Касаткіна.

Значнай постаццю ў беларускім пейзажным жывапісе з'яўляецца А. Гараўскі. Мастак нарадзіўся ў Мінскай губерні, адукацыю атрымаў у Пецярбургскай акадэміі мастацтваў, дзе яго здольнасці прыцягнулі ўвагу выкладчыкаў. Пасля заканчэння акадэміі ён атрымаў залаты медаль. Пейзажы А. Гараўскага «Ліпы», «На радзіме», «Вечар у Мінскай губерні» вылучаюцца жыццёвай праўдай і высокім тэхнічным майстэрствам. Мастак быў вядомы не толькі ў Расіі, але і за мяжой, ён атрымаў званне акадэміка жывапісу. Асабісты сябра рускага мецэната П. Траццякова, А. Гараўскі дапамагаў у збіранні яго славутай калекцыі. Некаторыя работы беларускага мастака зараз знаходзяцца сярод экспанатаў Траццякоўскай галерэі.

Вядомым майстрам бытавога жанру быў мастак Н. Сіліванові. Атрымаўшы адукацыю ў Пецярбургскай акадэміі мастацтваў, ён стварыў шэраг кампазіцый: «Дзеці на двары», «У школу», «Дзяўчынка». Сапраўдным рэалізмам вылучаецца карціна «Пастух». Н.Сіліванові запрасілі для ўдзелу ў афармленні Ісакіеўскага сабора ў Пецярбургу. За мазаічнае палатно «Тайная вячэра» мастаку было прысвоена ганаровае званне акадэміка.

На рубяжы XIX – XX стст. у беларускім жывапісе з'явіўся шэраг таленавітых мастакоў. Ю. Пэн працаваў у бытавым і партрэтным жанры, Я. Кругер – пераважна ў жанры партрэта. Яшчэ падчас вучобы ў Акадэміі мастацтваў, куды ён трапіў з дапамогай І. Рэпіна, мастак набыў вядомасць дзякуючы сваёй дыпломнай рабоце. Пасля вяртання ў Мінск Кругер адкрыў там у 1904 г. прыватную школу малявання.

Беларускі жывапісец, графік, тэатральны дэкаратар і педагог Ф. Рушчыц у ранні перыяд творчасці напісаў пейзажы, якія вылучаюцца рэалістычным паказам роднай прыроды («Мінск зімою», «Млын», «Каля касцёла»), У некаторых творах аўтара адчуваецца ўплыў імпрэсіянізму і

стылю мадэрн. Ф. Рушчыц аформіў таксама шэраг спектакляў у адным з віленскіх тэатраў.

У канцы XIX ст. пачалася творчая дзейнасць таленавітага беларускага мастака В. Бялыніцкага-Бірулі. У сваёй творчасці ён развіваў традыцыі рускага пейзажнага жывапісу. Эмацыянальныя, лірычныя творы мастака вылучаюцца мяккім каларытам. У ранні перыяд былі створаны работы «З аколіц Пяцігорска», якую набыў П. Траццякоў для сваёй калекцыі, «Вясна ідзе», што прынесла аўтару першую прэмію Маскоўскага таварыства аматараў мастацтваў. Шчырыя сяброўскія адносіны звязвалі мастака з І. Рэпіным. Шэраг значных работ стварыў В. Бялыніцкі-Біруля ў паслякастрычніцкі перыяд.

У беларускай графіцы другой паловы XIX ст. самай прыкметнай фігурай быў М. Андрыёлі, аўтар ілюстрацый да твораў А. Міцкевіча, Э. Ажэшкі. Графічныя работы стваралі таксама А. Каменскі, С. Богуш-Сестранцэвіч, К. Кастравіцкі (Карусь Каганец).

## 4. Развіццё беларусазнаўства

Пасля паўстання 1863 – 1864 гг. узрасла цікавасць прагрэсіўнай інтэлігенцыі да гісторыі, побыту і культуры насельніцтва Беларусі. Паранейшаму значны ўклад у вывучэнне краю ўносілі вядучыя навуковыя цэнтры Расіі – Акадэмія навук, Маскоўскі і Пецярбургскі універсітэты, у якіх працавалі вядомыя знаўцы культуры і побыту беларусаў – А.А. Шахматаў, А.І. Сабалеўскі, М.А. Янчук.

У 60 – 70-я гады XIX ст. вывучэнне Беларусі паступова стала справай мясцовай інтэлігенцыі, пачалі фарміравацца рэгіянальныя этнаграфічныя цэнтры. Адзін з такіх цэнтраў – Паўночна-Заходняе аддзяленне Рускага геаграфічнага таварыства – існаваў у Вільні. Ён меў ў сваім складзе болып за 300 членаў. У асноўным гэта былі настаўнікі (187 чалавек). Яны ажыццяўлялі экспедыцыйную работу па вывучэнні Беларусі і збіранні фальклорна-этнаграфічных і археалагічных матэрыялаў. За час існавання аддзялення выйшлі з друку 4 кніжкі «Записок», у якіх апублікавана 12 прац, прысвечаных побыту, культуры і вусна-паэтычнай творчасці беларусаў.

У 1902 г. па ініцыятыве Е.Р. Раманава ў Магілёве створаны таварыства па вывучэнні Беларускага краю (у 1913 г. рэарганізавана ў Таварыства па вывучэнні Магілёўскай губерні) і Гісторыка-этнаграфічны музей. У 1908 г. у Мінску быў арганізаваны царкоўны гістарычна-

археалагічны камітэт, які выдаваў працы пад назвай «Минская старина». У 1909 г. створана Віцебская архіўная камісія, дзейнасць якой была накіравана на вывучэнне і публікацыю старажытных актаў і дакументаў па гісторыі Віцебскага краю. Члены камісіі апублікавалі шэраг кніг. У сувязі са 100-годдзем вайны 1812 г. камісія арганізавала збор сродкаў на помнік воінам, якія загінулі на віцебскай зямлі. Помнік быў пастаўлены ў Віцебску на беразе Заходняй Дзвіны.

Заснаванае ў 1912 г. у Мінску Таварыства аматараў прыродазнаўства, этнаграфіі і археалогіі вывучала Мінскую губерню, праводзіла даследаванні рэк на Палессі.

Адным з першых буйных даследчыкаў Беларусі быў настаўнік І.І. Насовіч. У 1852 – 1869 гг. ён надрукаваў некалькі зборнікаў беларускіх прымавак і загадак, а ў 1873 г. – сабраныя ім самім «Беларускія песні». Асноўная праца І.І. Насовіча, якой ён аддаў 16 гадоў, – «Словарь белорусского наречия», выдадзены ў 1870 г. у Санкт-Пецярбургу.

Выдатным даследчыкам беларускай этнаграфіі і фальклору з'яўляўся настаўнік народных школ Віцебска М.Я. Нікіфароўскі. Першай яго працай былі «Нарысы Віцебскай Беларусі», якія давалі характарыстыку грамадскага побыту беларусаў. М.Я. Нікіфароўскі з'яўляецца аўтарам самай буйной працы па матэрыяльнай культуры беларусаў XIX ст. – «Нарысы простанароднага жыцця-быцця ў Віцебскай Беларусі і апісанне прадметаў ужытку (Этнаграфічныя звесткі)». Ён збіраў і запісваў фальклорныя творы, даследаваў абрады, звычаі і вераванні.

Плённай была дзейнасць этнографа, фальклargыста і археолага Е.Р. Раманава, настаўніка і інспектара народных вучылішч. Ён апублікаваў каля 200 навуковых прац. Пад яго кіраўніцтвам ажыццявіліся некалькі этнаграфічных экследыцый па Беларусі, у час якіх збіраліся матэрыялы для «Беларускага зборніка» – своеасаблівай энцыклапедыі матэрыяльнай культуры беларусаў дарэвалюцыйнага часу.

Значны ўклад у вывучэнне беларускай этнаграфіі і фальклору ўнеслі працы настаўніка рускай мовы Навагрудскага дваранскага вучылішча М.А. Дзмітрыева, педагога Ю.Ф. Крачкоўскага, супрацоўніка Віцебскага статыстычнага камітэта А.М. Семянтоўскага, П.В. Шэйна, М. Федароўскага, М.В. Доўнар-Запольскага, А.Я. Багдановіча і інш.

У пачатку XX ст. новай плынню ў беларускай этнаграфіі стала вывучэнне матэрыяльнай культуры і вытворчай дзейнасці беларусаў.

З'явіліся працы Е.Р. Раманава, А. Харузіна, А. Сержпутоўскага і іншых даследчыкаў, прысвечаныя асаблівасцям жылля, адзення, прылад

працы і вытворчай дзейнасці насельніцтва. Рабіліся першыя спробы навуковага аналізу сабраных матэрыялаў. Галоўная заслуга ў гэтым належыць Я.Ф. Карскаму. Вынікі сваёй шматгадовай працы ў галіне беларускай лінгвістыкі, этнаграфіі і фалькларыстыкі ён апублікаваў у 1903 – 1922 гг. у трохтомніку (7 кніг) «Белорусы», да якога і сёння звяртаюцца навукоўцы і палітычныя дзеячы.

## Пытанні і заданні для самакантролю

1. Прааналізуйце ўмовы для развіцця беларускай культуры ў другой палове XIX ст.
2. Як развівалася беларуская літаратура ў другой палове XIX ст.? Назавіце прозвішчы найбольш вядомых паэтаў і пісьменнікаў і іх творы.
3. Ахарактарызуйце асноўныя стылі і накірункі архітэктуры на Беларусі ў другой палове XIX ст.
4. Як змяніўся воблік гарадоў Беларусі ў другой палове XIX ст.?
5. Назавіце асноўныя факты аб узроўні развіцця выяўленчага мастацтва на Беларусі ў другой палове XIX ст. Працы якіх мастакоў гэтага перыяду вам вядомы?
6. На якім узроўні знаходзілася развіццё беларусазнаўства ў другой палове XIX ст.?

# 2. СЕМІНАРСКІЯ ЗАНЯТКІ

Семінарскія заняткі – гэта адзін з асноўных відаў практычнай работы студэнтаў, які з'яўляецца важнай часткай навучальнага працэсу ў вышэйшай школе.

На семінарскіх занятках пад кіраўніцтвам выкладчыка студэнты атрымліваюць магчы-масць больш глыбока і грунтоўна прааналізаваць найбольш складаныя праблемы вывучаемай дысцыпліны. Семінарскія заняткі па гісторыі – найважнейшая ўмова для фарміравання ў студэнтаў уменняў і навыкаў самастойна працаваць з першакрыніцамі і манаграфічнай літаратурай, рабіць высновы і выпрацоўваць уласную кропку погляда. Яны прадугледжваюць розныя формы работы: вусныя паведамленні, абмеркаванне дакладаў, абарона рэфератаў і інш.

Семінарскія заняткі выконваюць не толькі навучальную і развіваючую функцыі, але і з'яўляюцца адной з форм кантролю ведаў студэнтаў. Студэнт павінен быць падрыхтаваны для вуснага адказу па пытаннях кожнай тэмы, а ў выпадку непадрыхтаванасці ці пропуску – адпрацаваць тэму на кансультацыі.

Кожны семінарскі занятак прыкладна складаецца з трох этапаў: першы – вусныя выступленні студэнтаў па прапануемых пытаннях тэмы, другі – абарона рэфератаў альбо абмеркаванне дакладаў, трэці – выкананне студэнтамі прапануемых выкладчыкам практычных заданняў. На 7-м і 14-м тыднях навучальнага працэсу на семінарскіх занятках праводзяцца атэстацыйныя тэсты.

Падрыхтоўку да семінарскіх заняткаў студэнт павінен пачаць з азнаямлення з пытаннямі тэмы, спісам асноўнай літаратуры і спісам прапануемых крыніц і даследаванняў да кожнай тэмы. Вызначыўшы даступныя выданні, неабходна азнаёміцца з імі і скласці прыкладны план вуснага адказу, даклада ці рэферата. Пасля складання плана трэба правесці адбор матэрыялу, улічваючы прыкладныя нормы аб'ёму для кожнага віду работ. Так, вусны адказ альбо паведамленне не павінны перавышаць 5-7 хвілін, прадстаўленне даклада ці рэферата – 10-15 хвілін. Варта звярнуць увагу студэнтаў на выкарыстанне факталагічнай базы крыніц у якасці аргументацыі высноў. Менавіта гэты момант з'яўляецца асноўным крытэрыем пры ацэнцы якасці выконваемых студэнтамі заданняў. Правёўшы адбор матэрыялу, неабходна аформіць у пісьмовай форме даклад альбо рэферат адпаведна патрабаванням, для падрыхтоўкі да вуснага адказу – паўтарыць матэрыял некалькі разоў. Аднак трэба адзначыць, што студэнт не павінен засяроджваць увагу толькі на сваім

пытанні. Ён мусіць прымаць актыўны ўдзел у абмеркаванні іншых праблемаў: дапаўняць і выпраўляць адказы, задаваць пытанні, рабіць свае высновы і г. д.

Галоўнае на семінарскіх занятках – глыбокае, зацікаўленае і актыўнае абмеркаванне праблем. Дыскусіі ажыўляюць заняткі, садзейнічаюць лепшаму, больш трываламу засваенню матэрыялу лекцый, вучэбных дапаможнікаў, крыніц і літаратуры, рэкамендаваных для вывучэння.

Вучэбнымі практычнымі заданнямі студэнтаў-гісторыкаў з’яўляюцца таксама анатацыя манаграфій і канспект навуковых артыкулаў. Анатацыі і канспекты афармляюцца ў асобных сшытках, якія прадстаўляюцца на праверку выкладчыку. Анатацыя – гэта кароткая характарыстыка зместа манаграфіі. Афармленне анатацый пачынаецца з назвы манаграфіі і яе бібліяграфічнага апісання. Потым вызначаецца структура манаграфіі і даецца кароткая характарыстыка зместу кожнага раздзела альбо главы. Завяршаецца анатацыя асноўнымі вывадамі, да якіх прыйшоў аўтар манаграфіі ў сваім даследаванні. Канспект – гэта кароткі пісьмовы пераказ зместу артыкула. Канспект адлюстроўвае не толькі асноўныя палажэнні тэкста, але і сувязь паміж імі, а таксама абгрунтаванне асноўных палажэнняў. Пры канспектаванні трэба імкнуцца выражаць думкі сваімі словамі, цытаваць аўтарскі тэкст пры неабходнасці, суправаджаць цытаты адпаведнымі спасылкамі.

## ПЛАНЫ СЕМІНАРСКІХ ЗАНЯТКАЎ У IV СЕМЕСТРЫ

### Тэма 1. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў першай палове XIX ст.

#### План семінара (2 гадзіны)

1. Стан памешчыцкай і сялянскай гаспадаркі.
2. Развіццё прамысловасці. Пачатак прамысловага перавароту.
3. Эканамічныя рэформы 30 – 50-х гг. XIX ст.
4. Транспарт, гандаль, банкі.

#### Тэмы дакладаў

1. Феадальныя і дзяржаўныя павіннасці сялян.
2. Уніфікацыя мер даўжыні і вагі.
3. Водныя шляхі зносін.

## Тэмы рэфератаў

1. Узрастанне ролі гарадоў і мястэчак.
2. Сацыяльная структура насельніцтва.
3. Антыпрыгонніцкі рух сялян.

## Крыніцы

1. Белоруссия в эпоху феодализма (сб. документов и материалов). В 4-х т. – Минск, 1961. – Т. 3; 1979. – Т. 4.

2. Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі (1772 – 1903 г.). – Мінск, 1940. – Т. 2.

3. История Беларуси в документах и материалах / авт.-сост. Н.Н. Кузнецов, В.Г. Мазец. – Минск, 2000.

4. Хрестоматия по истории Белоруссии: С древнейших времен до 1917 г. – Минск, 1977.

## Даследаванні

1. Анішчанка, Я.К. Беларусь у часы Кацярыны ІІ / Я.К. Анішчанка. – Мінск, 1998.

2. Актуальныя пытанні гісторыі Беларусі ад старажытных часоў да нашых дзён. – Мінск, 1992.

3. Болбас, М.Ф. Развитие промышленности в Белоруссии (1795 – 1861 г.) / М.Ф. Болбас.– Минск, 1966.

4. Бусько, В.Н. Экономическая мысль Белоруссии середины XIX – начала XX в. Очерки / В.Н. Бусько. – Минск, 1990.

5. Доўнар-Запольскі, М.В. Гісторыя Беларусі / М.В. Доўнар-Запольскі. – Мінск, 1994.

6. Ігнатоўскі, У.М. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі / У.М. Ігнатоўскі. – Мінск, 1991.

7. Ільяшэвіч, М. Расійская палітыка на землях былога Беларуска-Літоўскага гаспадарства за панаваннем Кацярыны ІІ і Паўла І (1772 – 1801 гг.) / М. Ільяшэвіч. – Мінск, 1992.

8. Кабузан, В.М. Народонаселение России в XVIII – первой половине XIX в. (по материалам ревизий) / В.М. Кабузан. – М., 1971.

9. Кабузан, В.М. Изменения в размещении населения России в XVII – первой половине XIX в. (по материалам ревизий) / В.М. Кабузан. – М., 1963.

10. Кернажыцкі, К.І. Гаспадарка прыгоннікаў на Беларусі ў концы XVIII – першай палове XIX ст. / К.І. Кернажыцкі. – Мінск, 1935.

11. Козловский, П.Г. Землевладение и землепользование в Белоруссии в конце XVIII – первой половине XIX в. / П.Г. Козловский. – Минск, 1982.

12. Ластоўскі, В.Ю. Кароткая гісторыя Беларусі / В.Ю. Ластоўскі. – Мінск, 1992.

13. Луговцова, С.Л. Политика российского самодержавия по отношению к дворянству Белоруссии в конце XVIII – первой половине XIX века / С.Л. Луговцова. – Минск, 1997.

14. Лютый, А.М. Генезис капитализма в промышленности Белоруссии (вторая половина XVIII – первая половина XIX вв.) / А.М. Лютый. – Минск, 1991.

15. Лютый, А.М. Социально-экономическое развитие городов Белоруссии в конце XVIII – первой половине XIX в. / А.М. Лютый. – Минск, 1987.

16. Люты, А.М. Дваранства Беларусі ў перыяд разлажэння і крызісу феадалізму (канец XVIII – першая палова XIX стст.) / А.М. Люты, Г.М. Тумiловiч. – Мінск, 1991.

17. Мальдзіс, А.І. Падарожжа ў XIX стагоддзе / А.І. Мальдзіс. – Мінск, 1969.

18. Пічукоў, В.П. Палітыка царызму на Беларусі ў першай палове XIX ст. / В.П. Пічукоў, В.І. Сычоў. – Гомель, 1994.

19. Рашин, А.Г. Население России за 100 лет (1801 – 1913 гг.) / А.Г. Рашин. – М., 1956.

20. Романовский, Ц.Т. Развитие мануфактурной промышленности в Белоруссии (вторая половина XVIII – первая половина XIX вв.) / Ц.Т. Романовский. – Минск, 1966.

21. Сосна, У. Дзяржаўныя сяляне на Беларусі ў канцы XVIII – першай трэці XIX ст. / У.Сосна // Беларускі гістарычны часопіс. – 1996. – № 2.

22. Сосна, У.А. Фарміраванне саслоўна-групавога складу сялянства Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. / У.А. Сосна. – Мінск, 2000.

23. Сосно, В.А. Формирование сословия государственных крестьян Белоруссии в конце XVIII – первой половине XIX вв. / В.А. Сосно. – Минск, 1983.

24. Тумилович, Т.Н. Дворянство Белоруссии в конце XVIII – первой половине XIX в.: автореф. дис.... канд. ист. наук / Т.Н. Тумилович. – Минск, 1995.

25. Туміловіч, Г.М. Палітыка царызму ў адносінах да дробнай шляхты Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. / Г.М. Туміловіч // Нацыянальная палітыка расійскага самадзяржаўя ў канцы XVIII – пачатку XIX стагоддзяў. – Мінск, 1995. – С. 114 – 128.

26. Чепко, В.В. Города Белоруссии в первой половине XIX в.: экономическое развитие / В.В. Чепко. – Минск, 1981.

27. Чепко, В.В. Сельское хозяйство Белоруссии в первой половине XIX в. / В.В. Чепко. – Минск, 1966.

28. Чепко, В.В. Классовая борьба в белорусской деревне в первой половине XIX в. / В.В. Чепко. – Минск, 1972.

29. Швед, В.В. Торговля в Белоруссии в период кризиса феодализма (1830 – 1850-е годы) / В.В. Швед. – Гродно, 1995.

30. Яцунский, В.К. Изменения в размещении населения Европейской России в 1724 – 1916 гг. / В.К. Яцунский // История СССР. – 1957. – № 1.

## Тэма 2. Вайна 1812 г. на Беларусі

### План семінара (2 гадзіны)

1. Пачатак вайны і баявыя дзеянні летам 1812 г.
2. Палітыка Напалеона на Беларусі. Акупацыйны рэжым.
3. Партызанскі рух.
4. Баявыя дзеянні восенню 1812 г. Вынікі вайны для Беларусі.

### Тэмы дакладаў

1. Стварэнне Варшаўскага герцагства.
2. Лёс арміі ВКЛ.
3. Вітгенштэйн П.Х.

### Тэмы рэфератаў

1. Палітычная сітуацыя ў заходніх губернях напярэдадні вайны.
2. Полацк у гады вайны 1812 г.
3. Адносіны насельніцтва Беларусі да вайны.

### Крыніцы

1. Белоруссия в эпоху феодализма (сб. документов и материалов). В 4-х т. – Минск, 1961. – Т. 3; 1979. – Т. 4.

2. Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі (1772 – 1903 г.). – Мінск, 1940. – Т. 2.

3. История Беларуси в документах и материалах / авт.-сост. Н.Н. Кузнецов, В.Г. Мазец. – Минск, 2000.

4. Хрестоматия по истории Белоруссии: С древнейших времен до 1917 г. – Минск, 1977.

**Даследаванні**

1. Беларусь у 1812 г. // Звязда. – 1992. – 6 жніўня, 16 верасня.

2. Брыгадзін, П. 1812 г. на Беларусі / П. Брыгадзін // Настаўніцкая газета. – 1996. – 15 чэрвеня.

3. Вільчак, Б. Які «народ» падтрымаў Напалеона? / Б. Вільчак // Звязда. – 1992. – 16 верасня.

4. Жилин, П.А. Отечественная война 1812 г. / П.А. Жилин. – М., 1988.

5. Корнейчик, Е.И. Белоруский народ в Отечественной войне 1812 г. / Е.И. Корнейчик – Минск, 1962.

6. Мазин, Г. Березина, год 1812-й. / Г. Мазин, Л. Ерусалимчик. – Минск, 1991.

7. Нестерчук, Л.М. Отечественная война 1812 г. на Брестчине / Л.М. Нестерчук. – Брест, 1990.

8. Піліпчык, В. 1812 г.: грамадзянская вайна / В. Піліпчык // Літаратура і мастацтва. – 1993. – 12 сакавіка.

9. Таляронак, С. Для Беларусі гэта вайна была айчыннай / С. Таляронак // Звязда. – 1992. – 16 верасня.

10. Цішук, Я. Беларусы змагаліся на баку Напалеона / Я. Цішук // Звязда. –1992. – 6 жніўня.

11. Таляронак, С. Грамадска-палітычны рух на Беларусі напярэдадні вайны 1812 г. / С. Таляронак // Беларускі гістарычны часопіс. – 1994. – № 3.

12. Тарасаў, К. Беларусы ў напалеонаўскай гвардыі / К. Тарасаў // Звязда. – 1992. – 24 верасня.

13. Тарле, Е.В. Нашествие Наполеона на Россию / Е.В. Тарле. – М., 1992.

14. Таляронак, С. Апошняя армія Вялікага княства Літоўскага (1812 – 1814 гг.) / С. Таляронак, А. Блінеў // Беларускі гістарычны часопіс. – 1996. – № 2.

15. Французская рэвалюцыя і лёсы свету. – Мінск, 1999.

16. Французска-руская вайна 1812 г.: еўрапейскія дыскурсы і беларускі погляд. – Мінск, 2003.

17. Цуба, М. Якой была вайна 1812 г. для Беларусі? / М. Цуба // Літаратура і мастацтва. – 1991. – 7 чэрвеня.

18. Яроменка, К. Пра вайну 1812 г. / К. Яроменка // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1987. – № 4.

## Тэма 3. Грамадска-палітычнае жыццё на Беларусі ў першай палове XIX ст.

### План семінара (2 гадзіны)

1. Тайныя таварыствы вучнёўскай моладзі.
2. Дзекабрысты і Беларусь.
3. Шляхецкае паўстанне 1830 – 1831 гг.
4. Змены і асноўныя напрамкі ва ўрадавай палітыцы ў першай палове XIX ст.

### Тэмы дакладаў

1. Полацкі царкоўны сабор 1839 г.
2. «Экспедыцыя Валовіча».
3. Дэмакратычнае таварыства Ф. Савіча.
4. Полацкае піярскае вучылішча.

### Тэмы рэфератаў

1. Дзейнасць ордэна езуітаў на Беларусі ў першай чвэрці XIX ст.
2. Масонскія ложы на Беларусі.
3. Стварэнне Полацкага кадэцкага корпуса.

### Крыніцы

1. Белоруссия в эпоху феодализма (сб. документов и материалов). В 4-х т. – Минск, 1961. – Т. 3; 1979. – Т. 4.

2. Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі (1772 – 1903 г.). – Мінск, 1940. – Т. 2.

3. История Беларуси в документах и материалах / авт.-сост. Н.Н. Кузнецов, В.Г. Мазец. – Минск, 2000.

4. Уния в документах. Сборник документов и материалов / сост. В.А. Теплова. – Минск, 1997.

5. Філаматы і філарэты. Зборнік твораў. – Мінск, 1998.

6. Хрестоматия по истории Белоруссии: с древнейших времен до 1917 г. – Минск, 1977.

**Даследаванні**

1. Актуальныя пытанні гісторыі Беларусі ад старажытных часоў да нашых дзён. – Мінск, 1992.

2. Блинова, Т.Б. Иезуиты в Белоруссии / Т.Б. Блинова. – Минск, 1990.

3. Букчын, С. Дзекабрысты на Беларусі: пошук і памяць / С. Букчын // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі – 1986. – № 2.

4. Букчин, С. К мечам рванулись наши руки. Документальные повести / С. Букчин. – Минск, 1878.

5. Воронков, И.А. Восстание 1830 – 1831 гг. В Белоруссии / И.А. Воронков // Вестник Московского университета. – Серия IX. История. – 1966. – № 2.

6. Гарбачова, В.В. Паўстанне 1830 – 1831 гг. на Беларусі / В.В. Гарбачова. – Мінск, 2001.

7. Грыцкевіч, А. Нацыянальнае пытанне ў праграме дзекабрыстаў / А. Грыцкевіч // Літаратура і мастацтва. – 1990. – 7 верасня.

8. Декабристы: биографический справочник. – М., 1988.

9. Канфесіі на Беларусі (да XVIII – XX ст.). – навук. рэд. У.І. Навіцкі. – Мінск, 1998.

10. Коялович, М.О. История воссоединения западнорусских униатов старых времён / М.О. Коялович. – Минск, 1999.

11. Масонскія ложы ў Літве // Спадчына. – 1997. – № 1.

12. Миронов, Б.Н. Социальная история России. В 2 т. Т. 1 / Б.Н. Миронов. – СПб., 1999.

13. Морозова, С. Уніяцкая царква ў культурна-гістарычным развіцці Беларусі (1596 – 1839) / С. Морозова. – Гродна, 1996.

14. Мохнач, Н.Н. Идейная борьба в Белоруссии в 30 – 40-е гг. XIX в. / Н.Н. Мохнач. – Минск, 1971.

15. Нарысы з гісторыі грамадскай думкі на Беларусі ў XIX і пачатку XX стст. – Мінск, 1993.

16. Ненадавец, А. Дзекабрысты ў Бабруйскай крэпасці / А. Ненадавец // Чырвоная змена. – 1990. – 15 снежня.

17. Пракошина, Е.С. Очерк свободомыслия и атеизма в Белоруссии в XIX в. / Е.С. Пракошина. – Минск, 1973.

18. Соколова, М.А. Общественные объединения и движения в Беларуси в конце XVIII – начале XX века: проблемы становления гражданского общества / М.А. Соколова. – Минск, 2002.

19. Таляронак, С. Грамадска-палітычны рух на Беларусі напярэдадні вайны 1812 г. / С. Таляронак // Беларускі гістарычны часопіс. – 1994. – № 3.

20. Таляронак, С.В. Палітыка царызму ў адносінах да каталіцкай і уніяцкай царквы на Беларусі (1772 – 1839 гг.) / С.В. Таляронак // Весці АНБ. – Серыя грамадскіх навук. – 1992. – № 2.

21. Шалькевіч, В.Ф. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі / В.Ф. Шалькевіч. – Мінск, 1999.

22. Швед, В.В. Беларускія старонкі гісторыі дзекабрыстаў / В.В. Швед. – Мінск, 1998.

23. Швед, В.В. Восстание 1830 – 1831 годов / В.В. Швед // Гродненская правда. – 1991. – 12 июня.

24. Швед, В. Дзекабрысты – ураджэнцы Беларусі / В. Швед // Чырвоная змена. – 1990. – 13 кастрычніка.

25. Швед, В.В. Паміж Польшчай і Расіяй: грамадска-палітытнае жыццё на землях Беларусі (1772 – 1863 гг.) / В.В. Швед. – Гародня, 2001.

26. Цвікевіч, А. «Западно-руссизм». Нарысы з гісторыі грамадскай мыслі на Беларусі ў XIX і пачатку XX ст. / А. Цвікевіч. – Мінск, 1993.

27. Чернуха, В.Г. Внутренняя политика царизма с середины 50-х до начала 80-х гг. XIX в. / В.Г. Чернуха. – Л., 1978.

28. Філатава, А. Да пытання аб паланізацыі і русіфікацыі Беларусі ў XIX ст. / А. Філатава // Беларусіка. – Мінск, 1992.

29. Филатова Е.Л. Конфессиональная политика царского правительства в Беларуси. 1772 – 1860 гг.: автореф. дис.... канд. ист. наук / Е.Л. Филатова. – Минск, 2001.

## Тэма 4. Культура Беларусі ў першай палове XIX ст.

### План семінара (2 гадзіны)

1. Развіццё адукацыі ў першай палове XIX ст.
2. Фарміраванне новай беларускай літаратуры.
3. Беларускае выяўленчае мастацтва ў першай палове XIX ст.
4. Архітэктура і горадабудаўніцтва.

**Тэмы дакладаў**

1. Віленскі універсітэт.
2. Ян Чачот – пачынальнік новай беларускай літаратуры.
3. Напалеон Орда.
4. Друкарская і бібліятэчная справа.

**Тэмы рэфератаў**

1. Стварэнне і дзейнасць Віленскай навучальнай акругі.
2. Палацава-сядзібнае будаўніцтва.
3. Станаўленне беларусазнаўства ў першай палове XIX ст.
4. Віленская школа жывапісу.

**Крыніцы**


1. Беларуская літаратура XIX стагоддзя: хрэстаматыя. – Мінск, 1998.
2. Белоруссия в эпоху феодализма (сб. документов и материалов). В 4-х т. – Минск, 1961. – Т. 3; 1979. – Т. 4.
3. Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі (1772 – 1903 г.). – Мінск, 1940. – Т. 2.
4. История Беларуси в документах и материалах / авт.-сост. Н.Н. Кузнецов, В.Г. Мазец. – Минск, 2000.
5. Хрестоматия по истории Белоруссии: с древнейших времен до 1917 г. – Минск, 1977.


**Даследаванні**


1. Александровіч, С.Х. Кнігі і людзі / С.Х. Александровіч. – Мінск, 1976.
2. Бас, І. Падарожжа ў літаратурнае мінулае. Літаратурна-крытычныя артыкулы / І. Бас. – Мінск, 1971.
3. Бярозкіна, Н.Ю. Гісторыя кнігадрукавання Беларусі (XVI – пачатак XX ст.) / Н.Ю. Бярозкіна. – Мінск, 1998.
4. Дорошевич, Э.К. Философия эпохи Просвещения в Белоруссии / Э.К. Дорошевич. – Минск, 1971.
5. Дробаў, Л.М. Беларускія мастакі XIX ст. / Л.М. Дробаў. – Мінск, 1971.

6. Дробов, Л.Н. Живопись Белоруссии XIX – начала XX в. / Л.Н. Дробов. – Минск, 1974.

7. Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры. Літаратура XIX – пачатку XX ст. – Мінск, 1969. – Т. 2.

8. Залусский, А. Время и музыка Михала Клеофаса Огинского / А. Залусский. – Минск, 1999.

9. Каваленка, В.А. Вытокі, уплывы, паскоранасць / В.А. Каваленка. – Мінск, 1975.

10. Караў, Д. Пачаткі беларускага крыніцазнауства / Д. Караў // Спадчына. – № 1. – 1994.

11. Каханоўскі, Г.А. Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI – XIX стст. / Г.А. Каханоўскі. – Мінск, 1984.

12. Каханоўскі, Г.А. Беларуская фалькларыстыка эпохі феадалізму / Г.А. Каханоўскі, Л.А. Малаш, К.А. Цвірка. – Мінск, 1989.

13. Кацер, М.С. Изобразительное искусство Белоруссии дооктябрьского периода / М.С. Кацер. – Минск, 1969.

14. Кацер, М.С. Народно-прикладное искусство Белоруссии (от первобытного общества до 1917 г.) / М.С. Кацер. – Минск, 1972.

15. Киселев, Г. Разыскивается классик… Историко-литературная дилогия / Г. Киселев. – Минск, 1989.

16. Кісялёў, Г. Героі і музы: гісторыка-літаратурныя нарысы / Г. Кісялёў. – Мінск, 1982.

17. Лазук, Б.А. Гісторыя мастацтваў / Б.А. Лазук. – Мінск, 1996.

18. Лойка, А.А. Гісторыя беларускай літаратуры: дакастрычніцкі перыяд. У 2-х ч. Ч. 1 / А.А. Лойка. – Мінск, 1969.

19. Лойка, А. Адам Міцкевіч і беларуская літаратура / А. Лойка. – Мінск, 1959.

20. Лойка, А.А. Гісторыя беларускай літаратуры. Дакастрычніцкі перыяд. Частка I / А.А. Лойка. – Мінск, 1977.

21. Лойка, А.А. Беларуска-польскія літаратурныя ўзаемасувязі ў XIX ст. / А.А. Лойка, Н.С. Перкін. – Мінск, 1963.

22. Малаш, Л. Ян Чачот і яго рукапісныя зборнікі / Л. Малаш // Материалы научной конференции (к 40-летию библиотеки АН БССР). – Минск, 1965.

23. Мальдзіс, А. На скрыжаванні славянскіх традыцый / А. Мальдзіс. – Мінск, 1980.

24. Мальдзіс, А.І. Падарожжа ў XIX стагоддзе / А.І. Мальдзіс. – Мінск, 1969.

25. Масленікава, В.К. Музычная адукацыя ў Беларусі / В.К. Масленікава. – Мінск,1980.

26. Музыкальный театр Белоруссии. Дооктябрьский период. – Минск, 1990.

27. Няфёд, У.І. Гісторыя беларускага тэатра / У.І. Няфёд. – Мінск, 1982.

28. Ольшанский, П. Декабристы и польское национально-освободительное движение / П. Ольшанский. – М., 1959.

29. Очерки истории науки и культуры Беларуси. – Минск, 1996.

30. Пічэта В.І. Пытанне аб вышэйшай школе на Беларусі ў мінулым / В.І. Пічэта. – Мінск, 1991.

31. Праз смуту стагоддзяў. – Мінск, І993.

32. Самусік, А. Пакутны шлях вышэйшай школы / А. Самусік // Чырвоная змена. – 1995. – № 148.

33. Самусік, А. Піярскае вышэйшае вучылішча ў Полацку XIX ст. / А. Самусік // Народная асвета. – 1998. – № 24. – С. 141 – 146.

34. Тарасаў, К. Памяць пра легенды. Постаці беларускай мінуўшчыны / К. Тарасаў. – Мінск, 1990.

35. Цярохін, С.Ф. Многія прыйдуць пад імем маім: Езуіты на Беларусі / С.Ф. Цярохін. – Мінск, 1995.

36. Шайкоў, В. Полацкая езуіцкая акадэмія (1812 – 1820 гг.) / В. Шайкоў // Беларускі гістарычны часопіс. – 1995. – № 2 – 4.

37. Яструн, М. Мицкевич. Серия ЖЗЛ / М. Яструн. – М., 1963.

## Тэма 5. Буржуазныя рэформы 60 – 70-х гг. XIX ст. на Беларусі

### План семінара (2 гадзіны)

1. Асаблівасці судовай і гарадской рэформаў.
2. Рэформы ў галіне адукацыі і цэнзуры.
3. Ваенная рэформа.
4. Контррэформы 80 – 90-х гг. XIX ст.

### Тэмы дакладаў

1. Маніфест 19 лютага 1861 г.

2. Сутнасць выкупной аперацыі па рэформе 1861 г.

3. Змены ў правядзенні аграрнай рэформы на Беларусі ў сувязі з паўстаннем 1863 г.

## Тэмы рэфератаў

1. Сельскае кіраванне пасля рэформы 1861 г.
2. Рэформа 1867 года ў дзяржаўнай вёсцы.
3. Значэнне буржуазных рэформ 60 – 70-х гадоў XIX ст.

## Крыніцы

1. Белоруссия в эпоху капитализма (сб. документов и материалов). В 2-х т. – Минск, 1983 – 1990.

2. Вішнеўскі, А.Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў дакументах і матэрыялах / А.Ф. Вішнеўскі, Я.А. Юхо. – Мінск, 2003.

3. Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі (1772 – 1903 г.). – Мінск, 1940. – Т. 2.

4. История Беларуси в документах и материалах / авт.-сост. Н.Н. Кузнецов, В.Г. Мазец. – Минск, 2000.

5. Хрестоматия по истории Белоруссии: с древнейших времен до 1917 г. – Минск, 1977.

## Даследаванні

1. Бярозкіна, Н.Ю. Гісторыя кнігадрукавання Беларусі (XVI – пачатак XX ст.) / Н.Ю. Бярозкіна. – Мінск, 1998.

2. Вішнеўскі А.Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі / А.Ф. Вішнеўскі. – Мінск, 2003.

3. Вішнеўскі А.Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі: Некаторыя пытанні і адказы / А.Ф. Вішнеўскі, І.А. Саракавік. – Мінск, 1997.

4. Великие реформы в России. 1856 – 1874. – М., 1992.

5. Зайончковский, П.А. Кризис самодержавия на рубеже 1870 – 1880 годов / П.А. Зайончковский. – М., 1964.

6. Зайончковский, П.А. Офицерский корпус русской армии перед первой мировой войной / П.А. Зайончковский // Вопросы истории. – 1981. – № 4.

7. Кузнецов, И.Н. История государства и права Беларуси / И.Н. Кузнецов, В.А. Шелкопляс. – Минск, 1999.

8. Оржеховский, И.В. Самодержавие против революционной России (1826 – 1880 гг.) / И.В. Оржеховский. – М., 1982.

9. Панютич, В.П. Социально-экономическое развитие белорусской деревни в 1861 – 1900 гг. / В.П. Панютич. – Минск, 1990.

10. Самбук, С.М. Политика царизма в Белоруссии во второй половине XIX в. / С.М. Самбук. – Минск, 1980.

11. Свір, А.Ф. Асаблівасці правядзення судовай рэформы на Гродзеншчыне / А.Ф. Свір // Весці АН Беларусі. Сер. грамадскіх навук. – 1993. – № 4.

12. Соболева, Е.В. Организация науки в пореформенной России / Е.В. Соболева. – Л., 1983.

13. Чернуха, В.Г. Внутренняя политика царизма с середины 50-х до начала 80-х гг. XIX в. / В.Г. Чернуха. – Л., 1978.

14. Шелкопляс, В.А. Карательный аппарат России во второй половине XIX века / В.А. Шелкопляс. – Минск,1994.

15. Шыбека, З. Гарады Беларусі (60-я гады XIX – пачатак XX ст.) / З. Шыбека. – Мінск, 1997.

16. Шыбека, З. Социальное размежевание белорусов в конце XIX – начале XX вв. / З. Шыбека // Веснік БДУ. Сер. грамадскіх навук. – 1991. – № 6.

17. Юхо, І.А. Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі / І.А. Юхо. – Мінск,1994.

## Тэма 6. Развіццё капіталізму на Беларусі ў другой палове XIX ст.

### План семінара (2 гадзіны)

1. Памешчыцкая і сялянская гаспадаркі.
2. Аграрны крызіс 80-х гг. і яго ўплыў на сельскую гаспадарку.
3. Прамысловасць і яе асноўныя галіны.
4. Будаўніцтва чыгунак.

### Тэмы дакладаў

1. Першы трамвай на Беларусі.
2. Сістэма сухапутных шляхоў зносін.
3. Прамысловасць Полацка ў другой палове XIX ст.

### Тэмы рэфератаў

1. Фінансава-крэдытная сістэма на Беларусі ў другой палове XIX ст.
2. Формы арганізацыі гандлю.
3. Замежны капітал у прамысловасці Беларусі.

## Крыніцы

1. Белоруссия в эпоху капитализма. Развитие капитализма в сельском хозяйстве Белоруссии: сб. документов и материалов. В 2 т. Т. 1. – Минск, 1983.

2. Белоруссия в эпоху капитализма. Развитие капитализма в промышленности, положение промышленных рабочих и рабочее движение в Белоруссии: сб. документов и материалов. В 2 т. Т. 2. – Минск, 1990.

3. Вішнеўскі, А.Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў дакументах і матэрыялах / А.Ф. Вішнеўскі, Я.А. Юхо. – Мінск, 2003.

4. Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі (1772 – 1903 г.). – Мінск, 1940. Т. 2.

5. История Беларуси в документах и материалах / авт.-сост. Н.Н. Кузнецов, В.Г. Мазец. – Минск, 2000.

6. Хрестоматия по истории Белоруссии: с древнейших времен до 1917 г. – Минск, 1977.

## Даследаванні

1. Абезгауз, З.Е. Развитие промышленности и формирование пролетариата Белоруссии во второй половине XIX в. / З.Е. Абезгауз. – Минск, 1971.

2. Актуальныя пытанні гісторыі Беларусі ад старажытных часоў да нашых дзён. – Мінск, 1992.

3. Бейлькин, Х.Ю. Аграрный кризис конца XIX века и структурная реконструкция сельского хозяйства Беларуси / Х.Ю. Бейлькин. – Минск, 2001.

4. Бейлькин, Х.Ю. Сельскохозяйственный рынок Белоруссии. 1861 – 1914 гг. / Х.Ю. Бейлькин. – Минск, 1989.

5. Болбас, М.Ф. Промышленность Белоруссии (1860 – 1900) / М.Ф. Болбас. – Минск, 1978.

6. Бусько, В.Н. Экономическая мысль Белоруссии середины XIX – начала XX в. Очерки / В.Н. Бусько. – Минск, 1990.

7. Верещагин, П.Д. Крестьянские переселения из Белоруссии (вторая половина XIX в.) / П.Д. Верещагин. – Минск, 1960.

8. Глазырин, Е.В. Городское ремесло Беларуси во второй половине XIX в. (на материалах Минской губернии) / Е.В. Глазырин // Пытанні гісторыі Беларусі / пад рэд. А.М. Лютага. – Мінск, 1998.

9. Глазырин, Е.В. Развитие ремесленного производства Полоцка во второй половине XIX века / Е.В. Глазырин // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі (матэрыялы III Міжнароднай навуковай канферэнцыі). – Полацк, 1998.

10. Довнар-Запольский, М.В. Народное хозяйство Белоруссии (1861 – 1914 гг.) / М.В. Довнар-Запольский. – Минск, 1926.

11. Дудкоў, Д.А. Аб развіцці капіталізму ў Беларусі ў другой палове XIX і пачатку XX стст. / Д.А. Дудкоў. – Мінск, 1932.

12. Жытко, А.Л. Дваранства Беларусі перыяду капіталізму. 1861 – 1914 гг. / А.Л. Жытко. – Мінск, 2003.

13. З гісторыі эканамічных рэформаў на Беларусі: вуч.-метад. зб. Вып. 1. / пад агул. рэд. В.І. Галубовіча. – Мінск, 1994.

14. Иванов, В.И. Очерки быта промышленных рабочих дореволюционной Белоруссии / В.И. Иванов. – Минск, 1971.

15. Киштымов, А.Л. Германские капиталы и немецкие предприниматели в экономике Беларуси XIX – XX вв. / А.Л. Киштымов // Беларусіка. Кн. 7. – Минск, 1996. – С. 13 – 21.

16. Киштымов, А.Л. Добрушская бумажная фабрика: опыт социальной политики директора-распорядителя А.И. Стульгинского (80-е гг. XIX в. – 1915 г.) / А.Л. Киштымов // Предпринимательство в Белоруссии. – 2000. – № 7.

17. Киштымов А.Л. Удзел замежных прадпрымальнікаў і фінансаў у развіцці прамысловасці і транспарту Беларусі (канец XVIII – пачатак XX ст.) / А.Л. Киштымов // Штогоднік Інстытута гісторыі НАН Беларусі, 1999. – Мінск. – 1999. – С. 57 – 63.

18. Киштымов, А.Л. Экономика Белоруссии XIX – начала XX в.: государственная политика и частная инициатива // Экономическая история России XIX – XX вв.: современный взгляд / А.Л. Киштымов. – М., 2000. – С. 132 – 145.

19. Киштымов, А.Л. Экономические достижения Беларуси в XIX – начале XX в. / А.Л. Киштымов // Гісторыя Беларусі ў еўрапейскім кантэксце. – Мінск, 2002. – С. 22 – 52.

20. Кожушков, А.И. Развитие капитализма в сельском хозяйстве Белоруссии во второй половине XIX в. / А.И. Кожушков. – Минск, 1963.

21. Литвак, Б. Переворот 1861 г. в России / Б. Литвак. – Минск, 1991

22. Липинский, Л.П. Развитие капитализма в сельском хозяйстве Белоруссии (2-я половина XIX века) / Л.П. Липинский. – Минск, 1971.

23. Марцуль, Г.С. Гісторыя Беларусі: насельнщтва, фарміраванне і вызначэнне этнічных і дзяржаўна-адміністрацыйных межаў, беларускае замежжа / Г.С. Марцуль, М.С. Сташкеіч. – Мінск, 1997.

24. Панютич, В.П. Социально-экономическое развитие белорусской деревни в 1861 – 1900 г. / В.П. Панютич. – Минск, 1990.

25. Прамысловыя прадпрыемствы дарэвалюцыйнай Беларусі. – Мінск, 1988.

26. Соловьёва, А.М. Железнодорожный транспорт России во второй половине XIX века / А.М. Соловьёва. – М., 1975.

27. Солодков, И.М. Социально-экономическое положение Белоруссии до Великой Октябрьской социалистической революции (конец XIX – начало XX в.) / И.М. Солодков. – Минск, 1957.

28. Улащик, Н.Н. Предпосылки крестьянской реформы 1861 г. в Литве и Западной Белоруссии / Н.Н. Улащик. – Минск, 1965.

29. Фридман, М.Б. Отмена крепостного права в Белоруссии / М.Б. Фридман. – Минск, 1958.

30. Чернуха, В.Г. Внутренняя политика царизма с середины 50-х до начала 80-х гг. XIX в. / В.Г. Чернуха. – Л., 1978.

31. Шыбека, З. Социальное размежевание белорусов в конце XIX – начале XX вв. / З. Шыбека // Веснік БДУ. Сер. грамадскіх навук. – 1991. – № 6.

32. Шыбека, З. Гарады Беларусі (60-я гады XIX – пачатак XX ст.) / З. Шыбека. – Мінск, 1997.

33. Шыбека, З. Ад рэформы да рэвалюцыі (аб зямельнай рэформе 1861 г. і становішчы на Беларусі) / З. Шыбека // Голас Радзімы. – 1992. – 18 ліпеня.

34. Хок, С.А. Мальтус: рост населения и уровень жизни в России в 1861 – 1914 гг. / С.А. Хок // Отечественная история. – 1996. – № 2.

## Тэма 7. Грамадска-палітычнае развіццё Беларусі ў другой палове XIX ст.

### План семінара (2 гадзіны)

1. Ідэалогія манархізму ў Беларусі. «Заходнерусізм».
2. Ліберальна-буржуазны рух.
3. Народніцкі рух.
4. Паўстанне 1863 – 1864 гг.

## Тэмы дакладаў

1. К. Каліноўскі і яго рэвалюцыйная дзейнасць.
2. Выхадцы з Беларусі ў народніцкіх арганізацыях.
3. Легальныя грамадскія арганізацыі.

## Тэмы рэфератаў

1. Вытокі ідэалогіі беларускага нацыянальнага руха.
2. Дзейнасць «Народнай волі» на Беларусі.
3. Унутраная палітыка царызма на Беларусі ў другой палове XIX ст.

## Крыніцы


1. Белоруссия в эпоху капитализма. Развитие капитализма в сельском хозяйстве Белоруссии: сб. документов и материалов. В 2 т. Т. 1. – Минск, 1983.

2. Белоруссия в эпоху капитализма. Развитие капитализма в промышленности, положение промышленных рабочих и рабочее движение в Белоруссии: сб. документов и материалов. В 2 т. Т. 2. – Минск, 1990.

3. Восстание в Литве и Белоруссии 1863 – 1864 гг.: документы и материалы. – Минск, 1965. Т. 1 – 2.

4. Вішнеўскі, А.Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў дакументах і матэрыялах / А.Ф. Вішнеўскі, Я.А. Юхо. – Мінск, 2003.

5. Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі (1772 – 1903 г.). – Мінск, 1940. Т. 2.

6. История Беларуси в документах и материалах / авт.-сост. Н.Н. Кузнецов, В.Г. Мазец. – Минск, 2000.

7. Калиновский, К. Из печатного и рукописного наследия / К. Калиновский. – Минск, 1988.

8. Кастусь Каліноўскі. За нашу вольнасць. Творы, дакументы / скл. Г. Кісялёў. – Мінск, 1999.

9. Публицистика белорусских народников. – Минск, 1983.

10. Революционный подъем в Литве и Белоруссии в 1861 – 1862 гг.: документы и материалы. – М., 1964.

11. Хрестоматия по истории Белоруссии: с древнейших времен до 1917 г. – Минск, 1977.

**Даследаванні**


1. Актуальныя пытанні гісторыі Беларусі ад старажытных часоў да нашых дзён. – Мінск, 1992.

2. Багдановіч, А. Да гісторыі партыі «Народнай волі» ў Мінску і Беларусі / А. Багдановіч // Маладосць. – 1995. – № 11. – С. 221.

3. Біч, М.В. У крывым люстэрку: К. Каліноўскі: праўда і вымыслы / М.В. Біч // Настаўніцкая газета. – 1991. – 17, 24, 27 ліпеня.

4. Бич, М.О. Развитие социал-демократического движения в Белоруссии в 1883 – 1903 г. / М.О. Бич. – Минск, 1973.

5. Біч, М.В. Нацыянальнае і аграрнае пытанне ў час паўстання 1863 – 1864 гг. / М.В. Біч // Беларускі гістарычны часопіс. – 1993. – № 3.

6. Бригадин, П.И. Эсеры в Белоруссии (конец XIX – февраль 1917 г.) / П.И. Бригадин. – Минск, 1994.

7. Восстание 1863 г. и русско-польские революционные связи 60-х годов. Сборник статей и материалов. – М., 1960.

8. Глазырын, С.Я. Паўстанне 1863 года ў Віцебскай губерніі / С.Я. Глазырын // Труды молодых специалистов Полоцкого государственного университета. Выпуск 10. – Новополоцк, 2005.

9. Грыгор’ева, В. Каталіцкае і праваслаўнае духавенства ў паўстанні 1863 г. // Беларускі гістарычны часопіс / В. Грыгор’ева. – 1993. – № 3.

10. Карнейчык, Я І. Беларуская нацыя. Гістарычны нарыс / Я І. Карнейчык. – Мінск, 1969.

11. Кісялёў, Г. Паплечнік Каліноўскага / Г. Кісялёў. – Мінск, 1976.

12. Кісялёў, Г.В. З думкай пра Беларусь / Г.В. Кісялёў. – Мінск, 1966.

13. Кісялёў, Г.В. На пераломе дзвюх эпох: паўстанне 1863 г. на Міншчыне / Г.В. Кісялёў. – Мн, 1990

14. Лосинский, Н.Б. Революционно-народническое движение в Белоруссии 1870 – 1884 г. / Н.Б. Лосинский. – Минск, 1983.

15. Марцуль, Г.С. Гісторыя Беларусі: насельнщтва, фарміраванне і вызначэнне этнічных і дзяржаўна-адміністрацыйных межаў, беларускае замежжа / Г.С. Марцуль, М.С. Сташкеіч. – Мінск, 1997.

16. Нарысы з гісторыі грамадскай думкі на Беларусі ў XIX і пачатку XX стст. – Мінск, 1993.

17. Самбук, С.М. Революционные народники Белоруссии (70-е – начало 80-х годов XIX в.) / С.М. Самбук. – Минск, 1972.

18. Самбук, С.М. Общественно-политическая мысль Белоруссии во второй половине XIX в. / С.М. Самбук. – Минск, 1976.

19. Самбук, С.М. Политика царизма в Белоруссии во второй половине XIX в. / С.М. Самбук. – Минск, 1967.

20. Смірноў, А.Ф. Кастусь Каліноўскі ў паўстанні 1863 года / А.Ф. Смірноў. – М., 1959.

21. Смирнов, А.Ф. Восстание 1863 г. в Литве и Белоруссии / А.Ф. Смирнов. – М., 1963.

22. Соколова, М.А. Общественные объединения и движения в Беларуси в конце XVIII – начале XX века: проблемы становления гражданского общества / М.А. Соколова. – Минск, 2002.

23. Сакалова, М.А. Пачатак ліберальнага руху на Беларусі / М.А. Сакалова // Штогоднік Ін-та гісторыі НАН Беларусі. – Мінск, 1999. – С. 48 – 56.

24. Сакалова, М.А. Кансерватызм на Беларусі ў XIX ст. / М.А. Сакалова // Беларускі гістарычны часопіс. – 1997. – № 1. – С. 22 – 34.

25. Солошенко, В.И. Распространение марксизма и образование социал-демократических организаций в Белоруссии / В.И. Солошенко. – Минск, 1963.

26. Солошенко, В.И. От народничества к марксизму / В.И. Солошенко. – Минск, 1973.

27. Таляронак, С.В. «Тот самый Муравьев...». Генерал-карнік і паўстанне 1863 г. на Беларусі і Літве / С.В. Таляронак // Настаўніцкая газета. – 1991. – 9, 16, 20, 27 лютага

28. Федоров, Т.Н. Общественно-политическая мысль в Белоруссии и «Минский листок» / Т.Н. Федоров. – М., 1966.

29. Філатава, А. Да пытання аб паланізацыі і русіфікацыі Беларусі ў XIX ст. / А. Філатава // Беларусіка. – Мінск, 1992.

30. Цвікевіч, А. «Западно-руссизм». Нарысы з гісторыі грамадскай мыслі на Беларусі ў XIX і пачатку XX ст. / А. Цвікевіч. – Мінск, 1993.

31. Шалькевич, В. Кастусь Калиновский: страницы биографии / В. Шалькевич. – Мн, 1988.

32. Филяков, В.Г. Революционные связи рабочих Белоруссии и России в конце XIX – начале XX в. / В.Г. Филяков. – Минск, 1987.

## Тэма 8. Сацыяльная барацьба ў другой палове XIX ст. Узнікненне палітычных арганізацый

### План семінара (2 гадзіны)

1. Сялянскі рух на Беларусі ў другой палове 60 – 90-х гг.

2. Рабочы рух у 60-х – першай палове 90-х гг. Утварэнне рабочых саюзаў.

3. Распаўсюджванне марксізму, зараджэнне сацыял-дэмакратыі і іншых палітычных партый і арганізацый.

4. Зараджэнне беларускага нацыянальна-палітычнага руху.

## Тэмы дакладаў

1. Першы з’езд РСДРП у Мінску.
2. Стварэнне Ўсеагульнага яўрэйскага рабочага саюза ў Літве, Польшчы і Расіі.
3. «Віленская праграма».

## Тэмы рэфератаў

1. Этнадэмаграфічная сітуацыя на Беларусі ў другой палове XIX ст.
2. Сацыяльная структура сялянскага насельніцтва.
3. Становішча пралетарыята.

## Крыніцы

1. Белоруссия в эпоху капитализма. Развитие капитализма в сельском хозяйстве Белоруссии: сб. документов и материалов. В 2 т. Т. 1. – Минск, 1983.
2. Белоруссия в эпоху капитализма. Развитие капитализма в промышленности, положение промышленных рабочих и рабочее движение в Белоруссии: сб. документов и материалов. В 2 т. Т. 2. – Минск, 1990.
3. Вішнеўскі А.Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў дакументах і матэрыялах / А.Ф. Вішнеўскі, Я.А. Юхо. – Мінск, 2003.
4. Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі (1772 – 1903 г.). – Мінск, 1940. – Т. 2.
5. История Беларуси в документах и материалах / авт.-сост. Н.Н. Кузнецов, В.Г. Мазец. – Минск, 2000.
6. Крестьянское движение в Белоруссии после отмены крепостного права (1861 – 1862): документы и материалы. – Минск, 1959.
7. Первая всеобщая перепись населения Российской империи 1897 года. – Вып. IV, V, XI, XVII, XXIII. – СПб., 1899 – 1904.
8. Первый съезд РСДРП. Март 1898 года: документы и материалы.– М., 1958.
9. Программы политических партий России. Конец XIX – начало XX в. – М., 1985.
10. Хрестоматия по истории Белоруссии: С древнейших времен до 1917 г. – Минск, 1977.

**Даследаванні**


1. Бич, М.О. Развитие социал-демократического движения в Белоруссии в 1883 – 1903 г. / М.О. Бич. – Минск, 1973.
2. Бич, М.О. Рабочее движение в Белоруссии в 1861 – 1904 г. / М.О. Бич. – Минск, 1983.
3. Бригадин, П.И. Эсеры в Белоруссии (конец XIX – февраль 1917 г.) / П.И. Бригадин. – Минск, 1994.
4. Верещагин, П.Д. Крестьянские переселения из Белоруссии (вторая половина XIX в.) / П.Д. Верещагин. – Минск, 1960.
5. Иванов, В.И. Очерки быта промышленных рабочих дореволюционной Белоруссии / В.И. Иванов. – Минск, 1971.
6. История рабочего класса Белорусской ССР. В 4 т. Т. 1. – Минск, 1984.
7. Кожушков, А.И. Развитие капитализма в сельском хозяйстве Белоруссии во второй половине XIX в. / А.И. Кожушков. – Минск, 1963.
8. Крук, У.Н. Сялянскі рух на Беларусі (1864 – 1900 гг.) / У.Н. Крук. – Мінск, 1993.
9. Липинский, Л.П. Развитие капитализма в сельском хозяйстве Белоруссии (2-я половина XIX века) / Л.П. Липинский. – Минск, 1971.
10. Марцуль, Г.С. Гісторыя Беларусі: насельніцтва, фарміраванне і вызначэнне этнічных і дзяржаўна-адміністрацыйных межаў, беларускае замежжа / Г.С. Марцуль, М.С. Сташкеіч. – Мінск, 1997.
11. Панютич, В.П. Из истории формирования пролетариата Белоруссии (1861 – 1914 гг.) / В.П. Панютич. – Минск, 1969.
12. Панютич, В.П. Социально-экономическое развитие белорусской деревни в 1861 – 1900 г. / В.П. Панютич. – Минск, 1990.
13. Пракошина, Е.С. Очерк свободомыслия и атеизма в Белоруссии в XIX в. / Е.С. Пракошина. – Минск, 1973.
14. Самбук, С.М. Общественно-политическая мысль Белоруссии во второй половине XIX в. / С.М. Самбук. – Минск, 1976.
15. Самбук, С.М. Революционные народники Белоруссии (70-е – начало 80-х годов XIX в.) / С.М. Самбук. – Минск, 1976.
16. Солошенко, В.И. Распространение марксизма и образование социал-демократических организаций в Белоруссии / В.И. Солошенко. – Минск, 1963.

17. Солошенко, В.И. От народничества к марксизму / В.И. Солошенко. – Минск, 1973.

18. Федоров, Т.Н. Общественно-политическая мысль в Белоруссии и «Минский листок» / Т.Н. Федоров. – М., 1966.

19. Філатава, А. Да пытання аб паланізацыі і русіфікацыі Беларусі ў XIX ст. / А. Філатава // Беларусіка. – Мінск, 1992.

20. Филяков, В.Г. Революционные связи рабочих Белоруссии и России в конце XIX – начале XX в. / В.Г. Филяков. – Минск, 1987.

21. Хок, С.А. Мальтус: рост населения и уровень жизни в России в 1861 – 1914 гг. / С.А. Хок // Отечественная история. – 1996. – № 2.

22. Шыбека, З. Социальное размежевание белорусов в конце XIX – начале XX вв. / З. Шыбека // Веснік БДУ. Сер. грамадскіх навук. – 1991. – № 6.

23. Шыбека, З. Гарады Беларусі (60-я гады XIX – пачатак XX ст.) / З. Шыбека. – Мінск, 1997.

24. Эберхард П. Дэмаграфічная сітуацыя на Беларусі 1897 – 1989 / П. Эберхард. – Мінск, 1997.

## Тэма 9. Культура Беларусі ў 60 – 90-я гг. XIX ст.

### План семінара (2 гадзіны)

1. Вывучэнне этнаграфіі, гісторыі і культуры Беларусі.
2. Палітыка ўрада ў галіне адукацыі.
3. Фарміраванне беларускай літаратурнай мовы.
4. Жывапіс: характарыстыка асноўных жанраў.

### Тэмы дакладаў

1. Полацкая настаўніцкая семінарыя.
2. Развіццё друку. «Мінскі лісток».
3. Творчасць Ф. Багушэвіча.

### Тэмы рэфератаў

1. Дзейнасць Паўночна-Заходняга аддзялення Рускага Геаграфічнага Таварыства.
2. Палітыка царскага ўрада ў галіне адукацыі.
3. Архітэктура і горадабудаўніцтва.

## Крыніцы


1. Беларуская літаратура XIX стагоддзя: хрэстаматыя. – Мінск, 1998.
2. Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі (1772 – 1903 г.). – Мінск, 1940. – Т. 2.
3. История Беларуси в документах и материалах / авт.-сост. Н.Н. Кузнецов, В.Г. Мазец. – Минск, 2000.
4. Хрестоматия по истории Белоруссии: с древнейших времен до 1917 г. – Минск, 1977.


## Даследаванні


1. Александровіч, С.Х. Кнігі і людзі / С.Х. Александровіч. – Мінск, 1976.
2. Бас, І. Падарожжа ў літаратурнае мінулае. Літаратурна-крытычныя артыкулы / І. Бас. – Мінск, 1971.
3. Беларусы. У 8 т. Т. 3. Гісторыя этналагічнага вывучэння / В.К. Бандарчык, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; рэдкал.: В.К. Бандарчык, М.Ф. Піліпенка, А.І. Лакотка. – Мінск, 1999.
4. Бярозкіна, Н.Ю. Гісторыя кнігадрукавання Беларусі (XVI – пачатак XX ст.) / Н.Ю. Бярозкіна. – Мінск,1998.
5. Дробаў, Л.М. Беларускія мастакі XIX ст. / Л.М. Дробаў. – Мінск, 1971.
6. Дробов, Л.Н. Живопись Белоруссии XIX – начала XX в. / Л.Н. Дробов. – Минск,1974.
7. Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры. Літаратура XIX – пачатку XX ст. – Мінск, 1969. Т. 2.
8. Каханоўскі, Г.А. Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI – XIX стст. / Г.А. Каханоўскі. – Мінск, 1984.
9. Кацер, М.С. Изобразительное искусство Белоруссии дооктябрьского периода / М.С. Кацер. – Минск, 1969.
10. Кацер, М.С. Народно-прикладное искусство Белоруссии (от первобытного общества до 1917 г.) / М.С. Кацер. – Минск, 1972.
11. Кісялёў, Г. Героі і музы: гісторыка-літаратурныя нарысы / Г. Кісялёў. – Мінск, 1982.
12. Лазук, Б.А. Гісторыя мастацтваў / Б.А. Лазук. – Мінск, 1996.
13. Лойка, А.А. Гісторыя беларускай літаратуры: Дакастрычніцкі перыяд. У 2-х ч. Ч. 1 / А.А. Лойка. – Мінск, 1969.

14. Лойка, А.А. Гісторыя беларускай літаратуры. Дакастрычніцкі перыяд. Ч. 1 / А.А. Лойка. – Мінск, 1977.

15. Мальдзіс, А.І. Падарожжа ў XIX стагоддзе / А.І. Мальдзіс. – Мінск, 1969.

16. Масленікава, В.К. Музычная адукацыя ў Беларусі / В.К. Масленікава. – Мінск,1980.

17. Музыкальный театр Белоруссии. Дооктябрьский период. – Минск, 1990.

18. Няфёд, У.І. Гісторыя беларускага тэатра / У.І. Няфёд. – Мінск, 1982.

19. Очерки истории науки и культуры Беларуси. – Минск, 1996.

20. Пічэта, В.І. Пытанне аб вышэйшай школе на Беларусі ў мінулым / В.І. Пічэта. – Мінск, 1991.

21. Праз смуту стагоддзяў. – Мінск, I993.

22. Снапкоўская, С.В. Ля вытокаў нацыянальнай педагогікі. З гісторыі школы і педагагічнай думкі Беларусі канца XIX – пачатку XX ст. / С.В. Снапкоўская. – Мінск, 1995.

23. Федоров, Т.Н. Общественно-политическая мысль в Белоруссии и «Минский листок» / Т.Н. Федоров. – М., 1966.

24. Шчакаціхін, М.М. Нарысы гісторыі беларускага мастацтва / М.М. Шчакаціхін. – Мінск, 1993.

# 3. РЭЙТЫНГАВАЯ СІСТЭМА ПРЫ ВЫВУЧЭННІ ГІСТАРЫЧНЫХ ДЫСЦЫПЛІН

Адной з галоўных праблем развіцця вышэйшай адукацыі на сучасным этапе з’яўляецца павышэнне якасці ведаў будучых спецыялістаў. У канчатковым выніку аб’ем і трываласць ведаў, ўменне ўжываць іх на практыцы з’яўляюцца галоўнымі паказчыкамі эфектыўнасці працы ВНУ.

Праблемам методыкі выкладання надаецца ў сучасны час вялікая ўвага: сістэматычна абнаўляюцца лекцыйныя курсы, удасканальваюцца формы практычных заняткаў, актыўна ўкараняецца мультымедыя і інш. Разам з тым, актуальнай праблемай да сённяшняга дня застаецца сістэма кантролю ведаў студэнтаў і, першым чынам, яе аб’ектыўнасць, формы і навучальная функцыя.

Студэнцкі прынцып вучобы – «ад сесіі да сесіі, жывуць студэнты весела, а сесія ўсяго два разы ў год» захоўвае сваю жыццяздольнасць, спараджаючы негатыўныя наступствы. Па-першае, гэта пропускі заняткаў без важных прычын. Па-другое, неэфектыўнае размеркаванне пазнавальнай дзейнасці студэнтаў за час вучобы. Па-трэцяе, змяшчэнне матывацыі навучальнай дзейнасці на кароткатэрміновыя перыяды – на час сесій.

Дадзеныя негатыўныя моманты прыводзяць да перагрузкі студэнтаў і выкладчыкаў, а таксама да нетрываласці ведаў. Псіхолагі даўно ўжо заўважылі, што канцэнтраванае, згушчанае завучванне вялікага аб’ёму ведаў заўсёды дае значна меншы эфект, а пры размеркаванні пазнавальнай дзейнасці па часе запамінанне аказваецца больш прадуктыўным. Педагагічны досвед паказвае, што ўзмоцненая і паспешная падрыхтоўка да іспытаў не прыводзіць да трывалага замацавання ведаў. У той самы час сістэматычны парцыённы кантроль уліку ведаў стымулюе працэсы засваення і запамінання.

Недахопы традыцыйнага семестравага кантролю ведаў вядомыя: «латарэйны характар» іспыту правакуе шматлікіх студэнтаў спадзявацца на «шчаслівы квіточак». Насупраць, добрасумленных навучэнцаў на іспыце можа падсцерагчы няўдача. Многіх студэнтаў сесія прыводзіць да стрэсавых сітуацый. Сістэма выніковай адзнакі ператварае ў фармальнасць унутрысеместровую атэстацыю студэнтаў. І, нарэшце, нельга не адзначыць пэўны «суб’ектывізм», калі адзнака або завышаецца або прыніжаецца выкладчыкам наўмысна.

Больш таго, здача непадрыхтаваным студэнтам іспыту у сувязі з развіццём радыёэлектронікі і камп’ютарнай тэхнікі значна спрашчаецца.

Актыўна выкарыстоўваюцца сёння студэнтамі мабільныя тэлефоны, кішэнныя камп'ютэры, так званае «вуха» (бесправадны навушнік) і г. д.

Такім чынам, сістэма кантролю ведаў у цяперашні час уступае ў супярэчнасць з сучаснымі патрабаваннямі да падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў. Яна не спрыяе актыўнай, адказнай і рытмічнай працы студэнтаў. Іспыт, як асноўны элемент такой сістэмы кантролю, безнадзейна састарваецца.

У ВНУ даўно вядуцца пошукі шляхоў пераадолення гэтых негатыўных бакоў. Адзін з выкарыстоўваемых метадаў – надзяленне выкладчыка правам на «аўтамат», гэта значыць на выстаўленне адзнакі за навучальны курс па сукупнасці ведаў, паказаных студэнтам на занятках. Аднак, не маючы пад сабою нарматыўнай базы, такога роду практыка часцяком вядзе да яшчэ большага валюнтарызму; таму яе ўкараненне, як правіла, вельмі хутка натыкаецца на цалкам абгрунтаваныя адміністрацыйныя абмежаванні.

Замена вуснага іспыту выніковым тэставаннем таксама не панацэя. Распрацоўка, укараненне і ўжыванне іспытных тэстаў – складаная тэхналогія, якая патрабуе высокай кваліфікацыі выкладчыкаў і вялікіх выдаткаў працоўнага часу на складанне, папаўненне, удасканаленне і абнаўленне заданняў. Паміж тым у дзеючыя нарматывы, па якіх плануецца нагрузка, гэтыя выдаткі не закладзеныя.

Больш таго, спробы татальнага ўкаранення тэставага кантролю ведаў выклікаюць справядлівыя нараканні як з боку метадыстаў, так і практыкаў. Навучальныя дысцыпліны ў рознай ступені схільныя «фармалізацыі» і структураванню ведаў, без якіх іх немагчыма сістэмна ўпісаць у дыскрэтную «сетку» тэставых заданняў. Тэсты пазбаўляюць экзаменатара магчымасці ацаніць вельмі важныя, а для шэрагу гуманітарных дысцыплін – асноватворныя ўменні. Найперш, гэта камунікатыўныя здольнасці і навыкі звязнага пісьмовага і вуснага адказу вучэбнага матэрыялу. Тэсты з'яўляюцца ні чым іншым, як «наводным» пытаннем, яны палягчаюць, а дакладней, робяць аднастайнымі інтэлектуальныя намаганні экзаменуемых: неабходны адказ пасіўна здабываецца з прапанаванага набору варыянтаў. Гэта можа прывесці да парушэння раўнавагі паміж індуктыўнымі і дэдуктыўнымі здольнасцямі. Такім чынам, масіраванае ўжыванне тэстаў на іспытах без папярэдняй метадычнай падрыхтоўкі выкладчыкаў і студэнтаў, без «каліброўкі» тэстаў, якія пацвярджаюць іх карэляцыю з іншымі формамі адзнакі падрыхтаванасці студэнтаў, без сістэмы экспертнай адзнакі тэставых заданняў і іх атэстацыі на прыдатнасць зусім не вырашае праблемы ўдасканалення семестравага кантролю.

У апошнія гады азначыўся шлях, які дазваляе сумясціць у сабе практычна ўсе вартасці вядомых спосабаў кантролю ведаў студэнтаў і звесці да мінімуму недахопы кожнага з іх. Гэта – так званая рэйтынгавая сістэма адзнакі ведаў.

Рэйтынгавая тэхналогія ацэньвання вынікаў навучання студэнтаў па якой-небудзь дысцыпліне заснаваная на ўліку назапашваемых імі адзнак у балах за выкананне бягучых прац або рэгулярна праводзімых кантрольных мерапрыемстваў. У адрозненне ад традыцыйнага спосабу ацэньвання, рэйтынгавая тэхналогія прадугледжвае сістэму назапашвання ўмоўных адзінак ведаў на працягу ўсяго атэстуемага перыяду.

Бягучая рэйтынгавая адзнака па дысцыпліне складаецца з адзнак па практыкуемых відах вучэбнай працы і кантролю ведаў, у тым ліку не толькі працы па навучальным плане, але таксама такой дадатковай дзейнасці, як удзел у алімпіядах, конкурсах, выступы на канферэнцыях і т. д. У залежнасці ад колькасці балаў, атрыманых за кожны выкананы від навучальнай дзейнасці, студэнт па завяршэнні курсу атрымоўвае досыць адэкватную сукупную адзнаку.

**Мэтай** рэйтынгавай сістэмы адзнакі паспяховасці студэнтаў з’яўляецца комплексная адзнака якасці навучальнай працы студэнтаў у працэсе навучання.

**Галоўныя задачы рэйтынгавай сістэмы заключаюцца ў:**

- павышэнні матывацыі студэнтаў да засваення адукацыйных праграм шляхам больш высокай дыферэнцыяцыі адзнакі іх навучальнай працы;
- павышэнні ўзроўня арганізацыі адукацыйнага працэсу ў ВНУ.
- выраўноўванне нагрузкі студэнта і выкладчыка на працягу семестра.

**Перавагі рэйтынгавай сістэмы:**

- магчымасць арганізаваць і падтрымоўваць рытмічную сістэматычную працу студэнтаў на працягу ўсяго семестра;
- кантроль навучальнай дзейнасці не носіць дырэктыўнага характару, і студэнты ахвотна «зарабляюць» балы за набытыя веды і ўменні;
- павышэнне наведвальнасці і ўзроўня дысцыпліны на занятках; студэнтам «выгадна» наведваць заняткі;
- памяншэнне «сесійнага стрэсу»;

• прадказальнасць выніковай адзнакі, студэнты свядома падыходзяць да яе дасягнення і, як следства, сістэма становіцца прывабнай для студэнтаў;

• стымуляванне творчага падыходу да працы як студэнтаў, так і выкладчыкаў.

Аналіз вопыту ўкаранення рэйтынгавай сістэмы паказвае, што найболей паспяхова яна ўжываецца на тэхнічных спецыяльнасцях, спецыфіка навучання якім дазваляе сапраўды ацаніць навучальную дзейнасць студэнтаў з дапамогай складанай матэматычнай апрацоўкі назапашваемых на працягу семестра колькасных паказчыкаў (вылічэнні, разлікі, вымярэнні і т. п.). Такі «матэматычны» падыход да ўкаранення рэйтынгавай сістэмы на гуманітарных спецыяльнасцях, у прыватнасці, пры навучанні гісторыі, можа быць прымальны толькі часткова пры азначэнні выніковай адзнакі. Па-першае, мэтай навучання студэнтаў-гісторыкаў з'яўляюцца не толькі дакладныя веды па храналогіі, але і ўменні аналізаваць гістарычныя факты, інтэрпрэтаваць гістарычныя крыніцы, бачыць складанасць і супярэчлівасць гістарычнага працэсу, выпрацоўваць свой пункт гледжання і т. п. Па-другое, для выкладчыкаў гуманітарных дысцыплін авалоданне сістэмай складаных матэматычных разлікаў будзе праблематычна. Таму існуе неабходнасць адаптацыі рэйтынгавай сістэмы для гуманітарных спецыяльнасцей.

У дадзеным артыкуле будзе ажыццёўленая спроба змадэляваць найболей агульныя прынцыпы і механізм ужывання рэйтынгавай сістэмы пры навучанні студэнтаў-гісторыкаў. Перш за ўсё, неабходна вызначыць зыходныя прынцыпы функцыяніравання дадзенай методыкі. Такімі прынцыпамі могуць быць:

• **даступнасць** – прастата ва ўжыванні сістэмы выкладчыкамі і студэнтамі гістарычнага профіля;

• **варыятыўнасць** – магчымасць змены сістэмы або яе элементаў у залежнасці ад зместу навучальнай дысцыпліны і колькасці студэнтаў у групе;

• **дыферэнцыяцыя** – улік індывідуальных асаблівасцей студэнтаў і выкладчыкаў;

• **комплекснасць** – улік і кантроль як ведаў, уменняў і навыкаў студэнтаў, так і іх патэнцыйных здольнасцей;

• **спалучальнасць** – магчымасць выкарыстання рэйтынгавай сістэмы ў сукупнасці з іншымі відамі кантролю ведаў;

• **спецыфічнасць** – улік і адзнака спецыфічных гістарычных ведаў, уменняў і навыкаў.

Для хутчэйшага засваення і эфектыўнага ўжывання рэйтынгавай сістэмы неабходна ведаць яе лагічную структуру, утрыманне і ўзаемасувязь структурных элементаў. У самых агульных рысах структуру рэйтынгавай сістэмы можна прадставіць у выглядзе схемы (гл. схему 1).




Схема 1. Структурная схема рэйтынгавай сістэмы

Найважнейшым элементам рэйтынгавай сістэмы з'яўляецца прадметная рэйтынгавая формула, адным словам, сукупнасць ацэньваемых відаў навучальнай дзейнасці студэнтаў і непасрэдна сама сістэма ацэньвання кожнага з іх ва ўмоўных балах. Па сутнасці, гэта «правілы гульні», па якіх будуць узаемадзейнічаць выкладчык і студэнты пры вывучэнні пэўнага вучэбнага прадмета. Распрацоўка гэтых «правіл» і з'яўляецца пачатковым этапам ва ўжыванні рэйтынгавай сістэмы.

«Канструяванне» прадметнай рэйтынгавай формулы здзяйсняе непасрэдна той выкладчык, які будзе выкладаць дадзены вучэбны прадмет. Менавіта ён, першым чынам вызначае па сваім меркаванні ацэньваемыя віды навучальнай дзейнасці, іх колькасць, а таксама формы кантролю ведаў у сувязі са сваім практычным вопытам, спецыфікай прадмета і колькасцю студэнтаў у акадэмічнай групе. Відамі навучальнай дзейнасці па гістарычных дысцыплінах могуць быць вусныя выступленні, падрыхтоўка рэфератаў, дакладаў, канспектаванне навуковых артыкулаў, анатацыі манаграфій і інш.

Вельмі важна пры стварэнні прадметнай рэйтынгавай формулы разлічыць аптымальныя нарматывы ўдзелу студэнтаў у кожным відзе дзейнасці. Зрабіць гэта нескладана, ведаючы колькасць навучальных заняткаў, колькасць студэнтаў і прыкладны час, які адводзіцца на кожны від дзейнасці аднаго студэнта. Напрыклад, на прадстаўленне і абарону рэферата – да 15 мін, на вусны адказ – да 7 мін і т. д. Калі на вывучэнне прадмета адводзіцца 18 гадзін семінарскіх заняткаў (9 пар) і навучальная група складаецца з 20 студэнтаў, то рэальным нарматывам для такога віда навучальнай дзейнасці, як падрыхтоўка рэферата, будзе адзін рэферат на аднаго студэнта ў семестр.

Акрамя вызначэння форм навучальнай дзейнасці, пры складанні прадметнай рэйтынгавай формулы выкладчык павінен распрацаваць сваю сістэму ацэньвання ва ўмоўных балах кожнай з гэтых форм дзейнасці, улічваючы складанасць заданняў і іх педагагічную скіраванасць. Так, напрыклад, на малодшых курсах больш увагі можна надаць вусным выступленням (адказам) студэнтаў і, адпаведна, ацэньваць дадзены від навучальнай дзейнасці па 10-бальнай сістэме, у той час як ацэньванне тэстаў можа здзяйсняцца па 5-бальнай сістэме. У канчатковым варыянце выкладчык кожнаму віду вучэбнай дзейнасці прысвойвае ўласную сістэму адзнак ва ўмоўных балах – 3-х, 5-ці, 7-мі, 10-бальную.

Пры распрацоўцы прадметнай рэйтынгавай формулы неабходна ўлічваць і ацэньваць наведванне лекцыйных і семінарскіх заняткаў па прадмеце – як перцэптыўны выгляд навучальнай дзейнасці. За дзве гадзіны заняткаў (пару) можна прысвойваць адзін умоўны бал.

Наступным структурным элементам рэйтынгавай сістэмы з’яўляецца рэальны рэйтынгавы бал студэнта, г. зн. агульная сума ўмоўных балаў, атрыманых пры выкананні навучальных відаў дзейнасці на працягу семестра з ужываннем каэфіцыентаў, якія паніжаюць або павышаюць бал.

Калі падлік сумы балаў не выклікае цяжкасцей, то на сістэме павышэння і паніжэння рэальнага рэйтынгавага бала неабходна спыніцца падрабязней.

З мэтай стымулявання наведвання навучальных заняткаў і актывізацыі навучальнай дзейнасці прадугледжваецца як павелічэнне сумы набраных умоўных балаў, так і яе памяншэнне. Памяншэнне сумы («вылікі») здзейсняецца ў выпадку пропуску заняткаў і невыкананні вучэбных заданняў без важкіх прычын. Студэнт, які прапусціў заняткі па хваробе, сямейных абставінах або іншых важных прычынах, не атрымоўвае «вылікаў», але яму і не налічаюцца балы, бо пропуск заняткаў у любым разе вядзе да невыканання вучэбнай праграмы і павінен кампенсавацца выкананнем індывідуальных заданняў. За пропуск лекцыі (2 гадзіны) можна ўжыць зніжаючы каэфіцыент 4, за пропуск семінарскага занятку – 2. Такім чынам, за адну прапушчаную лекцыю з агульнай сумы адымаюцца 4 балы, адпаведна, за адзін семінар – 2 балы. За невыкананне вучэбнага задання здымаецца найвышэйшы бал, які можна было атрымаць за гэты тып задання (3, 5, 7, 10 і г. д.).

Павелічэнне сумы набраных балаў павінна ўлічваць, першым чынам, творчую працу студэнтаў па дысцыпліне. У якасці прыкладу можна прапанаваць наступную класіфікацыю асноўных відаў творчай дзейнасці студэнтаў і іх ацэньванне ва ўмоўных балах:

- удзел у навуковых канферэнцыях – 20 балаў;
- удзел у распрацоўцы навуковага праекту – 20 балаў;
- падрыхтоўка і публікацыя навуковага артыкула – 20 балаў;
- распрацоўка сцэнарыяў пазааўдыторных мерапрыемстваў па дысцыпліне – 15 балаў;
- удзел у пазааўдыторных мерапрыемствах па дысцыпліне – 10 балаў.

Неабходна адзначыць, што творчы кампанент у атрыманні найвышэйшай выніковай адзнакі па курсе мае вырашальнае значэнне, таму што менавіта ён дазваляе студэнту атрымоўваць дадатковыя веды па прадмеце і ўдасканальваць уменні і навыкі, уласцівыя будучаму гісторыку.

Для больш эфектыўнага ўліку ўмоўных балаў неабходна выкарыстоўваць ведамасць уліку наведвання навучальных заняткаў (гл. дадатак 1), а таксама рэйтынгавую ведамасць (гл. дадатак 2), у якіх «вылікі» будуць адзначацца са знакам мінус. Студэнтам для самакантролю можна парэкамендаваць выкарыстоўваць індывідуальную рэйтынгавую карту (гл. дадатак 3).

Пры падвядзенні выніковых адзнак важнае значэнне мае такі структурны элемент рэйтынгавай сістэмы, як максімальны рэйтынгавы бал (МРБ). МРБ – гэта «ідэальны» паказчык, які адпавядае працы бездакорнага студэнта на працягу семестра па дадзенай дысцыпліне. Такі віртуальны выдатнік прысутнічае на кожным занятку і выконвае ўсе прапанаваныя прадметнай рэйтынгавай формулай вучэбныя заданні з найвышэйшым умоўным балам, праўда без уліку дадатковай творчай працы. Для кожнага прадмета колькаснае значэнне МРБ будзе розным, але яно прыраўноўваецца да 100 %. У канцы семестра, калі за кожным студэнтам будзе лічыцца рэальны рэйтынгавы бал, які адлюстроўвае інтэнсіўнасць і паспяховасць яго навучальнай дзейнасці, РРБ параўноўваецца з МРБ і пералічваецца ў выніковыя адзнакі. У дачыненні да дзеючай 10-бальнай сістэмы адзнак у беларускіх ВНУ, для вывядзення выніковай адзнакі можна выкарыстаць даволі простую для разлікаў формулу

$$\text{Выніковая адзнака} = \frac{\text{РРБ} \times 10}{\text{МРБ}}.$$

Пасля нескладанага матэматычнага разліку атрыманы вынік і будзе адпавядаць выніковай адзнацы. Напрыклад, адзнацы «восем» будзе адпавядаць любы атрыманы лік ад 8 да 8,99. Іншымі словамі, атрыманы цэлы лік будзе супадаць з адзнакай.

Для разумення таго, як функцыяніруе рэйтынгавая сістэма і вядзецца выстаўленне выніковай адзнакі, можна прапанаваць наступны прыклад. Возьмем віртуальнага студэнта, які валодае сярэднімі здольнасцямі, досыць дысцыплінаваны, які вывучае гістарычную дысцыпліну, на якую вучэбным планам адводзіцца за семестр 36 лекцыйных гадзін (18 пар), 18 семінарскіх гадзін (9 пар). Студэнт вучыцца ў групе, якая складаецца з 20 чалавек.

У прадметную рэйтынгавую формулу закладваем такія віды навучальнай дзейнасці, як: падрыхтоўка рэфератаў, дакладаў, анатаванне манаграфій, канспектаванне навуковых артыкулаў, вусныя адказы і кантрольныя працы (тэсты). Затым вызначаем аптымальную нагрузку на аднаго студэнта. Рэальна атрымоўваецца, што адзін студэнт зможа за семестр падрыхтаваць 2 рэфераты, 2 даклады, 2 анатацыі, 4 канспекты артыкулаў, 2 разы вусна адказаць і выканаць 2 кантрольных працы. Сістэма ацэньвання будзе выглядаць так:

– рэферат ацэньваецца па 10-бальнай шкале;

– даклад – па 5-бальнай;

– вусны адказ – па 10-бальнай;

– анатаванне – па 5-бальнай;

– канспектаванне – па 5-бальнай;

– кантрольная праца – па 10-бальнай.

Вызначаем спачатку МРБ (схема дадзеная вышэй). У выніку ён складзе 127 балаў. Выкажам здагадку, што на працягу семестра наш студэнт наведаў усе навучальныя заняткі (пропускі адпрацаваў) і выканаў усе вучэбныя заданні на сярэднім узроўні (4 і 8 балаў). У такім разе яго РРБ складзе 107 балаў. Зараз вылічым выніковую адзнаку па прыведзенай вышэй формуле (107 × 10) : 127 = 8,4, г. зн. па дзесяцібальнай сістэме яго выніковая адзнака – 8 (восем).

Прадстаўленая мадэль рэйтынгавай сістэмы не з’яўляецца завершанай і нязменнай. У працэсе яе выкарыстання, вядома ж, паўстануць праблемы і цяжкасці. Важна, каб кожны выкладчык здолеў творча адаптаваць яе да свайго прадмета, да сябе, да студэнтаў. Неабходна актыўна выкарыстоўваць індывідуальныя і групавыя кансультацыі са студэнтамі, жадаючымі змяніць РРБ. У канчатковым варыянце, мы не ў праве пазбаўляць студэнта магчымасці атрымаць выніковую адзнаку і на іспыце. З гэтай мэтай у перыяд экзаменацыйнай сесіі павінны быць створаны ўмовы для студэнтаў, жадаючых павысіць сваю выніковую адзнаку (правядзенне кансультацый і іспыту).

## 4. ХРАНАЛОГІЯ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ ХІХ СТАГОДДЗЯ

**1801 г.** Новы адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел: Беларуская губерня падзелена на Магілёўскую і Віцебскую (абедзве ўвайшлі ў склад Беларускага генерал-губернатарства); Літоўская – на Віленскую і Гродзенскую губерні (увайшлі ў склад Літоўскага ваеннага губернатарства).

**1803 г., 4 ліпеня.** Забарона пераходаў уніяцкіх вернікаў у каталіцтва.

**1803 г. – 1832 гг.** Адкрыццё і дзейнасць Віленскага універсітэта.

**1804 г., 9 снежня.** Прыняцце Палажэння аб уладкаванні яўрэяў.

**1807 – 1884 гг.** Жыццё і творчасць В.І. Дуніна-Марцінкевіча.

**1807 г.** Тыльзіцкі мір. Стварэнне з польскіх зямель, якія належалі Прусіі, Вялікага герцагства Варшаўскага.

**1807 – 1809 гг.** Паўстанне сялян Кашалёўскага староства Магілёўскай губерні.

**1810 г.** Утварэнне ваенных пасяленняў у Беларусі.

**1810 г., 8 жніўня.** Указ аб тэрміне даўнасці (з 1798 г.) для тых, хто пакінуў уніяцтва.

**1810 – 1820 гг.** Будаўніцтва Бабруйскай крэпасці.

**1812 – 1820 гг.** Дзейнасць езуіцкай акадэміі ў Полацку.

**1812 г., 12 / 24 чэрвеня.** Пачатак вайны Расіі супраць нашэсця Напалеона I.

**1812г., 19 чэрвеня / 1 ліпеня**. Загад Напалеона аб стварэнні Часовага ўрада Вялікага княства Літоўскага.

**1812 г., 9 – 11 / 22 – 23 ліпеня.** Бой каля в. Салтанаўка (Магілёўскі раён).

**1812 г., 14 – 16 лістапада / 26 – 28 лістапада.** Пераправа французскай арміі праз р. Бярэзіну.

**1812 г., 3/15 лістапада.** Бой пад Койданава паміж расійскім корпусам К. Ламберта і французска-польскім Ф. Касецкага.

**1812 г., 10 снежня.** Маніфест Аляксандра I аб абвяшчэнні амністыі жыхарам Літвы – Беларусі, што ўдзельнічалі ў вайне на баку Напалеона, пры ўмове іх вяртання на радзіму.

**1815 г.** Венскі кангрэс.

**1817 г.** Стварэнне асобнага Літоўскага корпуса з ураджэнцаў беларуска-літоўскіх і ўкраінскіх губерняў.

**1817 – 1823 гг.** Дзейнасць тайных студэнцкіх таварыстваў у Віленскім універсітэце.

**1818 г.** Выпуск першага нумара часопіса «Miesęcznik Polocki».

**1820 г.** Выгнанне езуітаў з Расійскай імперыі.

**1823 г.** Заканчэнне будаўніцтва шашы Брэст – Варшава (177 вёрст).

**1824 г.** Выпрабаванне першага ў Беларусі парахода, пабудаванага А. Смітам у Гомельскім маёнтку графа М. Румянцава.

**1824 – 1839 гг.** Будаўніцтва Аўгустоўскага канала, які злучыў басейны Нёмана і Віслы.

**1825г., снежань.** Адмова Літоўскага піянерскага батальёна прысягаць імператару Мікалаю І.

**1826 – 1841 гг.** Дзейнасць у г. Віцебску Беларускага вольнага эканамічнага таварыства.

**1828 г., 28 красавіка.** Заснаванне асобнай грэка-уніяцкай духоўнай калегіі. Стварэнне замест чатырох уніяцкіх епархій дзвюх (Беларускай і Літоўскай).

**1829 г., 1850 г.** Дзейнасць Беларускай навучальнай акругі.

**1830 – 1831 гг.** Шляхецкае паўстанне ў Польшчы, Беларусі, Літве і Правабярэжнай Украіне.

**1831 г., студзень.** Стварэнне Віленскага цэнтральнага паўстанцкага камітэта (у склад увайшлі С. Шумскі, А. Гарэцкі, М. Балінскі, В. Пяткевіч, Л. Замбржыцкі, Э. Рамер, Ю. Грабніцкі).

**1830 – 1918 гг.** Жыццё і дзейнасць мастака Н. Сілівановіча.

**1831 г., люты.** Увядзенне забароны выкарыстоўвання у справаводстве Гродзенскай і Віленскай губерняў польскай мовы.

**1831 г., 22 сакавіка.** Зацвярджэнне Сенатам парадку «Аб ажыццяўленні і выкананні прысуду над бунтаўшчыкамі».

**1831 г.** Скасаванне Статута Вялікага княства Літоўскага 1588 г. у Віцебскай і Магілёўскай губернях.

**1831 – 1848 гг.** Дзейнасць Камітэта па справах заходніх губерняў.

**1832 г.** Закрыццё Віленскага універсітэта.

**1833 г.** Стварэнне Полацкай праваслаўнай епархіі.

**1833 – 1900 гг.** Жыццё і дзейнасць мастака А. Гараўскага.

**1833 – 1842 гг.** Будаўніцтва Брэсцкай крэпасці.

**1836 г.** Забарона выкладання ў навучальных установах польскай мовы як самастойнага прадмета.

**1836 г.** Стварэнне сакрэтнага камітэта па уніяцкіх справах.

**1836 г.** Утварэнне Ф. Савічам нелегальнага студэнцкага «Дэмакратычнага таварыства» ў Віленскай медыка-хірургічнай акадэміі.

**1837 г.** Выступленне Віленскага дваранскага сходу з праектам адмены прыгоннага права.

**1838 г., 23 лютага.** Дзень смерці апошняга уніяцкага мітрапаліта І. Булгака.

**1838 – 1917 гг.** Выданне «Губернских ведомостей» у губернскіх гарадах Беларусі.

**1838 – 1864 гг.** Жыццё і дзейнасць К. Каліноўскага.

**1839 г., 12 лютага.** Адбыўся Полацкі царкоўны сабор.

**1839 г., снежань.** «Палажэнне аб люстрацыі дзяржаўнай маёмасці заходніх губерняў і Беластоцкай вобласці».

**1840 – 1900 гг.** Жыццё і творчасць Ф. Багушэвіча

**1840 г., 27 жніўня.** Адкрыццё ў мястэчку Горы-Горкі земляробчай школы (з 1848 г. – земляробчы інстытут).

**1840 г.** Скасаванне Статута Вялікага княства Літоўскага 1588 г. у Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губернях.

**1840 – 1850 гг.** Дзейнасць у Мінску тэатра, арганізаванага В. Дунінinformed-Марцінкевічам.

**1841 – 1916** гг. Выданне газеты «Виленский вестник».

**1844 г.** Перавод дзяржаўных сялян на аброчную сістэму.

**1844 г.** Стварэнне дваранскіх інвентарных камітэтаў у заходніх губернях.

**1844 – 1857 гг.** Перавод дзяржаўных сялян на аброчную сістэму.

**1845 г.** Пачатак увядзення ў дзеянне абавязковых інвентароў заходніх губерняў.

**1846 г.** Увядзенне ваеннага становішча ў Віленскай, Гродзенскай і Ковенскай губернях у сувязі з рэвалюцыйнымі выступленнямі ў Польшчы і Галіцыі.

**1846 – 1849 гг.** Дзейнасць у Беларусі падпольнай арганізацыі «Саюз свабодных братоў».

**1847 г., сакавік – май.** Масавыя выступленні сялян Віцебскай губерні.

**1849 г.** Заканчэнне будаўніцтва шашы Брэст – Масква (999 вёрст).

**1851 – 1897 гг.** Жыццё і дзейнасць Янкі Лучыны (І. Неслухоўскага).

**1851 – 1915** гг. Жыццё і дзейнасць А. Стульгінскага, дырэктара Добрушскай папяровай фабрыкі, выдатнага інжынера, заснавальніка Саюза папяровых фабрыкантаў у Расіі.

**1852 г., 21 лютага.** Пастаноўка ў Мінску тэатральным калектывам В. Дуніна-Марцінкевіча першай беларускай оперы «Ідылія» С. Манюшкі і К. Кжыжаноўскага.

**1855 г.** Заканчэнне будаўніцтва шашы Віцебск – Смаленск (286 вёрст).

**1856 – 1881** гг. Жыццё і дзейнасць беларускага рэвалюцыянера І. Грынявіцкага.

**1857 г., 20 лістапада.** Рэскрыпт Аляксандра II віленскаму генерал-губернатару У. Назімаву аб стварэнні губернскіх камітэтаў па сялянскаму пытанню.

**1857 г., 3 студзеня.** Утварэнне Сакрэтнага камітэта па сялянскай справе для падрыхтоўкі рэформы.

**1858 г., 8 студзеня.** Пераўтварэнне Сакрэтнага камітэта ў Галоўны камітэт па сялянскай справе.

**1858 – 1859** гг. Выданне ў Пецярбургу газеты «Słowo».

**1859 г.** Увод у эксплуатацыю тэлеграфнай лініі Мінск – Бабруйск.

**1861 г., 19 лютага.** Маніфест аб адмене прыгоннага права ў Расіі.

**1861 – 1863 гт.** Уздым сялянскага руху ў сувязі з правядзеннем сялянскай рэформы 1861 г.

**1861 – 1864 гг.** Дзейнасць Мінскай падпольнай арганізацыі напярэдадні і ў час паўстання 1863 – 1864 гг.

**1861 – 1917 гг.** Жыццё і дзейнасць І. Буйніцкага.

**1861 – 1931 гг.** Жыццё і дзейнасць Я. Карскага – заснавальніка беларускага мовазнаўства.

**1862 г., чэрвень – 1863 г., май.** Выданне К. Каліноўскім газеты «Мужыцкая праўда» – першай нелегальнай рэвалюцыйна-дэмакратычнай беларускай газеты.

**1862 г.** Стварэнне Камітэта руху (Літоўскага правінцыяльнага камітэта) у Вільні.

**1862 г.** Адкрыццё руху па чыгунцы Пецярбург – Варшава (1207 вёрст), якая прайшла праз Гродна.

**1863 г., студзень – 1864 г.** Паўстанне ў Польшчы, Беларусі, Літве і Правабярэжнай Украіне.

1863 г., **20 студзеня.** Маніфест Часовага правінцыяльнага ўрада Літвы і Беларусі аб надзяленні сялян зямлёй.

**1863 г., 1 лютага.** Захоп паўстанцамі г. Пружаны.

**1863 г., 27 лютага.** Захоп «белымі» кіраўніцтва ў Літоўскім правінцыяльным камітэце.

**1863 г., 1 сакавіка.** Указ царскага ўрада аб увядзенні абавязковага выкупу сялянскіх надзелаў у Віленскай, Гродзенскай, Ковенскай, Мінскай губернях і ў інфлянцкіх паветах Віцебскай губерні з 1 мая 1863 г.

**1863 г., вясна.** Найвышэйшы ўздым паўстання на тэрыторыі Беларусі і Літвы.

**1863 г., 1 красавіка.** Закон аб найме сельскагаспадарчых рабочых.

**1863 г., 24 красавіка.** Захоп паўстанцамі г. Горкі.

**1863 г., 24 красавіка.** Бітва паміж паўстанцамі і царскімі войскамі каля в. Мілавіды Слонімскага павета.

**1863 г., 18 кастрычніка.** Цыркуляр аб выдзяленні трохдзесяціннага сямейнага надзелу сялянам, якія былі абеззямелены ў 1846 – 1856 гг., і аб вяртанні надзелаў сялянам, абеззямеленым пасля 1857 г.

**1863 г., 2 лістапада.** Цыркуляр аб пашырэнні ўказа ад 1 сакавіка 1863 г. на Магілёўскую губерню і астатнія паветы Віцебскай губерні з 1 студзеня 1864 г.

**1864 г., 1 студзеня.** Палажэнне аб земскіх установах (земская рэформа).

**1864 г., 29 студзеня.** Арышт К. Каліноўскага (пакараны смерцю 10 сакавіка 1864 г.).

**1864 г., 5 сакавіка.** Палажэнне аб ільготах пры куплі зямлі ў заходніх губернях асобам рускага паходжання.

**1864 г., май.** Заканчэнне ўвядзення ўстаўных грамат у Беларусі.

**1864 г., 10 ліпеня.** Забарона яўрэям купляць зямлю па-за гарадамі і мястэчкамі Беларусі, Літвы і Правабярэжнай Украіны.

**1864 г., 14 ліпеня.** Палажэнне аб пачатковых народных вучылішчах. Новы статут гімназій (школьная рэформа).

**1864 – 1876 гг.** Адкрыццё настаўніцкіх семінарый у Маладзечне, Нясвіжы, Свіслачы і Полацку.

**1864 г.** Заканчэнне будаўніцтва шашы Кіеў – Брэст (1864 вярсты).

**1865 г., 10 снежня.** Забарона асобам польскага паходжання купляць і арандаваць зямлю ў Беларусі, Літве і Правабярэжнай Украіне.

**1866 г.** Адкрыццё Дзвінска-Віцебскай чыгункі (245 вёрст).

**1867 г., 16 мая.** Закон аб пазямельным упарадкаванні дзяржаўных сялян Беларусі, Літвы і Правабярэжнай Украіны.

**1868 г., 19 лютага.** Палажэнне аб скасаванні аднадворцаў у Беларусі і Літве.

**1869 – 1878 гг.** Будаўніцтва Маскоўска-Брэсцкай чыгункі.

**1869 – 1894 гг.** Жыццё і дзейнасць А. Гурыновіча.

**1870 г., 1 мая.** Адкрыццё Гомельскага гарадскога банка, першага ў беларускіх губернях.

**1871 г., 16 лістапада.** Увод у эксплуатацыю чыгуначнай магістралі Смаленск – Мінск – Брэст; афіцыйная дата адкрыцця Беларускай чыгункі.

**1872 г.** Увядзенне ў Беларусі міравых судоў.

**1872 – 1918 гг.** Дзейнасць у Полацку настаўніцкай семінарыі.

**1873 г.** Увод у эксплуатацыю вадаправода у Мінску.

**1873 г.** Пачатак эксплуатацыі лініі Вільна – Мінск – Гомель Лібава-Роменскай чыгункі.

**1873 г.** Адкрыццё чыгунак Брэст – Граева (199 вёрст) і Брэст – Кіеў (985 вёрст).

**1873 г.** Адкрыццё Мінскага камерцыйнага банка.

**1873 г., 11 мая.** Палажэнне аб спыненні судовых спраў па канфіскацыі маёнткаў удзельнікаў паўстання 1863 – 1864 гг. у Беларусі і Літве.

**1874 г., 1 студзеня.** Ваенная рэформа – увядение ўсеагульнай воінскай павіннасці.

**1874 г.** Адкрыццё першых у Беларусі таварыстваў узаемнага крэдыту (Мінск, Магілёў, Віцебск).

**1875 – 1877 гг.** Дзейнасць гуртка Я. Хургіна ў Мінску.

**1875г., 29 красавіка.** Гарадская рэформа ў заходніх губернях.

1876**г., 7 сакавіка.** Забастоўка рабочых Мінскіх чыгуначных майстэрань – адно з першых выступленняў рабочых у Беларусі.

**1876 г., 15 ліпеня – 1916 г., 17 лютага.** Жыццё і творчасць Цёткі (А.С. Пашкевіч).

**1878 г.** Утварэнне ў Магілёве народніцкага гуртка «Зямля і воля».

**1878 г., 4 красавіка.** Скасаванне інстытута міравых пасрэднікаў у Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губернях.

**1879 – 1880 гг.** Прыезды ў Мінск Г. Пляханава з мэтай арганізацыі выдання газеты «Черный передел».

**80-я** – **першая палова 90-х гг.** Аграрны крызіс у Расійскай імперыі.

**1881 г., 1 сакавіка.** Забойства нарадавольцамі імператара Аляксандра II.

**1881 г.** Утварэнне ў Пецярбургскім універсітэце нелегальнага беларускага студэнцкага зямляцтва.

**1881 – 1882** гг. Утварэнне паўночна-заходняй арганізацыі «Народная воля».

**1881 г., 28 снежня.** Закон аб абавязковым выкупе часоваабавязаных сялян расійскіх, паўночна- і паўднёваўкраінскіх губерняў з 1 студзеня 1883 г.

**1882 г., 9 студзеня.** Прынящце закона аб абавязковым выкупе зямлі сялянамі і спыненне часоваабавязаных адносін сялян з памешчыкамі з 1883 г.

**1882 г., 3 мая.** Забарона яўрэям сяліцца па-за гарадамі і мястэчкамі «мяжы аселасці» (за выключэннем яўрэйскіх земляробчых паселішчаў).

**1882 г., 18 мая.** Заснаванне Сялянскага пазямельнага банка.

**1882 г., 18 мая.** Закон аб паступовай адмене саслоўнага падушнага падатку.

**1882 г., 1 чэрвеня.** Выданне закона аб забароне на фабрыках, заводах і мануфактурах працы дзяцей да 12 гадоў, абмежаванні працоўнага дня падлеткаў (12 – 15 гадоў) і вызваленні іх ад работы ў начны час і ў святочныя дні.

**1882 г., 3 чэрвеня.** Палажэнне аб пазямельным упарадкаванні вольных людзей у Беларусі і ў Літве.

**1882 г., 7 ліпеня – 1942 г., 28 чэрвеня.** Жыццё і творчасць Я. Купалы.

**1882 г., 3 лістапада – 1956 г., 13 жніўня.** Жыццё і творчасць Я. Коласа.

**1882 г.** Забарона яўрэям пражываць у вёсках, на тэрыторыі, уключанай у так званую мяжу яўрэйскай аселасці.

**1882 – 1887 гг.** Будаўніцтва Палескіх чыгунак (1408 вёрст).

**1884 г.** Выданне нелегальнага часопіса «Гомон» – органа беларускіх нарадавольцаў.

**1884 г.** Выданне ў Вільні «Праграмы рабочых, членаў партыі «Народная воля» ў Паўночна-Заходнім краі».

**1884** г. Хваляванні сялян у 12 валасцях Бабруйскага, Ігуменскага і Слуцкага паветаў у сувязі са спробай самавольнага перасялення ў Сібір.

**1884 – 1889 гг.** Дзейнасць у Мінску першых рабочых гурткоў марксісцкага кірунку.

**1885 г., 21 красавіка.** Заснаванне Дваранскага пазямельнага банка.

**1885 г., 3 чэрвеня.** Выданне закона аб забароне начной працы жанчын і падлеткаў (да 17 гадоў).

**1886 – 1902 гг.** Выданне газеты «Минский листок».

**1886 г.** Закон аб абавязковым пераводзе дзяржаўных сялян на выкуп.

**1886 г., 9 чэрвеня.** Палажэнне аб пазямельным упарадкаванні сельскіх чыншавікоў у Беларусі, Літве і Правабярэжнай Украіне.

**1886 г., 12 чэрвеня.** Палажэнне аб найме сельскагаспадарчых рабочых.

**1886 г.** Закон аб абавязковым пераводзе дзяржаўных сялян расійскіх, паўночна і паўднёваўкраінскіх губерняў на выкуп.

**1886 г., 11 – 20 ліпеня.** Забастоўка рабочых Гомельскіх чыгуначных майстэрань.

**1882 – 1887 гг.** Будаўніцтва Палескіх чыгунак (1408 вёрст).

**1887 – 1894 гг.** Дзейнасць у Гродне падпольнага рэвалюцыйнага гуртка пад кіраўніцтвам М. Дзем'яновіча і С. Галюна.

**1887 г.** Адкрыццё чыгункі Брэст – Холм (107 вёрст).

**1889 г.** Закон аб земскіх начальніках у Расіі (у Беларусі ўведзены ў 1900 г.).

**1889 г.** На Добрушскай папяровай фабрыцы пачала дзейнічаць першая ў Беларусі электрастанцыя.

**1889 – 1890 гг.** Выступленні сялян у шэрагу валасцей Чэрыкаўскага, Клімавіцкага і Гомельскага паветаў Магілёўскай губерні ў сувязі са спробамі самавольнага перасялення ў Сібір.

**1890 г.** Земская контррэформа. Новае палажэнне аб земскіх установах.

**1890 г., 5 чэрвеня.** Адкрыццё ў Мінску гарадскога тэатра.

**1891 г., 3 снежня – 1917 г., 25 мая.** Жыццё і творчасць М. Багдановіча.

**1892 г., 10 мая.** У Мінску пачала дзейнічаць конка.

**1893 г., 8 ліпеня.** Закон аб абмежаванні зямельных перадзелаў у сельскай абшчыне.

**1893 г., 14 снежня.** Закон аб абмежаванні права распараджэння надзельнымі землямі.

**1894 г.** Утварэнне партыі «Народнае права».

**1894 г., сакавік.** Забастоўка рабочых Гомельскіх чыгуначных майстэрань.

**1894 – 1897 гг.** Дзейнасць у Мінску падпольнай арганізацыі рамесных рабочых.

**1894 г., май.** Увядзенне на Добрушской папяровай фабрыцы ўпершыню ў Расійскай імперыі 8-гадзіннага працоўнага дня.

**1895 г., студзень, сакавік.** Забастоўка рабочых Мінскіх чыгуначных майстэрань пад кіраўніцтвам сацыял-дэмакратычный трупы С. Трусевіча.

**1895 г., 1 мая.** Першае святкаванне рабочымі Мінска 1 Мая.

**Канец 1895 г. – 1897 г.** Масавыя хваляванні сялян Магілёўскай і Віцебскай губерняў у сувязі са спробамі самавольнага перасялення ў Сібір.

**1896 г.** Утварэнне Літоўскай сацыял-дэмакратычнай партыі.

**1896 г.** У Мінску пачала дзейнічаць першая ў Беларусі тэлефонная сетка агульнага карыстання.

**1896 г., май.** Утварэнне Рабочага саюза Літвы.

**1897 г.** Першы ўсеагульны перапіс насельніцтва ў Расійскай імперыі.

**1897 г.** Утварэнне Таварыства ўзаемнай дапамогі настаўнікаў і вучаніц Віцебскай губерні.

**1897 г., 1 студзеня.** Грашовая рэформа ў Расіі (закон аб увядзенні залатога грашовага абарачэння).

**1897 г.**, **2 чэрвеня.** Выданне закона аб абмежаванні рабочага дня на фабрыках і заводах да 11,5 гадзіны.

**1897 г., верасень.** Першы з'езд прадстаўнікоў яўрэйскіх сацыялдэмакратычных арганізацый у Вільні. Утварэнне Бунда.

**1898 г., 1 – 3 сакавіка.** Першы з'езд РСДРП у Мінску.

**1898 г., 18 чэрвеня.** Бельгійскае акцыянернае таварыства пачало эксплуатацыю трамвая ў Віцебску.

**1899 г.** Пабудавана чыгунка Гродна – Сувалкі – Оліта (185 вёрст).

**1899 г., май.** Забастоўка рабочых Гомельскіх чыгуначных майстэрань пад кіраўніцтвам камітэта РСДРП.

**1899г., верасень.** Забастоўка работніц тытунёвай фабрыкі ў Гродне.

# 5. ТЭРМІНАЛАГІЧНЫ СЛОЎНІК

АБШЧЫННАЯ ЎЛАСНАСЦЬ – калектыўная ўласнасць групы людзей, аб'яднаных у якую-небудзь абшчыну (у гэтым выпадку – сельскую). На Беларусі існаванне абшчыннай уласнасці мела месца толькі ў Віцебскай і Магілёўскай губернях.

АГАРОДНІКІ – катэгорыя феадальна-залежных сялян, якія карысталіся толькі невялікім зямельным надзелам.

АГРАРНЫ КРЫЗІС – стан сельскагаспадарчай вытворчасці, які выкліканы цяжкасцямі збыту прадукцыі, падзеннем цэн на яе. Аграрны крызіс 80-х – першай паловы 90-х гг. XIX ст. у Расіі быў выкліканы наплывам на еўрапейскія рынкі значнай колькасці сельскагаспадарчых тавараў з Аўстраліі, ЗША, Канады і іншых краін. За час аграрнага крызісу Беларусь ператварылася ў рэгіён, куды ў значных памерах пачалі ўвозіць збожжа. Прывёў да пагаршэння матэрыяльнага становішча значнай колькасці беларускіх сялян. Адбылася пераарыентацыя сельскагаспадарчай вытворчасці рэгіёна: асноўнай галіной становіцца жывёлагадоўля.

АДЗІНАЯ СІСТЭМА АГУЛЬНААДУКАЦЫЙНЫХ ШКОЛ – новая сістэма асветы, якая была створана ў Расійскай імперыі ў пачатку XIX ст. Уведзена адзіная сістэма агульнаадукацыйных школ. Кіраўніцтва школамі было цэнтралізавана. Настаўнікі прыходскіх вучылішч падпарадкоўваліся наглядчыку павятовага вучылішча, а тыя, у сваю чаргу, – дырэкцыі губернскай гімназіі. Дырэктары гімназіі знаходзіліся ў распараджэнні Вучылішчнага камітэта універсітэта – цэнтра навучальнай акругі.

АДРАБОТКІ – кабальная форма найму памешчыкамі сялян са сваімі прыладамі і цяглам (за пазычаныя зерне, грошы, арэнду зямлі і т. д.).

АДРЭЗКІ – землі, адабраныя памешчыкамі ў сялян падчас рэформы 19 лютага 1861 г. У выніку сялянскіх хваляванняў, а таксама нацыянальна-вызваленчага паўстання 1863 – 1864 гг. значная частка адрэзкаў была вернута сялянам.

АДЫХОДНІЦТВА – часовы адыход сельскага насельніцтва на промыслы або сельскагаспадарчыя прадпрыемствы, гаспадаркі іншых рэгіёнаў.

БАБЫЛІ, ХАЛУПНІКІ, КАМОРНІКІ – катэгорыі беззямельных сялян, якія жылі на чужой зямлі, за што плацілі гаспадару.

БАТРАК (ПАРАБАК) – прадстаўнік сельскагаспадарчага пралетарыяту.

БЕЛАРУСКАЯ НАВУЧАЛЬНАЯ АКРУГА – навучальна-адміністрацыйнае падраздзяленне ў дарэвалюцыйнай Расіі. Створана 17.01.1829

пасля рэарганізацыі Віленскай навучальнай акругі. Падпарадкоўвала спачатку навучальныя ўстановы Віцебскай і Магілёўскай, з 1831 г. – таксама Мінскай, з 1832 г. – Гродзенскай, Віленскай губерняў і Беластоцкай вобласці. Кіравала ўсімі відамі сярэдніх навучальных устаноў і кантралявала дзейнасць іншых навучальных устаноў. 02.05.1850 акруга была ліквідавана ў сувязі з аднаўленнем Віленскай навучальнай акругі.

«БЕЛЫЯ» – кансерватыўна-ліберальная плынь у нацыянальна-вызваленчым руху напярэдадні і ў час паўстання 1863 – 1864 гг. Выступалі супраць узброенага паўстання, спадзяваліся шляхам палітычных камбінацый дамагчыся ад царскага ўрада ўступак у аднаўленні Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. Сабатавалі правядзенне рэвалюцыйных пераўтварэнняў, што вяло да звужэння сацыяльнай базы і размаху паўстання.

БУНД – усеагульны яўрэйскі рабочы саюз Літвы, Польшчы і Расіі. Створаны на базе асветніцкіх гурткоў і стачачных кас яўрэйскіх рамеснікаў і рабочых. У 1898 – 1903, 1906 – 1912 гг. аўтаномная арганізацыя ў складзе РСДРП.

ВАЕННАЕ СТАНОВІШЧА – разнавіднасць надзвычайнага становішча. Уводзіцца ў надзвычайных сітуацыях, пагражаючых існаванню дзяржавы. Характарызуецца перадачай агульнага дзяржаўнага кіравання, пераважна аховы грамадскага парадку і бяспекі ў распараджэнне ваенных. Апошнія, звычайна, атрымліваюць шэраг надзвычайных паўнамоцтваў, якія ў звычайных абставінах з’яўляюцца прэрагатывай вышэйшых органаў улады і судовых устаноў (арышты, вобыскі, правы перадачы спраў па злачынствах супраць дзяржаўнага ладу ваенным судам і т. д.).

ВІЛЕНСКАЯ АРХЕАЛАГІЧНАЯ КАМІСІЯ – навукова-асветная ўстанова, дзейнічала ў 1855 – 1865 гг. Створана па ініцыятыве Я.П. Тышкевіча пры Віленскім музеі старажытнасцей.

ВІЛЕНСКАЯ НАВУЧАЛЬНАЯ АКРУГА – навучальна-адміністрацыйнае падраздзяленне ў дарэвалюцыйнай Расіі. Створана ў 1803 г. у сувязі з рэформай асветы. Падпарадкоўвала навучальныя ўстановы Валынскай, Віцебскай, Гродзенскай, Кіеўскай, Магілёўскай, Мінскай і Падольскай губерняў. Вучэбны і адміністрацыйны цэнтр акругі – Віленскі універсітэт. Першым папячыцелем акругі быў польскі магнат А. Чартарыйскі. Навучанне на беларускай мове ў школах акругі было забаронена. У 1824 г. акруга была рэарганізавана, а ў 1850 г. зноў утворана пасля ліквідацыі Беларускай навучальнай акругі. З 1866 г. усе выкладчыкі

няруская паходжання пазбаўляліся права выкладаць у навучальных установах акругі. Праіснавала да 1917 г.

ВІЛЕНСКІ МУЗЕЙ СТАРАЖЫТНАСЦЕЙ – заснаваны ў 1855 г. Я.П. Тышкевічам, адкрыты 1.12.1856 у будынку бібліятэкі Віленскага універсітэта. Існаваў з перапынкамі да 1-й сусветнай вайны. Меў аддзелы археалогіі, этнаграфіі, мастацтва, мінералогіі, арніталогіі. Шмат экспанатаў было з Беларусі: археалагічныя знаходкі, граматы XII – XIV ст., каменныя ідалы са Слуцка і інш.

ГАНДЛЁВАЕ ЗЕМЛЯРОБСТВА – вытворчасць, якая зарыентавана на атрыманне таварнай прадукцыі для продажу на рынках з мэтай атрымання прыбытку.

ГІЛЬДЫІ КУПЕЦКІЯ – саслоўныя аб’яднанні для абароны інтарэсаў гандлёва-прамысловай часткі насельніцтва.

ГОМАН – рэвалюцыйная народніцкая група ў Пецярбургу. У 80-я гг. XIX ст. узнікла сярод студэнтаў – ураджэнцаў Беларусі, якія выступілі з ініцыятывай стварэння аўтаномнай беларускай фракцыі «Народнай волі». Стваральнікі і кіраўнікі: А.І. Марчанка, Х.А. Ратнер, М.І. Стацкевіч, У.Б. Крупскі і інш. Было выдадзена некалькі нумароў часопіса «Гоман».

ГРАМАДСКІЯ ШКОЛЫ – на Беларусі ў 60-я гг. XIX ст. многія школы поўнасцю знаходзіліся на ўтрыманні сялянаў. У афіцыйных дакументах яны называліся «грамадскімі».

ДЗЕКАБРЫСТЫ – рускія дваранскія рэвалюцыянеры, разгарнуўшыя барацьбу супраць самаўладства і прыгонніцтва. Дзейнасць асобных дзекабрыстаў звязана з Беларуссю, паміж імі і тайнымі арганізацыямі на Беларусі існавалі пэўныя кантакты.

ДЗЕСЯЦІНА – расійская мера зямельных плошчаў (1,0925 га), якою карысталіся да ўвядзення метрычнай сістэмы мер.

9-ы АРХЕАЛАГІЧНЫ З’ЕЗД – адбыўся ў Вільні ў 1893 г. Абмяркоўваў пытанні археалогіі, гісторыі, этнаграфіі, вывучэння архітэктуры, мастацтва, мовы. Былі выдадзены 2 тамы «Прац» (1895 г., 1897 г.), у якіх надрукаваны даклады і справаздачы пра археалагічныя даследаванні ў Заходнім краі.

ДУХОЎНЫЯ СЕМІНАРЫІ – навучальныя ўстановы царкоўнага ведамства, якія давалі багаслоўскую адукацыю.

«ДЭМАКРАТЫЧНАЕ ТАВАРЫСТВА» – тайная рэвалюцыйная арганізацыя, якая дзейнічала ў 1836 – 1838 гг. у Віленскай медыка-хірургічнай акадэміі. Ставіла мэтай дапамогу асобам усіх станаў незалежна

ад нацыянальнасці і веравызнання. З цягам часу дзейнасць набыла сацыяльны накірунак. Вядома таксама як «Маладая Польшча», з'яўлялася састаўной часткай «Садружнасці польскага народа».

ДЭПАРТАМЕНТЫ, ПАДПРЭФЕКТУРЫ, ДЫСТРЫКТЫ, КАНТОНЫ – назвы адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, уведзеных французскімі ўладамі на акупіраванай тэрыторыі Беларусі.

ЗАХОДНЕРУСІЗМ – плынь грамадска-палітычнай думкі, адна з форм этнічнай самасвядомасці на Беларусі ў XIX – пач. XX ст. Узнік пасля 30-х гг. XVIII ст. пад уплывам рэакцыйнай нацыянальнай палітыкі царызму. Канцэпцыя заходнерусізму грунтуецца на сцвярджэнні, што беларусы не самастойны этнас, а адгалінаванне рускага народа.

ЗГОНЫ (ТАЛАКА, ГВАЛТ) – адпрацоўчая феадальная павіннасць сялян. У адрозненне ад паншчыны на згоны прымушаліся і тыя сяляне, якія не неслі іншых феадальных павіннасцей.

«ЗЯМЛЯ І ВОЛЯ» (60-х гг. XIX ст.) – рэвалюцыйная арганізацыя. Рашуча падтрымала паўстанне 1863 г. у Польшчы, на Беларусі і ў Літве. Шэраг членаў гэтай арганізацыі прымалі ўдзел у баях супраць царскіх войскаў. Перапыніла існаванне на пачатку 1864 г.

«ЗЯМЛЯ І ВОЛЯ» (70-х гг. XIX ст.) – народніцкая арганізацыя, узнікла ў 1876 г. Праграма «Зямлі і волі» грунтавалася на ўтапічнай тэорыі сялянскага сацыялізму і прадугледжвала пераход зямлі сялянам, перадачу грамадскіх функцый абшчынам, падзел Расійскай імперыі на часткі паводле «мясцовых жаданняў». На Беларусі ў 1876 – 1879 гг. народніцкія гурткі існавалі пераважна сярод вучнёўскай моладзі (Мінск, Магілёў, Гродна, Горкі).

ІНВЕНТАРЫ – вопісы ўладанняў феадалаў.

ІНВЕНТАРНЫЯ ПРАВІЛЫ – захады царскага ўрада па рэгуляванню ўзаемаадносін паміж памешчыкамі і іх прыгоннымі сялянамі на Беларусі. Дзейнічалі з 15 красавіка 1844 г. да 19 лютага 1861 г.

КАМІТЭТ ПА СПРАВАХ ЗАХОДНІХ ГУБЕРНЯЎ – дарадчы орган пры імператары Мікалаі І у 1831 – 1848 гг. Мэта яго дзейнасці: разгляд прапаноў дзяржаўных устаноў і дзеячоў, выпрацоўка рэкамендацый ураду, накіраваных на ўзмацненне пазіцый самаўладдзя на тэрыторыі Заходніх губерняў (насаджэнне рускага памешчыцкага землеўладання, перасяленне на Беларусь рускіх казённых сялян, размежаванне сіл мясцовай шляхты).

КІРМАШ – перыядычны торг, які наладжваўся ў пэўным месцы і ў пэўны час.

КЛАСІЦЫЗМ – накірунак у еўрапейскай мастацкай культуры другой паловы XVII – пачатку XIX ст. На Беларусі ў пачатку XIX ст. з'явіўся асноўным архітэктурным стылем. Пабудовы вызначаліся манументальнасцю, урачыстасцю. У скульптуры і жывапісе шырокага развіцця не атрымаў.

КОНКА – гарадская наземная чыгунка, вагон, які рухаецца запрэжанымі конямі.

ЛАТЫФУНДЫІ – буйныя прыватнаўласніцкія зямельныя ўладанні.

«ЛІСТЫ З-ПАД ШЫБЕНІЦЫ» – былі напісаны К. Каліноўскім падчас следства на беларускай мове лацінскім шрыфтам і патаемна перададзены з турмы на волю. У іх утрымліваюцца развважанні барацьбіта аб неабходнасці працягваць барацьбу, сур'ёзна да яе рыхтавацца.

ЛІТОЎСКІ АСОБНЫ КОРПУС – вайсковае злучэнне, сфарміраванае ў 1817 г., дыслацыраванае на тэрыторыі Беларусі і Літвы. Пераважная большасць асабовага саставу складалі рэкруты і ўраджэнцы Заходніх губерняў. Існаванне корпуса пэўным чынам падтрымлівала сепаратысцкія настроі на Беларусі і ў Літве, спадзяванні на аднаўленне Рэчы Паспалітай.

ЛЮСТРАЦЫЯ – Перыядычнае апісанне дзяржаўнай маёмасці.

МІНСКАЕ ТАВАРЫСТВА АМАТАРАЎ ПРЫГОЖЫХ МАСТАЦТВАЎ – прагрэсіўная культурна-асветніцкая арганізацыя. Узнікла ў 1898 г. Мела секцыі: літаратурную, драматычную і мастацкую. Кіраўнікі – Я. Чырыкаў, В. Чавусаў, С. Мядзведзеў, К. Кокаўцаў, М. Мысаўскі, С. Камінскі.

МІРАВЫ ПАСРЭДНІК – у Расійскай імперыі службовая асоба, якая прызначалася для разгляду спрэчак і скаргаў, якія ўзнікалі паміж сялянамі і памешчыкамі падчас рэалізацыі сялянскай рэформы 1861 г.

МІРАВЫ СУД – асобы від суда са спрошчаным судаводствам для разгляду нязначных іскаў (да 500 руб.) і дробных крымінальных злачынстваў.

«МУЖЫЦКАЯ ПРАЎДА» – першая нелегальная рэвалюцыйна-дэмакратычная газета, якая друкавалася лацінкай. Выйшла 7 нумароў. Выдавалі К. Каліноўскі, В. Урублеўскі і інш. Газета заклікала да радыкальнага вырашэння сялянскага пытання.

МУЗЫЧНАЕ ТАВАРЫСТВА – аб'яднанне прафесійных музыкантаў або аматараў. Мэта – пашырэнне музычнай культуры. На Беларусі дзейнічалі ў канцы XIX – пачатку XX ст. У другой палове XIX ст. на Беларусі існавалі наступныя музычныя таварыствы: Мінскае музычнае

таварыства (з 1880 г.), Мінскае музычнае таварыства (з 1889 г.), Мінскі музычны гурток (з 1896 г.).

МЯЖА АСЕЛАСЦІ – у Расіі ў 1794 – 1917 гг. мяжа тэрыторыі, на якой дазвалялася жыхарства яўрэям.

НАДЗВЫЧАЙНАЕ СТАНОВІШЧА – часовае абмежаванне грамадзянскіх правоў насельніцтва пры адначасовым узмацненні паўнамоцтваў адміністрацыі.

«НАРОДНАЯ ВОЛЯ» – народніцкая арганізацыя ў Расіі. Узнікла ў жніўні 1879 г. у выніку расколу «Зямлі і волі». На Беларусі дзейнічалі прадстаўнікі выканкама «Народнай волі» М.Ф. Грачэўскі, М.М. Рагачоў, М.Ю. Ашэнбрэннер і інш. У беларускіх гарадах існавалі гурткі «Народнай волі». «Народавольцы» значнае месца ўдзялялі тэрору. 1 сакавіка 1881 г. яны здзейснілі забойства Аляксандра ІІ. У 1883 г. арганізацыя была разгромлена.

НАСТАЎНІЦКІЯ СЕМІНАРЫІ – навучальныя ўстановы ў ХІХ – пачатку ХХ ст., што рыхтавалі настаўнікаў пачатковых школ.

НАЦЫЯ – тып этнасацыяльнай супольнасці людзей, што прыходзіць на змену народнасці і ўзнікае на аснове развіцця капіталістычных адносін.

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ САМАСВЯДОМАСЦЬ – самаўяўленне этнічнай групы аб сваім нацыянальным паходжанні, якое вызначае пэўныя патрыятычныя пачуцці і неабыякавыя адносіны да сваёй нацыянальнай гісторыі, культуры і мовы.

ПАНШЧЫНА – форма эксплуатацыі феадальна-залежнага насельніцтва, дармавая прымусовая праца сялян з уласным інвентаром у гаспадарцы феадала (адпрацоўчая рэнта).

ПАРТЫЗАНЫ – удзельнікі ўзброенай барацьбы ў тыле праціўніка з ліку жыхароў акупіраваных тэрыторый ці часцей рэгулярнай арміі.

ПЕРАСЯЛЕНЧЫ РУХ – імкненне сялян, часта спантанае, адшукаць лепшую долю на новых землях. Яно падтрымлівалася верай сялян у «добрага» цара», які жадае лепшага свайму народу, у адрозненне ад «зламысных намераў» памешчыкаў і чыноўнікаў.

«ПРАЛЕТАРЫЯТ» – назва польскіх палітычных партый, якія дзейнічалі таксама і на Беларусі. Першы «Пралетарыят» дзейнічаў у 1882 – 1886 гг.; другі заснаваны ў 1888 г., а ў 1893 г. гурткі «Пралетарыята» увайшлі ў Сацыял-дэмакратыю Каралеўства Польскага; трэці «Пралетарыят» – Польская сацыялістычная партыя – дзейнічаў у 1900 – 1909 гг.

РАЗБОР ШЛЯХТЫ – палітыка царскага ўрада, накіраваная на раздрабленне сіл польскага (апалячанага) дваранства.

РАЗМЕЖАВАННЕ ЗЯМЛІ – спробы памешчыкаў перагледзець вынікі надзялення сялян зямлёй у 1863 – 1865 гг., калі ўлады вымушаны былі пайсці на пэўныя ўступкі сялянам.

РАЗНАЧЫНЦЫ – у Расіі канца XVIII – пачатку XIX ст. міжсаслоўная катэгорыя насельніцтва, якая ўключала выхадцаў з розных саслоўяў (дваранства, духавенства, купецтва, мяшчанства), якія пераважна займаліся разумовай працай. Носьбіты буржуазна-дэмакратычнай і рэвалюцыйнай ідэалогіі.

РАМАНТЫЗМ – ідэйна-мастацкі накірунак у духоўным жыцці, літаратуры і мастацтве Еўропы і Амерыкі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. На Беларусі ідэі рамантызму з'явіліся ў першай палове XIX ст. Для рамантызму ўласціва арыентацыя на голас пачуццяў. У беларускай літаратуры зарадзіўся пераважна пад уздзеяннем творчасці А. Міцкевіча, І. Крашэўскага і іх паслядоўнікаў: Я. Чачота, Я. Баршчэўскага, У. Сыракомлі, В. Дуніна-Марцынкевіча і інш.

РАССЛАЕННЕ СЯЛЯНСТВА – рост маёмаснай і класавай няроўнасці ў асяроддзі сялян; з аднаго боку, колькасна павялічвалася сельская буржуазія, з другога – сялянскі пралетарыят і паўпралетарыят. У канцы XIX ст. найбольш заможная група сялянскіх гаспадарак складала 8 – 10 %, сярэдніх было каля 32 %, беднаты – 60 %.

РЭКВІЗІЦЫЯ – прымусовыя кампенсаваныя выняткі маёмасці.

САЮЗЫ БАРАЦЬБЫ ЗА ВЫЗВАЛЕННЕ РАБОЧАГА КЛАСА – першыя агульнагарадскія сацыял-дэмакратычныя арганізацыі ў 90-х гг., якія перайшлі ад прапаганды марксізму да масавай палітычнай агітацыі. У сакавіку 1898 г. у Мінску стварылі РСДРП. Пасля сакавіка 1898 г. прынялі назву «Камітэты РСДРП».

СЕКУЛЯРЫЗАЦЫЯ – канфіскацыя царкоўнай маёмасці на карысць дзяржавы. На тэрыторыі Беларусі праведзена ў 1841 – 1843 гг., большай часткай у адносінах да каталіцкай царквы.

СЕНТЫМЕНТАЛІЗМ – плынь у літаратуры і мастацтве XVIII – пачатку XIX ст. у Заходняй Еўропе і Расіі. Сентыменталізму ўласцівы культ пачуцця, увага да ніжэйшых слаёў грамадства, увядзенне лепшых маральных і духоўных каштоўнасцей у ранг найважнейшага жыццевага правіла. У беларускай літаратуры не аформіўся ў самастойную плынь.

Элементы сентыменталізму ўпершыню прыкметна выявіліся ў вершах Я. Чачота.

СЕРВІТУТЫ – абмежаванае права карыстання чужой уласнасцю (напрыклад, права праезду, выпасу жывёлы, рыбнай лоўлі, карыстанне сенажацямі, ляснымі ўгоддзямі і інш.). Сервітуты былі вельмі пашыраны на Беларусі ў феадальныя часы. У парэформенны перыяд адбывалася напружаная барацьба сялян за права карыстання сервітутамі.

СТАЧКА – калектыўнае спыненне працы рабочых і служачых з прад'яўленнем прадпрымальніку ці ўраду эканамічных ці палітычных патрабаванняў.

СЯЛЯНСКІ РУХ – састаўная частка расійскага сялянскага руху. На працягу 1864 – 1900 гг. на Беларусі адбылося каля 400 сялянскіх выступленняў, якія былі накіраваны супраць памешчыкаў і мясцовай адміністрацыі.

УСТАЎНЫЯ ГРАМАТЫ – акты, якімі вызначаліся адносіны часоваабавязаных сялян з памешчыкамі пасля сялянскай рэформы 1861 г.

ФАБРЫКА – Форма арганізацыі вытворчасці; прамысловае прадпрыемства, заснаванае на выкарыстанні сістэмы машын.

ФАБРЫЧНАЯ ІНСПЕКЦЫЯ – у Расіі з 1882 г. структура міністэрства фінансаў, якая назірала за выкананнем уласнікамі прамысловых прадпрыемстваў фабрычных законаў.

ФІЛАМАТЫ (з грэч. – аматары ведаў) – тайнае студэнцкае таварыства ў Віленскім універсітэце, яднала моладзь з Беларусі, Літвы і Польшчы. Паступовa эвалюцыянізіравала ад культурна-асветніцкай дзейнасці да палітычнай барацьбы за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне. Філаматы ўнеслі значны ўклад у вывучэнне культуры беларускага народа. Яны далі пачатак іншым нелегальным арганізацыям моладзі: «прамяністым», філарэтам і інш. У 1823 г. дзейнасць гэтых арганізацый была выкрыта ўладамі, значная колькасць членаў была рэпрэсіравана (у гэтым значную ролю адыграў М.М. Навасільцаў).

«ХАДЖЭННЕ Ў НАРОД» – рух перадавой інтэлігенцыі ў вёску з рэвалюцыйна-асветніцкімі мэтамі ў 60 – 70 гг. XIX ст. Найбольшы размах набыло вясной 1874 г. У ім прынялі ўдзел народнікі, якія паходзілі з Беларусі. Большасць з іх была арыштавана.

ЦЭНЗАВАЯ ПРАМЫСЛОВАСЦЬ – прадпрыемствы (фабрыкі і заводы) пэўных памераў і аб'ёму вытворчасці, пры наяўнасці механічных прывадаў (рухавікоў).

ЦЯГЛЫЯ СЯЛЯНЕ – катэгорыя феадальна-залежных сялян у Расіі і Вялікім княстве Літоўскім. У XIX ст. – сяляне, якія мелі поўны зямельны надзел і адбывалі феадальныя павіннасці ў памеры поўнага цягла.

ЧАСОВААБАВЯЗАНЫЯ СЯЛЯНЕ – Былыя памешчыцкія сяляне ў Расіі, якія на падставе рэформы 1861 г. вызвалены ад прыгону, але да пэўнага часу павінны былі выконваць феадальныя павіннасці на карысць памешчыкаў. На Беларусі часоваабавязаны стан быў скасаваны ў 1863 г., а ўвогуле па Расійскай імперыі – у 1881 г.

«ЧАСОВЫЯ ПРАВІЛЫ» – згодна з гэтымі правіламі, пачатковыя школы ў Паўночна-Заходнім краі поўнасцю аддаваліся пад кантроль праваслаўнага духавенства, чыноўнікаў і паліцыі. Правіламі прадугледжвалася выкладанне ў школе элементарных ведаў – пераважна рускай і царкоўна-славянскай граматы, арыфметыкі, навучанне дагматам праваслаўнай веры і царкоўным спевам.

«ЧОРНЫ ПЕРАДЗЕЛ» – народніцкая арганізацыя ў Расіі. Узнікла ў жніўні 1879 г. у выніку расколу «Зямлі і волі». Спачатку арганізацыя прытрымлівалася праграмы і тактыкі «Зямлі і волі». На Беларусі група «Чорнага перадзелу» актыўна дзейнічала ў Мінску, тут у 1881 г. дзейнічала падпольная друкарня гэтай арганізацыі. «Чорны перадзел» прыпыніў дзейнасць у 1882 г.

ЧЫНШ – грашовая рэнта.

«ЧЫРВОНЫЯ» – дэмакратычная плынь у нацыянальна-вызваленчым руху ў Польшчы, Літве і Беларусі напярэдадні і ў час паўстання 1863 – 1864 гг. Заклікалі да ўзброенай барацьбы, нацыянальнае вызваленне звязвалі з дэмакратычнымі пераўтварэннямі. Падзяліліся на дзве плыні: левую – рэвалюцыйна-дэмакратычную і правую – шляхецка-рэвалюцыйную. Левае крыло выступала супраць памешчыцкага землеўладання, за права народаў на самавызначэнне, за саюз рэвалюцыйных рухаў у барацьбе супраць самаўладства. Правае крыло выступала з палавінчатай сацыяльнай і нацыянальнай праграмай: кампенсацыяй памещчыкам за зямлю ў выпадку яе перадачы сялянам, не мела прынцыповай пазіцыі ў нацыянальным пытанні.

ЭКАНАМІЗМ – плынь у расійскай сацыял-дэмакратыі ў канцы XIX – пачатку XX ст.; прыхільнікі эканамізму намагаліся абмежаваць рабочы рух эканамічнай барацьбой.

ЭКАНАМІЧНЫ КРЫЗІС – стан эканомікі, які характарызуецца падзеннем вытворчасці, рэзкім абвастрэннем усіх супярэчнасцей эканомікі.

# 6. СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ


1. Гісторыя Беларусі: навуч. дапам. – Мінск, 2001.
2. Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т. 4. Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пач.XX ст.). – Мінск, 2005.
3. Гісторыя Беларусі. У 2 ч. Ч. 1. Ад старажытных часоў па люты 1917 / пад рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. – Мінск, 2000.
4. Гісторыя Беларусі. У 2 ч. Ч. 2. XIX – XX ст.: курс лекцый. – Мінск, 2002.
5. Гісторыя Беларускай ССР. У 5 т. Т. 2 – 5. – Мінск, 1972 – 1975.
6. История Беларуси: учеб. пособие для студентов. В 2 ч / под ред. Я.И. Трешенка. – Могилёв: МГУ им. Кулешова, 2005.
7. Ковкель, И.И. История Беларуси / И.И. Ковкель, Э.С. Ярмусик. – Минск, 1998.
8. Кузнецов, И.Н. История государства и права Беларуси / И.Н. Кузнецов, В.А. Шелкопляс. – Минск,1999.
9. Лобанов, А.П. Управляемая самостоятельная работа студентов в контексте инновационных технологий / А.П. Лобанов, Н.В. Дроздова. – Минск, 2005.
10. Лыч, Л.М. Гісторыя культуры Беларусі / Л.М. Лыч, У.Л. Навіцкі. – Мінск, 1996.
11. Нарысы гісторыі Беларусі. У 2 ч. / рэд. М.П. Касцюк [і інш.]. – Мінск, 1994 – 1995.
12. Парашкоў, С.А. Гісторыя культуры Беларусі / С.А. Парашкоў. – Мінск, 2003.
13. Педагогические основы самостоятельной работы студентов / под общ. ред. О.Л. Жук. – Минск, 2005.
14. Проектирование и разработка учебно-методических комплексов по циклу социально-гуманитарных дисциплин в вузе / под общ. ред. А.В. Макарова. – Минск, 2003.
15. Сергеенкова, В.В. Управляемая самостоятельная работа студентов. Модульно-рейтинговая и рейтинговая системы / В.В. Сергеенкова. – Минск, 2005.
16. Эканамічная гісторыя Беларусі. – Мінск, 1999.

# ДАДАТКІ

Дадатак 1

## Ведамасць уліку наведвання заняткаў

### Улік

наведавання лекцый (практычных заняткаў)

студэнтамі гр.______ (дысцыпліна_______семестр_____ навуч. год______)

| № | Месяц і дзень правядзення заняткаў і ўлік наведвання / Прозвішча, імя студэнта | | | | | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 2 | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 3 | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 4 | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 5 | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 6 | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 7 | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 8 | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 9 | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 10 | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 11 | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 12 | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 13 | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 14 | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 15 | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 16 | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 17 | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 18 | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 19 | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 20 | | | | | | | | | | | | | | | | | |

Дадатак 2

# Рэйтынгавая ведамасць

Дысцыпліна ________група ______семестр

| № | Імя і прзвішча студэнта | Наведванне заняткаў | | Віды вучэбнай дзейнасці | | | | | | | | | | | | | Творчая праца | РРБ |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | вус.адк. | даклады | рэфер. | канспекты артыкулаў | | | | анатацыі | | хранал. дыкт. | | кантрол. работы | | | |
| | | лек. | прак. | 1 | 1 | 1 | 1 | 2 | 3 | 4 | 1 | 2 | 1 | 2 | 1 | 2 | | |
| 1 | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 2 | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 3 | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 4 | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 5 | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 6 | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 7 | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 8 | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 9 | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 10 | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 11 | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 12 | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 13 | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 14 | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 15 | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 16 | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 17 | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 18 | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 19 | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 20 | | | | | | | | | | | | | | | | | | |

Дадатак 3

**Індывідуальная рэйтынгавая карта**

Дысцыпліна ________________________(Прозвішча студэнта)________________________група______________семестр____________

| Ме-сяц / Дата | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | Усяго ўмоўных балаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | л | с | в | р | д | к | а | л | с | у | р | д | к | а | кр | л | с | у | р | д | к | а | л | с | у | р | д | к | а | кр | л | с | у | р | д | к | а | |
| 1 | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 2 | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 3 | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 4 | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 5 | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 6 | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 7 | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 8 | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 9 | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 10 | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 11 | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 12 | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 13 | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 14 | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 15 | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 16 | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 17 | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 18 | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 19 | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 20 | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 21 | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 22 | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 23 | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 24 | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 25 | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 26 | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 27 | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 28 | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 29 | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| 30 | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| Усяго | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |

Дадатак 4



ВТОРЖЕНИЕ НАПОЛЕОНОВСКОЙ АРМИИ В РОССИЮ В 1812 г.
( Жилин П.А. "Отечественная война 1812 г." )
Развертывание армий к началу войны
БАЛТИЙСКОЕ
МОРЕ
Лифляндская губ.
Курляндская губ.
Виленская губ
Витебская губ.
Смоленская губ.
Могилевская губ
Минская губ.
Гродненская губ.
Калужская губ.
Нарва
Псков
Новгород
Рига
Штейнгейль
Митава
Мемель
Шавли
Поневеж
Россиены
Тильзит
Макдональд
Неман
Ковно
Почемонь
Наполеон
Прены
Богарне
Сувалки
Вильно
Барклай-де-Толли
1-я армия
Вилькомир
Динабург
Удино
Якобштадт
Витгенштейн
Опочка
Себеж
Дрисса
Клястицы
Полоцк
Свенцяны
Глубокое
Ушач
Островно
13-14.VII
Витебск
Велиж
Великие Луки
Белый
Царево-Займище
Гжатск
Бородино
26.VIII
Можайск
МОСКВА
Вязьма
Дорогобуж
Смоленск
4-5.VIII
Красный
2.VIII
Орша
Борисов
Могилев
Минск
Даву
Сморгонь
Гродно
Платов
Лида
Николаев
Белосток
Волковыск
Новогрудок
Мир
27-28.VI
Слоним
Несвиж
Слуцк
Бобруйск
Багратион
2-я армия
Ренье
Пружаны
Шварценберг
15.VII
Брест-Литовск
Кобрин
Хомск
Игумен
Салтановка
11.VII
Новый Быхов
Гомель
Рославль
Калуга
Тула
Лихвин
Серпухов
Тарутино
Коломна
Бронницы
Кр.Пахра
Клин
Дмитров
Тверь
Ржев
Ярославль
Новгородское ополчение
Тверское ополчение
Ярославское ополчение
Владимирское ополчение
Рязанское ополчение
Калужское ополчение
Тульское ополчение
Волхов
Чудское оз.
оз.Ильмень
Молога
Волга
Ловать
Зап.Двина
Вилия
Березина
Днепр
Сож
Припять
Десна
Ока
Данциг
Кенигсберг
Макдональд
Наполеон
ПРУССИЯ
Плоцк
Богарне
ВАРШАВА
Жером
ВЕЛ. ГЕРЦ.
ВАРШАВСКОЕ
Витгенштейн
Динабург
Барклай
Ковно
Вильно
1 А
Белосток
2 А
Багратион
Брест-Литовский
Пуцк
3 А
Тормасов
Шварценберг
Львов
АВСТРИЯ
Р
О
С
С
И
Я
Районы сосредоточения войск
наполеоновских
русских
Направления вторжения наполеоновских войск
Отступление русских войск
Места боев и сражений с указанием дат
Районы сосредоточения ополчения
© Николаев В.В., 2001


КОНТРНАСТУПЛЕНИЕ РУССКОЙ АРМИИ В 1812 г.
( Жилин П.А. "Отечественная война 1812 г." )
Положение наполеоновских войск в начале октября
Отступление наполеоновских войск
Параллельный марш главных сил русской армии
Действия отдельных русских отрядов
РАСПОЛОЖЕНИЕ ФРАНЦУЗСКИХ ВОЙСК
ПРУССИЯ
ВЕЛ. ГЕРЦ.
ВАРШАВСКОЕ
КОММУНИКАЦИОННАЯ ЛИНИЯ
© Николаев В.В., 2001

Дадатак 6

**АДМІНІСТРАЦЫЙНА-ТЭРЫТАРЫЯЛЬНЫ ПАДЗЕЛ БЕЛАРУСІ І СУМЕЖНЫХ ТЭРЫТОРЫЙ у 2-й палове XIX—пачатку XX ст.**




Спецыяльны змест распрацаваны Л.Р.Казловым

ЗМЕСТ

УВОДЗІНЫ ........ 3
БАЗАВАЯ ПРАГРАМА КУРСА ........ 5
1. КАНСПЕКТ ЛЕКЦЫЙ ........ 12
ЛЕКЦЫЯ 1. Беларусь у першай палове XIX ст. ........ 12
ЛЕКЦЫЯ 2. Сацыяльна-эканамічнае развіццё на зыходзе прыгонніцтва ........ 22
ЛЕКЦЫЯ 3. Вайна 1812 г. і Беларусь ........ 32
ЛЕКЦЫЯ 4. Урадавая палітыка царызму ў першай палове XIX ст. ........ 37
ЛЕКЦЫІ 5 – 6. Светапогляд рамантызму і грамадска-палітычнае жыццё на Беларусі ў першай палове XIX ст. ........ 46
ЛЕКЦЫЯ 7. Культура. Ад асветніцтва да рамантызму ........ 58
ЛЕКЦЫЯ 8. Беларусь у другой палове XIX ст. ........ 69
ЛЕКЦЫЯ 9. Мадэрнізацыйныя працэсы ў Беларусі ........ 73
ЛЕКЦЫЯ 10. Адмена прыгоннага права ........ 78
ЛЕКЦЫЯ 11. Урадавая палітыка царызму пасля падаўлення паўстання 1863 – 64 гг. ........ 89
ЛЕКЦЫЯ 12. Сельская гаспадарка Беларусі ў другой палове XIX ст. ........ 97
ЛЕКЦЫЯ 13. Прамысловасць і гарады ў другой палове XIX ст. ........ 107
ЛЕКЦЫЯ 14. Транспарт, гандаль, крэдыт. Будаўніцтва чыгунак ........ 115
ЛЕКЦЫЯ 15. Паўстанне 1863 – 1864 гг. на Беларусі ........ 120
ЛЕКЦЫЯ 16. Грамадска-палітычнае жыццё на Беларусі ў другой палове XIX ст. ........ 128
ЛЕКЦЫЯ 17. Фарміраванне беларускай нацыі ........ 140
ЛЕКЦЫЯ 18. Культура Беларусі ў 60 – 90-я гг. ........ 146
2. СЕМІНАРСКІЯ ЗАНЯТКІ ........ 156
3. РЭЙТЫНГАВАЯ СІСТЭМА ПРЫ ВЫВУЧЭННІ ГІСТАРЫЧНЫХ ДЫСЦЫПЛІН ........ 181
4. ХРАНАЛОГІЯ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ XIX СТАГОДДЗЯ ........ 190
5. ТЭРМІНАЛАГІЧНЫ СЛОЎНІК ........ 199
6. СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ ........ 208
ДАДАТКІ ........ 209

*Вучэбнае выданне*

ГЛАЗЫРЫНА Таццяна Мікалаеўна

ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ XIX СТАГОДДЗЯ

Вучэбна-метадычны комплекс
для студэнтаў спецыяльнасцей 1-21 03 01 «Гісторыя»,
1-02 01 02-04 «Гісторыя. Англійская мова»

Рэдактар *А.Э. Цыбульская*

Дызайн вокладкі *В.А. Вінаградавай*

Падпісана да друку 24.04.09. Фармат 60х84 1/16. Папера афсетная. Гарнітура Таймс.
Рызаграфія. Ум. друк. арк. 12,53. Ул.-выд. арк. 11,28. Тыраж 45 экз. Заказ 735.

Выдавец і паліграфічнае выкананне –
установа адукацыі «Полацкі дзяржаўны універсітэт»

ЛИ № 02330/0133020 ад 30.04.2004 ЛП № 02330/0133128 ад 27.05.2004

211440 г. Наваполацк, вул. Блахіна, 29